ARCHE Зьмест № 11’06

1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE :: Галоўная
3. Блогер Трабант. Архіпелаг роспачы
4. Нярыюс Пракявічус. Анатоль Рубінаў і «залаты век» за Лукашэнкам
5. Пётра Рудкоўскі. Трасянкавае пісьмо беларускага мысьленьня
6. Алесь Смалянчук. Плебейскія нацыі і імперскія перыферыі
7. Сайман Франклін. «Слова пра паход Ігараў» — Багемская рапсодыя?
8. Хью Л. Агн’ю. Ёзэф Добраўскі: звышкрытык-асветнік або фальсіфікатар-перадрамантык?
9. Павел Усаў. Вялікія прэтэнзіі малой дзяржавы
10. Тарас Кузё. Заходняя тэорыя і практыка шматкультурнасьці: наколькі яна прыдатная для постсавецкіх дзяржаваў?
11. Лукан Э. Ўэй. Аўтарытарызм і палітычная лібэралізацыя на захадзе былога СССР у 1992—2004 гг.*
12. Валянцін Грыцкевіч. Справа аб замаху Барыса Каверды на Пятра Войкава.
13. Віктар Жыбуль. Арына Глінская і яе няспраўджаны талент
14. Марыюс Івашкявічус. Быў у Беларусі, альбо Спроба прымусіць кроў загаварыць
15. Сяргей Абламейка. Эгіпецкія фараоны — габрэі ці беларусы?
16. Юры Пацюпа. Пра кавалерысцкі наезд на пісьменьніцкія хутары
17. Яраслаў Гаўлічак. Пагібель мястэчка Альшыны
18. Карлас Шэрман. Лірыка.
19. Павал Абрамовіч. Ад дзёньніка да літаратуры

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 11 (51) - 2006**
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
[image]
11[image]-[image]**2006**
крытыка • аналітыка • эсэістыка • гісторыя • палеміка • літаратура
[image] [image] [image]
[image]

Зьмест

Contents

БЛОГЕР ТРАБАНТ Архіпэляг роспачы
НЯРЫЮС ПРАКЯВІЧУС Анатоль Рубінаў і «залаты век» за Лукашэнкам

КРЫТЫКА

ПЁТРА РУДКОЎСКІ Трасянкавае пісьмо беларускага мысьленьня
АЛЕСЬ СМАЛЯНЧУК Плебэйскія нацыі і імпэрскія пэрыфэрыі
САЙМАН ФРАНКЛІН «Слова пра паход Ігараў» – Багемская рапсодыя?
ХЬЮ Л. АГН'Ю Ёзэф Добраўскі: звышкрытык-асветнік або фальсыфікатар-перадрамантык?

АНАЛІТЫКА

ПАВАЛ УСАЎ Вялікія прэтэнзіі малой дзяржавы. Адраджэньне Вялікай Літвы: міт ці новая геапалітычная рэчаіснасьць?
ТАРАС КУЗЁ Заходняя тэорыя і практыка шматкультурнасьці: наколькі яна прыдатная для постсавецкіх дзяржаваў?
ЛУКАН Э. ЎЭЙ Аўтарытарызм і палітычная лібэралізацыя на захадзе былога СССР у 1992–2004 гг.

ГІСТОРЫЯ

ВАЛЯНЦІН ГРЫЦКЕВІЧ Справа аб замаху Барыса Каверды на Пятра Войкава. Яшэ адзін міт пра этнічнага беларуса
ВІКТАР ЖЫБУЛЬ Арына Глінская і яе няспраўджаны талент

ЭСЭІСТЫКА

МАРЫЮС ІВАШКЯВІЧУС Быў у Беларусі, альбо Спроба прымусіць кроў загаварыць
СЯРГЕЙ АБЛАМЕЙКА Эгіпецкія фараоны – габрэі ці беларусы?

ПАЛЕМІКА

ЮРЫ ПАЦЮПА Пра кавалерысцкі наезд на пісьменьніцкія хутары

ЛІТАРАТУРА

ЯРАСЛАЎ ГАЎЛІЧАК Пагібель мястэчка Альшыны
КАРЛАС ШЭРМАН Лірыка

РЭЦЭНЗІІ

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Ад дзёньніка да літаратуры

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 11 (51) - 2006
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/01/29
[image]

Powered by phpBB © 2001, 2005 phpBB Group

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 11 (51) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]

[image]

аналітыка • крытыка • эсэістыка • гісторыя • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

Блогер

Трабант

Архіпелаг

роспачы

Набыўшы беспрэцэдэнтныя памеры, галадоўка пратэстанцкіх вернікаў царквы «Новае жыццё» адлюстравала ўсе палітычныя і сацыяльныя рэаліі сённяшняй Беларусі. Сам размах і выбуховы памер акцыі сведчыць пра многае. Хацелася б верыць, што яна – яшчэ адно сведчанне паступовай рэвалюцыі духу, што адбываецца ў беларускім грамадстве. Вера і прага волі сапраўды родняць вернікаў-галадоўнікаў з тымі, хто выйшаў у сакавіку на плошчу Каліноўскага. Аднак сёння аб тэндэнцыі можна гаварыць толькі ўмоўна. Адзін за другім адбываюцца лакалізаваныя выбухі пратэсту. Тое, што яны ўсё часцей набываюць форму галадоўкі, сведчыць, што гэтымі пратэстамі рухае не мэта, а роспач. Зразумеўшы, што іншых сродкаў камунікацыі з уладай не застаецца, пакрыўджаныя рашаюцца на адчайныя, ахвярныя дзеянні.

Гэтыя пратэсты пакуль што лакалізаваныя. Характэрна, што першымі прарывае тых, хто ўсё яшчэ імкнецца да самастойнага, незалежнага ад дзяржавы існавання (пазбаўлены ўласнасці і ліцэнзіі прадпрымальнік – гэта сапраўдны беларускі пралетар – яму сапраўды ўжо няма чаго губляць), а таксама, усё больш і больш, людзей веры – хай будзе то вера ў Бога, хай вера ў палітычныя ідэалы. Важна тое, што гэтая вера сапраўды кіруе людзьмі, а не з’яўляецца дэманстратыўным атрыбутам прыналежнасці да нейкай групы. Людзей веры ў Беларусі пакуль мала. Таму гэтыя выспачкі адчаю пакуль што не

сцягваюцца, не ствараюць прасторы пратэсту і супраціву, а застаюцца такім архіпелагам роспачы…

Самай яскравай адметнасцю стварэння і існавання гэтай апошняй і самай буйной (як мінімум з моманту знікнення плошчы Каліноўскага) выспы адчаю ёсць відавочная разгубленасць улады. Апошняя яскрава дэманструе сваю неадэкватнасць перад сілай бяссільных. Яе звычайны сродак размовы з непакорнымі – націск, гвалт не спрацоўвае перад тымі, хто не проста гатовы супрастаяць гвалту, а лічыць гэта найвышэйшым абавязкам. Берасцейскі чыноўнік яўна паспяшыў абвесціць вядомага палітыка «трошкі вышэй за бога». Уварванне ў храм, нават пазбаўлены рэгістрацыі, пакуль што тая мяжа, перад якой спыняюцца нават лукашэнкаўцы. Бог – гэта вам не апазіцыя…

Характэрна таксама амаль поўная адсутнасць рэакцыі палітычнай апазіцыі на беспрэцэдэнтныя падзеі. Выглядае, што апазіцыі грамадства патрэбнае толькі ў пэўных абставінах, калі гэта выгадна ёй самой. Нагадаем, што і падчас плошчы Каліноўскага апазіцыя не была лідэрам падзеяў, а хутчэй імкнулася ў іх упісацца. У Плошчы быў бачны пэўны палітычны капітал, які пасля гэтага быў выкарыстаны альбо, хутчэй, прафуканы. З іншага боку, аднак, трэба адзначыць, што і самі вернікі асабліва не імкнуліся ператварыць сваю акцыю ў палітычны пратэст, болей за тое, яны вельмі адмоўна ставіліся да наведвальнікаў з апазіцыйнай ці незалежніцкай «незарэгістраванай» сімволікай. Выходзіць, што апазіцыя не патрэбная незадаволеным? Бадай што, так яно і ёсць, але, калі падыходзіць аб’ектыўна, то рэч не столькі ў апазіцыі, колькі ў агульным пачуцці безнадзейнасці, што сфармавалася ў грамадстве да палітыкі і палітычнай дзейнасці ўвогуле. У адносінах да яе нават даведзеныя да роспачы вернікі пачынаюць паводзіць сябе рацыянальна – калі застаецца хоць маленькая надзея на тое, што з уладай можна дамовіцца, кантакты з палітычнай супольнасцю абрываюцца, бо яны могуць толькі сапсаваць магчымы кампраміс з уладай і стварыць падставы для апраўдання гвалту. Збіваць і выкідваць на вуліцу апазіцыю ў сённяшнім беларускім грамадстве вельмі нават паліткарэктна.

Наўмысная непалітызаванасць апошніх акцыяў прыводзіць нас да відавочнай высновы, што пакуль мы маем справу хутчэй з лакалізаванай гапонаўшчынай, а не з нарастаючай пратэставай грамадскай актыўнасцю. Архіпелаг так і застаецца архіпелагам, а таму стрымліванне пратэстных настрояў стварае толькі лакальныя праблемы для ўлады. З іншага боку, апошнія падзеі паказальныя тым, што дынаміка пратэставых дзеянняў цалкам адпавядае структурнаму і палітычнаму стану нашай сатрапіі. Прыніжаныя і зняважаныя, шукаючы сродкаў абароны сваіх правоў, рэагуюць на стан сістэмы, якая не пакідае ім ніякіх іншых варыянтаў, акрамя радыкальных, самаахвярных дзеянняў. Робячыся больш жорсткаю, сатрапія прымушае да выпрацоўкі новага пратэставага рэпертуару, які ўжо відавочна не зводзіцца да традыцыйнай апазіцыйнай дзейнасці і стандартных тэхналогіяў электаральных рэвалюцый. Пратэставы рэпертуар, нават у межах архіпелагу, становіцца непрадказальным, неардынарным, нечаканым. Болей за тое, адбываецца яго дыфузія, распаўсюджванне праз медыі, інтэрнэт, чуткі. Калі сапраўдны грамадскі рух, аб неабходнасці якога так доўга гаварылі апазіцыйныя палітыкі, і сапраўды паўстане, ён паўстане менавіта праз гэты працэс дыфузіі, а не праз размеркаванне пасадаў у галоўным штабе ці радзе. Бо рух – гэта менавіта сінхранізаваны рэпертуар грамадскіх дзеянняў. Сапраўдны палітычны складнік руху паўстае тады, калі складзецца і афарміцца гэты рэпертуар, а значыць і ідэалогія калектыўнага пратэсту. Калі існая палітычная кааліцыя не здолее гэтага зрабіць, яна так і застанецца тусоўкай.

Тэкст перапрацаваны спэцыяльна для «ARCHE».

[image]

[image]

№ 11 (51) - 2006

[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/11/28

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 11 (51) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]2006

[image] • крытыка • эсэістыка • гісторыя • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

НЯРЫЮС ПРАКЯВІЧУС

Нярыюс Пракявічус Анатоль Рубінаў і «залаты век» за Лукашэнкам

стыпэндыят унівэрсытэцкага коледжу «Södertörn» у Стакгольме, сталы аўтар «ARCHE».

КАЛІ ПОСПЕХІ САЮЗНІКАЎ БАЛЮЧА РАНЯЦЬ

Міжнароднае становішча заўсёды змяняецца. Некаторыя працэсы больш істотныя, некаторыя – менш. На маю думку, для Беларусі найважнейшымі падзеямі году за мяжой сталіся распад «памаранчавай» кааліцыі ва Украіне і нядаўняе абвастрэнне напружанасці вакол Ірана і Паўночнай Карэі. У дадатак узраслі цэны на сыравіну, у т. л. і на энэрганосьбіты. Усё гэта істотна аслабіла пазіцыі Беларусі на міжнароднай арэне.

Я б ахарактарызаваў палітыку Беларусі ў міждзяржаўных статунках і замежным гандлі як перадусім двухбаковае ўзаемадзеянне паміж Беларуссю і Расіяй. З аднаго боку, Беларусь для Расіі – вайсковы саюзнік і транзітная краіна ў гандлі з заходнееўрапейскімі партнёрамі. З другога – Расія падтрымлівае беларускі рэжым палітычна, пастаўляючы сыравіну па нізкіх цэнах і прапаноўваючы рынкі збыту для беларускіх прадпрыемстваў. Не ўсе гэтыя чыннікі аднолькава істотныя, і ніводны з іх нельга назваць абсалютным. Для Расіі

значэнне вайсковага саюзу з Беларуссю прапарцыйнае пагрозе з боку Еўразвяза і НАТО. Транзітны патэнцыял Беларусі трэба разглядаць у параўнанні з умовамі, якія прапануюць Украіна і дзяржавы Балтыі. Вага расійскай палітычнай падтрымкі вызначаецца ступенню самастойнасці беларускай улады і яе дачыненнямі з іншымі краінамі. Наколькі істотны для Беларусі гандаль з Расіяй, залежыць ад дасяжнасці іншых рынкаў збыту.

Для Расіі вартасць палітычнага саюзу з Беларуссю досыць невялікая. Меркаваць, што НАТО збіраецца напасці на Расію, папросту смешна. Расія адыгрывае ўсё большую ролю як крыніца сыравіны для краін Еўразвяза і ЗША, і ніхто ў заходнім альянсе не хоча пазбыцца гэтых паставак. Аднак нельга адмаўляць, што некаторыя расійскія палітыкі прыкрываюцца ўяўнай «пагрозай з Захаду», каб схаваць уласную няздольнасць вырашаць штодзённыя праблемы звычайных расійскіх грамадзянаў. Пэўныя колы ў Расіі могуць успрымаць як пагрозу жаданне Захаду бачыць краіну больш дэмакратычнай. Але саюз з Беларуссю ніяк не ўплывае на гэтую сітуацыю. Больш за тое, рост коштаў на прыродныя рэсурсы падвышае ўпэўненасць Расіі ва ўласных сілах, таму ёй менш патрэбны саюз з Беларуссю. Праз канфлікт Захаду з Іранам і Паўночнай Карэяй Расія робіцца яшчэ важнейшым гульцом у сусветнай палітыцы. Магчыма, кіраўніцтва Расіі адчувае, што можа знайсці сабе саюзнікаў і па ніжэйшым кошце. Некаторыя каланіяльныя імперыі распаліся не таму, што цэнтр не мог іх кантраляваць, а таму, што іх утрыманне задорага абыходзілася. Такім чынам, саюз з Беларуссю для Расіі – папросту справа прэстыжу.

Роля Беларусі як транзітнай зоны зменшылася, калі ва Украіне В. Януковіч перахітрыў сваіх «памаранчавых» супернікаў. Расіі, відавочна, патрэбныя розныя партнёры па транзіце, каб яны, канкуруючы між сабою, прапаноўвалі выгаднейшыя для Расіі ўмовы. Напрыклад, калі А. Лукашэнка займае занадта жорсткую пазіцыю, Расія можа звярнуцца да В. Януковіча, так што, трэба меркаваць, А. Лукашэнка вымушаны будзе памякчэць. Цяжэй весці справы з палітычна непрыхільным да вас партнёрам па транзіце. У такім выпадку палітычныя меркаванні могуць пераважыць над эканамічнымі. Больш за тое, пашырэнне Пецярбургскага порта, адкрыццё паромнай

лініі на Калінінград і будаўніцтва простага газаправода ў Нямеччыну сведчаць, што Расія гатовая пайсці на дадатковыя выдаткі, каб зменшыць кошт транзіту.

Палітычная падтрымка з боку Расіі мае для цяперашніх беларускіх уладаў двайное значэнне. Па-першае, Расія дапамагае ім супрацьстаяць міжнароднаму ціску. Па-другое, прыхільнасць Расіі забяспечвае А. Лукашэнку далейшую падтрымку пэўных сацыяльных колаў. Прэзідэнт гадамі развіваў асаблівыя стасункі з Расіяй. Нават можна сказаць, што саюз з Расіяй стаўся для яго сэнсам існавання. І хоць ён можа знайсці міжнародную падтрымку ў іншых дзяржаў (напрыклад, у Кітая), Расія незаменная як фактар унутранай стабільнасці. На Еўрапейскім кантыненце месцяцца краіны, што ўваходзяць у Еўразвяз або імкнуцца да яго далучыцца. Таму Беларусь застаецца ізаляванай ад Еўропы. Магчыма, гэтым тлумачыцца замірэнчы тон у выказваннях Лукашэнкі наконт стасункаў з Еўразвязам.

Гандаль з Расіяй, мабыць, на сучасным этапе прыносіць Беларусі большую карысць, чым Расіі. РФ можа з лёгкасцю знайсці замену таварам, што пастаўляе Беларусь (такім, як грузавікі, малочныя прадукты, лядоўні і г. д.). Але Беларусі не знайсці таннай замены расійскім прыродным рэсурсам (газу, нафце, вугалю, металу і г. д.). Яшчэ больш істотна тое, што канкурэнтаздольнасць беларускіх тавараў у вялікай ступені залежыць ад гэтых паставак з Расіі. І з цяжкасцямі ў пошуках новых рынкаў збыту сутыкнецца Беларусь, а не Расія. Сітуацыя для Беларусі пагаршаецца праз павелічэнне эканамічнага росту ў развіваных краінах, у якіх таксама расце попыт на энэрганосьбіты і сыравіну. Заўважна, што А. Лукашэнка паступова пераарыентоўвае беларускую эканоміку на іншыя рынкі ў развіваных краінах. Але падобны падыход можа аказацца не такім плённым, як здаецца. Некаторыя з патэнцыйных партнёраў (Венесуэла, Іран, Куба) хочуць змяніць наяўны *status quo* ў міжнародных стасунках. Гэткае сяброўства не палепшыць дачыненняў Беларусі з заходнімі дзяржавамі. Некаторыя з іх (напрыклад, Куба) неплацежаздольныя, а некаторыя (напрыклад, Кітай) складаюць канкурэнцыю беларускай прамысловасці, а не дапаўняюць яе. Урэшце, нельга

пераацэньваць аб’ёму гандлю Беларусі з развіванымі краінамі. Калі паглядзець на статыстыку за гэты год[1], можна заўважыць, што толькі 11 % вонкавага гандлёвага абарачэння Беларусі прыпадае не на краіны Еўразвяза і СНД. Кітай і Бразілія ўваходзяць у спіс пятнаццаці найбуйнейшых гандлёвых партнёраў Беларусі, але з абедзвюма Беларусь мае адмоўнае гандлёвае сальда!

У БОК ЗАХАДУ?

Усе адзначаныя вышэй складанасці адлюстроўваюцца ў афіцыйным дыскурсе, які ва ўмовах Беларусі выяўляецца ў форме г. зв. дзяржаўнай ідэалогіі. Наш аналіз перакананасці абапіраецца на два артыкулы першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Анатоля Рубінава, надрукаваныя ў газеце «Советская Белоруссия» ад 28 ліпеня і 27 кастрычніка гэтага года[2].

1 belta.by (дата звароту)

2 sb.by

3 Тым не менш, можна было б чакаць машэйтага тэаратычнага абгрунтавання гэтай думкі.

А. Рубінаў пачынае адзін са сваіх артыкулаў характарыстыкай ідэалогіі як неабходнай грамадству рэчы. Далей ён сцвярджае, што Беларусь можа выжыць толькі ў тым выпадку, «калі ўсе грамадзяне рэспублікі […] будуць аб’яднаныя адзінай культурай, адзінай сістэмай адукацыі, будуць адданыя адным і тым жа каштоўнасцям, падзяляць адну ідэалогію». А. Рубінаў выказвае меркаванне, што гэтае адзінства маецца ў наяўнасці: «…падтрымка А. Р. Лукашэнкі […] сведчанне ідэалагічнага адзінства нашага народу».

Разам з тым, ужыванне тэрміна «ідэалогія» ў абодвух артыкулах вельмі няяснае. Ідэалогія вызначаецца як прынцыпы пабудовы грамадскіх дачыненняў, сістэма каштоўнасцяў, грамадская думка. Прынцыпы, характэрныя для дзяржаўнай ідэалогіі («чэсная дзяржаўная ўлада, моцная сацыяльная палітыка і апора на народ»), пытання не праясняюць. Калі ўвагу да сацыяльнай палітыкі можна прыняць за кампанент ідэалогіі[3], дык два астатнія цверджанні надзвычай цмяныя: якая ж улада заявіць, што яна несумленная або што яна не мае народнай падтрымкі? А. Рубінаў таксама характарызуе беларускую ідэалогію ў прыватнасці як «ідэалогію на справе, ідэалогію жыцця», змешваючы палітычныя ідэі з іх рэалізацыяй.

Тая самая блытаніна з'яўляецца пры разглядзе распаду Савецкага Саюза. Палітык сцвярджае, што крызісу не было, але дагматычная ідэалогія «скоўвала палітычнае кіраванне і не дазваляла адэкватна рэагаваць на змену ўмоваў развіванага свету». Іншымі словамі, калі б савецкае кіраўніцтва мела больш гнуткую ідэалогію або не мела патрэбы звяртаць на яе ўвагу, не пачалося б ніякага крызісу[4].

Аднак зменлівасць дзяржаўнай ідэалогіі не павінна дзіўнымі. У сваім першым артыкуле для «ARCHE» я пісаў, што ідэалогія перадусім адлюстроўвае сучасныя патрэбы, але яна можа рэзка змяняцца. Адмовіўшыся ад прынятай раней ідэі пра асобную еўразійскую або ўсходнеславянскую цывілізацыю, А. Рубінаў (гэтаксама як і прэзідэнт у сваіх апошніх прызнае перавагу заходняй цывілізацыі, адначасова крытыкуючы тых, хто супрацьпастаўляе сябе ёй, за дагматызм, нежаданне лічыцца з відавочнымі сусветнымі працэсамі і тэндэнцыямі, высакамернае стаўленне да заходняй цывілізацыі і ўсячаснае імкненне выпрацаваць адмысловы шлях развіцця, у корні адрозны ад таго, які прыняты ў разьвітым свеце». Гэткае імкненне да выключнасці разглядаецца ў якасці адной з прычын развалу Савецкага Саюза.

[4] Цікавым
словамі,
ідэалогіі
ідэалогіі ад
вонкавага
свету.
Вынікае
даволі
таўталагічна.

А. Рубінаў не ўхваляе «паспешнае, сляпое капіяванне асобных пазіцый і палажэнняў заходняга ладу і стылю жыцця». Належыць гэта рабіць павольна («па меры саспявання і развіцця ў грамадстве неабходных традыцый, механізмаў, фінансавай сферы, інфраструктуры, заканадаўчай базы, урэшце, менталітэту народу»), каб захаваць стабільнасць. Тым не менш, палітык сцвярджае, што раней ці пазней гэта будзе зроблена – «рынкавыя ўмовы, ад якіх мы нікуды не дзенемся, запатрабуюць ўрэшце і ад нас раздзяржаўлення асноўных сфераў вытворчасці і паслуг».

Такім чынам, агульная ідэя ў тым, што Беларусь у прынцыпе прымае заходнія мадэлі развіцця, аднак не можа адразу пусціць іх у ход, таму ёй неабходны доўгі перыяд пад [мудрым] наглядам і кіраваннем улады, каб пабудаваць грамадства «на

заходні лад». Парадаксальным чынам гэта цверджанне апраўдвае дзяржаўнае ўмяшанне ў стварэнне рынкавай эканомікі і развіццё грамадзянскай супольнасці. Паколькі дакладная працягласць гэтага перыяду клапатлівага кіраўнічага нагляду няясная[5], мы маем новае і нашмат больш арыгінальнае абгрунтаванне аўтарытарызму.

ЗАСТАЦЦА Ў СУЧАСНАСЦІ?

А. Рубінаў дасюль ідэалізуе дасягненні савецкага часу: «...штатная «міфалагізаваная агульнасць»... [савецкае грамадства] пабудавала магутную дзяржаву, зрабіла гістарычны прарывы ў сучаснай навуцы і тэхніцы, перамагла фашызм». Распад Савецкага Саюза ўспрымаецца як катастрофа накшталт землятрусу – «не барацьба за нацыянальную незалежнасць […] а тэктанічныя гістарычныя працэсы, якія адбыліся насуперак волі і жаданню беларускага народу». Што даволі цікава, большая частка раздзела пра гістарычную пераемнасць прысвечаная савецкай спадчыне. Аднак гэта настальгія аб савецкім часе не мае наступстваў – Савецкі Саюз застаўся ў мінулым.

З іншага боку, А. Рубінаў крытыкуе ідэі «нацыянальнага адраджэння», спасылаючыся на адсталасць Беларусі да 1917 г. У пэўнай ступені ён прапануе развіваць беларускую нацыянальную самасвядомасць, засяродзіўшыся толькі на сучаснасці – «ствараць новае, прагрэсіўнае». Гэта, безумоўна, паспрыяе ўхваленню і падтрымцы дзейнага прэзідэнта. У абодвух артыкулах паўсюль бачная засяроджанасць на сучаснасці, імкненне выявіць «залаты век» за Лукашэнкам. Цяперашняе жыццё апісваецца як амаль што ідэал: «...такога жыцця, такога забеспячэння прадуктамі, таварамі, такой увагі да людзей ніколі тут яшчэ не было». Усё гэта разглядаецца як вынік палітыкі прэзідэнта («усё гэта дасягнута пры Прэзідэнту А. Р. Лукашэнку»). Ягоная інаўгурацыя выглядае ідылічнай карцінай: «...па ўсёй краіне было свята».

Гэты пазагістарычны падыход можа падацца натуральным кірункам далейшага развіцця дзяржаўнай ідэалогіі. Ранейшы акцэнт на супольнай з Расіяй гісторыі можа прывесці да

[5] Хто можа вызначыць, калі будзе «слушна» ўжыць заходнія мадэлі?

адваротных вынікаў у час, калі стасункі паміж краінамі пагаршаюцца. З іншага боку, адсутнасць у Беларусі выразнай нацыянальнай ідэнтычнасці ўскладняе навязванне агульнага погляду на гістарычныя падзеі.

НАЙЛЕПШЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ ІНСТЫТУТЫ

На думку А. Рубінава, для дэмакратычных дзяржаў характэрным, галоўным чынам, «выбарнасць кіраўніка дзяржавы і незалежнасць трох галін улады»[6]. У якасці другасных кампанентаў выступаюць незалежныя СМІ, шматпартыйная сістэма, прафесіяналізм грамадзянскай супольнасці. Палітык разглядае падзел уладаў як адзін з ідэалаў («разумныя сістэмы, якія ставяцца ў прыклад»), якога цяжка дасягнуць у рэчаіснасці (у якасці прыкладу згадваецца Расія). Замест таго, каб сцвярджаць, што Беларусь цалкам адпавядае ўсім вышэйпералічаным крытэрыям, А. Рубінаў пераходзіць да разгляду прэзідэнцкіх выбараў.

На думку аўтара, [illegible] кіраўніка дзяржавы. [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзесятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-адзінаццатае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дванаццатае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трынаццатае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-чатырнаццатае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пятнаццатае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шаснаццатае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямнаццатае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васямнаццатае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевятнаццатае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дваццатае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дваццаць першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дваццаць другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дваццаць трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дваццаць чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дваццаць пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дваццаць шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дваццаць сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дваццаць восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дваццаць дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трыццатае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трыццаць першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трыццаць другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трыццаць трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трыццаць чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трыццаць пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трыццаць шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трыццаць сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трыццаць восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трыццаць дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сарокавае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сорак першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сорак другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сорак трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сорак чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сорак пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сорак шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сорак сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сорак восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сорак дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцідзесятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцідзесят першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцідзесят другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцідзесят трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцідзесят чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцідзесят пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцідзесят шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцідзесят сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцідзесят восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцідзесят дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шэсцідзесятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шэсцідзесят першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шэсцідзесят другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шэсцідзесят трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шэсцідзесят чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шэсцідзесят пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шэсцідзесят шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шэсцідзесят сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шэсцідзесят восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шэсцідзесят дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямідзесятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямідзесят першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямідзесят другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямідзесят трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямідзесят чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямідзесят пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямідзесят шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямідзесят сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямідзесят восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямідзесят дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмідзесятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмідзесят першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмідзесят другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмідзесят трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмідзесят чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмідзесят пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмідзесят шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмідзесят сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмідзесят восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмідзесят дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяноста, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяноста першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяноста другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяноста трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяноста чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяноста пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяноста шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяноста сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяноста восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяноста дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сотае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сто дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзвюхсотае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзвюхсот першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзвюхсот другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзвюхсот трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзвюхсот чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзвюхсот пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзвюхсот шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзвюхсот сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзвюхсот восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзвюхсот дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трохсотае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трохсот першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трохсот другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трохсот трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трохсот чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трохсот пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трохсот шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трохсот сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трохсот восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-трохсот дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-чатырохсотае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-чатырохсот першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-чатырохсот другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-чатырохсот трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-чатырохсот чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-чатырохсот пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-чатырохсот шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-чатырохсот сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-чатырохсот восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-чатырохсот дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцісотае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцісот першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцісот другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцісот трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцісот чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцісот пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцісот шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцісот сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцісот восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-пяцісот дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шасцісотае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шасцісот першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шасцісот другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шасцісот трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шасцісот чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шасцісот пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шасцісот шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шасцісот сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шасцісот восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-шасцісот дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямісотае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямісот першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямісот другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямісот трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямісот чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямісот пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямісот шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямісот сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямісот восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-сямісот дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмісотае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмісот першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмісот другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмісот трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмісот чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмісот пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмісот шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмісот сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмісот восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-васьмісот дзевятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяцісотае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяцісот першае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяцісот другое, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяцісот трэцяе, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяцісот чацвёртае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяцісот пятае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяцісот шостае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяцісот сёмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выбараў [illegible] кіраўніка дзяржавы. Па-дзевяцісот восьмае, [illegible] кіраўніка дзяржавы [illegible] кіраўнікі [illegible] прэзідэнцкіх выб

наўпрост выбірае свайго лідэра»), падкрэслівае ролю дзейнага кіраўніка дзяржавы («калі ранейшы кіраўнік спадабаўся, то яго зноў падтрымаюць»), адкідаючы іншых прэтэндэнтаў як не вартых увагі («не столькі выбар, колькі пратэстнае галасаванне»). Палітык яшчэ раз сцвярджае, што «развітыя» палітычныя сістэмы («дзе ёсць дзве-тры асноўные партыі»[9]) спараджаюць пажаданыя вынікі («кандыдат на пасаду кіраўніка дзяржавы не ўзнікае з ніадкуль»), што таксама не з'яўляецца ідэалам («у ход ідуць самыя хітрыя піараўскія прыёмы»).

А. Лукашэнка параўноўваецца з расійскім царом Пятром I – яму патрэбныя тыя ж самыя якасці («асоба лідэра, ягоная энэргія, воля, інтэлект, інтуіцыя, здольнасць бачыць перспектыву, здольнасць аб'яднаць і накіраваць грамадства»). У з'яўленні прэзідэнта як лідэра бачыцца наканаванне («вынік спрацоўвання інстынкту самазахавання грамадства»). У абарону трэцяга прэзідэнцкага тэрміну А. Лукашэнкі прыводзяцца спасылкі на розныя прыклады з Захаду (амерыканскі прэзідэнт Ф. Д. Рузвельт, прэм'ер Вялікабрытаніі Т. Блэр, князь Манака Рэнье) [10].

Падкрэсліванне ролі прэзідэнта дазваляе абмінуць увагай іншыя інстытуты дэмакратыі, і зноў паўстае пытанне, што можа здарыцца з гэтай сістэмай, створанай пад лідэра, пасля сыходу А. Лукашэнкі. Адзін з моцных бакоў дэмакратыі – непарыўнасць, пераемнасць сістэмы: будучыя лідэры гартуюцца ў палітычных кампаніях і парламенцкіх дэбатах. Іначай застаецца толькі спадзявацца на празорнасць Божую.

ЯК ДАЦЬ РАДЫ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

А. Рубінаў хоча давесці, што беларускае грамадзтва не даспела да дэмакратыі: «Дэмакратыя несумяшчальная з карупцыяй, крадзяжом, падманам, здзірствам, грэблівым стаўленнем да экалогіі, рэсурсаў, непавагай і няўвагай да чалавека. А хіба мы, грамадзяне, сёння вырашылі ў нашым грамадстве гэтыя праблемы?» Да таго ж «гэты рацэпт паводзінаў арганічна не спалучаецца з традыцыямі народу». Гэтай фразай палітык фактычна адмятае ўсе крытычныя заўвагі Захаду наконт

развіцця дэмакратычных інстытутаў у Беларусі. Але заходняя мадэль – не толькі прыклад сталай, трывалай дэмакратыі. Яе трэба браць за ўзор, за пункт адліку, іначай усялякую сістэму кіравання можна будзе назваць дэмакратычнай. А. Рубінаў сцвярджае, што толькі прэзідэнт не дае грамадзтву скаціцца да хаосу: «...высілкі ўлады, Прэзідэнта прымушаюць нас выбрацца з бруду і бескультур'я». Лукашэнка выглядае гэткім платонаўскім валадаром-філосафам, які ведае, што лепш для грамадзтва: «...адлюстроўваецца вялікая інтуіцыя Прэзідэнта, які не перашкаджае натуральнаму развіццю грамадскай свабоды, але і не дазваляе выйсці гэтаму працэсу з-пад разумнага кантролю». Грамадства разглядаецца як пасіўны аб'ект кіравання: «...свабода мусіць давацца грамадству настолькі, наколькі яно гатовае несці за яе адказнасць». Выглядае, што А. Рубінаў перакульвае сістэму дачыненняў «вядоўца – ведзены» паміж грамадствам і дзяржавай: у яго грамадства адказвае перад дзяржавай, а не наадварот. Нарэшце, дэмакратыя разглядаецца як інструмент сацыяльнай інжынерыі, а не як мэта: «...дэмакратыя з сродку дасягнення мэты – пабудовы эфэктыўнага і справядлівага грамадства – пераўтварылася ў саму мэту».

Развіваючы гэты тэзіс, А. Рубінаў падыходзіць да СМІ як да неад'емнага кампанента дзяржавы, механізма кіравання грамадствам: «...даючы насельніцтву праўдзівую інфармацыю пра розныя бакі жыцця ў краіне і сусвеце, трэба клапаціцца пра тое, каб не запаўняць экрана сцэнамі жорсткасці і жахаў, не нагнятаць упадніцкіх настрояў, песімізму, нявер'я ў сваю краіну, не падкідваць ў грамадства бацылаў нянавісці і вострых супярэчнасцяў». Гэтая цытата – вельмі паказальная. Яна сведчыць, што аўтар пераканаы: меркаванне ўлады і ёсць праўдай. У ёй выказваецца агульнае кансерватыўнае стаўленне да СМІ і надзіва песімістычны погляд на цяперашнюю сітуацыю: навошта змагацца з «упадніцкімі настроямі», калі ўсё так добра? А. Рубінаў таксама сцвярджае, што СМІ не павінны заплюшчваць вочы на праблемы ці праяўляць стараннасць, бо гэта падрывае давер да СМІ і ўлады. (Тут варта было б запытацца, ці можна распаўсюджваць старонную інфармацыю, калі грамадства схільнае прымаць яе на веру?) Аўтар скептычна выказваецца пра незалежнасць СМІ: «...поўнай

незалежнасці ні ў кога не існуе». Гэта досыць звыклы стэрэатып: паколькі ідэал свабоднай прэсы – недасяжны, навошта турбавацца пра абарону наяўнай – недасканалай – свабоды прэсы? А. Рубінаў нават малюе ўрад заступнікам прэсы перад адсталым грамадствам і мясцовымі ўладамі: «… натыкаемся […] на няздатнасць успрымаць розныя меркаванні і падыходы, на нецярпімасць да крытыкі, якая почасту разглядаецца як асабісты выпад і падрыў аўтарытэту мясцовага кіраўніка».

А. Рубінаў ускосна закранае канфлікт, які працягваецца вакол Саюза палякаў. Спачатку ён папросту адкідае праблему, называючы этнічныя пытанні «хобі»: «Можна толькі вітаць грамадскія арганізацыі і клубы па вывучэнні, напрыклад, кітайскай, польскай ці азербайджанскай культуры». (З гэткім жа посьпехам можна было сказаць: «У Менску жывуць туркі, беларусы і армяне». Такая паслядоўнасць сведчыць пра поўнае ігнараванне нацыянальнага складу насельніцтва.) Далей аўтар ставіць пад сумнеў мэтазгоднасць стварэння нацыянальных арганізацый: «…навошта ж асобным групам адасабляцца?» І нарэшце ён заяўляе, што нацыянальныя інтарэсы нясуць у сабе пагрозу і яны павінны падпарадкоўвацца дзяржаўным: «…краіна падзеліцца на асобныя дыяспары са сваімі мовамі, сваімі школамі, сваімі газетамі і тэлевізійнымі праграмамі, арганізацыйна-структурнымі цэнтрамі (почасту фінансаванымі з-за мяжы)». Аднак, на нашую думку, гэтая заява звязаная не столькі з праблемамі нацыянальных меншасцяў, колькі з агульнай лініяй на тое, каб пазбавіць беларускія НДА замежнага фінансавання.

Кантроль над грамадзянскай супольнасцю – асноўная тэма артыкулаў А. Рубінава. Ён не адмаўляе дэмакратыю ўвогуле, а надае ёй новае азначэнне – такое, што служыць на карысць уладзе.

БЕЛАРУСКІ АДЫСЕЙ ПАМІЖ СЦЫЛАЙ І ХАРЫБДАЙ

Артыкул А. Рубінава суправаджаецца шэрагам каментароў – звязаных з тэмай і безадносных да яе. «Советская Белоруссия»

радасна заяўляе, што «свой пункт гледжання на ідэалагічныя працэсы выказваюць навукоўцы і пенсіянеры, дзяржаўныя дзеячы і студэнты». Яны з настальгіяй аб савецкім часе разважаюць пра «вынікі развалу магутнай Страны Саветаў, што спарадзілі бездухоўнасць»11, выказваюць меркаванне, што «неабходна прывесці ўсе вядомыя навукі да адной роўніцы»12, прапаноўваюць увесці дзяржаўную ідэалогію: «...ёсць безліч ідэалогій і ёсць выбар адзіна слушнага ў цяперашні час пункту гледжання і кіраванне ім» – і не зважаюць на праблему нацыянальнага самавызначэння: «...адправіць гэтую [нацыянальную] ідэю на перыферыю грамадскай зацікаўленасці»13. Аўтары згодныя з А. Рубінавым што да залежнасці СМІ: «…калі «свабода» пераўтвараецца ў бізнес, то церпіць перадусім свабода»14, і што да «непрымальнасці і гістарычнай бесперспектыўнасці штампу «адраджэння Беларусі» незалежна і насупраць братэрскай дапамозе рускага народу і Расіі, савецкай краіны»15.

Складваецца ўражанне, што ідэя А. Рубінава наконт паступовай пераарыентацыі Беларусі на заходні ўзор згубілася. У другім артыкуле палітыка дачыненні паміж Беларуссю і Захадам апісваюцца ў больш ваяўнічым ключы – ствараецца вобраз варожага атачэння: «…і радыёстанцыямі атачылі, і прапагандысцкую літаратуру закідваюць, і інструктараў шлюць, і запалохваюць замарожваннем міфічных замежных рахункаў». Замежныя пасольствы абвінавачваюцца ў тым, што яны ўзгадоўваюць апазіцыю: «…служаць не для палягчэння стасункаў між краінамі, а для дэстабілізацыі дзяржавы». А праціўнікі ўлады «імкнуцца сваім жаласным выглядам выдурыць з прастадушнай публікі хаця б пару залатых».

А. Рубінаў ураўнаважвае гэтыя заявы словамі, што Расія – не тая, што была раней: «…іншы ўклад, іншыя прыярытэты, іншыя сілы ўплыву». Ён усведамляе: «…брацкія саюзніцкія памкненні з боку Беларусі для многіх карпаратыўных групаў Расіі чужыя». Асноўная ідэя, якую даводзіць палітык, спалучае раней афіцыйна прапагандаваны вобраз Беларусі, што ідзе на ахвяры дзеля Расіі («нам у інтарэсах большасці трэба праявіць цярпенне, мудрасць і паслядоўна дабівацца сваёй мэты»), і расчараванне тым, што падобная палітыка не прыносіць

вынікаў: «…эйфарыя ад… рытуальных дасягненняў Расіі ў стасунках з заходнімі краінамі хутка пройдзе».

Агульная ідэя А. Рубінава ў тым, што Беларусь хоча развіваць сяброўскія дачыненні і з Захадам, і з Расіяй, але гэтае жаданне – аднабаковае. І Захад, і Расія патрабуюць ад беларускай улады немагчымага. Захад хоча бачыць у Беларусі больш адкрытую палітычную і эканамічную сістэму. Расія хоча змяніць мадэль супрацоўніцтва з Беларуссю так, каб рэспубліка цалкам увайшла ў склад РФ. У мінулым А. Лукашэнка выяўляў немалую палітычную вынаходлівасць. Цікава, як ён дасць рады з тым, што больш магутная Расія менш добразычліва ставіцца да Беларусі?

Пераклала з ангельскай Аляксандра Каласоўская

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 11 (51) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/11/27**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 11 (51) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]-[image]2006

да Зьмяшчэнь

крытыка • эсэістыка • гісторыя • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

ПЁТРА РУДКОЎСКІ

Пётра Рудкоўскі Трасянкавае пісьмо беларускага мысьленьня

філёзаф, багаслоў, ляўрэат прэміі «ARCHE».

Фрагмэнты. Вясна'06. № 11. 2006. Тэма нумару: Усходняя Эўропа: пасьля Гедройца.

Топос: Философско-культурологический журнал. 2006. № 1 (12).

Kenos ekeinou philosophou logos hyph’ hou meden tou anthropou pathos terapeuetai.

Pithagoras ho Philosophos[1]

Быць – гэта пакліканьне і наканаваньне ўсяго космасу.

Жыць – пакліканьне і наканаваньне ўсяе біясфэры.

Думаць і спасьцігаць думкамі ўсё існае – пакліканьне і наканаваньне ўсяго чалавечага роду.

Быцьцё імкнецца да звышбыцьця, хоча ўзысьці на ўзровень самаарганізацыі і размнажэньня. Тады яно робіцца *жыцьцём*.

[1] Парожняе слова такога філёзафа, якое ніводнага чалавечага пачуцьця ня лекуе. Філёзаф Пітагор.

Жыцьцё ірвецца да звышжыцьця, хоча здабыць самасьвядомасьць і праз мысьленьне асвойваць навакольны сьвет. Думаньне, калькуляцыя, прагназаваньне, сузіраньне, філязофія – гэта і ёсьць тыя формы звышжыцьця, да якіх імкнецца біясфэра і космас. А чалавечая думка, у сваю чаргу, таксама скіраваная да свайго «звыш-», нейкага трансцэндэнтнага *Logos*, які надае сэнс усяму існаму, жывому і духоўнаму.

Гісторыя беларускага народу таксама пазначаная гэтым патройным памкненьнем – да звышбыцьця, звышжыцьця і звыш-Х. Кожны з нас так ці іначай улучаны ў гэты маўклівы працэс, і кожны з нас пакліканы яго *агучваць*. Калісьці гэта рабілі Эўфрасіньня Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францішак Скарына, пазьней – Абдзіраловіч, Самойла, а сёньня спрабуюць голас інтэлектуалы, пісьменьнікі і песьняры.

Чалавечы *logos*, выяўляючы быцьцё-жыцьцё, адначасна фальшуе-ўтойвае яго – прыкладна да гэткай высновы прывяла Гайдэгера ягоная антааналітыка. Трохі адыходзячы ад гайдэгераўскай артадоксіі, прапаную вось якую тэзу: нашае слова часам больш выяўляе быцьцё, чым фальшуе, а часам наадварот: больш фальшуе, чым выяўляе. Высьветліць, чаго больш, бывае няпроста, але ўсё ж паспрабуем гэта зрабіць у дачыненьні да выказьнікаў беларускага думаньня. За «матэрыял» для досьледаў возьмем сёлетнія нумары беларускамоўных «Фрагмэнтаў» («Вясна ’06») і расейскамоўнага «Топоса» (2006. 01). А за ліхтарык, каб асьвятляць нам шлях, возьмем Пітагоравы: *Парожняе слова такога філёзафа, якое ніводнага чалавечага пачуцьця ня лекуе*.

ПРА ТОЕ,
ЯК ФІЛЁЗАФЫ ЗВОДЗЯЦЬ КАНЦЫ З КАНЦАМІ

1. «Беларускае мысьленьне – гэта гэст адвагі, зь якім мы ўваходзім у сфэру *блізкага*, але *непрадуманага*, у рэчы, якія нам дадзены, але мы не разумеем кім і навошта», – піша Ігар Бабкоў у рэдактарскай прадмове да «Фрагмэнтаў», названай «Вяртаньне». Зноў прыгадваецца Гайдэгер з больш агульнай зацемкай: чалавек *антычна* найбольш блізкі самому сабе, але

анталягічна найбольш аддалены сам ад сябе. Бадай, для беларуса словы Гайдэгера актуальныя больш, чым для каго-кольвек іншага. Можа, звычайнаму эўрапейцу нялёгка зразумець галаваломку: што значыць «быць блізкім *антычна* і быць далёкім *анталягічна*». Але ён, гэты звычайны эўрапеец, хутчэй за ўсё зробіць выгляд, што даўно яе разгадаў і добра яе разумее. А вось зь «незвычайным эўрапейцам», г. зн. беларусам, праблема меншая: дастаткова ўзяць любога заўзятага адраджэнца, завесьці да вясковай бабулі, якая гаворыць на трасянцы, пабожна цалуе партрэт прэзыдэнта і дзьвюма рукамі галасуе за калгасы, і спытацца: *што* вас яднае? Яднае *быцьцё беларусам*, а дыстанцыюе *спосаб разуменьня* гэтага быцьця. Інакш кажучы, *антычна* вы блізкія, *анталягічна* – безнадзейна далёкія.

Можа, і не было тут вялікай праблемы, калі б ня тое, што *спосаб разуменьня быцьця* ўплывае на само быцьцё. Быцьцё трансфармуецца пад уплывам самаразуменьня. Такім чынам, калі *анталягічная аддаленасьць* не пераадольваецца, яна прыводзіць да *антычнай аддаленасьці*.

Магчыма, усьведамляючы гэтую небясьпеку, а мо і зь іншае прычыны, Бабкоў у сваёй рэдактарскай прадмове дэкляруе: «Фрагмэнты» *вяртаюцца*». Больш за тое: «Фрагмэнты» *вяртаюцца як часопіс беларускага мысьленьня*». Калі першая фраза выклікае зацікаўленьне (*вяртаюцца з чым?*), дык другая трохі насьцярожвае. «Часопіс мысьленьня» можна разумець падвойна: альбо часопіс зьмяшчае ў сабе беларускае мысьленьне, альбо... часопіс, які я трымаю ў руках, належыць беларускаму мысьленьню, уяўляе сабою ўласнасьць беларускага мысьленьня! Інакш кажучы, калі хтосьці запытае ў мяне: «*Чый* гэта часопіс?» – я ня маю права казаць: «Гэта часопіс Бабкова», альбо: «Гэта часопіс Цэнтру антрапалягічных дасьледаваньняў», альбо, крый, Божа: «Мой часопіс». Я мушу казаць: «*Гэта часопіс Беларускага Мысьленьня*». Другую інтэрпрэтацыю пацьвярджае і ляпідарная фраза рэдактара: «Мы патрапляем у мысьленьне». Вось у чым рэч: яно, мысьленьне, існуе як бы аўтаномна, а «мы», г. зн. аўтары і, магчыма, чытачы «Фрагмэнтаў», у яго *патрапляем*.

У анонсе на другой старонцы «Фрагмэнты» названыя «легендарным альманахам», «зь якога пачалося сучаснае беларускае мысьленьне». Пасьля гэтых словаў ужо няма сумневу, што «Фрагмэнты» – тэрыторыя не абы-якога, а найбольш якаснага і амбітнага беларускага мысьленьня. Нават «паўза», г. зн. часовы нявыхад «Фрагмэнтаў», мае своеасаблівы, вышэйшы сэнс:

Паўза, якая паўстала на зломе эпохаў, была важнай. Яна дазволіла зразумець, што думка не абавязкова прысутная ўвесь час. Больш за тое: некаторыя эпохі робяць усё магчымае, каб думка і не паўстала ніколі – пакуль яны пры ўладзе.

Зь першых двух сказаў вынікае, што:

1) думка не абавязкова прысутная ўвесь час. Гэта тэза, якую вельмі важна зразумець;

2) часовы нявыхад «Фрагмэнтаў» дазволіў зразумець гэтую тэзу.

Шчыра кажучы, не разумею, у чым важнасьць тэзы (1), роўна як не разумею і ейнага зьместу. Да таго ж няясна, якая роля тут належыць «Фрагмэнтам». Магло быць – напэўна, так і было, – што «Фрагмэнты» не выходзілі, але «думка» *прысутнічала* ў беларускай прасторы. І калі раптам здарыцца, што на нейкім чарговым «зломе» «легендарны альманах» зноў не захоча выходзіць, гэта ня будзе азначаць, што беларускае мысьленьне спыніцца. Яно, напэўна, «разьмяркуецца» па іншых часопісах і інтэрнэт-старонках. Нават калі зьнішчаць усе часопісы ды старонкі, мысьленьне мае шанец захавацца ў нашых галовах. Вядома, пры ўмове, што гэтыя галовы – здаровыя.

2. Разгляданы нумар «Фрагмэнтаў» прысьвечаны інтэлектуальнай спадчыне выбітнага польскага дзеяча літоўска-беларускага паходжаньня Ежага Гедройця. Таму па сутнасьці ўся рубрыка «Гісторыя ідэяў» запоўненая перакладамі

тэкстаў польскіх публіцыстаў. Тры зь іх: фрагмэнты з «Аўтабіяграфіі на чатыры рукі», «Прысьвячэньне» і «Дэмакратычны маніфэст» – уласна Гедройцевы. Пра Гедройця і ягонае галоўнае стварэньне – парыскую «Культуру» – таксама ідзе гаворка ў інтэрвію І. Бабкова з Томашам Нягодзішам, які асабіста ведаў Гедройця і супрацоўнічаў зь ім. У іншых рубрыках – «Філязофія», «Антрапалёгія» і «Далягляды» – фігуруюць пераважна беларускія аўтары. Цікава толькі, чаму ў рэдактарскай прадмове няма ані згадкі пра Гедройця. А было б дарэчы паказаць сымбалічнасьць адначасовага вяртаньня «Фрагмэнтаў» і сотай гадавіны народзінаў выбітнага менчука. Думаю, гэта нашмат больш уражвала б і пераконвала, чым цьмяная філязафэма пра мэтафізычную «паўзу» ў гісторыі «Фрагмэнтаў».

Але ў першыя дзесяць хвілінаў кідаецца ў вочы не тэматыка сёлетняга альманаху. Адразу зьвяртае на сябе ўвагу своеасаблівы *выбар правапісу*. Як вядома, часопіс, на старонках якога друкуецца гэты агляд, каб больш эфэктыўна інтэграваць беларускамоўнае інтэлектуальнае асяродзьдзе, прыняў у моўным пытаньні лібэральнае рашэньне: выбар правапісу (клясычны ці афіцыйны) – за аўтарам. Відаць, рэдакцыя «Фрагмэнтаў» вырашыла пераўзысьці «ARCHE» ў лібэральнасьці. У выніку ня тое што ў адным часопісе, а проста ў адным тэксьце, а часам нават у адным сказе могуць сутыкацца дзьве адрозныя традыцыі. Прывядзем пару прыкладаў (усе *курсівы* ў наступных цытатах[2] – мае):

«Постмадэрнізм як *апатэёз* матэрыялізму», – гэтак на тарашкевіцку выглядае падзагаловак артыкулу Сяргея Самыкіна. Але першы ж ягоны сказ – цалкам наркамаўскі: «У апошнія некалькі *дзесяцігоддзяў* адбывалася відавочнае *сталенне*». Трохі пазьней аўтар на момант вяртаецца да тарашкевіцы, каб потым зноў здрадзіць ёй на карысьць афіцыйнага правапісу.

[2] Цытаты з «Фрагмэнтаў» падаюцца ў арыгінальным правапісе.

Зьміцер Смалякоў больш радыкальны: у яго ў адным сказе пераплятаюцца некалькі правапісных варыянтаў: «Для гэтых людзей і *Пазняк*, і *апазіцыя*, і *улада*, і ўсе гэтыя інстытуты *сацыялёгіі*, статыстыкі і аналізу разам з байцамі АМАПу

з'яўляліся варожымі...» І калі «Пазняк» і «апазіцыя» адлюстроўваюць афіцыйнае напісаньне, «сацыялёгія» – клясычнае, дык як разумець слова «улада», напісанае бяз «у нескладовага» пасьля галоснага «і»? Не іначай, як «граматыку будучыні». Калісьці ў 1970-я гг. Джэнкс, пачынальнік постмадэрнізму ў архітэктуры, прапагандаваў эстэтыку «падвойнага кадаваньня», спалучэньне традыцыйных і мадэрновых, лякальных і ўнівэрсальных элемэнтаў у адным і тым жа архітэктурным творы. Мабыць, сёньняшнія беларускія постмадэрністы вырашылі ўжыць прынцып падвойнага (а то і патройнага) кадаваньня ў сваіх тэкстах. А каб надаць ім як мага большую плюралістычнасьць, дзе-нідзе паўстаўлялі цалкам гібрыдныя варыянты: «*Интэрпрэтацыя*, заснаваная на *суаднесеннасці*» (Санько), «вымярэньне кіламетраў мяжы (...) ці канстатацыя танчэйшых нюансаў паміж аканьнем і оканьнем зьяўляюцца толькі другаснымі фактарамі ў *ідэнтыфікацыі* прасторы», «мільянэры ў *Тренто*» (Гобзем). А спадар Смалякоў, тэкст якога, як адмыслова заўважае рэдакцыя, «друкуецца ў аўтарскай рэдакцыі», праводзіць нейкі своеасаблівы экспэрымэнт з самім словам «постмадэрнізм»: «*Пастмадэрнізм* радуецца, нават ганарыцца...» – чытаем у адным сказе, а ў наступным: «*Постмадэрнізм* не можа інакш...» Той жа аўтар здолеў ужыць «падвойнае кадаваньне» нават у адным слове: «*бязьмежнасць*».

Ці ўсе гэтыя моўныя варыяцыі і непасьлядоўнасьці, якімі поўняцца тэксты «Фрагмэнтаў», маюць таксама – як тая «паўза» – нейкае вышэйшае, мэтафізычнае значэньне? Ці яны папросту сьведчаць пра нізкую моўную культуру стваральнікаў «легендарнага альманаху»? Мабыць, апошняе. Часопіс, які называе сябе пачынальнікам беларускага мысьленьня, выступае носьбітам трасянкавага пісьма...

А можа, сіла альманаху ня ў мове, а ў тым, *што* гэтай мовай выказваецца? Можа, аўтары й рэдактары «Фрагмэнтаў», апантаныя *eros philosophicus*, таму і занядбалі мову, што цалкам аддаліся *мысьленьню*, у якое яны – як кажа рэдактар – «патрапілі»? Можа, яны папросту ня мелі часу думаць пра такія банальныя рэчы, як «у нескладовае» ці пераход «о» ў «а»? Такім чынам, варта адсунуць убок усе моўныя прэтэнзіі і зьвярнуцца

да зьместу.

3. Першы філязофскі тэкст у альманаху – «Off Grammatology» С. Санька. Першыя ж тры літары: «off» – вельмі інфарматыўныя для таго, хто цікавіцца дарогамі і бездарожжамі сучаснай філязофіі. «Off», «post», «канец», «заняпад», «крызіс», «няма» і г. д. – усё гэта фрагмэнты пэўнага стылю філязафаваньня, які атрымаў назоў (трапны ці нятрапны, гэта ўжо іншая рэч) постмадэрнізм. Спадар Санько паведамляе нам пра «крызіс культуры Знаку», пра новую сэміялягічную парадыгму як рэакцыю на гэты крызіс і выказвае ўласную рэакцыю на рэакцыю на крызіс культуры Знаку.

Дзеля гэтага яму даводзіцца прайсьці досыць няпросты шлях. Трэба чарговы раз сьцісла перадаць гісторыю згаданага крызісу і гісторыю згаданай рэакцыі на згаданы крызіс, абавязкова згадваючы Дэрыду, Дэлёза, Эка, Сасюра, Барта, Пірса, Ліятара і г. д. Чарговы раз трэба аздобіць старонкі своеасаблівай тэрміналёгіяй: *граматалёгія*, *улада азначанага*, *сымулякр*, *Arpanet*, *différance*, *référence*, *DISRÉFÉRANCE*, *RÉDIFFÉRANCE* – і ня менш экзатычнай моўнай эквілібрыстыкай: «неапраўданае пашырэнне заснаваных на пэўным чынам інтэрпрэтаваным паняцці знаку структуральных і семіятычных (лінгвістычных) метадаў», «'прысутнасць', якое скрэмпоўвае чыстую крэатыўнасць 'пісьма'», «калі ў 'тэкставай' парадыгме лімінальна ўсякі тэкст з'яўляецца інтэртэкстам усякага іншага тэксту, то прастора 'пісьма' здзяйсняецца як сплошнае гіпертэкставае поле». Прычым усё гэта трэба зрабіць па-постмадэрнісцку: думкі клясыкаў выкласьці максымальна цьмяна, да любой тэзы паставіцца іранічна, каб – крый, Божа! – ніхто яе не ўспрыняў сур'ёзна, а перадусім самому не займаць аніякай акрэсьленай пазыцыі, каб ніхто не западозрыў у лёгацэнтрычнай герасі.

Санько ў сваёй рэакцыі на рэакцыю на крызіс культуры Знаку мімаходзь закранае некалькі сапраўды важных для філязофіі праблемаў. Перадусім гэта пытаньне пра *спосаб існаваньня дэнатату* – таго, да чаго адсылае нас Знак. Калі мы засвойваем рэчаіснасьць толькі праз пасярэдніцтва словаў і думак і калі думкі і словы маюць – як цьвердзяць многія сэміёлягі –

знакавую прыроду, атрымліваецца, што мы ўвесь час знаходзімся ў прасторы знакаў, так і не выходзім па-за яе межы да рэчаіснасьці-самой-у-сабе. Але паўстае пытаньне, ці *сапраўды* знак-*significans* і знак-*significatum* існуюць у адным і тым жа анталягічным вымярэньні?

Санько закранае і праблему «неабмежаванае сэміёзы». Ізаляваны знак пазбаўлены якой-кольвек вартасьці. Калі я, зайшоўшы да суседа, скажу яму адно слова: «чалавек», дык, па сутнасьці, нічога не скажу. Сусед, мабыць, стане чакаць удакладненьня – чарговых знакаў, якія вытлумачаць моўны знак «чалавек». Альбо ён пачне азірацца, каб знайсьці, да чаго адносіцца мой знак, г. зн. будзе шукаць невэрбальных знакаў, каб зразумець вэрбальны. Альбо, беручы пад увагу інтанацыю майго голасу, міміку, прыме слова «чалавек» за мой да яго зварот. Дарэчы, у апошнім выпадку знакамі-інтэрпрэтантамі выступаюць ня толькі інтанацыя ці міміка, але і сам аўтар і адрасат. Я і мой сусед – элемэнты знакавай сыстэмы, пакліканай надаць значэньне вымаўленаму слову «чалавек». Цяпер узьнікае пытаньне: як такі падыход суадносіцца са «здаровым сэнсам», якія наступствы ён мае для нашага разуменьня рэчаіснасьці?

Яшчэ адна абазначаная Саньком праблема – «сутнасная тоеснасьць» постструктуралісцкага разуменьня «пісьма» і антычнага разуменьня «матэрыі». Матэрыя (*hyle*) у старажытных – гэта перадусім множнасьць, патэнцыйнасьць, неакрэсьленасьць. Адпаведнік Анаксымандравага «апэйрону», матэрыя ў Плятона мяжуе зь нябытам (*me-on*), утварае своеасаблівую прастору (*chora*) паміж быцьцём і нябытам. І калі «пісьмо» Дэрыды мае сваю ўласную лёгіку, адрозную ад клясычнай лёгікі суаднясеньня, дык яго супастаўленьне з плятонаўскай «матэрыяй» – вельмі цікавы прыём. Называць гэта «тоеснасьцю», ды яшчэ «сутнаснай», відавочна, ужо занадта, але сама ідэя параўнаньня постструктуралісцкага пісьма з антычнай матэрыяй вартая ўвагі.

Ці ў сваім тэксьце спадар Санько аналізуе і вырашае закранутыя ім самім праблемы? Што да першых дзьвюх, дык ён абмяжоўваецца толькі паўтарэньнем сырых

постструктуралісцкіх тэзаў-аксіёмаў: «знакі інтэрпрэтуюцца знакамі», «азначаным знака аказваецца іншы знак» і «азначанае бясконца адкладаецца на будучыню». Але мы не знаходзім творчай перапрацоўкі гэтых тэзаў. Санько адно паказаў, што няблага засвоіў галоўныя ідэі сэміёлягаў другой паловы XX ст. Але ад аўтараў часопісу – пачынальніка беларускага мысьленьня хацелася б чагосьці большага, чым толькі ўменьне цытаваць клясыкаў постмадэрнізму.

Што да трэцяй праблемы, дык тут пачынаецца нейкі філязофскі авантурызм. Спачатку Санько заяўляе, што «матэрыя – *катэгорыя хутчэй дэзанталагічная або дыерэтычная*», а затым чапляецца за прыстаўку «дэз-» і робіць яе аб'ектам скрупулёзнага дасьледаваньня, забыўшыся, мабыць, што «сутнасная тоеснасьць» матэрыі зь пісьмом так і засталася нявытлумачанай.

Слова «дыерэтычная» сапраўды паходзіць ад *diaeresis*, але яно не лацінскае, як піша Санько ў спасылцы, а грэцкае. Сэмантычная характарыстыка ўпадабанай Саньком прыстаўкі «дэз-» трохі нязграбная:

Прэфікс дэз- (з лацін. dis-) надае словам, да якіх далучаецца, адмоўнае значэньне або узмацняе адмоўнае значэнне слова, паказвае на пазбаўленасць нечага або на падзеленасць на часткі, рассеянасць.

Лацінскае «dis-» сапраўды паказвае на падзеленасьць на часткі, але не надае адмоўнага значэньня словам і не ўзмацняе адмоўнасьці. «Dis-» – гэта адпаведнік нашага «раз-». Кажучы «разь-біць», «рас-павядаць», «раза-браць», мы не надаем адмоўнага значэньня словам «біць», «казаць», «браць». Лацінскае «dis-» паходзіць, хутчэй за ўсё, ад грэцкага «dyo» (два) і, такім чынам, надае слову, да якога далучана, значэньне раздвоенасьці, плюральнасьці. Напрыклад, «дэз-арыентацыя» – гэта не «адсутнасьць арыентацыі», а наадварот, «лішак арыентацыі», стан, калі некалькі арыентацыяў накладаюцца адна на адну і няма крытэраў, паводле якіх можна выбраць адзіную праўдзівую арыентацыю.

Этымалягічныя нюансы ў гэтым выпадку маюць сваё значэньне. Калі б спадар Санько ўзяў іх пад увагу, дык змог бы адкрыць, што *différance* (якое паходзіць ад лац. *differre* < *dis-ferre* – «адрозьнівацца», а калі літаральна: «раз-носіцца») значыць не «адсутнасьць аднясеньня», а *наяўнасьць розна-аднясеньня, разьнесенасьць*. Такім чынам, *différance* Дэрыды, супастаўленая з *référence*, пазначае не адмаўленьне рэфэрэнцыі, а папросту рэфэрэнцыйную множнасьць, уласьцівую кожнай знакавай сыстэме і кожнаму асобнаму знаку. Інакш кажучы, *différance* падказвае шлях пераасэнсаваньня «сэміялягічнага крызісу». Трэба перастаць паўтараць адно і тое ж – маўляў, «па-за знакам няма рэчаіснасьці», а зьвярнуць увагу, што насамрэч *знак адносіцца да некалькіх рэчаіснасьцяў*. Таму пра знак можна казаць, што ён не «адносіцца» ці «не адносіцца», а «разносіцца». Усялякі знак – «шматвэктарны», ён як сьвятло, што расьсейваецца ў розных кірунках. І цяпер варта было б разгледзець працэс «фіксацыі» значэньня. Інтэрпрэтатар знаку заўжды імкнецца «зафіксаваць» знак, «прычапіць» яго да пэўнае рэчы. У практыцы мы не дазваляем знаку «разьнесьціся» цалкам, мы «дысцыплінуем» яго пры дапамозе іншых знакаў, таксама шматвэктарных і нестабільных. І – адважуся заявіць – нам гэта часткова ўдаецца.

Вось жа выявіць і растлумачыць заканамернасьці «працэсу фіксацыі значэньня» было б сапраўды каштоўна і важна. Між тым Санько і тут не выходзіць па-за старыя тэзы Дэлёза, якія зводзяцца да думкі, што *différance* ня можа быць саматоеснай, таму яна мусіць быць самаадрознай. А самаадрознасьць узьнікае толькі дзякуючы самапаўтору, самаўзнаўленьню, «вечнаму вяртаньню» – *rédifférance*. Замест таго, каб пераказваць усю хаду разваг Дэлёза, як гэта робіць Санько, можна было б абмежавацца тут простай зацемкай: *différance* Дэрыды – не субстанцыя, адсюль пытаньне пра тоеснасьць ці адрознасьць тут ня мае сэнсу.

Што нам дае аналізаваны тэкст? Важных праблемаў сэміялёгіі ён не разьвязвае, а трывіялізуе, камэнтары да выказваньняў цытаваных філёзафаў пераважна плыткія і непрадуманыя, а галоўныя сэміялягічныя паняткі пакінутыя ў «сырым», неперапрацаваным выглядзе. Тэкст не арыгінальны, ён нічога

новага ня ўносіць у філязофію. Адзіная, бадай, праява арыгінальнасьці – «сакавітая» выснова з Дэлёзавых разважаньняў:

Твань – бляво́ціна чорта – сумесь цвёрдай зямлі і цечнай вады, ідэальная мадэль Хаосму як пачатку і канца ўсіх шызафрэнічных дыскурсаў, замяшаных на аральна-анальна-генітальнай фізіялогіі.

А каб гэтыя высновы злучыць зь беларускай рэчаіснасьцю, Санько трыюмфальна дадае:

Але нам, тутэйшым, не прывыкаць жыць сярод твані і...
OFF GRAMATOLOGY!

«Глыбіня» апошняй – завяршальнай у тэксьце – высновы папросту ўражвае. Я, са свайго боку, шчыра скажу, што не жадаю жыць сярод твані, не хачу патрапіць у Дэлёзавы Хаосмас і не хачу «быць сапраўдным балотам, каб засмоктваць у сябе чысьцюткія крыніцы». Хачу толькі аднаго: каб беларускія філёзафы навучыліся без памылак пісаць слова «gra*mm*atology», а перадусім не казалі, што «сімулякр – *ложны* прэтэндэнт» або што фэміністкам хтосьці «*з'імпанаваў*».

4. У рубрыцы «Філязофія» друкуецца тэкст іншага беларускага аўтара, Макса Шчура, «Сучаснае заходняе буржуазнае мастацтва і ягоны заняпад». Гэты вельмі аб'ёмны (34 старонкі) артыкул зьяўляецца – як кажа сам аўтар – «практыкаваньнем у Дэлёзаўскім духу», а яго сутнасьць – «спроба перастварэньня новай мастацтвазнаўчай тэрміналёгіі шляхам адраджэньня 'старой', абгрунтаваная нашай глыбокай верай у неперарыўнасьць працэсу гістарычнага разьвіцьця мастацтва».

Аўтар пачынае з аналізу «мастацкіх тэндэнцыяў эпохі пост-

постмадэрнізму», які грунтуецца на поглядах Артэгі-і-Гасэта. Далей ён прапануе дыягностыку «чалавека-пакупніка», якая грунтуецца на Карлу Марксу. І нарэшце Макс Шчур прыходзіць да некалькіх прарочых высноваў, якія грунтуюцца невядома на чым:

Постмастацтва, альбо новы Дэкаданс, згодна з прынятай намі мадэльлю, станецца кульмінацыйнай стадыяй «дэгуманізацыі» мастацтва; паэзія, напрыклад, ня будзе мець іншага ўжытку як толькі стацца аздабленьнем вагонаў мэтро, як гэта адбываецца ўжо цяпер; наведваньне тэатру (бы напрыканцы 18-ага стагодзьдзя) зробіцца сумным штотыднёвым абавязкам тых, хто належыць да сьмятанкі грамадзтва; слуханьне музыкі станецца немагчымым без наркотыкаў, а сузіраньне жывапісу – без транквілізатараў.

Вось тады настане своеасаблівая кульмінацыя: «агіда постмастацкага чалавека да сябе й да свайго існаваньня будзе большая за ягоную агіду да ўласных экскрэмэнтаў». Вось тады адкрыюцца шляхі да зьяўленьня Новага Мастацтва. Праўда, што за яно, гэтае *новае*, для мяне так і засталося таямніцай. Затое ў тэксьце Макса Шчура я знайшоў вельмі шмат *старых* ідэяў, бездакорна вытрыманых у духу колішняй сацрэалістычнай крытыкі:

Мастацтва існавацьме, пакуль існуе чалавецтва – у адрозьненьне ад капіталізму, чыя гісторыя, праўда, яшчэ ня скончылася, але хутка скончыцца… Змаганьне за будучыню гэтай плянэты, за будучыню ейнага шматлікага і каляровага насельніцтва, адвеку прыгнятанага заходняй цывілізацыяй, за канец «Сусьветнай гісторыі мярзоты» й пачатак Сусьветнай гісторыі Хараства толькі пачынаецца.

Хацеў бы тут зрабіць маленькае адступленьне і запытацца ў Чытача, што ён адчуў бы, калі б убачыў перад сабою вялікі дом, пабудаваны з самых розных матэрыялаў: з цэглы, з дрэва, саломы, гліны, паперы, воску, пластыліну і ўсялякага хлуду? Прычым усе гэтыя «будаўнічыя матэрыялы» злучаныя паміж сабой абсалютна хаатычна. Думаю, увайсьці ў такі дом было б боязна. Нешта падобнае адчуваю і я ў інтэлектуальным доме, пабудаваным беларускімі аўтарамі сёлетніх «Фрагмэнтаў». І небеспадстаўна: уваходзіш у любы пакой – на цябе адразу ж звальваецца нешта цяжкое і бруднае. Напрыклад: «Нежылыя памяшканні ператварылі чалавека ў раба», «Чалавек належыць нежылым памяшканням», «Чалавек – інструмент для культуры», «Горад абязлюдзеў», «быццё чалавека ператварылася ў быццё раба», «чалавек зрабіўся рабом не сябе самога, а свайго прадукту, культуры, якая падпарадкавала сабе чалавека», «культура прыватызавала ўсю чалавечнасць», «культура павесіла чалавеку постмадэрністычную паранджу на вочы, каб той канчаткова спыніў барацьбу за свой, чалавечы жыццёвы асяродак», «бессэнсоўнасць настолькі ўелася ў свядомасць, што нават не адчуваецца» – чытаю ў тэксьце Зьмітра Смалякова «Культура нежылых памяшканьняў» у рубрыцы «Антрапалёгія». Што хаваецца за гэтымі фразамі-калодамі? Нейкі забабонны страх перад *культурай*, якая ўяўляецца Смалякову гіганцкім дэманам-монстрам – ён толькі і чакае, каб заатакаваць маленькага чалавечка, што сьцішыўся, бы мыш, у змрочным закутку «нежылога памяшканьня». Дыскутаваць са страхамі і забабонамі няма сэнсу, можна тут толькі параіць аўтару наведаць спэцыфічнае «нежылое памяшканьне» – царкву або касьцёл – і там трохі памаліцца. Тады, можа, і зьнікнуць усе ягоныя страхі.

* * *

Калі старажытных грэцкіх філёзафаў цікавіў перадусім *першапачатак* (arche), дык сёньняшніх беларускіх філёзафаў цікавіць чамусьці *канец*. Мэтафізыка канца – гэта ўлюбёны занятак нашых мысьляроў, тое, у чым яны адчуваюць сябе моцнымі. Ажно дзіву даесься, як нястомна яны твораць усё новыя і новыя «канцы» і як імкнуцца «зводзіць канцы з

канцамі», гэта значыць паказваць, якім чынам адзін канец лягічна вынікае з другога. Канец мадэрну паклаў постмадэрн, канец постмадэрну – пост-постмадэрн, а канец усякага «посту» паклаў антыбуржуазны маніфэст Макса Шчура. Канец культуры Знаку і – наагул – усёй праклятай «аральна-анальна-генітальнай фізіялёгіі» паклала «Граматалёгія» Дэрыды, а канец ягонай граматалёгіі паклала «тутэйшая твань» Сяргея Санька...

Толькі хто пакладзе канец усёй гэтай тутэйшай твані?

ЗАГАДКІ І ЗДАГАДКІ ЧАЛАВЕЧАГА EGO

Філязофска-культуралягічны часопіс «Топос», што выдаецца навукоўцамі Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту, ня мае такіх, як «Фрагмэнты», амбітных задумаў і не прэтэндуе на званьне «часопісу беларускага мысьленьня». У сёлетнім нумары «Топоса» рэдакцыя прапануе некалькі дасьледаваньняў у галіне сучаснай камунікатыўнай філязофіі.

У рамках гэтай сьціплай – на першы погляд – задумы друкуецца шэраг тэкстаў, прысьвечаных пераасэнсаваньню мэтафізыкі («Дэкарт – настаўнік філязофіі» У. Фурса, «Дэструкцыя суб'ектывізму ў філязофіі М. Гайдэгера і Л. Вітгенштайна» Я. Барысава, «*Metaphysica naturalis*: неабходнасьць і недастатковасьць» А. Паткуля і інш.), праблеме ідэнтычнасьці («Прасторавая ідэнтычнасьць у эпоху глябалізацыі» Ю. Бедаш), філязофіі гісторыі («Раскрыцьцё генэзісу канструяваньня як трансцэндэнтальна-фэнамэналягічны падыход да разуменьня гісторыі» А. Савіна) і шэрагу экзыстэнцыйных праблемаў: сьмерці («Слова пра радасьць»: антынамічнасьць гайдэгераўскай трактоўкі *быцьця і сьмерці*» Т. Шчытцовай) і болю («Эфэкты мэдыкалізацыі і апалёгія патасу» В. Лехціера), досьведу часовасьці, загадцы вечнасьці і таямніцам жаночасьці («Час і іншы. Гусэрль і Левінас пра трансцэндэнцыю» Д. Ёнкуса), нявіннасьці і грэшнасьці чалавечай прыроды («Эстэтычнасьць пасіўнага суб'екту. Левінас і Дастаеўскі» І. Зайцава) і інш.

Большасьць пазначаных праблемаў разглядаецца ў духу

фэнамэналягічна-гермэнэўтычнай філязофіі праз тэрміналягічны апарат, выпрацаваны гэтым філязофскім кірункам. Таму шмат якія тэксты «Топоса» могуць падацца «цяжкастраўнымі» і даволі гермэтычнымі. Зрэшты, можна меркаваць, што стваральнікі часопісу і не арыентуюцца на «шырокую публіку». Выданьне мае наклад усяго 220 асобнікаў і разьлічанае на вузкае кола спэцыялістаў у экзыстэнцыяльнай фэнамэналёгіі. Зь неафіцыйных крыніцаў вядома, што ў рэдакцыі «Топоса» вядзецца дыскусія, ці заставацца часопісу «сьцісла навуковым», ці ўсё ж стаць «навукова-папулярным», каб гэткім чынам неяк уплываць на грамадзка-культурныя працэсы ў Беларусі.

«Навукова-папулярная» тэндэнцыя прасочваецца нават у гэтым нумары. Напрыклад, тэкст Уладзімера Фурса напісаны даволі займальна і з пэўнаю дозай гумару. Але ён мае і іншае значэньне: дэканструкцыя Дэкартавага *cogito*, праведзеная Фурсам, апасродкавана разбурае падмуркі артадаксальнай фэнамэналёгіі. Дэкарт, канчаткова расчараваўшыся ў схалястычнай філязофіі, вырашыў узьняць пытаньне пра магчымасьць новай філязофскай сыстэмы, вольнай ад усялякіх папярэдніх спасылак. Падмуркам новай філязофіі мусіла быць *пэўнасьць + праўдзівасьць*, а кожны ейны складнік – ідэяй *яснай* і *выразнай*. І дзеля гэтага Дэкарт прыдумаў адпаведную працэдуру «самаачышчэньня». Фурс рэканструюе яе наступным чынам.

Першы крок – «акт прызнаньня асабістай віны асобнага чалавека (…) у непацьверджанасьці (неудостоверенности) ісьціны». Далей ідзе мэтад глябальнага сумневу: «тэхніка сумненьня, ужываньне якой прыводзіць да паўстаньня філязофскага ’Я’». Затым – «мэтадычная артыкуляцыя філязофскага мысьленьня. (…) Філязафаваньне, заснаванае на ідэі мэтаду, ажыцьцяўляецца як давядзеньне да «яснасьці» рэфлексіўнай празрыстасьці для «Я» любога мысьлёвага зьместу», і, нарэшце, адбываецца «цэнтраваньне сьвету ў «Я». (…) Калі пры вынясеньні меркаваньняў я ўтрымліваю сваю волю ў межах яснага і выразнага разуменьня, гарантаванага мэтадычнай самадысцыплінай розуму, дык я застрахаваны ад памылак».

Фурс даволі пераканаўча паказвае наіўнасьць Дэкартавага праекту. Па-першае, «Я» – вельмі нестабільны элемэнт ува ўсёй структуры пазнаньня: «Разумнае «Я» само па сабе – гэта сьветлейца, якое на імгненьне запальваецца і зараз жа гасьне». Гэтае сьветлейца – скрайне бездапаможнае і кволае, таму як яно можа быць фундамэнтам новай – *пэўнай* і *праўдзівай* – філязофіі? І тут Дэкарт – гэта па-другое – пастулюе, прызнае спрэжанасьць чалавечага «Я» зь нейкім «звыш-Я», Богам. А гэта ўжо сур'ёзная саступка *папярэдняй*, схаластычнай філязофіі. Такім чынам, кажа Фурс, «кагнітыўныя паўнамоцтвы інтэлектуальнага сузіраньня (…) грунтуюцца на нелегальных Богавых інвэстыцыях: толькі спадзяваньне на тое, што «Бог ня можа быць злосным хлусьліўцам», гарантуе адпаведнасьць дапушчэньняў сьвядомасьці субстанцыяльнай ісьціне». Патрэцяе, само сумненьне патрабуе пэўных папярэдніх спасылак. Бо за мэтадычным сумненьнем Дэкарта хаваецца ідэя ўтоенай субстанцыяльнай ісьціны, папярэдняе разуменьне яе «пацьверджанасьці» і перажываньне асабістай віны за яе непацьверджанасьць.

З усяе гэтай аналітычнай працы Фурс робіць даволі вострую выснову: «Ці прызнаюць заўзятыя прыхільнікі «філязофіі сьвядомасьці» ўласную сьлепату, ці адкрыюцца ім вочы на стан актуальнай філязофіі?»

Тут варта вярнуцца да прапанаванай мною вышэй тэзы: удар аўтара па асновах Дэкартавай філязофіі цягне за сабою і разбурэньне некаторых посткартэзіянскіх філязофскіх праектаў, у т. л. фэнамэналёгіі. Калі на пачатку ХХ ст. Гусэрль запрапанаваў «трансцэндэнтальную рэдукцыю», тым самым ён усяго толькі ўзнавіў Дэкартаву ідэю глябальнага сумневу. «Прынцып усякага прынцыпу», сфармуляваны бацькам фэнамэналёгіі, дазваляў прымаць за *пэўнае* ўсё, што зьяўляецца нам у беспасярэдняй навочнасьці, але толькі ў гэтых межах. Таму трэба рэдукаваць увесь сьвет да філязофскага «Я», бо «беспасярэднія навочнасьці» месьцяцца ў ягоным абсягу.

Калі падмурак філязофіі сьвядомасьці (у т. л. фэнамэналёгіі Гусэрля) пабураны (а можа, лепш сказаць: выяўленыя яго слабыя месцы?), паўстае пытаньне, ці ёсьць сэнс культываваць

філязофію пры дапамозе фэнамэналягічнага інструмэнтару? Ці не занадта ён грувасткі, і ці эфэктыўны ён для аналізу і вырашэньня філязофскіх праблемаў? Часам мне падаецца, што фэнамэналягічнае філязафаваньне вельмі энэргаёмістае, але малапрадуктыўнае. Яно *ўнутрана* вельмі строгае, разьвітае і шматвымернае, але пры гэтым пераважна адчужанае ад *вонкавага* сьвету. Яно губляецца ў лябірынтах уласнага аналітычнага апарату ці, як сказаў бы Бабкоў, у «катакомбах *cogito*». Яно не дазваляе тому, хто даверліва ўвойдзе ў гэтыя катакомбы-лябірынты, убачыць Божага сьвету.

Расейскі фэнамэноляг Аляксей Савін спрабуе на старонках «Топоса» пабудаваць канцэпцыю гісторыі пры дапамозе фэнамэналягічных катэгорыяў. Дзеля гэтага ён мусіць выканаць вельмі складаны манэўр. Спачатку «статычную фэнамэналёгію» трэба ператварыць у «генэтычную». Затым неабходна так апрацаваць панятак «генэзы», каб ён не пярэчыў галоўным ідэям фэнамэналёгіі. Далей разьвіваецца «правільнае» разуменьне генэзы. І нарэшце – пасьля ўсёй гэтай складанай працэдуры – дасьледнік набліжаецца да праблемы гісторыі.

Адзначым пару момантаў гэтага працэсу і тое, да чаго прывяла нас генэтычная фэнамэналёгія. Савін на пачатку акрэсьлівае прынцып падзелу навукі на рэгіёны. Грунтуецца гэты падзел на Гусэрлевай думцы, што «царства ісьцінаў аб'ектыўна дзеліцца на вобласьці». Думаю, што сёньня немагчыма казаць, што навука існуе ў «царстве ісьцінаў». Яна – у царстве «доксы» – «дапушчэньняў і адпрэчаньняў» (*conjectures and refutations*), а межы паасобных «рэгіёнаў» даволі няўстойлівыя і ўмоўныя. Псыхолягі і сацыёлягі дагэтуль ня ведаюць, дзе канчаецца адна і пачынаецца другая дысцыпліна і, відаць, ніколі ведаць ня будуць.

Пазьней аўтар заўважае, што «падзел прадметаў на рэгіёны базуецца, у сваю чаргу, на канцэпцыі залежнасьці факту ад сутнасьці і, у канчатковым пляне, ад «чыстай сутнасьці», г. зн. эйдасу». «Існаваньне такога ўнутранага закону ў рэчах, у фактах робіць магчымым аб'ектыўнае, навуковае мысьленьне». Гэтыя цьверджаньні паказваюць, што фэнамэналёгія – адзін з варыянтаў эсэнцыялізму. Цікава, аднак, што з гусэрлеўскага

эсэнцыялізму, як сьведчыць праца Савіна, не вынікае гістарыцызму, як у Плятона, Арыстотэля, Гэгеля. «Фэнамэналёгія прыходзіць да ўсьведамленьня значэньня індывідуальнасьці шляхам уласных рэфлексіяў, не зьвязаных з заняткамі нямецкай гістарыяграфіяй і мэтадалёгіяй гісторыі». Адбываецца гэта праз успрыманьне *Ego* як комплексу своеасаблівасьцяў, перакананьняў, рашэньняў і звычак. Ego ў Гусэрля – гэта адкрытая манада, якую можна ўявіць толькі ў «супольнасьці манадаў, што паўстае ў выніку іх «камунікацыі». Але, што самае важнае, усялякая фэнамэналягічна зразуметая манада мае сваю ўнутраную гісторыю, і, больш за тое, само манадычнае Ego канстытуюецца ў адзінстве матывацыяў, якія зьяўляюцца наступствам заканамернасьцяў генэзы, «у адзінстве пэўнае гісторыі».

Неаднакроць чалавечае «Я» ўспрымалася многімі філёзафамі як «прадукт» альбо нават «раб» гісторыі або культуры (дастаткова яшчэ раз прыгадаць «Культуру нежылых памяшканьняў»). У Гусэрля адбываецца нешта адваротнае: «Вонкавая гісторыя магчымая толькі дзякуючы гістарычнасьці трансцэндэнтальнае сьвядомасьці, працэсам самаканстытуяваньня ў ім».

Такім чынам, вынік досьледаў Савіна мог бы суцешыць праціўнікаў гістарыцызму і абаронцаў чалавека як аўтаномнай у дачыненьні да гістарычна-культурных працэсаў істоты. Тым ня менш, важныя для філязофіі гісторыі праблемы: ступень і характар абумоўленасьці чалавека гісторыяй і культурай, пытаньне пра ўзаемасувязь глябальнай і лякальнай гісторыі, спосабы ўспрыманьня і «дэфармацыі» гісторыі – застаюцца па-за ўвагай фэнамэноляга.

* * *

Фэнамэналёгія мае сваё значэньне як у глябальнай гісторыі філязофіі, так і ў гісторыі беларускай філязофіі. Нельга забывацца, што асноўнай ідэяй гэтай філязофскай плыні была ідэя *вяртаньня да рэчаў*, гэта значыць пабудова рэалістычнай філязофіі. Увага да рэчаіснасьці, стварэньне багатай паняткавай мовы, каб як мага лепш апісаць рэчаіснасьць, – гэта мне падаецца паказьнікам «здаровай» філязофіі. І калі ўзяць

пад увагу, што яшчэ два дзясяткі гадоў таму ў нашай філязофіі паўсюдна панавала не рэчаіснасьць, а таталітарная ідэалёгія, дык трэба прызнаць, што заслугі філёзафаў-фэнамэнолягаў ЭГУ ў справе «вяртаньня да рэчаў» (то бок у аздараўленьні філязофіі) насамрэч немалыя.

Тым ня менш, рызыкуючы трохі пакрыўдзіць прыхільнікаў фэнамэналягічнага мэтаду, падзялюся ўражаньнем, якое ўзьніклала ў мяне ад артыкулу Савіна. Бачыцца мне Філёзаф-экспэрт, які, заўважыўшы, што да яго набліжаецца пэўная Праблема (у гэтым выпадку – праблема гісторыі), адразу ж кіруецца ўглыб лябірынту сваіх паняткаў і аксіёмаў, пакінуўшы гэтую Праблему вонках. У сваім лябірынце ён нямала намучаецца, каб знайсьці патрэбныя дасьледніцкія прылады і «перакаваць» іх, адаптаваць да праблемы. Ці ня лепш было б спачатку азнаёміцца з праблемай, каб потым шукаць патрэбныя сродкі яе вырашэньня? Можа, яна тады сама падкажа, альбо прынамсі намякне, дзе ляжаць неабходныя інструмэнты, каб яе дасьледаваць і «разьвязаць»?

Фэнамэналёгія, вядома ж, не адзіны філязофскі кірунак, які культывуецца ў сьценах ЭГУ і на старонках «Топоса». Магчыма, фэнамэналёгія ў гусэрлеўскім, артадаксальным выглядзе мае тут хутчэй маргінальнае, чым паноўнае значэньне. Як можна меркаваць паводле публікацыяў супрацоўнікаў ЭГУ, тут часьцей выяўляюцца розныя «неартадаксальныя» вэрсіі фэнамэналёгіі, перадусім экзыстэнцыяльная фэнамэналёгія Гайдэгера і культуралягічная, вытыманая ў духу нэакантыянства, фэнамэналёгія Касырэра. Апрача таго, можна заўважыць «скокі» ў бок экзыстэнцыялізму левінасаўскага тыпу, постмадэрнізму і постмарксізму. Усё гэта, несумнеўна, сьведчыць пра разьвіцьцё айчыннай філязофскай думкі, але, разам з тым, пакідае нейкае пачуцьцё «ненасычанасьці». Няма пакуль якасных тэкстаў, якія б распрацоўвалі праблематыку нэатамізму, аналітычнай філязофіі, крытычнага рацыяналізму і постпазытывістычных кірункаў у філязофіі. Няма таксама ў ЭГУ – што ведаю з прыватных размоваў – сыстэматычных дасьледаваньняў у галіне гісторыі філязофіі, асабліва старажытнай і сярэднявечнай. Але, пэўна, «ня ўсё адразу».

ПАДАГУЛЬНЕНЬНЕ

«Фрагмэнты» і «Топос» – вельмі розныя часопісы. «Фрагмэнты» – гэта сшытак-чарнавік, які можна разглядаць як месца для практыкаваньняў і экспэрымэнтаў амбітных філёзафаў-пачаткоўцаў. Панує там своеасаблівая *licentia poetica*, аўтары пачуваюцца вольнымі паэтамі, якія толькі гуляюць філязофскімі паняткамі, ператвараючы філязофію ў своеасаблівы спосаб самавыяўленьня. У разьвіцьцё філязофіі «Фрагмэнты» нічога ня ўносяць.

Мне самому было балюча рабіць крытычны агляд «Фрагмэнтаў». Часопіс імкнецца разьвіваць беларускамоўную філязофію, і для мяне асабіста, як прадстаўніка беларускамоўнай культуры, такое імкненьне асабліва каштоўнае. Але вельмі хацелася б, каб стваральнікі «Фрагмэнтаў» ажыцьцяўлялі сваю задуму больш пасьлядоўна і адказна. Калі ўжо знайшліся сродкі і магчымасьць, каб выдаць 300-асобнікавы альманах, дык, пэўна, можна было знайсьці таксама сродкі, каб наняць добрага карэктара. Ну і няблага было б «фрагмэнтаўцам» усьвядоміць, што філязофія – гэта не зусім тое самае, што паэзія прозай.

Грэцкае слова *topos* значыць «месца». Часопіс «Топос» можна трактаваць як *месца* росквіту фэнамэналягічнай аналітыкі, гермэнэўтыкі і экзыстэнцыялізму. Пакінем убаку пытаньне, ці згаданыя кірункі сапраўды рэпрэзэнтуюць «якасную» філязофію. Урэшце, спрэчкі, які кірунак больш філязофска якасны, малапрадуктыўныя. Важна іншае: аўтары, што працуюць у згаданых кірунках, – добрыя майстры сваёй справы. Яны пасьлядоўна і скрупулёзна, трымаючыся навуковых стандартаў, аналізуюць пастаўленыя праблемы. Важна і тое, што панує там добры, спакойны дух: няма рэвалюцыйнага патасу, але няма і кансэрватыўнай закасьнеласьці. Аўтары «Топоса» далёкія ад трыюмфалізму і фанабэрыі – наадварот, яны самі прызнаюць магчымасьць недасканаласьці і абмежаванасьці іхных канцэпцыяў.

Ці слова беларускіх філёзафаў мае якую-кольвек тэрапэўтычную моц? Ці лекуе яно наш *pathos* (боль) або

застаецца ў гэтым пляне пустым, парожнім, дарэмным? Чалавечы *pathos* вельмі глыбокі і шматварыянтны, таму нельга патрабаваць ад філязофскага слова, каб яно адразу і канчаткова яго ацаліла. Важна, аднак, каб *philosophou logos*, філязофская думка, не лунала па-над нябёсамі, а была чуйнай да *pathos*'у, каб знаходзіла і лекавала чалавечы боль, асабліва той найглыбейшы і найцяжэйшы – пачуцьцё духоўнай пустэчы, *vacuum existentiale*.

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: **2006/11/28**

[image]

[redacted]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 11 (51) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

крытыка • [image]-[image]2006

ада Зтыкатук

крытыка • эсэістыка • гісторыя • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

АЛЕСЬ СМАЛЯНЧУК

гісторык, прафэсар Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту, выдавец «Гістарычнага альманаху» (Горадня—Беласток). Аўтарская назва тэксту — «Ускраіннае вымярэньне» Расейскай імпэрыі».

Алесь Смалянчук Плебейскія нацыі і імперскія перыферыі

Западные окраины Российской империи. — Москва: Новое литературное обозрение, 2006. — 608 с.

Інтарэс да эпохі імперыі ў сучаснай расійскай гістарыяграфіі, верагодна, тлумачыцца інтэлектуальнымі пошукамі новай расійскай саматоеснасці, якія ізноў зрабілі запатрабаваным міф імперыі. А ў навуковым плане гэтая цікавасць абумоўленая двума чыннікамі. Першы — імкненне пераадолець пэўную палітызацыю праблемы, характэрную для доследаў савецкага часу і многіх працаў першага постсавецкага дзесяцігоддзя. Другі — жаданне парушыць традыцыйную абмежаванасць расійскай гістарыяграфіі, у полі ўвагі якой знаходзілася амаль выключна тэматыка цэнтра, дзяржавы і ўлады. Прынамсі, на гэтую акалічнасць звярнула ўвагу рэдкалегія серыі «Ускраіны Расійскай імперыі» (старшыня Аляксей Мілер), у межах якой і выйшла з друку рэцэнзаванае выданне.

Заснавальнікі серыі паабяцалі засяродзіцца на *праблеме дачыненняў цэнтра і ўскраін*. Яны пералічылі пытанні, на якія павінна адказаць сучасная гістарыяграфія «імперскага вымярэння расійскай гісторыі». Заўважым, што большасць з іх ізноў жа датычыць палітыкі цэнтра: *Як улады структуравалі*

прастору імперыі, у т. л. адміністрацыйную, адукацыйную, эканамічную, заканадаўчую ды інш.? Якімі былі эканамічныя стасункі ўскраін і цэнтра? Як у розныя перыяды фармавалася палітыка імперыі ў дачыненні да рэлігіі, місіянерскай дзейнасці, перамены веравызнання? Як рэгулявалася ўжыванне розных моваў? Як выпрацоўвалася ў цэнтры і на месцах палітыка што да розных групаў насельніцтва? «Ускраіннае вымярэнне» засяродзілася на наступных пытаннях: *Як мясцовыя эліты і супольнасці рэагавалі на палітыку імперскіх уладаў? Як адстойвалі свае ўласныя інтарэсы? Як супрацоўнічалі з імперыяй? Як спрабавалі выкарыстаць у мясцовых інтарэсах імперскія рэсурсы?*

Апошні блок пытанняў выклікае найбольшую цікавасць таму, што расійская гістарыяграфія — як імперская, так і савецкая — звычайна глядзела на «заходнія ўскраіны» як на арэну польска-расійскага змагання. Нацыянальныя рухі карэннага насельніцтва ацэньваліся выключна ў такім кантэксце і не разглядаліся як самастойная з'ява палітычнага і культурнага жыцця. У першую чаргу гэта тычылася беларусаў і ўкраінцаў.

Варта адзначыць, што рэдкалегія асобна звярнула ўвагу на тое, як важна даследаваць дачыненні цэнтра і ўскраін у перыяд разгортвання нацыянальных рухаў. (Яны спрычыніліся да з'яўлення таго экзістэнцыйнага страху перад імперыяй, які існуе ў суседзяў Расіі (с. 9).) На думку рэдкалегіі, суседзям неабходна пераадолець адмоўны вобраз імперыі — яна ніколі не была той імперыяй зла, якой яе паказваюць у школьных падручніках. А вось расійцам, у сваю чаргу, неабходна крытычнае пераасэнсаванне ўласнай гісторыі, у т. л. і стасункаў з суседзямі (с. 9).

Можна дадаць, што Расійская імперыя сваёй этнічнай і канфесійнай разнароднасцю была для Еўропы унікальнай з'явай. Перапіс 1897 г. засведчыў існаванне больш чым ста моваў і ўсіх пяці сусветных рэлігій. Да таго ж, у пэўны час на тэрыторыі Расійскай імперыі адначасна назіраліся розныя этапы станаўлення нацый і разгортвання нацыянальных рухаў. На думку Андрэаса Капелера, усё гэта робіць імперыю патэнцыйнай эксперыментальнай пляцоўкай для

даследаванняў нацыяналізму[1].

Намеры рэдкалегіі адлюстраваліся ў структуры першай кнігі серыі. Яна складаецца з дзвюх частак. У асноўнай – 11 раздзелаў, якія ахопліваюць перыяд ад эпохі Кіеўскай Русі да распаду імперыі. Але выразная перавага аддаецца XIX ст. Аўтары тэкстаў — расійскія даследчыкі Міхаіл Далбітаў, Аляксей Мілер, Рустэм Цівунчук, Алег Будніцкі, Лілія Беражная, Аляксандр Макушын, Кацярына Правіла, Таццяна Якаўлева. Прычым трэба адзначыць двух першых (М. Далбітаў, А. Мілер), якія асобна або ў суаўтарстве рыхтавалі амаль усе раздзелы. Яны ж выступаюць навуковымі рэдактарамі тэкстаў выдання.

У кнізе змешчаныя «Дадаткі», у якіх аглядаюцца даследаванні імперскай праблематыкі ў беларускай (Сяргей Токць), літоўскай (Дарус Сталюнас), польскай (Анджэй Новак) і ўкраінскай (Уладзімір Краўчанка) гістарыяграфіях. У «Дадатках» таксама падаюцца статыстычныя звесткі пра колькасць насельніцтва «заходніх ускраін» і розныя аспекты ягонай сацыяльнай характарыстыкі (А. Макушын, Т. Якаўлева).

У I раздзеле («Замест уводзінаў. Пра задачы кнігі») ягоныя аўтары яшчэ раз патлумачылі прадмет даследавання і прыняты імі тэрміналагічны апарат. Пры гэтым высветлілася, што тэрмін «заходнія ўскраіны» датычыць тэрыторый Рэчы Паспалітай, захопленых Расіяй на працягу XVII—XVIII стст. Гэтая геаграфічная прастора, паводле аўтараў, была арэнай барацьбы польскага руху і імперыі, расійскіх і польскіх нацыятворчых праектаў, а пазней таксама дзейнасці іншых «нацыяналістычных рухаў» (с. 14). Датычна да беларускага руху зробленая агаворка, што яму праз ягоную слабасць адводзіцца найменш увагі. Наўрад ці гэтая агаворка задаволіць удумлівага чытача, бо, нават саступаючы ў актыўнасці і масавасці іншым рухам, беларускія дзеячы на пачатку XX ст. здолелі зрабіць беларускае пытанне істотным фактарам палітычнага і нацыянальна-культурнага жыцця «ўскраін».

Звяртае на сябе ўвагу канцэптуальна значная тэрміналогія выдання. Датычна той часткі «заходніх ускраін», на якой пераважала праваслаўнае насельніцтва, аўтары палічылі

[1] Кайнікіс Г. Образование и распад империй. XIX – XX вв. Бинациональные движения в Российской империи и в зарубежной историографии. Работы последних лет. Антология / Сост. П. Верт, П. Кабытов, А. Миллер. Москва: Новое издательство, 2005. С. 398.

мэтазгодным для XIII—XVII стст. карыстацца тэрмінамі «Русь», «русіны», «каб не заблытацца ў нетрах гістарычных тапонімаў і саманазваў» (с. 16). Насамрэч гэтыя тэрміны і іхныя вытворныя ўжываюцца таксама для тлумачэння сітуацыі на ўкраінскіх і беларускіх землях напрыканцы XVIII ст. і нават у XIX ст. (с. 76, 111). У кароткім абгрунтаванні аўтары згадалі, што тэрмінамі «Малая Русь» і «Вялікая Русь» карыстаўся Канстанцінопальскі патрыярхат, і праігнаравалі харонім «Белая Русь», вядомы з XIII ст., а таксама этнонім і канфесіонім «беларусец» (XVII ст.). На іхную думку, для тэрыторыі сучаснай Беларусі ў XIV—XVII стст. характэрныя толькі этнонімы «ліцвіны», «русіны» і «руськія» (с. 16), а тапонім «Украіна» пачаў ужывацца толькі напрыканцы XVII ст. і толькі датычна зямель Кіеўскага і Брацлаўскага ваяводстваў (с. 15).

Канцэпцыя «русінства» насельніцтва ВКЛ прысутнічае ў літоўскай гістарыяграфіі, якая сцвярджае фармаванне у XVI ст. «рускай народнасці» ці нават «рускай нацыянальнасці» (?!). Напрыклад Эдвардас Гудавічус, у XVI ст. «Русія, якія жыла у Літоўскай і Полыскай дзяржаве, пачала адрозніваць сябе асобным этнасам. [...] Іншы казуны, з пачатку XVI ст. трэба весці размову пра русінскую нацыянальнасць, што жыла у Вялікім Княстве Літоўскім і ў кіроўнай Польшчай чырвонай Русі, — не тоеснай усходня-рускай (вялікарускай, маскоўскай) ці проста рускай нацыянальнасці, якая жыла ў Рускай дзяржаве»[2]. Адпаведна, мову перакладаў Ф. Скарыны літоўскі даследчык ахарактарызаваў як «русінскую» (?!) (с. 449). Наогул, параграф «Утварэнне русінскай народнасці» гісторык завяршыў прызнаннем, што менавіта дзякуючы літоўскай экспансіі супраць «Русі» стала магчымым фармаванне «русінскай народнасці». Беларусы і ўкраінцы ў «Гісторыі Літвы» Э. Гудавічуса нават не згадваюцца, бо, на думку аўтараў, іх не існавала[3].

Падобна, аўтары «Заходніх ускраін» падзяляюць перакананне літоўскага гісторыка і таксама лічаць, што да канца XVII ст. (і нават пазней) не існавала ні беларусаў, ні ўкраінцаў, а была нейкая ўсходнеславянская праваслаўная супольнасць з неакрэсленай этнічнай «фізіяноміяй». Падобны падыход цалкам ігнаруе шматлікія беларускія і ўкраінскія даследаванні

2 Гудавичюс Э. История Литвы. С древнейших времён до 1569 г. Москва, 2005. С. 446—447.

3 У беларускай гістарыяграфіі на эндаэтноніме «русіны» (амаль да сярэдзіны XVII ст.) настойвае Ігар Марзалюк у кнізе «Людзі дайняй Беларусі: этнаканфесійныя і сацыякультурныя стратыгіі (X—XVII ст.)» (Мінск, 2003). Іншыя даследчыкі (напр. Г. Сагановіч) сцвярджаюць, што ў беларускай этнічнай прасторы адбывалася перакананасць этнічнага зместу гатага тэрміну.

праблемы этнагенезу, развіцця беларускай і ўкраінскай мовы ды інш.

Але вернемся да тэксту кнігі. Як жа рэалізаваліся намеры рэдкалегіі і рэдактараў выдання? Наколькі грунтоўнымі былі адказы на пастаўленыя пытанні? У якой ступені аўтары тэкстаў здолелі раскрыць складаную праблему дачыненняў імперскага цэнтра з «заходнімі ўскраінамі», што ў XIX ст. пачалі набываць выразнае нацыянальнае аблічча? Нарэшце, як яны ахарактарызавалі месца беларусаў і Беларусі ў гісторыі «заходніх ускраін»?

Ужо ў I раздзеле чытачам прапанаваны кароткі агляд палітычнай гісторыі «ўскраін» з часу Кіеўскай Русі. Згадваецца таксама Галіцка-Валынскае княства і засяроджваецца ўвага на Вялікім Княстве Літоўскім. Пачатак гісторыі ВКЛ напісаны паводле канцэпцыі сучаснай літоўскай гістарыяграфіі. Нават імёны першых князёў прыводзяцца паводле літоўскага гучання і напісання (напр. Міндаўгас, Гедымінас, Альгірдас (с. 17—18). Міндоўг пры гэтым лічыцца заснавальнікам (?!) Наваградка, які першым «пашырыў уладанні аб'яднаных плямён за кошт русінскіх зямель» (с. 17). Адзначаецца, што галоўная асаблівасць ВКЛ — яго двухэтнічнасць: «…балтыйскае насельніцтва было ў меншасці, а большую частку складалі славяне-русіны» (с. 17).

Расійскія гісторыкі актыўна карыстаюцца тэрмінамі «русінская шляхта», «русінскія землі», «русінскае грамадства» і нават «русінская мова» (с. 18, 22 ды інш.). Апошнюю (у ейнай «беларускай версіі») Т. Якаўлева называе афіцыйнай мовай ВКЛ, якая выкарыстоўвалася ў справаводстве (с. 18). Да мовы аўтары звяртаюцца яшчэ раз пры ацэнцы вынікаў Люблінскай уніі для «русінскага грамадства». Аўтар гэтага тэксту Т. Якаўлева сцвярджае, што унія паспрыяла рэзкаму ўздыму ў культурным і рэлігійным жыцці, які часта называюць ажыўленнем праваслаўя (с. 24). Гэтую небясспрэчную выснову яна пацвярджае фактамі актывізацыі кнігадрукавання на «русінскіх землях»: «Гэта быў час Івана Фёдарава, які адкрыў пры двары магната Хадкевіча першую друкарскую майстэрню, Францішка Скарыны, які перакладаў Біблію на русінскую мову,

Герасіма Сматрыцкага, які выдаў яе на царкоўнаславянскай» (с. 25).

Тут проста немагчыма ўтрымацца ад заўваг. Першадрукара Францыска Скарыну Т. Якаўлева залічвае да тых, хто працягваў справу Івана Фёдарава, хоць нават школьнікі ведаюць, што скарынаўскі Псалтыр выйшаў з друку ў 1517 г., задоўга як да пачатку дзейнасці І. Фёдарава, так і да падпісання Люблінскай уніі. Цверджанне пра «русінскую мову» выдання Скарыны — «рэвалюцыя» ў гісторыі кніжнай культуры ўсходніх славянаў. Магчыма, перадумовы гэтай «рэвалюцыі» трэба шукаць таксама ў працах літоўскіх медыявістаў. Даследчыкі з Расіі, Беларусі і Украіны найчасцей спрачаюцца толькі пра тое, якіх моўных элементаў: царкоўнаславянскіх ці старабеларускіх — было болей у скарынаўскім перакладзе. Аўтарытэтныя расійскія спецыялісты (А. А. Аляксееў) называюць мову скарынаўскай Бібліі «руськай», абавязкова дадаючы, што ў сучаснай тэрміналогіі яе можна называць «старабеларускай».

Агляд XVII—XVIII стст. у гэтым раздзеле, як і ў наступным («Гетманшчына і ейная інкарпарацыя ў Расійскую імперыю»), прысвечаны амаль выключна ўкраінскім землям. Пры гэтым аўтары не паклапаціліся пра тое, каб распавесці чытачам, якім чынам частка «русінскіх зямель» у сярэдзіне XVII ст. робіцца «Украінай». Яны засяродзілі ўвагу на палітычных пераменах — ператварэнні ўкраінскіх зямель ва ўнутраную вобласць імперыі. Пры гэтым адбылася своеасаблівая рэабілітацыя постаці традыцыйнага «здрадніка Расіі» Івана Мазепы. Ягоны пераход на бок шведаў у часе Паўночнай вайны Т. Якаўлева тлумачыць паслядоўным курсам Пятра І на ліквідацыю аўтаноміі гетманшчыны (с. 53).

У аўтарскіх разважаннях наконт геапалітычных намераў Масквы ў сярэдзіне XVII ст. згадваецца таксама і беларуская тэма: «Масква ж больш за ўсё марыла пра вяртанне северскіх зямель і Беларусі» (с. 41). Тут таксама адсутнічае якое-небудзь тлумачэнне прычын і ходу ператварэння «русінскіх зямель» у *«Белоруссию»* . А слова «вяртанне», ужытае без двукосся, нагадвае славутую формулу Кацярыны II: *«Отторженное возвратихъ»* . На жаль, аўтары цалкам праігнаравалі падзеі

вайны 1654—1667 гг. паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай на беларускіх землях. Між тым дэмаграфічная катастрофа, якой абярнулася для беларускай зямлі гэтая вайна, з'яўляецца вельмі важнай для разумення яе далейшага лёсу, у т. л. ужо як «ускраіны» імперыі.

У наступным раздзеле кнігі («Ад падзелаў Рэчы Паспалітай да Венскага кангрэсу») ягоныя аўтары (А. Мілер, М. Далбілаў, К. Правілава) засяродзілі ўвагу на ролі Расіі ў падзелах Рэчы Паспалітай. Яны адзначылі ўнутраную слабасць «шляхецкай рэспублікі», асабліва на фоне ўмацавання ейных абсалютысцкіх суседзяў, і імкненне Кацярыны II захаваць расійскі пратэктарат над Рэччу Паспалітай (с. 72). Галоўнай прычынай I і II падзелаў Рэчы Паспалітай і актыўнага ўдзелу ў іх Расіі гісторыкі лічаць спробу розных шляхецкіх груповак пры падтрымцы сілаў звонку аб'яднацца супраць Расіі (с. 69). Адпаведна, III падзел быў толькі адказам на паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі (с. 72). Пры гэтым чамусьці не згадваецца расійска-прускі дагавор 1764 г., у адпаведнасці з якім абедзве дзяржавы дамовіліся не дапускаць рэфармавання палітычнага ладу Рэчы Паспалітай у кірунку кансалідацыі цэнтральнай улады. Між тым аналіз гэтага дакумента дазваляе лепш уявіць увесь драматызм сітуацыі. Аднак істотна тое, што расійскія даследчыкі пагадзіліся з ацэнкай расійскай і прускай палітыкі як захопніцкай (с. 72).

Падзелы Рэчы Паспалітай стварылі новую геапалітычную сітуацыю ў Еўропе: «Імперыі Раманавых, Габсбургаў і Гагенцалернаў цяпер непасрэдна межавалі адна з адной, а агульны шкілет у шафе стаў фактарам, які шмат у чым вызначаў дачыненні трох імперый аж да іхнага краху ў выніку Першай сусветнай вайны» (с. 73). Таксама варта дадаць, што менавіта анексія ўсходніх тэрыторый Рэчы Паспалітай ператварыла Расію ў адну з вялікіх еўрапейскіх дзяржаў. Гэта было ўжо не пятроўскае акно ў Еўропу. Расія ўварвалася ў еўрапейскую геапрастору як магутная імперыя.

Аналіз палітыкі Пецярбурга на землях былой Рэчы Паспалітай пачынаецца з кароткай характарыстыкі этнічна-сацыяльных асаблівасцяў далучаных тэрыторый. Галоўнай асаблівасцю

зямель колішняга ВКЛ лічыцца тое, што «шляхта тут была польская ці ў большасці сваёй паланізаваная, а сялянскае насельніцтва ці русінскае (усходнеславянскае), ці літоўскае» (с. 76). Нават напрыканцы XVIII ст. расійскія аўтары не бачаць існавання ні беларусаў, ні ўкраінцаў.

На анексаваных тэрыторыях Пецярбург выкарыстаў тактыку, апрабаваную падчас інкарпарацыі остзейскіх правінцый. У абмен на палітычную лаяльнасць мясцовая эліта («польская арыстакратыя») запрашалася да ўдзелу ў кіраванні не толькі рэгіёнам, але і ўсёй імперыяй (с. 76). Пры гэтым расійскія ўлады бралі на сябе абарону зямельнай маёмасці шляхты і яе ўлады над сялянамі, захоўвалі прававую, культурную і канфесійную адметнасць краю. З апошнім цверджаннем цяжка цалкам пагадзіцца. Прынамсі, беларускія гісторыкі звяртаюць увагу на непаслядоўнасць у стаўленні Кацярыны II да уніяцкай царквы — яно вагалася паміж лаяльнасцю і пераводам уніятаў у праваслаўе адміністрацыйнымі сродкамі[4].

Безумоўна, імперскаму цэнтру патрабаваўся час, каб выпрацаваць палітыку на новых «заходніх ускраінах». «Остзейская мадэль» была толькі адным з магчымых варыянтаў. Усё ж, адрозна ад узбярэжжа Балтыйскага мора, беларускія і ўкраінскія землі лічыліся «сваімі», калісьці страчанымі ў выніку «польска-літоўскай экспансіі». Да таго ж колькасцю насельніцтва «заходнія ўскраіны» значна пераўзыходзілі остзейскія правінцыі. Расійскія ўлады ўпершыню сутыкнуліся з такімі «праклятымі пытаннямі» — палітычнага жыцця, як польскае і жыдоўскае. Няўдача ў адказаць на іх больш чым праз сто гадоў непасрэдна спрычыніцца да краху імперыі.

У IV раздзеле («Ад Канстытуцыйнай хартыі да рэжыму Паскевіча») упершыню ў катэгорыю «ўскраіннага элементу» трапіла Польшча — Каралеўства (Царства) Польскае. Пачынаючы з гэтага раздзелу польскі сюжэт пачынае пераважаць і робіцца адным з найбольш цікавых у аналізе сітуацыі на «заходніх ускраінах».

Шмат увагі ў раздзеле надаецца размежаванню функцый паміж Пецярбургам і Каралеўствам Польскім і дачыненням паміж імі

[4] Напр.: Марозава С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596—1839 гг.) — Гродна, 2001; Канфесіі на Беларусі. Канец XVIII — XX ст. / Пад рэд. У. Навіцкага. Мінск, 1998. С. 5—8 (аўтар адпаведнага

да паўстання 1830 г. Эканамічнае становішча Каралеўства К. — Правілава акрэсліла як фінансава-эканамічную аўтаномію (Аляксандрыя. Полатава). 86). Яна падкрэсліла, што сітуацыя спрыяла развіццю гаспадаркі Каралеўства Польскага, таму што для польскай прамысловасці адкрыўся расійскі рынак, а імпарт з Прусіі і Аўстрыі стаў абмяжоўвацца. Як кажа расійская даследчыца, сістэма эканамічных і фінансавых стасункаў паміж Каралеўствам і Расіяй будавалася паводле мадэлі міждзяржаўных зносінаў (с. 89).

Варта адзначыць аналіз поглядаў і дзейнасці Аляксандра I як караля польскага (А. Мілер, М. Далбілаў). Даследчыкі справядліва заўважылі, што імператар знаходзіўся ў складаным становішчы, бо мусіў сумяшчаць статус абсалютнага манарха ў Расіі і канстытуцыйнага — у Польшчы. Гэтая дваістасць адчувалася і ў стаўленні да тэрыторыі былога ВКЛ, дзе палітыка імперскай уніфікацыі спалучалася з прызнаннем адметнасці краю. У прыватнасці, А. Мілер і М. Далбілаў звярнулі ўвагу на развіццё польскай сістэмы адукацыі ў Віленскай навучальнай акрузе, што спрыяла актывізацыі працэсаў паланізацыі (с. 96).

Апошні тэзіс цалкам адпавядае ўяўленню пра гісторыю Беларуска-Літоўскага краю з пазіцый Пецярбурга або Варшавы. Сапраўды, калі ўспрымаць землі і насельніцтва былога ВКЛ як «заходні край» або «ўсходнія крэсы», то ўся ягоная гісторыя XIX ст. будзе выглядаць як арэна расійска-польскага змагання. Аднак простая спроба зірнуць на мінуўшчыну краю з гледзішча Вільні (або Менска) дазваляе заўважыць больш складаныя працэсы: нараджэнне літоўскай і беларускай культурных традыцый і пачатак ператварэння былога ВКЛ у Беларуска-Літоўскі край.

Нельга забываць, што ў першай палове XIX ст. паняцце польскасці на беларускіх і літоўскіх землях па-ранейшаму звязвалася толькі з прадстаўнікамі вышэйшых сацыяльных колаў грамадскасці. Тэрмін «паляк» быў у першую чаргу палітонімам, які сведчыў пра прыналежнасць да шляхецкай «палітычнай нацыі» («naród polityczny»). Таму небяспека паланізацыі беларускай і літоўскай вёскі ў першай траціне XIX

ст. падаецца перабольшанай. Сацыёлаг Рышард Радзік справядліва заўважыў, што да адмены прыгону польская грамадскасць не выяўляла зацікаўленасці ў моўнай паланізацыі мясцовага насельніцтва. Больш за тое, культурная адрознасць спрыяла захаванню недатыкальным ставанага падзелу[5].

Шкада, што калегі з Расіі не заўважылі феномену ліцвінскай традыцыі. Ліцвінства грунтавалася на гістарычных і культурных традыцыях ВКЛ, на пэўнай тэндэнцыі да дэмакратызацыі (яна праяўлялася ў цікавасці да народнай культуры), на ўсведамленні сваёй этнакультурнай адрознасці як ад расійцаў, так і ад палякаў з этнічнай Польшчы. Яно было часткай патрыятызму Рэчы Паспалітай, але адрознівалася высокай ступенню аўтаномнасці. Паводле веравызнання, большасць прадстаўнікоў ліцвінскай традыцыі належала да Каталіцкага Касцёлу, а паводле грамадскага стану — да шляхты. Літаратурныя і публіцыстычныя творы ў межах гэтай традыцыі ствараліся пераважна на польскай, а таксама на літоўскай і беларускай мовах. Апошняя перадавалася на пісьме лацінкай. Цэнтрам ліцвінскай традыцыі была Вільня[6].

Аналіз палітычнай і культурнай дзейнасці ліцвінаў дазволіў польскаму даследчыку Юліюшу Бардаху зрабіць выснову пра падвоенасць іхнай свядомасці, якую часта пазначаюць формулай *gente Lithuanus (vel Ruthenus), natione Polonus* (ліцвін або русін з паходжання, паляк з нацыянальнасці). Прычым апошняе датычыла палітычна-прававой сферы[7].

Гэтая з’ява сфармавалася ў апошнія дзесяцігоддзі існавання Рэчы Паспалітай і захоўвалася ўсё XIX ст. А пэўныя ейныя праявы (краёвасць) назіраліся яшчэ ў першай траціне XX ст. У межах ліцвінства выспяваў літоўскі, а пазней таксама і беларускі протанацыяналізм. Зрэшты, апошні ў форме назапашвання беларускай культуры развіваўся ў першай палове XIX ст. таксама ў межах «заходнярускай традыцыі».

Каб заўважыць усё гэта, трэба, прынамсі, чытаць працы беларускіх гісторыкаў. Між тым знаёмства аўтараў «Заходніх украін…» з беларускай гістарыяграфіяй абмяжоўваецца толькі зборнікам дакументаў пра паўстанне Т. Касцюшкі, падрыхтаваным Яўгенам Анішчанкам, і калектыўнай манаграфіяй «Канфесіі на Беларусі. Канец XVIII—XX ст.»[8]. Фактычна, мы сутыкаемся з ігнараваннем гістарыяграфіі краіны, якая складала вельмі важны элемент «заходніх украін» імперыі. З навуковага гледзішча прыняць падобнае немагчыма. Паўстанне 1830—1831 гг. характарызуецца як адзін з асноўных момантаў у гісторыі імперыі, які шмат у чым вызначыў характар «праклятага польскага пытання» (с. 97). Сапраўды, лістапад 1830 г. засведчыў: у межах адной дзяржавы немажліва сумяшчаць расійскае самаўладдзе і еўрапейскі парламентарызм. У пэўным сэнсе зазнала паразу спроба

паяднаць палітычныя прынцыпы праваслаўнай і заходняй (паводле С. Гантынгтана) цывілізацый. Зрэшты, расійскія гісторыкі не сталі заглыбляцца ў прычыны паўстання, коратка адзначыўшы, што яно было вынікам рамантычнага патрыятызму і радыкалізму моладзі (с. 93). Ход паўстання ў Каралеўстве Польскім асвятляецца даволі грунтоўна, чаго не скажаш пра іншыя «ўскраіны». Напрыклад, падзеі паўстання на беларускіх землях цалкам абмінаюцца. Чытач можа толькі даведацца, што паўстанне з тэрыторыі Каралеўства перакінулася на літоўскія землі і на Правабярэжную Украіну (с. 99).

Характарызуючы мікалаеўскую палітыку, расійскія гісторыкі закранулі праблему імперыі і нацыяналізму. Насуперак пашыранаму меркаванню, што імперыя ніяк не можа мець рысаў нацыянальнай дзяржавы, яны звярнулі ўвагу на спалучэнне імперскасці з нацыяналізмам і ўвялі тэрмін «мікалаеўскі нацыяналізм» (с. 106). Ён выявіўся ў паслядоўным імкненні цэнтра аслабіць польскі культурны ўплыў (згадаем закрыццё Віленскага універсітэта ды інш.), а таксама ў асцярожным павароце ад шляхты да сялянства. Значным поспехам уладаў на шляху ператварэння зямель былога ВКЛ у «заходні край» стала ліквідацыя грэка-уніяцкай царквы (1839). Адначасна жорстка рэгламентаваліся статус і функцыі каталіцкага духавенства. І, нарэшце, у 1830-х гг. гісторыкі Устралаў і Пагодзін пачалі прапагандаваць тэзіс пра «исконно русское» паходжанне «русінскага насельніцтва» (с. 111). Пазней ён стане афіцыйнай ідэалагемай уладаў і будзе супрацьпастаўляцца як польскім прэтэнзіям на «крэсы», так і патрабаванням украінскага і беларускага нацыянальных рухаў. Зрэшты, апошні на старонках выдання нават не згадваецца. А вось «украінафільству» 20—40-х гг. XIX ст. прысвечаны асобны параграф.

Праблема імперыі і нацыяналізму разглядалася таксама ў V раздзеле («Заходнія ўскраіны ў 1855—1862 гг.»). Ягоныя аўтары найбольш увагі надалі сітуацыі ў Каралеўстве Польскім, спыніліся на праграме рэформаў маркіза Аляксандра Веляпольскага і паказалі стаўленне да ягонай дзейнасці як расійскіх уладаў, так і польскага грамадства. Апошняе, дарэчы, раскалолася. Прычым, усё больш значную ролю ў польскім руху пачалі адыгрываць радыкальныя элементы («чырвоныя»).

Даследчыкі прааналізавалі погляды розных прадстаўнікоў расійскай вышэйшай бюракратыі на вырашэнне польскага пытання. Аўтары звярнулі ўвагу і на прысутнасць нацыяналістычнага дыскурсу як у палітыцы Пецярбурга, так і ў дзейнасці кіраўнікоў мясцовай адміністрацыі і нават праваслаўнага духавенства.
Расійская палітычная эліта меркавала, што скасаванне прыгону (1861 г.) на «заходніх украінах» паспрыяе вырашэнню нацыянальнага пытання. Нацыятварэнне, якое выходзіла за межы «палітычнай нацыі» часу Рэчы Паспалітай і мусіла адбывацца пры актыўным удзеле сялянства, не мела перспектывы пры захаванні прыгону. Як мяркуюць расійскія даследчыкі, улады зразумелі: ад таго, хто выступаў у ролі «вызваліцеля» — мясцовая шляхта або расійскае самаўладдзе, — залежала перамога польскага або расійскага праекту фармавання нацыі. Ініцыятывай валодаў царызм, і, адпаведна, «праграма рэформы 19 лютага 1861 г. адпачатку несла ў сабе магутны нацыяналістычны зарад і мела на ўвазе пастаноўку новых русіфікатарскіх мэтаў» (с. 139). Магчыма, акурат у гэты момант адбывалася нараджэнне мадэрнага расійскага нацыяналізму.
Сітуацыю на беларускіх і літоўскіх землях у гэты перыяд прааналізаваў М. Далбілаў. Ён адзначыў актывізацыю мясцовай польскай шляхты, ад імя якой выступаў маршалак шляхты Гарадзенскай губерні Віктар Старжынскі. Маршалак паспрабаваў ісці шляхам А. Веляпольскага і прапанаваў міністру ўнутраных справаў П. Валуеву праграму рэфармавання «заходняга краю». Між іншым яна прадугледжвала аднаўленне асноўных нормаў Статута 1588 г., увядзенне польскай мовы ў судовых установах, аднаўленне шляхецкіх соймікаў і ўмацаванне сувязяў краю з Каралеўствам Польскім. Праграму не прынялі, але яе абмеркаванне прыспешыла выпрацоўку віленскай адміністрацыяй уласнай канцэпцыі «рускасці» краю. Яе найважнейшым кампанентам была барацьба супраць паланізацыі сацыяльных нізоў. Прапануючы, напрыклад, развіваць пачатковую адукацыю на родных мовах насельніцтва, Назімаў дэманстраваў сапраўдны этналінгвістычны падыход да нацыянальнай праблемы. Як адзначыў М. Далбілаў, у падмурку назімаўскага праекту знаходзілася ідэя, ужо апрабаваная ў імперыі Габсбургаў. Ва

ўмацаванні этнічнасці недамінантных супольнасцяў, пазбаўленых уласнай эліты і лаяльных уладзе, віленскі генерал-губернатар бачыў супрацьвагу польскім уплывам (с. 168).

Віленская адміністрацыя зрабіла крок да прызнання этнічнай адметнасці літоўцаў. Адначасна Назімаў асцярожна ўзняў пытанне моўнай самабытнасці беларусаў. Ён не адкідаў афіцыйнай дактрыны, якая адносіла беларусаў (разам з велікарусамі і маларусамі) да «рускай» нацыі, але спрабаваў асэнсаваць беларускасць як прамежкавую ступень у фармаванні рускай нацыянальнай свядомасці. З'явілася ідэя перакласці каталіцкі катэхізіс на «беларускую гаворку». А ўвесну 1863 г. выйшлі з друку «Разсказы на белорусском наречіи». М. Далбілаў лічыць іх адзіным прыкладам беларускамоўнай праўрадавай прапаганды, якая сцвярджала, што беларусы — не палякі, а рускія (с. 169).

Насамрэч «Разсказы…» сведчаць пра іншае. Іх ананімны аўтар падкрэслівае акурат адметнасць беларусаў: «…мы сами по себи народ особный — Белоруссы»[9]. Этнічных рускіх у нарысе наагул няма, як няма і згадкі пра расійскую дзяржаву. Толькі аднойчы аўтар кажа пра маскоўскіх цароў і толькі дзеля таго, каб нагадаць пра жахлівае спусташэнне беларускай зямлі падчас ваенных канфліктаў паміж Масквой і Польшчай. Затое шырока асвятляецца роля палякаў у беларускай гісторыі. Пры гэтым яны выразна супрацьпастаўляліся ліцвінам, якія «жилы з Билоруссамы в вэликой згоди». З палякамі звязвалася страта незалежнасці, апалячванне і акаталічванне. Звяртае на сябе ўвагу асуджэнне аўтарам тых, хто «пнетца да панув» і пры гэтым выракаецца роднай мовы і роднай (праваслаўнай) веры. Беларускі даследчык Алег Латышонак пераканаўча паказаў, што аўтар здолеў асэнсаваць гісторыю Беларусі з нацыянальна-беларускага гледзішча. Уважлівы аналіз «Разсказов…» сведчыць не столькі пра рэалізацыю праекту Назімава, колькі пра першыя самастойныя крокі беларускага руху. Дакладней, таго ягонага кірунку, што звязваўся з «заходнярускай культурнай традыцыяй» першай паловы XIX ст.

Яе характэрнымі рысамі было ўсведамленне самабытнасці Беларусі як «Заходняй Русі», зварот да гістарычных традыцый Полацкага княства, высокая ацэнка ролі праваслаўнай царквы ў

9 Латышонак А. Гутарка «царкоўнага старасты Янкі» з «Яськам гаспадаром з пад Вільны» // Дзеяслоў. 2004. № 9. С. 211.

гісторыі «заходнярускіх зямель», антыпольскасць і антыкаталіцкасць. Паводле веравызнання, большасць прадстаўнікоў «заходнярускай традыцыі» былі уніятамі, а пасля 1839 г. — праваслаўнымі. Многія належалі да праваслаўнага духавенства, займалі дзяржаўныя ці вайсковыя пасады або мелі сувязі з расійскімі магнатамі. Літаратурныя і публіцыстычныя творы пісаліся па-расійску і па-беларуску. Беларуская мова, якую часцей называлі «заходнярускай гаворкай», перадавалася кірыліцай. «Заходняруская традыцыя» ў першай палове XIX ст. развівалася пераважна на Гомельшчыне і Магілёўшчыне. Разам з ліцвінствам яна непасрэдна спрычынілася да нараджэння ўласна *беларускай культурнай традыцыі*.

На жаль, расійскія гісторыкі не заўважылі ейнага з'яўлення. Дарэчы, як і саміх беларусаў: М. Далбілаў чарговы раз акрэсліў іх як «усходнеславянскае насельніцтва» (с. 172). Украінцам пашанцавала болей: А. Мілер асвятляе нараджэнне ўласна ўкраінскай культурнай традыцыі на пачатку 60-х гг. XIX ст. (Кірыла-Мяфодзеўскае брацтва, «Грамада», выданне ўкраінскіх кніг і часопіса «Основа»). Праўда, па-за ўвагай застаўся працэс ператварэння часткі «русінскага» («усходнеславянскага») насельніцтва ва ўкраінцаў. Між тым аўтарам выпадала б адмыслова засяродзіць увагу на праблеме знікнення «русінства» і нараджэння «ўкраінскасці».

Тым не менш, даследаванне М. Далбілавым праектаў нацыянальнага будаўніцтва ў «заходнім краі» мае наватарскі характар. Цяжка аспрэчваць ягонае цверджанне, што шмат элементаў нацыянальнай палітыкі ўлады сфармулявалі яшчэ да паўстання 1863 г. у кантэксце «вялікіх рэформаў», якія ўпершыню ўзнялі праблему лаяльнасці і самавызначэння ўжо свабоднага сялянства: «У дачыненні да ўсходнеславянскага насельніцтва заходніх ускраін у цэнтры ўвагі ўладаў апыналася пытанне аб зацверджанні агульнарускай ідэнтычнасці. У дачыненні да польскага і літоўскага селяніна, як і ў дачыненні да масы габрэйскага насельніцтва Рысы аселасці, улады былі занепакоеныя не столькі іхным абрусеннем, колькі сцверджаннем такой ідэнтычнасці, якая рабіла б іх лаяльнымі падданымі імперыі» (с. 172).

Фактычна, у сярэдзіне XIX ст. высветлілася глыбінная супярэчнасць паміж традыцыйнай імперскай ідэалогіяй, заснаванай на дынастычнай лаяльнасці і маёмасным цэнзе, з аднаго боку, і мадэрным нацыяналізмам — з іншага. Традыцыйны метад супрацоўніцтва Пецярбурга з польскай элітай зазнаў канчатковую паразу, што падштурхнула ўлады да русіфікацыі адміністрацыйнымі сродкамі. Адначасна ўзнік мадэрны расійскі нацыяналізм, які сцвярджаў тоеснасць імперскай (грамадзянскай) нацыі і рускай этнічнай нацыі (Міхаіл Каткоў). Гэта, як адзначаў яшчэ нямецкі гісторык Андрэас Капелер, аслабіла традыцыйнае апірышча імперскага рэжыму — палітычную лаяльнасць да дынастыі і яе стаўку на сацыяльную эліту, незалежна ад яе этнаканфесійных рысаў. Цяпер лаяльнасць пачала атаясамлівацца не столькі з сацыяльным паходжаннем, колькі з этнічнымі «каранямі»[10].

Паўстанне 1863—1864 гг. асвятляецца фрагментарна. Аўтар VI раздзелу («Імперская ўлада і Царства Польскае ў 1863—1869 гг.») засяродзіліся выключна на падзеях у Каралеўстве Польскім. Між тым, напрыклад, аналіз поглядаў і дзейнасці Вікенція Канстанціна (Кастуся) Каліноўскага (1838—1864) мог бы даць расійскім гісторыкам вельмі цікавы матэрыял для разважанняў над суадносінамі ліцвінства, польскасці і беларускасці ў сярэдзіне XIX ст.

[10] Капелер А. Дзесяць дзесяцігоддзяў // Дзеяслоў. 2005. № 2.

Характарызуючы русіфікатарскую палітыку Пецярбурга ў польскім рэгіёне пасля паўстання, М. Далбілаў сцвярджае, што галоўнай мэтай расійскіх уладаў была не асіміляцыя, а канструяванне новай польскай ідэнтычнасці, фармаванне прыхільнага да Расіі паляка (с. 198). Улады звярнулі асноўную ўвагу на польскае сялянства. У пэўным сэнсе, яны здолелі ізаляваць яго ад вышэйшых сацыяльных колаў, але не забяспечылі новых крыніцаў культурнага ўплыву. Магчыма, Расіі не хапіла цывілізацыйнага патэнцыялу, каб асіміляваць польскае насельніцтва.

Нацыянальнае пытанне засталося ў цэнтры ўвагі і ў VII раздзеле («Палітыка «рускай справы» ў заходніх губернях у 1863—1868 гг.»). У ім разглядаюцца праблемы палітыкі дэпаланізацыі, стаўленне ўладаў да ўкраінафільства, пытанне

рускай саматоеснасці ды інш. Усё разам ізноў жа ўкладаецца ў рамкі праблемы «Імперыя і нацыяналізм». А. Мілер і М. Далбілаў прааналізавалі новы русіфікатарскі курс імперыі на «заходніх ускраінах». На думку даследчыкаў, трэба казаць пра розныя ягоныя варыянты. Калі, напрыклад, у Каралеўстве Польскім не планавалася знішчаць польскую мову і культуру, дык на тэрыторыях сучасных Беларусі, Украіны і Літвы акурат гэта і было галоўнай мэтай русіфікатараў (с. 210).

М. Далбілаў прааналізаваў асноўныя захады палітыкі дэпаланізацыі, звярнуў увагу на практыку выяўлення «асоб польскага паходжання», спыніўся на дыскусіі вакол каланізацыі «заходніх ускраін». Пры гэтым ізноў няма нават згадкі пра беларусаў, пра тое, як палітыка дэпаланізацыі паўплывала на іх гаспадарчае і культурнае становішча. Затое А. Мілер даволі падрабязна спыніўся на антыўкраінафільскіх дзеяннях улады, якія негатыўна адбіліся на развіцці ўкраінскага руху. Прадметам асобнай гаворкі таксама стала палітыка ў дачыненні да літоўцаў.

Што да праблемы «рускай саматоеснасці», то ў афіцыйным дыскурсе сялянства «заходніх ускраін» бачылася галоўным захавальнікам «рускай народнасці». Ужо ў часе паўстання 1863 г. Пецярбург пачаў глядзець на сялянскія антышляхецкія выступленні не з сацыяльнай, а з нацыянальнай («нацыяналістычнай») пазіцыі (с. 228). Таксама актыўна выкарыстоўвалася Праваслаўная Царква, якая традыцыйна лічылася асновай «рускасці». Альтэрнатыўны варыянт пашырэння рускай ідэнтычнасці прапанавалі прыхільнікі ідэі моўнай русіфікацыі Каталіцкага Касцёла (М. Каткоў). Як заўважылі расійскія даследчыкі, сутыкненне дзвюх канцэпцый паказала «няздатнасць бюракратаў прызнаць гістарычную натуральнасць становішча, пры якім мова богаслужэнняў (польская) і мова паўсядзённых стасункаў («беларуская гаворка» рускай мовы) мелі, прынамсі, супастаўляльнае значэнне для фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці» (с. 243).

Аўтары прыйшлі да высновы, што «палітыка дэпаланізацыі пасля паўстання 1863 г. незваротна падарвала магчымасці польскага нацыябудавання ў заходніх губернях Расійскай

імперыі. […] На працягу апошняй траціны XIX ст. пераважна шляхецкае паводле складу польскае насельніцтва былых «крэсаў» усё больш адасаблялася ад развіцця польскай нацыянальнай самасвядомасці на тэрыторыі Ц[арства] П[ольскага]. Аднак нельга сказаць, што рускі праект нацыябудавання выйшаў з гэтага сутыкнення пераможцам. Творцы ўскраіннай палітыкі не змаглі прапанаваць такога бачання рускасці, якое было б здатнае дынамічна развівацца, улічваючы этнакультурную гетэрагеннасць рэгіёну» (с. 252).

У наступным раздзеле («Заходнія ўскраіны ў апошняй траціне XIX в.») М. Далбілаў і А. Мілер адзначылі пэўную стабілізацыю імперскай палітыкі на «заходніх ускраінах». Як мяркуюць даследчыкі, адбылася свайго роду руцінізацыя адміністрацыйнай дзейнасці (с. 216). Пры гэтым палітычныя намаганні скіроўваліся на тое, каб ураўнаважыць імперскасць і нацыянальныя прыярытэты. Магчыма, акурат таму антыпольскія захады пашырыліся на сялянаў-каталікоў і выявілася схільнасць да пэўных кампрамісаў у дачыненні да «асоб польскага паходжання».

Дарэчы, на шырокае ўжыванне расійскімі калегамі тэрміна «русіфікацыя» і ягоных вытворных варта звярнуць увагу сучасным беларускім чыноўнікам ад гістарычнай навукі. Ужо некалькі гадоў яны фактычна забараняюць ужываць тэрмін «русіфікацыя» ў беларускай гістарыяграфіі, дакладней, у дысертацыйных даследаваннях. Няўжо баяцца пакрыўдзіць «старэйшага брата», які, дарэчы, не саромеецца сваёй колішняй палітыкі?

Расійскія гісторыкі здолелі зрабіць вельмі грунтоўны аналіз ідэалагічных і практычных асаблівасцяў палітыкі дэпаланізацыі. На жаль, ён не спалучаецца з уважлівым і зацікаўленым стаўленнем да этнакультурнай гетэрагеннасці рэгіёну. Па-першае, трэба адзначыць, што магчымасці польскага нацыятварэння на беларускіх і літоўскіх землях зусім не былі вычарпаныя. Між іншым, гэта засведчылі этналагічныя і лінгвістычныя даследаванні польскамоўных рэгіёнаў Віленшчыны, якія ў 30-я гг. XX ст. праводзіліся польскім этнолагам Галінай Турскай. Паланізацыю яна

разглядала як пашырэнне арэалу польскай мовы.

Г. Турска давяла, што фармаванне польскамоўных рэгіёнаў на беларуска-літоўскім этнічным памежжы (Вільня—Коўна—Дзвінск) адбывалася ў трэцяй чвэрці XIX ст. Сутнасць гэтага працэсу — у добраахвотным імкненні сялянаў-каталікоў далучыцца да польскай мовы і польскай культуры, бо яна паранейшаму ўспрымалася як прыкмета прыналежнасці да вышэйшых колаў грамадства[11]. Варта дадаць, што пашырэнню польскіх культурных уплываў спрыяла сама расійская палітыка дэпаланізацыі. У прыватнасці, гэта датычыла сялянаў-каталікоў, на якіх у апошняй траціне XIX ст. таксама пачалі распаўсюджвацца антыпольскія абмежаванні. Менавіта ад расійскага чыноўніка беларускія або літоўскія сяляне-каталікі раптам даведваліся, што яны — палякі, і таму не маюць, напрыклад, права набываць зямлю.

Па-другое, больш уважлівага стаўлення патрабуе сведчанне палякаў Беларуска-Літоўскага краю, большасць з якіх нікуды не забываліся на сваё мясцовае паходжанне і часта свядома падкрэслівалі адрозненасць ад этнічных палякаў. Насуперак меркаванню расійскіх гісторыкаў, якія праблему «рускага» літоўскага паходжання шляхты «Паўночна-заходняга краю» звязалі або з афіцыйнай прапагандай XIX ст., або з кансерватыўным кірунках расійскай гістарыяграфіі, іхных беларускіх, польскіх і літоўскіх калегаў галоўным фактарам фармавання польскай грамадскасці гістарычнай Літвы лічаць працэс паланізацыі (самапаланізацыі) апошняй траціне XIX ст. сярод гэтай супольнасці павінна пашырацца этнонім «літоўскія палякі»[12].

Нарэшце, трэба сказаць некалькі словаў у абарону беларускага руху, якога аўтары кнігі не бачаць нават у апошняй траціне XIX ст. Спасылаюцца на беларускай культурнай традыцыі

[11] Турска Г. О большасць польскага населения в Виленском крае. — Vilnius: Minis, 1995.

[12] Гл. Малюнкаў Б. Адлюстраванне беларускай культурнай традыцыі ў творах Францішка Багушэвіча // Спадчына. — 1998. — № 1. — С. 18.

Адмоўна ставяцца, напрыклад, да беларускага альманаху «Гомон». Беларуская традыцыя прысутнічала ў артыкулах М. Доўнар-Запольскага (1888), які даказваў існаванне беларускай нацыі, падкрэсліваў самабытнасць беларускай гісторыі і мовы. Нарэшце, трэба згадаць славутую «Прадмову» да «Дудкі беларускай» Францішка Багушэвіча

(1891), якога з поўным правам можна назваць адным з тых філалагічных завадатараў, ролю якіх у нацыянальных працэсах высока ацэньваў Бенедыкт Андэрсан. Характэрнай рысай беларускай традыцыі можна лічыць своеасаблівы рэлігійны індыферэнтызм яе прадстаўнікоў: яны абміналі праблему канфесійнага расколу беларускага этнасу і звярталіся да ўсіх беларусаў, незалежна ад веравызнання. Прадстаўнікі беларускай традыцыі належалі як да каталіцкага шляхецка-сялянскага асяродка, так і да праваслаўнага інтэлігенцка-сялянскага. Тэксты пісаліся пераважна на беларускай мове як кірыліцай (грамадзянкай), так і лацінкай. Першым цэнтрам гэтай традыцыі была Вільня, але ўжо на пачатку XX ст. да яе далучыўся Менск.

У наступным раздзеле («Габрэі ў Расійскай імперыі. 1772—1917») каротка аглядаецца гісторыя яшчэ аднаго «праклятага пытання» расійскай гісторыі — жыдоўскага. Аўтары (А. Будніцкі, М. Далбілаў, А. Мілер) стварылі шырокую панараму намаганняў улады ў разгабрэйванні жыдоўскага насельніцтва, адзначылі недасяжнасць гэтай мэты і пагадзіліся з думкай жыдоўскага даследчыка Я. Каца: сцяна гета будавалася з двух бакоў (с. 309).

Перадапошні раздзел кнігі («Заходнія ўскраіны ў пачатку XX ст. Дзяржаўная дума. Ад рэвалюцыі да сусветнай вайны») прысвечаны палітычным падзеям рэвалюцыі 1905—1907 гг. і тым нацыянальным і канфесійным пераменам, якія яна выклікала. Сапраўды, рэвалюцыя істотна змяніла агульнапалітычны кантэкст нацыянальных і канфесійных стасункаў у імперыі і асабліва на яе «заходніх ускраінах». На думку расійскіх даследчыкаў, акурат тут нацыянальныя рухі набылі найбольшую моц і спрыялі падвышэнню ўвагі да праблем сацыяльных супярэчнасцяў, грамадзянскай роўнасці, адукацыі, мясцовага самакіравання і палітычнага прадстаўніцтва (с. 343).

Аднак аналіз новай нацыянальнай і канфесійнай сітуацыі абмяжоўваецца амаль выключна Каралеўствам Польскім і дзейнасцю «ўскраіннага» прадстаўніцтва ў Дзяржаўных думах (Рустэм Цівунчук). Трэба прызнаць высокі прафесійны ўзровень

гэтага доследу. А вось няпольскай частцы «заходніх ускраін» пашанцавала меней. Фактычна не разглядаецца стан літоўскага, беларускага і ўкраінскага рухаў. Іх аналізу не можа замяніць кароткі пералік асноўных нацыянальных палітычных партый. Прычым Беларуская сацыялістычная грамада ў гэтым пераліку наагул не згадваецца. Засталася па-за ўвагай праблема заходнерусізму на беларускіх землях на пачатку XX ст., няма нават згадкі пра такія істотныя праблемы, як родная мова ў навучанні ў пачатковых школах, увядзенне літоўскай і беларускай моваў у каталіцкае набажэнства. Адпаведна, не асвятляюцца і абвастрэнне польска-літоўскіх дачыненняў, спробы некаторых літоўскіх палітыкаў абаперціся ў гэтым канфлікце на расійскія ўлады і г. д. Таксама ігнаруецца своеасаблівасць палітычнай дзейнасці «крэсовых» палякаў, якія выпрацавалі ідэалогію краёвасці. Яе характэрнай рысай была перавага агульнакраёвых інтарэсаў над інтарэсамі асобных народаў. Фактычна, краёўцы прапанавалі канцэпцыю грамадзянскага (палітычнага), а не этнакультурнага бачання нацыі. Не выпадкова іх дэпутаты прынцыпова адмаўляліся ўваходзіць у склад думскага Польскага кола. Рустэм Цівунчук памыляецца, калі піша пра аб'яднанне дэпутатаў Каралеўства Польскага і літоўска-беларускіх губерняў у II Думе (с. 362). Насамрэч іх адзінства мела выключна фармальны характар. Дэпутаты Тэрытарыяльнага кола Літвы і Беларусі захавалі поўную самастойнасць і адстойвалі не польскую нацыянальную, а краёвую ідэю. Да таго ж, «заходнія ўскраіны» ў міжрэвалюцыйны час разглядаюцца пераважна з пазіцый Пецярбурга і Варшавы, г. зн. выключна як арэна польска-расійскага змагання.

Аўтар апошняга раздзелу («Замест заключэння») Аляксей Мілер паспрабаваў канспектыўна пазначыць асноўныя этапы таго «выбуховага нацыяналізму», які стаў галоўным вынікам Першай сусветнай вайны. Пры гэтым беларускі чытач не можа не звярнуць увагі на велізарную колькасць факталагічных памылак акурат у беларускім сюжэце. У прыватнасці, сцвярджаецца, што толькі ў 1916 г. у Вільні ўзнікла першая (?!) беларуская палітычная арганізацыя — Таварыства дапамогі ахвярам вайны (с. 415), што Беларускі нацыянальны камітэт быў створаны ўлетку 1917 г. (с. 417) (насамрэч — у сакавіку

таго ж года), што першай формай беларускай савецкай дзяржаўнасці стала ЛітБелССР, створаная ў студзені 1919 г. (?!), што Рыжскай дамовай вызначаліся межы РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшчы — з другога (с. 421). БССР чамусьці не згадваецца.

«Дадаткі» пачынаюцца артыкулам А. Новака («Барацьба за ўскраіны, барацьба за выжыванне: Расійская імперыя XIX і палякі, палякі і імперыя…»). Польскі гісторык зрабіў агляд-пералік найбольш значных працаў суайчыннікаў па праблеме польска-расійскіх дачыненняў у перыяд імперыі і ахарактарызаваў найбольш распаўсюджаныя тэндэнцыі і прыярытэты польскай гістарыяграфіі. У агляд трапілі працы А. Шварца, А. Хвальбы, Л. Заштаўта, В. Слівоўскай, Х. Глэмбоцкага ды інш. А. Новак заўважае, што польская гістарычная навука на працягу XX ст. пражыла эвалюцыю ад выключна змагарнай тэматыкі і акцэнту на рэпрэсіях царызму («палякі супраць імперыі, імперыя супраць палякаў») да аналізу стасункаў паміж імперскім (наднацыянальным) і нацыяналістычным (велікаруска-праваслаўным) полюсамі палітыкі імперыі. Для працаў апошняга дзесяцігоддзя характэрная ўвага да працэсу палітызацыі нацыі (с. 459), г. зн. да палітычнага змагання на культурна-нацыянальнай глебе. Да тэматычных прыярытэтаў апошняга часу ён адносіць канфлікт імперыі і нацыяналізмаў, а таксама сутыкненне на «заходніх ускраінах» нацыяналізмаў і розных канцэпцый фармавання нацый.

Прызнанне А. Новака, што ў апошняе дзесяцігоддзе польскія гісторыкі больш увагі надаюць лёсу карэнных нацый «заходніх ускраін» (літоўцаў, украінцаў і беларусаў), на жаль, не знайшло пацверджання ў аўтарскім тэксце. Чамусьці не згадваюцца даследаванні ў галіне гістарычнай беларусістыкі люблінскага гісторыка і сацыёлага Рышарда Радзіка. Таксама не прыводзяцца працы Збігнева Соляка, прысвечаныя аднаму з першых краёўцаў Міхалу Ромеру і самому феномену краёвасці як ідэалагічнай прасторы для міжнацыянальных кантактаў.

Нельга не пагадзіцца з высновай аўтара пра неабходнасць у кантэксце даследаванняў польскіх і расійскіх гісторыкаў

вывучаць найноўшую літоўскую, беларускую і ўкраінскую гістарыяграфію (с. 460). Іхнае ігнараванне абарочваецца тым, што шматнацыянальная, шматкультурная і шматканфесійная тэрыторыя «заходніх ускраін» ператвараецца ў тэрыторыю польска-расійскага змагання.

Аналагічны агляд-пералік найбольш значных даследаванняў беларускіх аўтараў зрабіў Сяргей Токць («Расійская імперыя і ейная палітыка на беларускіх землях у 19 — пачатку 20 ст. у сучаснай беларускай гістарыяграфіі»). Ён коратка спыніўся на калектыўных манаграфіях 1990-х гг., а таксама на даследаваннях Я. Анішчанкі, С. Куль-Сяльверставай, С. Марозавай, А. Смаленчука, З. Шыбекі, А. Латышонка ды інш. Засяродзіўшы ўвагу на праблемах сучаснай беларускай гістарыяграфіі, С. Токць адзначыў састарэласць «метадалагічнай майстэрні» большасці даследчыкаў, якія не выходзяць па-за межы «стыхійнага пазітывізму» (с. 528). У выніку адсутнічаюць фундаментальныя даследаванні такіх істотных праблем, як, напрыклад, палітыка імперыі на беларускіх землях і ейныя наступствы для лёсу беларускага народу, фармаванне беларускай нацыі як нацыі мадэрнага тыпу ды інш. Развіццё гістарыяграфіі таксама стрымліваецца тым, што беларускія гісторыкі не маюць супольнай камунікацыйнай прасторы.

С. Токць асцярожна згадаў пра сучасную тэндэнцыю ідэалагічнага дыктату, што абарочваецца дзяржзаказам на падручнікі, у якіх палітыка Расійскай імперыі атрымлівае выключна пазітыўнае асвятленне. Насамрэч сёння ствараецца новы варыянт дырэктыўнай гістарыяграфіі, які вагаецца паміж заходнерусізмам і велікарускім шавінізмам. Робіцца спроба дыскрэдытаваць беларускую нацыянальную ідэю сродкамі «гістарычнага даследавання». Беларусь вяртаюць у эпоху «Кароткага курсу гісторыі ВКП (б)». Яго роля адводзіцца кнігам выкладчыка Магілёўскага універсітэта Якава Трашчанка.

Украінскі гісторык Уладзімір Краўчанка («Украіна, імперыя, Расія...») зрабіў грунтоўны аналіз украінскай гістарыяграфіі. Ён засяродзіў увагу на метадалагічнай сітуацыі і асноўных парадыгмах у вывучэнні мінуўшчыны Украіны ў складзе

Расійскай імперыі. У прыватнасці, даследчык спыніўся на працах прадстаўнікоў мадэрнісцкай (Я. Грыцак, Г. Касьянаў) і нацыянальна-дзяржаўнай парадыгмаў, прааналізаваў эмігранцкую гістарыяграфію і працы неўкраінскіх аўтараў. На думку У. Краўчанкі, новае пакаленне даследчыкаў дэманструе адкрытасць да метадалагічных навацый і дыялогу ва ўмовах метадалагічнага плюралізму. Але іх магчымасці абмежаваныя тым, што перспектывы сучаснага ўкраінскага нацыянальнага праекту застаюцца ня вызначаныя, яго не прызнае частка расійскіх і заходніх аўтараў. Гісторыя ўкраінска-расійскіх стасункаў і ўкраінская нацыянальная гісторыя эпохі імперыі патрабуюць увогуле вышэйшага ўзроўню канцэптуалізацыі, а таксама новых арыгінальных падыходаў (с. 492).

Літоўскі гісторык Дарус Сталюнас («Погляд на палітыку Расійскай імперыі ў літоўскай гістарыяграфіі») засяродзіў увагу на гістарыяграфічных ацэнках далучэння ўсходняй часткі Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі, на палітыцы расійскага ўраду на літоўскіх землях і ейных наступствах, на праблеме ўжывання тэрміна «русіфікацыя» і ягоным змесце. Адзначыўшы залежнасць гістарыяграфічных ацэнак ад палітычнага развіцця краіны і ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі гісторыкаў, Д. Сталюнас вылучыў тры перыяды ў літоўскай гістарыяграфіі: 1918—1940; 1940 (1945) — 1990; пасля 1990 г. Апошні перыяд стаўся часам новых падыходаў. Д. Сталюнас асобна адзначыў ролю выданняў серыі «Даследаванні з гісторыі літоўскага Адраджэння» («Lietuvi? Atgimimo istorijos studijos»), а таксама працу-абагульненне Э. Александравічуса і А. Кулакаўскаса «Пад уладай цароў. Літва ў XIX ст.» (1996). Галоўнай навацыяй сучаснай літоўскай гістарыяграфіі стала адмова ад этнацэнтрычнай канцэпцыі гісторыі Літвы, акцэнтаванне ўвагі не толькі на палітычнай практыцы расійскіх уладаў, але і на грамадскім і афіцыйным дыскурсе.

Сярод найбольш актуальных праблем вывучэння «расійскага стагоддзя» літоўскай гісторыі апынулася гісторыя адукацыі і цэнзуры, становішча Каталіцкага Касцёлу, роля недамінантных этнічных групаў (асабліва жыдоўскай) ды інш. Даследчык адзначыў даволі шырокі спектр ацэнак расійскай нацыянальнай палітыкі: ад тэзісу пра свядомы курс на

дэнацыяналізацыю (Вебра) і русіфікацыю (Меркіс) да цверджання пра адсутнасць сістэматычнай палітыкі «абрусення» (Чапенас) альбо канцэпцыі розных ступеняў русіфікацыі (А. Кулакаўскас, А. Александравічус). Дадаткова трэба адзначыць вартыя самай сур'ёзнай увагі публікацыі самога Д. Сталюнаса.

Аналіз тэкстаў «Заходніх ускраін…» сведчыць пра выразна новы для расійскай гістарыяграфіі падыход да гісторыі імперыі. Яму ўласцівае адмаўленне ад традыцыйнага бачання мінуўшчыны выключна з гледзішча Пецярбурга і Масквы і ўвага не толькі да гісторыі этнічных расійцаў. Гэтае наватарства выявілася як у пастаноўцы самой праблемы даследавання (дачыненні цэнтра і «ўскраін»), так і ў прызнанні, што расійская палітыка ў дачыненні да ўсходніх тэрыторый колішняй Рэчы Паспалітай была захопніцкай і русіфікацыйнай.

Расійскія даследчыкі грунтоўна прааналізавалі палітыку цэнтра ў дачыненні да Каралеўства (Царства) Польскага і да г. зв. польскага пытання наагул. Тэма «Імперыя і палякі, палякі і імперыя», безумоўна, — сярод найбольш цікавых у кнізе. Веданне польскай гістарыяграфіі, аналіз шматлікіх архіўных матэрыялаў, спроба ацаніць расійскую палітыку таксама з пазіцыі Варшавы, нарэшце, выразнае імкненне аўтараў да навуковай аб'ектыўнасці дазваляе сцвярджаць, што «Заходнія ўскраіны…» працягваюць лепшыя традыцыі расійскай гістарычнай паланістыкі.

Таксама трэба адзначыць асвятленне праблемы «Імперыя і нацыяналізм». Расійскія даследчыкі звярнулі ўвагу на спробу спалучыць імперскасць і нацыяналізм, якая выявілася ўжо ў першай палове XIX ст. Аб'ектам аналізу стаўся не толькі нацыяналістычны дыскурс у палітыцы Пецярбурга, але і дзейнасць мясцовых адміністрацый і праваслаўных іерархаў. Аўтары паказалі пераход імперскай палітыкі ад супрацоўніцтва з лаяльнымі мясцовымі элітамі да русіфікацыі адміністрацыйнымі сродкамі. Нараджэнне мадэрнага расійскага нацыяналізму фактычна адбылося ў перыяд «вялікіх рэформаў». М. Далбілаў і А. Мілер адзначылі ўплывы мадэрнага расійскага праекту фармавання нацыі на адмену

прыгону ў «заходнім краі». Аднак характэрнай рысай «імперскага нацыяналізму» заставалася непаслядоўнасць, абумоўленая супярэчнасцямі паміж традыцыйнай імперскай ідэалогіяй і мадэрным нацыяналізмам. Варта адзначыць тэзіс пра адсутнасць адзінай палітыкі русіфікацыі на «заходніх ускраінах». Калегі з Расіі прыйшлі да высновы, што ў дачыненні да розных рэгіёнаў «заходніх ускраін» існавалі розныя варыянты гэтага курсу.

Але цяжка ўтрымацца і ад крытычных заўваг. Відавочна, што задачы, якія ставілі перад сабой рэдактары выдання, вырашаныя толькі часткова. Адказы на шмат якія з пастаўленых у «Прадмове» пытанняў маюць фрагментарны характар. Найбольш грунтоўна асвятляецца г. зв. польскае пытанне. Таксама разглядаецца ўкраінская праблематыка і закранаецца літоўская. Але пры гэтым даследчыкі недастаткова ўвагі надалі развіццю ўкраінскага і літоўскага нацыянальных рухаў, а беларускі рух не заўважылі нават на пачатку XX ст. Наагул, беларускаму сюжэту найменш пашанцавала. Фактычна, аўтары манаграфіі яго папросту праігнаравалі, як, дарэчы, і ўсю беларускую гістарыяграфію. Шмат падзей беларускай гісторыі асвятляецца «з падачы» польскіх або літоўскіх даследчыкаў, што абумовіла вялікую колькасць факталагічных памылак. Недаравальнай выглядае адсутнасць аналізу такіх важных для «заходніх ускраін» ідэалагічных феноменаў, як заходнерусізм і краёвасць. Праігнараваная этнакультурная адметнасць г. зв. літоўскіх палякаў ды інш.

Тэрміны «русіны» і «русінства» міжволі прымушаюць згадаць пра ўзніклыя яшчэ ў перыяд імперыі канцэпцыі заходнерусізму і маларасійства з характэрнымі для іх абвінавачаннямі палякаў і літоўцаў у расколе адзінага «рускага народу». У савецкі час гэтыя канцэпцыі адрадзіліся ў выглядзе тэорыі старажытнарускай народнасці. На жаль, аўтары не засяродзілі сваёй увагі на феномене «русінства». Між тым у гэтым выпадку «русінская» тэрміналогія набыла канцэптуальную вагу. Дарэчы, ніхто з аўтараў не растлумачыў, калі і якім чынам «русіны» ператварыліся ва ўкраінцаў і беларусаў, якія адразу ж па сваім з'яўленні распачалі нацыянальнае змаганне.

Тым не менш, зробленыя першыя крокі, каб пераадолець састарэлую канцэпыю, паводле якой «заходнія ўскраіны» разглядаліся пераважна як тэрыторыя польска-расійскага канфлікту. Але ці стануць яны паваротнымі для расійскай гістарыяграфіі? Думаю, што адказ на гэтае пытанне будзе залежаць не толькі ад расійскіх даследчыкаў, але і ад гісторыкаў Беларусі, Украіны і Літвы.

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2007/01/16

[image]

[image] [image] [image]

САЙМАН ФРАНКЛІН
прафэсар, загадчык катэдры славянскіх моваў прэстыжнага Клар-каледжу Кеморыдзкага ўнівэрсытэту. Апошняя публікацыя — «National Identity in Russian Culture: an Introduction» (Cambridge, 2004).

Сайман Франклін «Слова пра паход Ігараў» — Багемская рапсодыя?

Keenan, Edward L. *Josef Dobrovsky and the Origins of the Igor's Tale.* — Cambridge, MA: Harward University Press, 2003. — xxiii + 541 p.

«Слова пра паход Ігараў» — невялікі тэкст, які нарабіў шмат шуму. Да Пушкіна ніводны літаратурны твор не выклікаў такой плоймы навуковых і калянавуковых публікацый, не кажучы ўжо пра невычэрпную плынь аматарскіх разваг і проста бязглуздых домыслаў. А калі б падлічыць аб'ём аналітычнай літаратуры на слова зыходнага тэксту, «Слова» магло б пацягацца і з самім Аляксандрам Сяргеевічам. Нядаўна слынны русіст Эдвард Л. Кінан дадаў да сціжмы тэкстаў свой — больш як на пяцьсот старонак, — у якім высунуў і паспрабаваў абгрунтаваць новую гіпотэзу што да паходжання і аўтарства «Слова».

Спрэчкі наконт паходжання і аўтарства «Слова пра паход Ігараў» вядома, пачаліся не учора. Твор не падпісаны і не датаваны, чуткі віліся над ім з моманту яго першага апублікавання ў 1800 г. Для большасці «Слова» было і застаецца ананімным літаратурным шэдэўрам канца XII — пачатку XIII ст. Месцамі цяжкі для разумення, твор хутчэй за

1 Гл., напр.: Дмитриев Л. А. Автор «Слова» // Энциклопедия «Слова о полку Игореве». Т. 1. Санкт-Петербург: Дмитрий Булганин, 1995. С. 24—36.

2 Паводле версіі А. А. Зіміна і (умоўна) Андрэ Мазона: гл.: Кінанаў кароткі гістарычны агляд поглядаў «скептыкаў». С. 12—27.

3 Акчурин Ш. Х. А. И. Мусин-Пушкин — автор «Слова о полку Игореве» или

ўжо на пачатку XX ст. Ён пісаў пра Іпацьеўскі і Кірыла-Белазёрскі спісы «Слова» (Санкт-Пецярбург, 1907), Сафійскі і Пагодзінскі спісы «Слова» (Санкт-Пецярбург, 1907), Лаўрэнцьеўскі і Іпацьеўскі спісы «Слова» (Санкт-Пецярбург, 1908), Кірыла-Белазёрскі спіс «Слова» (Санкт-Пецярбург, 1908), Сафійскі і Пагодзінскі спісы «Слова» (Санкт-Пецярбург, 1909), Лаўрэнцьеўскі і Іпацьеўскі спісы «Слова» (Санкт-Пецярбург, 1909), Кірыла-Белазёрскі спіс «Слова» (Санкт-Пецярбург, 1909), Сафійскі і Пагодзінскі спісы «Слова» (Санкт-Пецярбург, 1910), Лаўрэнцьеўскі і Іпацьеўскі спісы «Слова» (Санкт-Пецярбург, 1910), Кірыла-Белазёрскі спіс «Слова» (Санкт-Пецярбург, 1910), Сафійскі і Пагодзінскі спісы «Слова» (Санкт-Пецярбург, 1911), Лаўрэнцьеўскі і Іпацьеўскі спісы «Слова» (Санкт-Пецярбург,

летапісаў». Нішто не сведчыць ані пра ягоны намер кагосьці падмануць, ані пра тое, каб выдаць свае пісанні за аўтэнтычныя старажытныя творы, ані нават пра жаданне іх друкаваць. Добраўскі проста практыкаваўся ў інтэлектуальнай мімікрыі, у яго не было задумы распаўсюдзіць падробку. Чэшскі навуковец даслаў напісанае — ці толькі яго частку — пісьменніку і прыдворнаму Івану Ялагіну. Пазней апошні скарыстаў вытрымку з першай часткі твора Добраўскага ў дадатку да рыхтаванага ім рукапісу працы са старажытнай гісторыі Расіі. У верасні 1793 г. Ялагін памёр, і ягоная цытата сталася першым захаваным сведчаннем існавання тэксту «Слова».

Па вяртанні дадому Добраўскі напісаў яшчэ некалькі фрагментаў, якія ён таксама даслаў у Расію, магчыма, таму ж Ялагіну. Пасля смерці апошняга ягоныя паперы перадалі ў збор ягонага сябра і апекуна Мусіна-Пушкіна, а ў 1797 г. перавезлі ў Маскву і даручылі архіварыусу Аляксею Маліноўскаму. Так пачалося «публічнае» жыццё «Слова». У кастрычніку 1797 г. Карамзін аб'явіў, што знайшоўся (два гады таму) невядомы сярэднявечны «спеў», і Маліноўскі пачаў перапісваць і перакладаць створаныя Добраўскім фрагменты, рыхтуючы іх да публікацыі. Калі даць веры Кінану, сапраўдным злачынцам выглядае Маліноўскі. Ён аб'яднаў разрозненыя кавалкі, напісаныя Добраўскім, каб склалася ўражанне суцэльнага твора. Маліноўскі мог і не ведаць, што фрагменты належаць Добраўскаму, але ён выдаў іх за старажытныя і — галоўнае ягонае злачынства — бессаромна прыдумаў крыніцу іх «сярэднявечнага» паходжання. «Яраслаўскі летапіс», у якім нібыта было змешчанае «Слова», ніколі не існаваў. І як жа зручна, што праз колькі дзесяцігоддзяў можна распаўсюдзіць праўдападобныя байкі пра ягонае трагічнае знікненне! Першапачатковыя сумневы адкінутыя, і «Слова» заняло сваё месца ў міфалогіі расійскага нацыянальнага генія. Замест таго, каб застацца цікавым прыкладам славянскага асіянізму, фальшыўка Маліноўскага (складзеная з твораў Добраўскага), атрымала сталую прапіску ў новым каноне.

Высновы Кінана грунтуюцца на трох тыпах доказаў: гістарычных, тэкстуальных і моўных.

Гістарычныя падставы для скептычнага стаўлення да «Слова» навідавоку. Мы не маем ані арыгінала твора, ані дакладных сведчанняў яго існавання. Няма таксама і надзейных доказаў таго, што рукапіс знік разам з некаторымі іншымі зборамі Мусіна-Пушкіна, як прынята сёння лічыць. У сувязі з гэтым Кінан усяляк падкрэслівае няшчырасць у адказах Мусіна-Пушкіна на пытанні маладога архіварыуса і антыквара Канстанціна Калайдовіча ў 1813—1814 гг. Час, калі было «знойдзенае» «Слова», прыпаў у Расіі на гады захаплення асіянскім дарамантызмам (так супала — а мо гэта і не проста супадзенне, — што пераклад псеўдасярэднявечных вершаў «Асіяна» на расійскую мову пабачыў свет у 1792 г.). Што да канкрэтных гістарычных акалічнасцяў, Кінан сцвярджае: Добраўскі — адзіны, хто адначасова меў доступ да ўсіх больш-менш значных рукапісаў і друкаваных выданняў, якія паўплывалі на ягоны твор, і філалагічныя веды і здольнасці, дастатковыя, каб скласці такога кшталту тэкст. Даследнік піша: «Не будзе перабольшаннем сцвярджаць, што да 1793 г. адзіны, хто мог напісаць «Слова», — Добраўскі». Тым самым Кінан вельмі сур'ёзна падвышае стаўкі. Калі проста прыняць гістарычныя аргументы і цверджанні на веру, час напісання тэксту (XVIII ст.) стаецца цалкам залежным ад аўтарства Добраўскага. Або Добраўскі, або ніхто. Калі аўтарства не належыць яму, «Слова» аўтаматычна вяртаецца ў Сярэднявечча.

Кінан звяртае ўвагу чытача на два тыпы тэкстуальных аргументаў. Не дзіва, што ў традыцыйнай спрэчцы: што было раней — «Слова» ці «Задоншчына», — Кінан аддае перавагу апошняй. Сам даследнік прызнае, што адны тэкстуальныя параўнанні нельга прымаць за кончыя доказы. Але нягледзячы на гэта Кінан намагаецца давесці, што калі прызнаць «Задоншчыну» даўнейшай за «Слова», можна раскрыць некаторыя асаблівасці пабудовы апошняга. Больш арыгінальна падыходзіць Кінан да аналізу «фрагментаў Маліноўскага» — кавалкаў «Слова», занатаваных у рукапісах Маліноўскага. Напрошваецца выснова, што гэтыя «фрагменты» — простыя цытаты, выпісаныя з тэксту, магчыма, для таго, каб іх пракаментаваць, таму яны не маюць вялікай каштоўнасці як тэкстуальныя доказы. Але Кінан прапануе зусім іншую інтэрпрэтацыю. Ён сцвярджае, што «фрагменты Маліноўскага»

— насамрэч *дадаткі* да тэксту, у пачатковай версіі іх не было. Добраўскі не пісаў іх у Расіі. На думку Кінана, «фрагменты» — гэта часткі, якія Добраўскі стварыў і даслаў у Расію па вяртанні дадому. А аб'яднанне розных тэкстаў — ужо справа рук Маліноўскага. Таму пры грунтоўным разглядзе «Слова» Кінан вылучае «фрагменты Маліноўскага» як асобны тэкст, адрозны ад «Слова».

Ладную частку кнігі Кінана займае мовазнаўчы каментар. Як і ў абсалютнай большасці твораў, прысвечаных «Слову», у лінгвістычнай частцы Кінанавай працы збольшага аналізуюцца асобныя словы, рэканструюецца і інтэрпрэтуецца лексіка твора, пры гэтым адносна мала ўвагі надаецца праблемам сінтаксісу. Тут аўтар прапануе два кардынальна новыя цверджанні. Па-першае, ён пастулюе, што процьму фрагментаў «Слова» прасцей зразумець з улікам асаблівасцяў чэшскай (у тым ліку старачэшскай) мовы. То бок аўтар мае на ўвазе, што ў творы адлюстраваны асабісты моўны досвед Ёзэфа Добраўскага. Паўсюль у «Слове» Кінан бачыць «багемізмы». Пераканаўчасць ягонай аргументацыі — не столькі ў даказанасці кожнай канкрэтнай інтэрпрэтацыі таго ці іншага фрагмента тэксту, а ў праўдападабенстве (ці няпраўдападабенстве) іх усіх разам узятых. Па-другое, Кінан прапануе літаральна некалькі новых прачытанняў асобных момантаў «Слова», якія, на ягоную думку, уяўляюць сабой моцныя — нават неабвержныя — доказы, што «Слова» не можа быць сярэднявечным тэкстам. Ён, у прыватнасці, надае аграмаднае значэнне новай інтэрпрэтацыі словаў з біблійнага іўрыту *урим* і *туммим* (датычна нагрудніка першасвятара: габрэйскае слова не магло быць вядомае ўсходнім славянам у Сярэднявеччы) і пераасэнсаванага італьянскага (праз старачэшскую) слова *altana* ў значэнні «маленькая вежа».

Такім чынам, падмурак Кінанавай тэорыі складаюць хутчэй лексічныя, чым гістарычныя аргументы. Менавіта ў гэтай сферы Кінан пераходзіць ад «магчыма» да «бясспрэчна», тут ён выказвае пэўнасць што да пазнейшага паходжання «Слова» і паўсюднай прысутнасці ў тэксце самога Добраўскага.

Апроч трох традыцыйных узроўняў аналізу тэксту, Кінан

заклікае перагледзець эстэтычныя вартасці «Слова», скінуць бярэмя двух стагоддзяў піетэту перад тэкстам як літаратурным шэдэўрам Сярэднявечча. Гэтая вера традыцыяналістаў, на думку Кінана, часткова грунтуецца на глыбокіх, але няслушных перакананнях што да крыніц і значэння стылю «Слова». У прыватнасці, на залішне наіўнай схільнасці прымаць лексічныя недарэчнасці за «паэзію». Кінан бачыць у «Слове» няшмат паэтычнага. Мастацкія якасці тэксту ён ацэньвае як «вельмі сціплыя», хоць і прызнае, што аўтар — «бліскучы вынаходца, майстар ствараць загадкі».

Але ні ў якім разе не паэт. Нашыя аблуды наконт «паэтычных» якасцяў «Слова» тлумачацца дзвюма памылкамі. Першай стаецца схільнасць бачыць паэтычнае ў незразумелым, лічыць па-мастацку геніяльнымі фразы, якія Кінан, наадварот, называе банальнай моўнай кантамінацыяй, што акурат і сведчыць пра асяродак і метады Добраўскага: «У «Слове» поўна агульнаславянізмаў, ужытых не да месца […] маладасведчанаму чытачу з завышанымі чаканнямі такія выразы пададуцца не «няслушнымі», а пранікнёнымі, нават у найвышэйшай ступені «паэтычнымі». Другая памылка карэніцца ў неразуменні характару самога Добраўскага. Кінан надае вялікае значэнне псіхічнай хваробе чэшскага навукоўца, якую ён вызначае як біпалярны разлад, або маніякальную дэпрэсію. Адсюль і мноства эпізодаў у «Слове», якія Кінану падаюцца «ірацыянальнымі»: «Усевалад, Рурык і Давід крыху апантаныя […], Баян… уводзіць сябе ў стан, падобны да шаманскага трансу… […] размовы Яраслаўны і Ігара з ракой падобныя да галюцынацыяў. Усяслаў перажывае слыхавыя галюцынацыі. На працягу ўсяго твора аўтар, героі, гарады, гарадскія ўмацаванні, птушкі, жывёлы, рэкі, кветкі, трава і дрэвы — наогул уся Русь вагаецца паміж хісткім шчасцем, экзальтацыяй і дэпрэсіяй». Атрымліваецца, што сама паэтыка «Слова» не мае нічога агульнага з вуснай мастацкай традыцыяй старажытнасці, не кажучы ўжо пра тагачаснае светаўспрыманне і вераванні: «Безумоўна, што паралель паміж тэкставымі рэаліямі і тым, што мы ведаем пра Добраўскага, не будзе ўсяго толькі плёнам нашай фантазіі».

Кінан ладзіць наступ на агульнапрынятае меркаваньне з двух

бакоў. Па-першае, ён звяртаецца да метадаў і крытэраў традыцыйнай навукі, якая вымагае, каб кожны доказ пераправяраўся і ўзважваўся, кожная гіпотэза праходзіла праз дробнае «сіта» сумневу і тэорыя будавалася «ад падмурка». Па-другое, ён прапануе цалкам іншы агульны погляд на «Слова», што дазваляе (прынамсі, Кінану) у шмат якіх выпадках не толькі дакладней чытаць тэкст, але і высунуць лепшую, значна больш верагодную тэорыю паходжання твора. Напрыканцы сваёй кнігі аўтар, натуральна, вітае (ці хаця б прадчувае) крытыку: «Толькі час і адкрытая навуковая дыскусія пакажуць, ці падаюцца мае высновы такімі ж пераканаўчымі іншым, як і мне самому».

Пачнем з дробных «зачэпак» і пакінем пакуль убаку асноўную парадыгму. Мы паслядоўна разгледзім асноўныя тыпы Кінанавых доказаў: гістарычныя, пасля тэкстуальныя і моўныя.

Гістарычныя аргументы самі сабой нельга ўважаць за пераканаўчыя. У іх зашмат няпэўнасцяў, каб пацвердзіць любую тэорыю. Гісторыя пра тое, як быў знойдзены і згублены рукапіс, месцамі не ўдае на праўду. Можа таксама падацца падазроным, што некаторыя дзейныя асобы ўхіляліся ад адказаў на пытанні або нават нешта хавалі. Тым не менш, «белыя плямы» ў гісторыі рукапісаў зусім не абавязкова сведчаць пра падман. Недакладнасці і нядбайнасць што да дэталяў былі характэрныя ў той час нават для твораў, аўтэнтычнасць якіх не ставіцца пад сумнеў. Гэты факт у пэўнай ступені раздражняе навукоўца, што прызвычаіўся да жорсткіх патрабаванняў, якім мусіць адпавядаць сучасны дослед. Напрыклад, выглядае вельмі дзіўна, што ані Аляксандр Шышкоў, ані Якаў Пажарскі, якія адпаведна ў 1805 г. і 1819 г. рыхтавалі выданні «Слова» з каментарамі, не выявілі аніякай цікаўнасці да рукапісу і задаволіліся друкаваным тэкстам, хаця Пажарскі, відаць, верыў, што арыгінал «Слова» ў той час яшчэ існаваў[5].

Кінан усведамляе, што прапанаваная ім альтэрнатыўная рэканструкцыя падзей не дае адказаў на праблемныя адмовы. Ён прызнае: дакументальных пацверджанняў аўтарства Добраўскага няма. Да таго ж, Кінан не можа ніяк перакрэсліць

[5] Гл. прадмову Якава Пажарскага

адзін гістарычны доказ *супраць* Добраўскага: апошні на працягу трыццаці гадоў у сваіх працах шмат цытуе і спасылаецца на «Слова». Добраўскі ніводнага разу не дае нават слабой намінкі на тое, што ставіць пад сумнеў аўтэнтычнасць старажытнага тэксту. Кінан мяркуе, што Добраўскі вырашыў не выдаваць падману Маліноўскага. Можна паверыць, што так яно і было, калі разглядаць толькі спасылкі на «Слова» ў друкаваных працах Добраўскага. Але як патлумачыць цытаванне «Слова» ў асабістых нататках, дзе няма патрэбы нікога ўводзіць у

Кінан абмінае ўвагай больш сур'ёзныя гістарычныя праблемы, тычацца важнейшай праблемы — існавання рукапісу Мусіна-Пушкіна. Кінан павінен ведаць, што Карамзін у сваёй «Гісторыі расійскай дзяржавы»[7] называе першакрыніцай менавіта рукапіс, хоць і без спасылкі на «Слова». Такім чынам, Карамзін або хлусіў сваім чытачам (у гэтым выпадку ён таксама быў у змове з Маліноўскім), або казаў праўду, і рукапіс Мусіна-

---

6 Тут, напэўна, і ляжыць прычына таго, што Добраўскі ніколі не друкаваў свае знаходкі ў Ягіна і Калайдовіча (гл. Добраўскі Ёзаф. Выбраныя тэксты. Мінск, 1986. С. 102–103).

7 Карамзин Н. М. История государства Российского. Т. 3. С. 258, 259, 260, 506 (прымечанні 341 і 342).

8 Зноскі тэксту і ілюстрацыі, якія ў арыгінале знаходзяцца ў канцы кнігі, у нашым выданні змешчаны ў адпаведных месцах тэксту.

9 Гэта, напэўна, і ёсць прычына таго, што Карамзін не ўключыў «Слова» ў свой зборнік старажытнарускіх твораў, апублікаваны ў 1821 г., першае выданне якога было канфіскавана цэнзурай, бо ў ім змяшчаліся вершы Пушкіна «Вальнасць» і «Кінжал».

10 Гл. Чейшвили Г. Н. Из истории русской литературы XVIII века. Тбилиси, 1981. С. 165–167.

11 Адзіны выпадак, калі Карамзін цытуе «Слова» не праз, а непасрэдна, — гэта цытата з «Слова» ў 2-м томе «Гісторыі», якая ўзята з «Кіеўскага летапісца» (Карамзин Н. М. История государства Российского. Т. 2. С. 172, прымечанне 278). Гэта, напэўна, і ёсць прычына таго, што Карамзін не ўключыў «Слова» ў свой зборнік старажытнарускіх твораў, апублікаваны ў 1821 г., першае выданне якога было канфіскавана цэнзурай, бо ў ім змяшчаліся вершы Пушкіна «Вальнасць» і «Кінжал».

Унёсак Кінана ў тэкстуальныя дыскусіі пачалову палягае ў сумарным эфекце яго спробаў давесці, што больш лагічна і страхаву ў яе артыкуле «A New Look on the Origin of the Igor' Tale: A Backward Step» у: Palaeoslavica. № 12 (2). 2004. Р. 204–258.

(«змешчана ў: Козлов В. П. Кружок А. И. Мусина-Пушкина и «Слово о полку Игореве». Новые страницы древнерусской

Слова
Ігаравым
Іпатаўскага
Сказання
Маманава
Петербург:
В
Типографии
Департамента
Народного
Просвещения,
1819. С. 5.

пэўна ў 18 ст. Падтрымаць гэтую фразеалогію, такім чынам, сінадальны спіс «Задоншчыны» 1646 года, які ўтрымлівае ўсе «фрагменты» Маліноўскага, акрамя «Ярославны плача», і ў якім адсутнічае «Слова» (Зализняк А. А. «Слово о полку Игореве»: Взгляд лингвиста. Москва: Языки русской культуры, 2004. С. 263—323).

Абодва цвярджэнні Кінана слабыя. Можна нагадзіцца, што «Слова» месцамі больш падобнае да шэрагу знітаваных фрагментаў, чым да звязнага тэксту. Але высновы, што цягне за сабой гэтая версія, не на карысць галоўнага аргумента Кінана пра «фрагменты Маліноўскага». Ну і што з таго, што «фрагменты» можна лёгка прыбраць, і ў тэксце не застанецца відавочных прабелаў? Паколькі «Слова» ўвогуле «фрагментарнае», гэтак жа проста можна выдаліць з тэксту і *іншыя* ўрыўкі або камбінацыі ўрыўкаў. Таму сучасным крытыкам даспадобы гульні з усялякімі перастаноўкамі і дадаткамі. Што да крыніц, пераканаўча давесці падабенства «фрагментаў Маліноўскага» да пэўнага спісу «Задоншчыны» (як тое патрэбна Кінану) немагчыма[10]. Больш за тое, калі разглядаць «фрагменты» разам з кароткімі заўвагамі самога Маліноўскага (на якія Кінан не звяртае ўвагі), складаецца моцнае ўражанне, што самая простая іх інтэрпрэтацыя — да расчаравання аўтараў тэорыі змовы — адначасова і самая верагодная. Усё проста — «фрагменты» *ўзятыя* Маліноўскім *з* тэксту для каментавання і аналізу, а не *дададзеныя да* яго.

Найвялікшую частку кнігі Кінана займае падрабязны, амаль парадковы лінгвістычны аналіз тэксту «Слова». У нашым крытычным аглядзе твора Кінана мы можам разгледзець толькі мізэрную частку ўсіх ягоных прапаноў і гіпотэзаў. Магчыма, тое несправядліва, але я засяроджу сваю ўвагу на момантах, якія лічу найбольш спрэчнымі, хаця і мушу заўважыць, што для агульнай тэорыі Кінана самі сабою маюць асноўнае значэньне толькі лічаныя ягоныя мовазнаўчыя здагадкі.

Не трэба даводзіць, што «Слова» — тэкст складаны. Ніхто не можа сцвярджаць, што дакладна ведае сэнс кожнага ягонага слова, а новыя спробы праліць святло на незразумелыя моманты толькі вітаюцца. Кінан старанна вышуквае ў «Слове»

---

146 заўвага 24; гл. таксама Зализняк А. А. «Слово о полку Игореве»: Взгляд лингвиста. Москва: Языки русской культуры, 2004. С. 169 заўвага 245.

10 Гл. дадатак Кінана: Kinan, Victor. A New Book… Падрабязны аналіз гэтай дыскусіі дадзены ў Kinan, Victor. The Lay of Igor: Translation, Analysis, Commentary. Cambridge, MA: Harvard University Press, 2013. P. 3—7.

11 Падрабязны аналіз гэтай дыскусіі дадзены ў Kinan, Victor. The Lay of Igor: Translation, Analysis, Commentary. Cambridge, MA: Harvard University Press, 2013. P. 3—7.

«багемізмы». Я не «багеміст» і не мовазнаўца, таму я не вазьмуся ацэньваць вартасць выключна мовазнаўчых высноў аўтара[11]. Тым не менш, у мяне выклікаюць пытанні некаторыя аспекты метадалогіі Кінана.

Перш за ўсё, ён абірае для лексічнага параўнання несувымерныя корпусы тэкстаў. Кінан заяўляе, што «прыдатным» пры разглядзе нібыта раннеўсходнеславянскай моўнай прыроды «Слова» можна лічыць вельмі абмежаванае кола тэкстаў. Ён не ўключае сюды фальклорных твораў; неахвотна прымае «прынесеныя» царкоўнаславянскія тэксты і пераклады. Даследнік прытрымліваецца «строгага падыходу», згодна з якім «сапраўды прыдатнымі для супастаўлення лічацца толькі аўтэнтычныя «рускія» тэксты», а іх сапраўды няшмат. А вось «багемізмы» Кінан чамусьці шукае ў значна шырэйшым корпусе: у старачэшскай мове, сучаснай чэшскай, літаратурнай і гутарковай чэшскай. На першы погляд, Кінанавы падставы для жорсткага адбору «супастаўных» крыніц проста бездакорныя: даводзіць старажытнасць твора пры дапамозе пазнейшых крыніц нельга, а вось аўтара пазнейшага часу (у прыватнасці, Добраўскага) можна з поўным правам змясціць у шырэйшы лінгвістычны кантэкст. Такі метад, тым не менш, не на карысць мэтам доследу. Калі поле доследу асіметрычнае, яго вынікі амаль непазбежна будуць гэтаксама асіметрычныя. Такім чынам, яны ў большай ступені будуць адлюстроўваць параметры эксперыменту, чым ягоны аб'ект. Кінан няслушна вызначае мэту — або, прынамсі, адну з мэтаў — пашырэння «прыдатных» для аналізу крыніц. Рэч не ў тым, каб абавязкова давесці сярэднявечнае паходжанне «Слова», а ў тым, каб знайсці пераканаўчыя тлумачэнні яго моўных асаблівасцяў. Менавіта таму цалкам абгрунтавана — нават неабходна — будзе прызнаць «прыдатнымі» крыніцы, што выходзяць за межы непасрэднага кантэксту, у якім магло стварацца «Слова». Безумоўна, што ў гэтым выпадку мэта менш канкрэтная, чым давесці сярэднявечнае паходжанне тэксту, але і сам Кінан робіць акурат тое ж, калі прыводзіць дзеля параўнання чэшскія крыніцы. У інтарэсах падманнай навуковай чысціні Кінан хібіць, яшчэ не пачаўшы выкладаць свае доказы.

Па-другое (што, пэўна, менш значна), безумоўная арыгінальнасць мыслення заводзіць Кінана так далёка, што ён даволі некрытычна падыходзіць да сваіх гіпотэз. Так, некаторыя з ягоных «багемізмаў» насамрэч уяўляюць вельмі цікавыя магчымыя тлумачэнні загадак «Слова». Але залішняя схільнасць прыдумляць новыя прачытанні і бачыць «багемізмы» там, дзе іх няма, толькі псуе станоўчы эфект. Напрыклад, Кінану не падабаецца, што пальцы Баяна, як сокал, «даганялі» (*дотечяше*) струны ягонага інструмента, бо «гэта не мае сэнсу (як могуць пальцы гусляра «даганяць» струны?)». Адсюль ён робіць выснову, што на месцы *дотечяше* мусіць быць форма, вытворная ад *dot''katisia/dot''knutisia* , «якія ў чэшскай і старачэшскай… выкарыстоўваюцца ва ўсіх значэннях «дакранацца» […] Відавочна, што *дотечяше* — яшчэ адзін багемізм». «Відавочна»? Выпраўленне, магчыма, і можна вытлумачыць як «багемізм». Але навошта наагул нешта выпраўляць? Шаноўны спадар Кінан, у тэксце вядзецца не пра пальцы, што «даганяюць» струну, а пра сокалаў, якія даганялі лебедзяў. Навукоўцу Кінану могуць быць недаспадобы «паэтычныя» звароты, але ў межах гэтай метафары ягонае выпраўленне не проста непатрэбнае, а нават недарэчнае і згубнае. Можна спрачацца, ці пасуе слова *дотечяше* да сокала, але каб сцвярджаць, што гэта «відавочны багемізм» патрэбныя нашмат больш грунтоўныя доказы. Такія катэгарычныя цверджанні пры спрэчнай аргументацыі мы знаходзім у працы Кінана досыць часта[12].

Па-трэцяе, большасць прапанаваных Кінанам новых прачытанняў зыходзіць з прыпушчэння, што аўтар слова — Добраўскі, а не сведчыць, што ён мог ім быць. У выніку — мноства непатрэбных, а часам недарэчных інтэрпрэтацыяў. Так, Кінан мяркуе, што слова *красный* датычна Рамана Сцяпанавіча ўжытае ў іранічным сэнсе, таму што, па-першае, аснова *красн-* «у пісьмовай рускай мове *ніколі* не ўжываецца для апісання мужчынскай прыгажосці» і, па-другое, Добраўскі ведаў з летапісаў, што Раман не быў героем. Але спасылкі на «пісьмовую рускую» недарэчныя, бо ў гэтым значэнні слова шырока ўжывалася ў царкоўна- і ўсходнеславянскай мовах. Яскравы прыклад таму — «Сказанне пра Барыса і Глебкі з «Успенскага зборніка», якое, бясспрэчна, адпавядае нават

[12] Параўн., напрыклад, Кіпуп — ягоныя простыя цверджанні. Так, датычна Сцяпанавіча ўжытае *красн-* (с. 178) з дакасцямі, даследаванымі Кірылам Александравічам Мабкімовічам.

самым жорсткім крытэрам «прыдатнасці»[13]. Што тычыцца другога аргумента, як можна быць упэўненым у тым, што аўтар мусіць падзяляць нашыя маральныя ацэнкі пэўнага дзеяння ў пэўным летапісе? Думка, што аўтар ужывае слова *крыянін* іранічным сэнсе, лінгвістычна нічым не падмацаваная і бессэнсоўная.

Мы прапанавалі, што аўтар ужывае слова *крыянін* у сэнсе, які ён мог мець у старажытнарускай мове: Ст[аро]сл[авянский] къмет, др[евне]рус[ский] кмѣть / Russian Linguistics. № 28 (1). 2004. С. 109–123.

Іншы прыклад: Кінану недаспадобы вялікае значэнне, якое надаецца рацэ Нямізе, і ён робіць выснову, што Добраўскі «вырашыў увекавечыць» рачулку, якую ўбачыў па дарозе ў Прагу праз Менск. Іншае, разгорнутае і больш вераломнае, тлумачэнне мы знаходзім у летапісах: хто б ні напісаў «Слова», Добраўскі або сярэднявечны пясняр з паўднёвай Русі, велічыня ракі — дробязь у параўнанні з яе сімвалічным значэннем як частка драматычнай гісторыі князя Ўсяслава Полацкага. Ізноў

[13] Успенский Б. А. Из истории русского литературного языка XVII–начала XIX в. Язык Радищева. Москва: Наука, 1971. С. 58.

Нарэшце, крыху пра «габраізмы» і «багемізм», што пайшоў з італьянскай мовы часу Рэнесансу.

Згадаем, што Кінан бачыць габрэйскае біблійнае слова *урим* у фразе *Уримъ* [часта замяняецца на *У Римъ*] *крычать* ; габрэйскі дублет *урим* і *туммим* (скарочана *ур-тм*) у загадкавым слове *орьтъмами* і змяняе фразу *Стреляеши… салътаны* на *Стреляеши… съ алътаны* (то бок з altán[a], што па-чэску значыць, таксама як і ў італьянскім арыгінале, «маленькая вежа»). Новыя прачытанні падаюцца Кінану звышважнымі. Зноў і зноў ён падкрэслівае іхную праўдзівасць і значнасць як сведчанняў пазнейшага за сярэднявечнае паходжання тэксту: «Я лічу гэтае прачытанне бясспрэчным і вельмі важным у некалькіх аспектах», «урывак сведчыць пра тое, што «Слова» не можа быць сярэднявечным славянскім тэкстам». Праз габраізмы «проста немагчыма датаваць тэкст XII ст.», «даказанае ўжыванне архітэктурнага тэрміну часу італьянскага Рэнесансу *altana* ставіць пад вялікі сумнеў узнікненне тэксту раней за канец XVI ст.», «зыходзячы з этымалогіі *уримъ* і *altana* , «Слова» было напісанае пасля «Задоншчыны».

Ці можна будаваць нагэтулькі далёкасяжныя высновы, абапіраючыся на два-тры словы? Наўрад ці. Я не маю на мэце

сцвердзіць няслушнасць Кінана, а толькі не разумею, якім чынам ён можа пераканаўча давесці сваю рацыю. Што мы насамрэч маем? Пару нестандартных здагадак: першая (*altana*) семантычна выглядае прывабна, другая (*урим* і г. д.) — больш спрэчная. Добра. Гіпотэзы такога кшталту вітаюцца. Але яны — толькі гіпотэзы, ніводная з якіх не падтрымліваецца нічым іншым, апроч асабістага адчування што да іхнай верагоднасці або неверагоднасці. Метадалагічна, калі казаць пра крытэр даказанасці, Кінан не паказвае, чым яго версіі адрозніваюцца ад соцень іншых спробаў патлумачыць незразумелыя месцы «Слова» праз аналогію з сугучнымі словамі іншых моваў. Насамрэч, метадалагічна яны ненашмат лепшыя за спробы візантыйскага гісторыка Льва Дыякана вывесці назву Русь (Русь) ад біблейскай Росі (Рошы), дзе ўладарылі, паводле Кнігі прарока Езекіля, Гог і Магог[14].

Кінан прадбачыць багата крытыкі на свой адрас і робіць некалькі папераджальных захадаў. З аднаго боку, ён спасылаецца на «прэцэдэнт» — крытыкуе тых, хто ў XX ст. выступіў з абвяржэннем «скептыка» Зіміна, працы якога збольшага засталася ненадрукаванай[15]. З іншага — адчуць, што большасць «вернікаў» не можа мець аб’ектыўнага погляду, бо яны не здольныя пазбавіцца ад друзу заганных аблудаў. Калі на карту пастаўлена вельмі шмат, калі ідзе пра вартасць усёй папярэдняй навуковай кар’еры, тады, адзінкі, на думку Кінана, здольныя, як апостал Павел, Кнігай навярнуцца ў новую веру. І тут Кінан мае рацыю. Але пераканаўчы закліку праявіць разуменне і адкінуць забабоны неда канца ён, каб абвергнуць крытыку.

Раздзьмуваннем высноў са сваёй тэорыі Кінан не дасягае большай пераканаўчасці. Нават калі мы пагодзімся з ягоным

[14] Цыт. па: Deacon. History of the Kings of Rus. Leiden, 2012. P. 1.

[15] Дэнер «Слова», шаноўнае спадарства, ніколі не існаваў, што сведчыць і ягоная кар’ера. Дамінуючая постсавецкая гістарыяграфія «Слова» — гэта ідэалагічны канструкт часоў Сталіна. Яго стварылі, каб даказаць, што Ігаравы паходы — гэта «агрэсія» супраць «мірных» плямёнаў, а Ігар — «крывавы тыран». Дакладнасць «Слова» ў перадачы падзей, імёнаў, назваў, геаграфіі і г. д. пацвярджаецца шматлікімі крыніцамі, якія з’явіліся пасля 1951 г. (публікацыі спісаў з новых археаграфічных экспедыцый, археалагічныя раскопкі і г. д.). Гл. Лихачев Д. С. Литературная деятельность древней Руси (X–XVII вв.). Ленинград, 1947. С. 385–422; Сперанский М. Н. Слово о полку Игореве и народная поэзия // Труды Отдела древнерусской литературы. № 6. 1948. С. 3–22; Сперанский М. Н. Слово о полку Игореве и народная поэзия // Труды Отдела древнерусской литературы. № 8. 1951. С. 3–22; Сперанский М. Н. Слово о полку Игореве и народная поэзия // Труды Отдела древнерусской литературы. № 9. 1953. С. 3–22; Сперанский М. Н. Слово о полку Игореве и народная поэзия // Труды Отдела древнерусской литературы. № 10. 1954. С. 3–22; Сперанский М. Н. Слово о полку Игореве и народная поэзия // Труды Отдела древнерусской литературы. № 11. 1955. С. 3–22; Сперанский М. Н. Слово о полку Игореве и народная поэзия // Труды Отдела древнерусской литературы. №

перакананы, што Кінан знайшоў разгадку тайны «Слова». Але ён да гэтага звыклы.

Я папярэдзіў, што збольшага буду займацца дробнымі зачэпкамі, але кнігу Кінана можна аналізаваць і з іншых пазіцый. Аўтар адданы сваёй ідэі, ён абараняе высунутую ім тэорыю з навуковай жарсцю і інтэлектуальнай энергіяй. Шмат у чым праца сапраўды ўражвае. Можна не пагаджацца з агульнымі пастулатамі або асобнымі заўвагамі Кінана, але неабходна прызнаць, што ў працы шмат каштоўнага. Першыя раздзелы цікавыя як бліскучыя ўводзіны ў гісторыю «Слова» і расповед пра асоб, што мелі дачыненне да ягонага існавання на раннім этапе. Амаль парадковы мовазнаўчы каментар — самы поўны на сённяшні дзень на англійскай мове, а заўвагі і ідэі Кінана нярэдка стаюцца карыснымі і даюць штуршок думцы самога чытача. Больш за тое, з майго боку несправядліва падкрэсліваць толькі слабыя месцы доследу. Кінан не можа давесці і не даводзіць сваю слушнасць, але яму і не трэба гэтага рабіць. Ён не абавязаны сцвердзіць бездакорнасць сваёй гіпотэзы — толькі паказаць, што яна больш праўдападобная за ўсе астатнія, што напісанне «Слова» Добраўскім у XVIII ст. больш верагоднае — або менш абсурднае, — чым любым аўтарам XII ст. Яго пераканаўчасць залежыць ад сумарнага эфекту ўсіх яго інтэрпрэтацый тэксту ўзятых разам, а не ад значнасці кожнай з іх паасобку. Думаю, мала хто з навукоўцаў будзе перакананы, што Кінан знайшоў разгадку тайны «Слова». Але ён да гэтага звыклы.

Пераклаў з англійскай Алесь Мартынаў паводле:
Kritika: Explorations in Russian and Eurasian History.
Vol. 6. No. 4. Fall 2005
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/01/22
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 11 (51) - 2006**

[image]

[image]

[image]

крытыка [image]-[image]2006
"да Зьмітук"
аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • гісторыя • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

Хью Л. Агн’ю Ёзэф Добраўскі: звышкрытык-асветнік або фальсіфікатар-перадрамантык?

ХЬЮ Л. АГН’Ю
прафэсар гісторыі і міжнародных дачыненьняў унівэрсытэту Джорджа Вашынгтона. У сфэру ягоных навуковых інтарэсаў уваходзяць дасьледаваньне сымбаляў і рытуалаў чэскага нацыяналізму XIX ст. Апошняя публікацыя — кніга «The Czechs and the Lands of the Bohemian Crown» (Hoover Institution

---

У сваёй працы «Ёзэф Добраўскі і паходжанне «Слова пра паход Ігараў» Эдвард Кінан прапануе, безумоўна, правакацыйны адказ на спрэчнае пытанне пра сапраўднасць і паходжанне гэтага літаратурнага помніка, нагэтулькі значнага для сучаснай расійскай культуры. Аўтар сцвярджае, што твор насамрэч — падробка, да якой спрычыніўся напрыканцы XVIII ст. найвыбітнейшы славянскі мысляр таго часу, патрыярх багемістыкі Ёзэф Добраўскі. Імя асобы, якой Кінан прыпісвае аўтарства, выклікае шок, асабліва ў даследнікаў чэскай гісторыі і культуры. Для іх Добраўскі — узор крытычнага навукоўцы эпохі Асьветніц тва, які скіраваў свой магутны інтэлектуальны патэнцыял на дослед гісторыі Багеміі, чэшскай мовы і літаратуры, істотна паспрыяў з’яўленню сучаснай чэшскай літаратурнай мовы і, між іншым, фактычна заснаваў новую дысцыпліну — параўнальнае славянскае мовазнаўства. Падобныя пачуцці выклікаў бы высока інтэлектуальны і лагічны доказ, што Чарльз Дарвін стварыў міф пра пілт даўн скага чалавека. Чаму ж цверджанне, што «Слова пра паход Ігараў» належыць Добраўскаму, выклікае такую рэакцыю? Адказ вынікае з той ролі ў гісторыі чэшскага нацыянальнага

адраджэння, якую прыпісваюць гэтаму чалавеку. Press, 2004).

Чэшскі гісторык Міраслаў Грох высунуў вельмі трапную тыпалогію сучасных нацыянальных рухаў «малых народаў» Еўропы, у тым ліку і чэхаў. Ён мяркуе, што «абуджэнне» нацыі, як правіла, праходзіць за тры этапы. На першым патрыятычная дзейнасць абмяжоўваецца навуковымі доследамі. Вядуцца яны адносна невялікай групай інтэлектуалаў, якія вывучаюць гісторыю, мову і літаратуру сваёй нацыі, што толькі нараджаецца. Гэтыя інтэлектуалы могуць выяўляць моцную эмацыйную повязь з нацыянальнай супольнасцю, але іх інтарэсы перадусім звязаныя з даследаваннем і захаваннем мінуўшчыны, яны зусім не абавязкова маюць веру ў «адраджэнне» нацыі. На другім этапе ўжо большая, але ўсё яшчэ колькасна абмежаваная група палкіх патрыётаў, распрацаваўшы нацыянальную ідэалогію, праводзяць агітацыю ад імя нацыі і дзеля яе захавання і будучага развіцця. Трэцяя стадыя характарызуецца паўстаннем масавага нацыянальнага руху, які мае палітычныя мэты[1]. На першы этап чэшскага адра джэння збольшага наклала адбітак асветніцтва, на другі паўплываў рамантызм. Калі чэшскі нацыянальны рух увайшоў у трэцюю фазу, панавала своеасаблівае для Цэнтральнай Еўропы спалучэнне рамантызму і лібералізму. Творчасць Ёзэфа Добраўскага (1753—1829) захапіла і першы, і другі перыяды чэшскага адраджэння, але яго навуковыя метады і светапогляд практычна заўсёды атаясамліваюцца з першым. Палеміку Добраўскага з маладзейшымі патрыётамі, якой адзначаныя (або азмрочаныя) пазнейшыя гады яго жыцця, звычайна, як мінімум часткова, спісваюць на «канф лікт пакаленняў», розніцу ў светапоглядах чалавека эпохі Асветніцтва і патрыётаў-летуценнікаў перыяду рамантызму. У якасці самага яскравага прыкладу такога разыходжання Кінан прыводзіць ролю Добраўскага ў палеміцы, што разгарнулася вакол сапраўднасці літаратурных «помнікаў», дарагіх сэрцу ягоных сучаснікаў, асабліва Кралавадворскага і Зеленагорскага рукапісаў (названыя паводле мясцовасцяў, дзе яны нібыта былі знойдзеныя, адпаведна, у 1817 і 1818 гг.).

Кралавадворскі і Зеленагорскі рука пісы — самыя знакамітыя з шэрагу фрагментаў старажытна чэшскага ліра эпасу, «знойдзеных» сярод іншых вучнем Добраўскага Вацлавам

[1] Тэорыя Гроха, выдадзеная па чэшску і па нямецку на пачатку 1960-х гг., палагульненая па-англійску ў Hroch, Miroslav, Social

Гэтыя
замацаванню шмат якіх
Добраўскім прыкладна ў
Добраўскага, якія
Добраўскага, якія
Добраўскага, якія

праца Йозефа Добраўскага «ўважліва і крытычна» разглядаецца ў Ватыкане. «Ар. 179, 180. Макферсаніяда?»[4].

Пачатковы дух самога Добраўскага, падкапаны фактычна ягонай правесці, руковы аналіз тэксту. Адпаведны фокус Добраўскаму не было ройным з часу, калі ён разглядзеў фрагмент Евангелля паводле Марка са збору Карла IV, напісаны як мяркавалася самім святым і знойдзены ў 1818 г. Добраўскі пісаў сваёй сяброўцы Крыстыне (Варвары) Рантару, нагляднику імперскай бібліятэкі ў Вене: «Я не хачу нічога дадаваць са *Stavics*, што прыйшло ў галаву Вам пра Рацію». Гл.: Der Briefwechsel zwischen Dobrowsky und Kopitar 1808—1828 / Ed. Vatroslav Jagić. Berlin: Weidemann, 1885. S. 188. Граф Лутвіг Узрыў Запатаваў у сваім дзённіку, што Добраўскі з незвычайным задавальненнем згадваў сваё падарожжа у Расію. Дзённік часткова змешчаны у: Ondřej J. O stopách Dobrovského v deníku hraběte Eugena Černína z Chudenic // Bratislava. № 3. 1929. S. 868—891, асабліва запіс за 30 чэрвеня 1810 г.

Добраўскі з незвычайным задавальненнем згадваў сваё падарожжа у Расію. Дзённік часткова змешчаны у: Ondřej J. O stopách Dobrovského v deníku hraběte Eugena Černína z Chudenic // Bratislava. № 3. 1929. S. 868—891, асабліва запіс за 30 чэрвеня 1810 г.

Добраўскі з незвычайным задавальненнем згадваў сваё падарожжа у Расію. Дзённік часткова змешчаны у: Ondřej J. O stopách Dobrovského v deníku hraběte Eugena Černína z Chudenic // Bratislava. № 3. 1929. S. 868—891, асабліва запіс за 30 чэрвеня 1810 г.

[12] Ella Agnew. Hugh Lacaine. Origins of the Czech National Renascence. — Ар. 179, 180.

[13] Dobrovský, Josef. Litterarische Nachrichten von einer auf Veranlassung der Böhm. Gesellschaft der Wissenschaften im Jahre 1792 unternommen Reise nach Schweden und Russland. Nebst einer Vergleichung der Russischen und Böhmischen Sprache. Prag: Calve, 1796. S. 1—5.

[4] Keenan, Edward L. Josef Dobrovsky and the Origins of the Igor' Tale. Harvard University Press, 2003. P. 104—105. Адзінкавы 1818 г. Добраўскі пісаў сяброўцы Крыстыне (Варвары) Рантару, нагляднику імперскай бібліятэкі ў Вене: «Я не хачу нічога дадаваць са *Stavics*, што прыйшло ў галаву Вам пра Рацію». Гл.: Der Briefwechsel zwischen Dobrowsky und Kopitar 1808—1828 / Ed. Vatroslav Jagić. Berlin: Weidemann, 1885. S. 188. Граф Лутвіг Узрыў Запатаваў у сваім дзённіку, што Добраўскі з незвычайным задавальненнем згадваў сваё падарожжа у Расію. Дзённік часткова змешчаны у: Ondřej J. O stopách Dobrovského v deníku hraběte Eugena Černína z Chudenic // Bratislava. № 3. 1929. S. 868—891, асабліва запіс за 30 чэрвеня 1810 г.

Пазней, жывучы ў Празе, Добраўскі працаваў над цэлым шэрагам артыкулаў для часопіса Навуковага таварыства, аб'яднаных пытаннем, як адасобіць факты ад прыдумак у старажытных легендах, якія часцяком былі адзінай крыніцай старадаўняй гісторыі Чэхіі. Пры ягоным жыцці пабачылі свет тры такія доследы, дзе разглядаліся паданні пра хрышчэнне Баржывоя, пра Людмілу і Драгаміру, пра Вацлава і Баляслава. Чацвёрты артыкул, прысвечаны легендзе пра святога Пракопа, застаўся ненадрукаваны[6]. Добраўскі акрэсліў свой метадалагічны прынцып як «нічога не прымаць на веру без дастатковых доказаў і заўсёды звяртацца да найстаражытнейшай крыніцы»[7]. Гэтымі і іншымі сваімі гістарычнымі працамі Добраўскі зрабіў значны ўнёсак у прызнанне і распаўсюд крытычных, пазітывісцкіх метадаў гістарычнага даследавання.

Сфера навуковых зацікаўленняў Добраўскага не абмяжоўвалася гісторыяй. Ён займаўся гісторыяй літаратуры і сучасным яе

станам, пачынаючы з кароткатэрміновых і ўрэшце беспаспяховых спробаў выдаваць літаратурны часопіс Чэхіі, які ён заснаваў у 1779 г. (праз год пасля з'яўлення ягонага доследу фрагментаў Евангелля паводле Марка). Добраўскі надрукаваў *Böhmische Literatur auf das Jahr 1779* («Літаратура Чэхіі ў 1779 г.»), затым *Böhmische und Mährische Literatur auf das Jahr 1780* («Літаратура Чэхіі і Маравіі ў 1780 г.»), і скончылася ўсё на *Litterarisches Magazin von Böhmen und Mähren* («Літаратурны часопіс Чэхіі і Маравіі, у трох тамах») (1785—1787). У «Літаратурным часопісе» Добраўскі абяцаў рабіць агляды сучаснай чэшскай і мараўскай літаратуры «як яна ёсць»[8]. Яго цікавіла самае шырокое кола пытанняў, але Добраўскі заўсёды з асаблівай лю боўю друкаваў апісанні старачэшскіх кніг і рукапісаў, што змяшчаліся ў бібліятэчных фондах Чэхіі і Маравіі. Калі друкавалася апошняе выданне, «Літаратурны часопіс», Добраўскі ўключаў у яго матэрыялы з гістарыяграфіі, археалогіі, граматыкі чэшскай мовы і славянскай этна графіі. Ягоная прапанова скласці поўны каталог чэшскіх рукапісаў, створаных да з'яўленьня кнігадруку, ажыццявілася толькі часткова: *Litterarisches Magazin* за 1786 г. надрукаваў каталог чэшскіх рукапісных Біблій. Але нават частковае здзяйсненне ягонай задумы яскрава адлюстроўвае погляды Добраўскага на гісторыю і веру ў тое, што праз аналіз і інтэрпрэтаванне тэкстаў можна прыйсці да «слушнага» разумення гісторыі, у т. л. і гісторыі літаратуры[9]. Акрамя спробы выдаваць літаратурны часопіс, Добраўскі напісаў некалькі артыкулаў з гісторыі літаратуры для часопіса Навуковага таварыства. У ім таксама з'явілася першая версія яго манументальнай працы «Гісторыя чэшскай мовы і літаратуры». І тут ён не адыходзіў ад крытычнага, пазітывісцкага метадалагічнага падыходу[10].

Паралельна з гістарычнымі і літаратурнымі доследамі Добраўскі зрабіў унёсак у сучасную літаратурную чэшскую мову сваімі працамі з граматыкі і прасодыі, а часам і сваёй з'едлівай крытыкай апанентаў. Добраўскі дапамагаў свайму старэйшаму калегу Францішку Марціну Пэлцлу (1734—1801) рыхтаваць граматыку чэшскай мовы, чаго вымагала яго пасада першага прафесара чэшскай мовы і літаратуры ў Пражскім універсітэце. Ён браў удзел ва ўкладанні або рэцэнзаваў чэшскія слоўнікі Карала Гінэка Тама (1763—1816), Антаніна

Яраслава Пухмаера (1769—1820), Францішка Яна Томзы (1751—1814) і інш. Пасля доўгіх гадоў працы ў 1809 г. ён нарэшце апублікаваў сваю кнігу *Ausführliches Lehrgebäude der Böhmischen Sprache* («Падрабязнае апісанне чэшскай мовы»). І вось іронія лёсу: Добраўскі зрабіў унёсак у фармаванне сучаснай літаратурнай чэшскай мовы, нягледзячы на свой часам моцны скептыцызм што да рэальнасці яе з'яўлення. У рэцэнзіі на палкую «абарону мовы» Тама Добраўскі зацеміў, што гэта не проста абарона мовы, а палымяны заклік актыўней бараніць і развіваць чэшскую мову. «Пытанне, ці дасягнем мы калі-небудзь узроўню нашых продкаў, — прадракаў ён, — ці нават здолеем узняцца да таго, што тут зафіксавана, не па трабуе адказу»[11]. Зрэшты, Добраўскі часам адкідаў свой скептыцызм. Так было, напрыклад, калі ў 1791 г. аўстрыйскі імператар Леапольд II, каранаваўшыся ў Празе на караля Чэхіі, наведаў пася джэнне Навуковага таварыства. Звярнуцца да манарха з прамовай выпала Добраўскаму, і, адкінуўшы першапачатковую ідэю засяродзіцца на чыста філалагічных пытаннях і прасіць у Леапольда грошай на ўкладанне вялікага славянскага слоўніка, навукоўца казаў пра вя лікую ролю славянскіх падданых у імперыі Габсбургаў.

У сваёй прамове *Über die Ergebenheit und Anhänglichkeit der Slawischen Völker an das Erzhaus Österreich* («Пра паслушэнства і адданасць славянскіх народаў каралеўскаму дому Аўстрыі») Добраўскі зазначыў, што сярод падданых Габсбургаў пераважаюць менавіта славяне, адцеміў іхную веліч як народу (прыводзячы Расійскую імперыю як прыклад таго, што славяне здольныя падпарадкаваць сабе вялізную тэрыторыю і кіраваць ёю) і ўнёсак у вайсковую моц Аўстрыі. Напрыканцы спавешчання Добраўскі меркаваў заклікаць Леапольда II «бараніць чэшскі народ і неацэнную яго спадчыну, атрыманую ад продкаў, — матчыну мову — ад жорсткіх захадаў і прыхаванага ціску», якія б толькі шкодзілі інтарэсам дзяржавы. Умяшальніцтва найвышэйшага бургграфа Ротэнхана вымусіла Добраўскага выкінуць са сваёй прамовы апошні абзац, але нецэнзураваны нямецкі арыгінал і чэшскі пераклад тэксту, які, паводле словаў Добраўскага, «вельмі ўзрадаваў нашых славянска-чэшскіх па трыётаў», неўзабаве надрукавалі пражскія газеты[12].

Наведванне імператарам Чэшскага таварыства навук мела іншае значнае наступства, непасрэдна звязанае з цэнтральным тэзісам Кінана: у якасці развітальнага падарунка Леапольд пакінуў таварыству 6000 гульдэнаў на пад трыманне яго дзейнасці. Было прынятае рашэнне за гэтыя грошы паслаць Добраўскага і яшчэ аднаго сябра таварыства, графа Іяхіма фон Штэрнбэрга, у Швецыю і Расію. Штэрнбэрг меў вывучаць стан натуральных навук у Расіі, а Добраўскі мусіў шукаць у шведскіх і расійскіх бібліятэках старачэшскія кнігі, якія маглі трапіць туды пасля разрабавання шведамі Прагі падчас трыццацігадовай вайны, а таксама даследаваць матэрыялы з славянскай літаратуры[13]. Такім чынам, калі Добраўскі ўжо меў рэпутацыю найвыбітнейшага абаронцы крытычнага гістарычнага метаду і меў найбагацейшыя веды з параўнальнага славянскага мовазнаўства, у яго з'явілася магчымасць правесці блізу чатырох з паловай месяцаў у Расіі ў 1792—1793 гг. Як заўважае Кінан, цяжка знайсці больш удалы час, бо ў 1791 г. Кацярына II загадала, каб манастыры перадалі ўсе рукапісы, звязаныя са старажытнай гісторыяй і культурай Расіі, у бібліятэку Акадэміі навук ці Святога Сінода. Яны апынуліся там прыкладна за год да прыезду Добраўскага. З неверагодным задавальненнем перапрацоўваў даследчык горы матэрыялаў па стараславянскай мове і літаратуры і рупліва рабіў мноства запісаў, з якіх ён будзе карыстаць усё астатняе жыццё[14].

Паездка Добраўскага ў Расію, разам з веданнем Добраўскім гісторыі першых славянскіх перакладаў Бібліі, дасведчанасцю ў біблійнай крытыцы і іншых га лінах славянскай лінгвістыкі, набывае асаблівую значнасць для Кінана ў святле цверджання, што Добраўскі — не толькі адзіны, «хто дастаткова добра ведаў міфалогію славянаў і Русі і гісторыю, каб стварыць такі (як «Слова пра паход Ігараў») тэкст», але і «без перабольшвання, да 1793 г. Добраўскі — адзіны, хто *быў здольны* напісаць «Слова» і, безумоўна, адзіны, хто мог яго прачытаць». У адным са шматлікіх сваіх амаль дэтэктыўных літаратурна-філалагічных пасажаў Кінан даводзіць, што Добраўскі не толькі ведаў крыніцы, якія, на думку сучасных навукоўцаў, маюць дачыненне да тэксту «Слова», але і рабіў выпіскі з рукапісаў, звязаных з рэдкімі лексічнымі адзінкамі, ужытымі ў «Слове».

Прачытаўшы першыя тры раздзелы, чытач будзе гатовы пагадзіцца, што Кінан, выключна на аснове ўскосных доказаў, пераканаўча давёў: Добраўскі меў здольнасці і магчымасць стварыць «Слова».

Але гэта не азначае, што Кінан давёў, нібы Добраўскі *сапраўды напісаў* «Слова». Спрабуючы даказаць аўтарства Добраўскага, Кінан прысвячае чацвёрты, найвялікшы, раздзел свайго доследу па драбязнаму, амаль парадковаму, аналізу «Слова пра паход Ігараў». Яго мэта — даследаваць усе неадназначныя і незразумелыя месцы ў тэксце, рэдкія словы і *hapax legomena* (словы або фразы, зафіксаваныя толькі аднойчы), якімі перасыпаны тэкст, каб паглядзець: дадае гіпотэза пра аўтарства Добраўскага да іхнага разумення ці, наадварот, ускладняе яго або нічога кардынальна не змяняе. Атрымліваецца ў Кінана гэта элегантна, і — калі не заглыбляцца ў дэталі лексічнага каментара, які займае ажно 237 старонак, — трэба прызнаць, што пераканаўча. Ён прапаноўвае каля трыццаці тэкставых удакладненняў, якія дазваляюць прымальна вытлумачыць сэнс незразумелых частак. Тут ён падае, магчыма, самы значны свой аргумент на карысць аўтарства Добраўскага: доўгі спіс лексічных, граматычных і фразеалагічных багемізмаў. Пры гэтым «ладная частка вядомых *hapax legomena* перастае імі быць, калі іх разглядаць у звязку з чэшскім і старачэшскім матэрыялам; мноства ўрыўкаў можна прачытваць толькі праз прызму чэшскай інфармацыі; шмат якія спасылкі на чэшскую дапамагаюць лепш зразумець тэкст, праліваючы святло на розніцу паміж славянскімі, рускімі і чэшскімі эквівалентамі або дэманструючы любоў аўтара да полісеміі». У якасці дадатковых доказаў Кінан прыводзіць акадэмічныя гэбраізмы, безумоўна, вядомыя Добраўскаму; пераканаўчыя аргументы на карысць таго, што прапанаваная гіпотэза выяўляе і тлумачыць стасункі паміж «Словам» і «Задоншчынай», і пацверджанні, што Добраўскі да следаваў шэраг іншых тэкстаў, лексіка якіх вельмі падобная да лексікі «Слова».

Выкладзеныя доказы Кінанавай гіпотэзы агулам дастатковыя, хаця б згодна з крытэрам ляза Окама, каб сцвярджаць, што на сённяшні дзень яна самая пераканаўчая з наяўных. Тым не менш, найбольш загадкавае і цікавае пытанне застаецца

нявырашанае. Кінан паспяхова давёў, што Добраўскі быў здольны напісаць «Слова», што ў яго была такая магчымасць. Праз аналіз тэксту ён сцвердзіў таксама, што ягоная гіпотэза, магчыма, тлумачыць больш спрэчных момантаў тэксту, чым іншыя. Але дзе матывацыя? Як з трывалым вобразам Ёзэфа Добраўскага — ідэала Асветніцтва, рацыянальнага, крытычнага (нават звышкрытычнага) навукоўцы — стасуецца прыпушчэнне, што ён здзейсніў дзёрзкі «літаратурны падман» (як ён сам ахарактарызаваў Зеленагорскі рукапіс у сваёй рэцэнзіі да аднаго з яго нямецкіх перакладаў)?[15] Кінан прысвяціў большую частку пятага і заключнага раздзела тлумачэнню некаторых момантаў, звязаных з матывацыяй. Глава распачынаецца дзвюма важнымі папярэднімі заўвагамі. Першая з іх у тым, што «Добраўскі не «падрабляў» найкаштоўнейшай рэ ліквіі «рускай» літаратурнай мінуўшчыны; уяўленне пра «Слова» як пра велічны культурны помнік стварыла далейшая расійская інтэлектуальная гісторыя». Калі Кінан мае рацыю, Добраўскі ўсяго толькі напісаў колькі кавалкаў дзеля пераймання стылю «Задоншчыны», іншых тэкстаў, якія нядаўна бачыў у Расіі, і ўжо вядомых яму гераічных славянскіх летапісаў. Кінан сцвярджае, што падобныя «знаходкі» старажытных твораў былі ў той час з'явай далёка не рэдкай, ім не надавалі вялікага значэння. Галоўнае — «аднавіць «дух» нацыі або мінуўшчыны». Да агульнага настрою эпохі Асіянізму можна дадаць асаблівы стан чэшскіх патрыётаў у Чэхіі, купкі інтэлектуалаў (сярод іх было багата вучняў Добраўскага — магчыма, яны паўплывалі на настаўніка?), якія пачыналі распрацоўваць праект нацыі, што існавала, так бы мовіць, як «міф»[16].

Сэнс другой папярэдняй заўвагі ў тым, што пры любым разглядзе матываў Добраўскага мы мусім браць пад увагу характар гісторыю яго псіхічнай хваробы. Прыблізна з трыццаці чатырох гадоў асветнік пакутаваў на перыядычныя, часам цяжкія прыступы бінаярнага псіхічнага разладу, што адбівалася на ягоных паводзінах і творчасці. Сябры намагаліся ўратаваць Добраўскага ад найгоршых наступстваў ягоных часам нерацыянальных паводзін і не зважалі на недарэчныя выказванні ў ягоных лістах. Так, славацкі пратэстант Юрай Рыбай заўважыў яму, што «я б ахвотней... пачытаў што-небудзь

[15] Агляд Добраўскага, пад назвай «Literarischer Betrug», з'явіўся ў: Hormayr. Archiv für Geschichte, Statistik, Literatur und Kunst. 15, a 46, 1824, S. 260. Перадрукавана ў: Dobrovský, Josef. Literární a prozodická bohemika / Ed. Miroslav Herman. Praha: Academia, 1974, S. 152—153.

[16] Гл. змястоўную частку «Ideálnost Hra Mystifikace» у: Macura, Vladimír. Znamení zrodu: České obrození jako kulturní typ. Vyd. 2. Jinoncany: H&H, 1995, S. 102—117.

[17] Рыбай — Добраўскаму, 21 студзеня 1796 г., у:

Korespondence Josefa Dobrovského, díl 4: Vzájemné listy Josefa Dobrovského a Jana Nepomuka Leopolda Haye z let 1783–1816 / Ed. Adolf Patera. Praha: Česká akademie císaře Františka Josefa pro vědy, slovesnost a umění, 1913. S. 262–263.

17 Hadernia Cichorius (1735–1802) — польскі філолаг, прафесар Віленскага ўніверсітэта, сябра Віленскага таварыства сяброў навук.

18 Agnew, Hugh LeCaine. Origins of the Czech National Renascence. Pittsburgh: University of Pittsburgh Press, 1993. P. 218–219.

19 Кінан, Э. Ідэй… С. 221–224; Kienast, Edmund. Josef Dobrowsky… S. 108a–108, 424–425.

20 Jevons, Stanley. Dobrovsky // Encyclopaedia Britannica. 11th ed. Vol. 8. New York: Encyclopaedia Britannica Co., 1910. P. 485–486.

21 Antwort auf die Frage, wo Aufsätze böhmischer Art zu finden sind // Archiv für Geschichte, Statistik, Literatur und Kunst. 1824. Nr. 79. S. 485–486; Dobrovský, Josef. Literární dopisy. Praha: Melantrich, 1955. S. 154–155.

22 Dobrowsky, Joseph. Ueber Beiträge zur Kenntniss der böhmischen Literatur // Archiv für Geschichte, Statistik, Literatur und Kunst. 1827. Nr. 37. S. 145–148; Dobrovský, Josef. Literární dopisy. S. 167–169.

23 Pranaitis, Andrew. Prasnicki, Hyacinth Dobrowsky, and Slavic Views of Writing // Eighteenth-Century Bohemia: Images of the Land, Its History, and Its Nation / Ed. Howard Louthan, Jiří Kroupa, Gary B. Cohen. Leiden: Brill, 2006. P. 93–107; Lass, Andrew. Romantic Discourse and the Politics of Tradition: Dobrovsky's Legacy // Harvard Ukrainian Studies. 1987. Vol. 11. No. 1/2. P. 28–47; Kann, Edward. Dobrowsky as Historian // Journal of Central European Affairs. 1951. Vol. 11. No. 3. P. 271–279; Kann, Edward. Dobrowsky as Ethnologist // Journal of Central European Affairs. 1948. Vol. 8. No. 3. P. 271–279.

Для Кінана і Агнью — Кеканэн, Эдмунд і Дабравольскі — Добраўскі прарочыў пра будучыню славянскіх моў і літаратур, а Ёнс — Ёнс, Стэнлі — Ёнс, Стэнлі — Ёнс, Стэнлі

адказу застаецца пытанне, чаму аўтар (пры ўмове, што ён пазнаў напісанае), маўчаў пра сваё дачыненне да тэксту і дазволіў, каб міжнародныя навуковыя колы лічылі яго сапраўдным. Кінан таксама дапушчае, што вучань Добраўскага Ганка ведаў пра «шкілет у шафе» «патрыярха славістыкі» і спадзяваўся, што той, са зразумелых прычын, не бу дзе надта зацята выкрываць ягоныя рамантычныя падробкі. У гэтай сувязі цікава, што Ганка прысвяціў выдадзенае ім у 1821 г. «Слова» менавіта Ёзэфу Добраўскаму![20]

Сам Добраўскі згадваў «Слова» ў адказе на заўвагу наконт рэцэнзіі на «Суд Лібушы». У кантэксце, які адназначна сведчыць, што Добраўскі верыў у сапраўднасць «Слова», ён адкрыта называе «Суд Лібушы» «літаратурнай падробкай». Добраўскі сцвярджаў, што той, хто падрабіў «Суд Лібушы», добра ведаў «Слова пра паход Ігараў», іншыя рускія крыніцы і выдатна засвоіў старачэшскі правапіс і мову паводле кнігі самога Добраўскага *Geschichte der Böhmischen Sprache*, так што «не складала завялікай цяжкасці напісаць 120 вершаў, на выгляд досыць старадаўніх, быццам іх склаў летапісец Лібушы». Адмаўляючы закіды ў непатрыятычнасці і горача пераконваючы чытачоў, што, хоць ён нарадзіўся і не ў Чэхіі, але тут узгадоўваўся і заўсёды падзяляў «нацыянальны гонар» Чэхіі, асабліва ў сферы яе літаратуры, Добраўскі пытаўся: «Ці будзе закрануты чэшскі нацыянальны гонар, калі мы адрозніваем сапраўдны твор ад падробкі?» Добраўскі сцвярджаў, што рукапіс — ніякі не каштоўны помнік IX—X стст., і яго ў найлепшым разе можна назваць «небеспаспяховай спробай імітаваць мову часоў Лібушы»[21]. Добраўскі зноў звяртаецца да «Слова» ў іншай рэцэнзіі на *Geschichte der slawischen Sprache und Literatur* (1826) Паўла Ёзэфа Шафарыка (напісанае для таго ж часопіса) і ў каментары да Зеленагорскага рукапісу[22].

Як бы ні тлумачылася загадкавае маўчанне Добраўскага датычна «Слова» і яго палеміка з Ганкам і іншымі што да Кралавадворскага і Зеленагорскага рукапісаў, ужо цяпер відавочная пэўная іронія лёсу: Кінан зрабіў тую самую працу, да якой заклікаў Добраўскі датычна «знойдзеных» старачэшскіх рукапісаў. Да таго ж, Кінан ужывае метады, якімі заўсёды

карыстаўся сам Добраўскі, пачынаючы з доследу фрагмента Евангелля паводле Марка. Тыя самыя гістарычныя і філалагічныя веды, якія гэтак эфектыўна выкарыстоўваў Добраўскі і якімі скарысталіся аўтары «падману» з Кралава дворскім і Зеленагорскім рукапісамі, каб стварыць пераканаўчыя фізічныя «арыгіналы» знаходак, цяпер павернутыя супраць самога Добраўскага. Парадаксальна, але і Добраўскі, і Кінан маюць агульную са стваральнікамі Кралавадворскага і Зеленагорскага рукапісаў і выдаўцамі «Слова» рысу: веру, што тэкст захоўвае мінуўшчыну, якой без яго ніяк няма. Хоць апошнія шукалі зусім не той мінуўшчыны, што Кінан і Добраўскі, але гэта не змяняе іх агульнага стаўлення да дакумента як да пісьмовай рэліквіі[23]. Высновы Кінана змяняюць гучанне «Слова» — з Русі XII ст. ён пераносіць нас у Багемію і Расію канца XVIII ст. Яны, магчыма, выклікаюць навуковыя спрэчкі, як тое было з ягонай апошняй працай наконт ліставання цара Івана Жахлівага з князем Андрэем Курбскім. Здаецца, што Добраўскі, які ў шмат якіх праблемах працягла палемізаваў з іншымі даследнікамі, з асалодай далучыўся б і да гэтага абмеркавання[24]. Застаецца толькі загадкай, на чыім баку.

[image]

[image]

№ 11 (51) - 2006

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2007/01/27**

[image]

ПАВЕЛ УСАЎ
палітоляг, сталы аўтар «ARCHE».

Павел Усаў Вялікія прэтэнзіі малой дзяржавы Адраджэнне Вялікай Літвы: міф ці новая геапалітычная рэчаіснасць?

Дарма што амаль уся Еўропа ўяўляе сабой адзіную палітычную і эканамічную прастору, тым не менш, яна не з’яўляецца суцэльным геапалітычным арганізмам, які б меў адзінае бачанне кірункаў вонкавай палітыкі і акрэсленыя геапалітычныя прыярытэты. З гэтай прычыны ў нібыта агульным Еўрапейскім Саюзе існуе некалькі геапалітычных цэнтраў, якія імкнуцца праводзіць адносна самастойную вонкавую палітыку, асабліва ў дачыненні той часткі Усходняй Еўропы, якая ляжыць па-за межамі ЕС.

За апошні час у межах ЕС дакладна акрэсліліся тры геапалітычныя цэнтры, чые інтарэсы засяроджаныя на Беларусі, Украіне, Малдове і Расіі. Гэтымі гульцамі ёсць Германія, Польшча і Літва. Калі памкненні Германіі і Польшчы падаюцца зразумелымі, то з’яўленне Літвы як самастойнага геапалітычнага суб’екта са сваёй асабістай вонкавапалітычнай дактрынай падаецца дзіўным і незразумелым. Тым не менш,

Літва — вельмі актыўны геапалітычны суб'ект, які імкнецца, прынамсі, зацвердзіць сябе як асноўнага геапалітычнага гульца ў рэгіёне і стараецца ўплываць на палітычныя працэсы, што адбываюцца ў суседніх дзяржавах. Ускосна пра гэта сведчаць абвінавачанні з боку афіцыйнага Менска на адрас Літвы, што апошняя падтрымлівае беларускую апазіцыю і тым самым умешваецца ва ўнутранныя справы незалежнай дзяржавы, а таксама тое, што менавіта на тэрыторыі Літвы адбываюцца важныя сустрэчы прадстаўнікоў беларускай апазіцыі з еўрапейскімі і амерыканскімі палітыкамі.

Геапалітычную актыўнасць Літвы можна вытлумачыць наступнымі прычынамі. Перш за ўсе, гэта зніжэнне геапалітычнай зацікаўленасці і актыўнасці Заходняй Еўропы ў дачыненні ўсходне-еўрапейскіх дзяржаў, якія не ўвайшлі ў ЕС, тым самым іх перадача ў сферу геапалітычнага ўплыву Расіі. Па-другое, сама Літва, хаця і імкнецца да добрасуседскіх стасункаў з Расіяй, адчувае ўсё большую ейную прысутнасць у рэгіёне, а значыць і пагрозу для сваіх геапалітычных памкненняў і інтарэсаў. Па-трэцяе, нязменным застаецца інтарэс і прысутнасць ЗША, для якіх Літва і іншыя балтыйскія краіны ёсць важкімі геапалітычнымі сатэлітамі як у дачыненні да Расіі, так і да Еўрасаюза. Чацвертае, у літоўскіх палітычных і грамадзкіх колах застаецца настальгія па «залатым веку» Літвы.

Даючы геапалітычную ацэнку Літве, можна казаць, што яна ператварылася з геапалітычнага аб'екта ў геапалітычнага медыятара з пэўнай геапалітычнай аўтаноміяй. Гэта азначае, што Літва хаця і з'яўляецца незалежнай краінай, тым не менш, з прычыны слабога гаспадарчага, сацыяльнага і тэрытарыяльнага патэнцыялу, не можа быць паўнавартасным геапалітычным суб'ектам, гэта значыць праводзіць цалкам незалежную ад іншых дзяржаў вонкавую палітыку. Але ў інфармацыйны век, калі геапалітыка пераходзіць з узроўню тэрытарыяльнага захопу на ўзровень прасторавай прысутнасці і геапалітычнага ўплыву, значна павялічваецца роля дзяржаў-медыятараў, якія выконваюць наступныя функцыі:

1. Рэпрэзентуюць інтарэсы рэальных геапалітычных гульцоў.

2. Павялічваюць прастору і магчымасьці ўплыву на тэрыторыі патэнцыйнага ворага.

3. Аддаляюць магчымасці варожага ўплыву на ўласныя тэрыторыі.

У большасці выпадкаў дзяржавы-медыятары становяцца своеасаблівай буфернай зонай, але ўключыўшыся ў такую геапалітычную гульню, яны могуць пашырыць асабістыя інтарэсы і прысутнасць у зоне ўплыву.

Літоўскі істэблішмэнт, абапіраючыся на вонкавую палітыку ЗША і крытыкуючы ЕС, тым самым імкнецца выпрацаваць і рэалізаваць сваю асабістую геапалітычную дактрыну. «Літва намагаецца прымусіць ЕС і НАТО праводзіць палітыку «адкрытых дзвярэй» у дачыненні да ўсходніх суседзяў. Справа ў тым, што большасць старых сяброў ЕС бачаць перспектывы развіцця ЕС у іншым святле, чым гэта бачыцца Літве і іншым новым сябрам»[1].

Да 2004 г. геапалітычныя прыярытэты Літвы акрэслівалі як Найбольш важнымі, праз якія Літва можа рэалізаваць сябе як геапалітычны суб'ект, з'яўляюцца наступныя: 1. Узмацненне Паўночна-Балтыйскага супрацоўніцтва, з мажлівасцю ўтварэння больш зынтэграванага Балтыйскага рэгіёна. 2. Спрыянне інтэграцыі Калінінградскай вобласці з Еўропай. 3. Актыўная падтрымка Беларусі ў ейных памкненнях да дэмакратычнай і незалежнай еўрапейскай краінай. 4. Падтрымка рэформаў ва Украіне і ейных крокаў у дачыненні да ЕС.

Выпрацоўваючы і рэалізуючы ўласную геапалітычную канцэпцыю, Літва прэтэндуе не толькі на ролю звычайнага актара ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне, але жадае выйсці на ўзровень рэгіянальнага лідэра. Неабходнасць гэтага падкрэсліваюць як палітыкі (у рэзалюцыі Літоўскага парламенту ад 1 мая 2004 г. гаворыцца, што Літва павінна стаць рэгіянальным цэнтрам і мець уплыў на палітыку ЕС у дачыненні да суседзяў), так і літоўскія навукоўцы: «Найбольш важным элементам новай палітыкі Літвы ёсць памкненне стаць «цэнтрам рэгіянальнага прыцягнення», рэгіянальным лідэрам»,

1. Nekrašas, Evaldas. Lithuanian Foreign Policy Concepts, Achievements and Problems // Lithuanian Foreign Policy Review. 2004. № 1—2. P. 34.

альбо, кажучы простымі словамі, «рэгіянальным цэнтрам»[2].

Спецыфіка геапалітычнай сітуацыі ў рэгіёне спрыяе таму, каб Літва магла замацавацца як суб'ект уплыву на суседнія краіны. Больш за тое, праз сваю актыўную палітыку яна таксама імкнецца калі не паменшыць, дык прынамсі стварыць альтэрнатыву геапалітычнаму ўплыву ў рэгіёне з боку Польшчы, якая на працягу апошніх гадоў праводзіла вельмі актыўную палітыку датычна суседніх дзяржаў, у тым ліку і самой Літвы.

Геапалітычным арэалам сваіх непасрэдных інтарэсаў Літва лічыць Беларусь, Украіну, Калінінград і часткова Малдову. Разам з тым, Літва павінна лічыцца з інтарэсамі Польшчы і іншых балтыйскіх краін. Але літоўскія геапалітычныя планы выглядаюць больш канкрэтнымі, чым планы Латвіі і Эстоніі. Як заўважыў літоўскі палітоляг К. Паўлаўскас: «Літва мае больш шырокую рэгіянальную праграму працы і адыгрывае больш актыўную ролю ва ўсходне-суседскай палітыцы, чым Латвія і Эстонія… Латвія падзяляе літоўскія інтарэсы што да будучыні Беларусі і намагаецца дапамагаць Украіне і Паўднёваму Каўказу. Эстонія менш зацікаўленая ў Калінінградзе і Беларусі, але праяўляе свой інтарэс да Украіны і Паўднёвага Каўказу»[3].

Разглядаючы геапалітычную функцыянальнасць Літвы ў рэгіёне, спынімся на сціслым аналізе асобных кірункаў з пункту гледжання перспектыў і пагроз.

1. Расія — геапалітычна пагрозлівы і бесперспектыўны кірунак. Дарма што Літва, уступіўшы ў ЕС і НАТО, пазбавілася непасрэднай пагрозы з боку Расіі, яна, тым не менш, успрымае Расію як патэнцыйнага ворага, які так ці інакш імкнецца аказваць уплыў на рэгіён. Больш за тое, у вонкавай палітыцы Расіі ўсё ясней прасочваюцца рэвізіянісцкія тэндэнцыі, асноўны матыў якіх — адраджэнне «Вялікай Расіі».

Літва не ў стане самастойна супрацьстаяць геапалітычнаму монстру, а таксама аказваць нейкі ўплыў на палітычныя працэсы ў Расіі. У гэтым выпадку Літва выступае не толькі як медыятар геапалітычных інтарэсаў ЗША, але, разам з іншымі балтыйскімі дзяржавамі, уключаная ў глабальную

[2] Nekrašas, Evaldas. Lithuanian Foreign Policy… P. 31—33.

[3] Paulauskas, Kazutis. The Baltic States: picking region, shedding myths, decoding acronyms // Lithuanian Foreign Policy Review. 2005. № 1—2. P. 54.

таласакратычную сістэму, якая супрацьстаіць тэлуракратычнай[4].

Прыбалтыйскія дзяржавы ствараюць бар'ер і з'яўляюцца аванпостам марскіх дзяржаў супраць кантынентальных. Літва выконвае ролю эксперта па Усходняй Еўропе і Паўночнай Расіі (аванпост у распаўсюджанні ўплываў ЗША), які ў любым канфлікце можа стаць важнай перашкодай для рэімперыялізацыі Расіі. Рэалізацыя памкненняў ЗША ва ўзмацненні трансатлантычнага супрацоўніцтва (стварэнне трансатлантычнай зоны свабоднага гандлю, трансатлантычнага вышэйшага савета і гэтак далей) дала б магчымасць Літве спадзявацца на атрыманне палітычных і эканамічных выгад[5].

[4] Адна з традыцыйных ідэй *Літвы* — *геапалітычнай* (таласакратычнай і сухапутнай (тэлуракратычнай), якія вядуць паміж сабою бясконцую барацьбу. ЗША з'яўляецца тыповай марской дзяржавай, Расея — сухапутнай.

2. Калінінград — праблемны і непрадказальны кірунак, але зона мажлівага ўплыву. Гэта частка Расіі атрымала назву «шэрай зоны», тэрыторыі, якая з'яўляецца геапалітычна нестабільнай. Дарма што Калінінград — гэта суб'ект Расійскай Федэрацыі, ён знаходзіцца ў спрыяльнай для геапалітычнага ўплыву зоне і разглядаецца як геаграфічная і гістарычная частка Еўропы. Зразумела, што адарваць гэтую тэрыторыю ад Расіі проста немагчыма, прынамсі ў найбліжшы час, аднак яна можна стварыць на ёй такія гаспадарчыя і палітычныя ўмовы, пры якіх Калінінград больш наблізіцца да еўрапейскай цывілізацыі.

3. Украіна — найбольш спрыяльны кірунак для ўплываў і супраць Украіна — гэта тэрыторыя, якая на сённяшні дзень адчувае на сабе моцны геапалітычны ўплыў з боку Усходу і Захаду. Нягледзячы на перамогу Памаранчавай рэвалюцыі ў 2004 г. і змену ўлады, Украіна пакуль не ў стане цалкам выйсці з-пад геапалітычнага ўплыву Расіі. Гэтаму спрыяе і неакрэсленая пазіцыя ЕС у дачыненні да Украіны. Краіны ЕС «не разумеюць геапалітычнай важнасці Украіны і як заўсёды азіраюцца на мажлівую рэакцыю з боку Расіі ў адказ на ініцыятывы ЕС у гэтай краіне… І, прынамсі псіхалагічна, разглядаюць Украіну як частку Расіі»[6].

Зусім іначай на праблему геапалітычнага становішча Украіны глядзіць Літва. З аднаго боку, геапалітычныя памкненні ў гэтым кірунку ёсць працягам палітыкі ЗША ў адрозненні

[5] Lopata, Raimundas. Nortautas Statkus Empires, the World Order and Small States // Lithuanian Foreign Policy Review. 2005. № 1—2. P. 57.

[6] Ukrainas, Latvijas, Lietuvas Eksperti.

Украіны ад геапалітычнай сферы Расіі. З другога боку, супраца Літвы і Украіны можа значна ўзмацніць палітычныя пазіцыі Літвы ў НАТО і ЕС і ў рэгіёне.

Іншымі словамі, для Літвы незалежная і праеўрапейская Украіна з’яўляецца элементам стабільнай сістэмы бяспекі ў рэгіёне.

4. Беларусь — геапалітычна нестабільная і патэнцыйна агрэсіўная зона. З аднаго боку, Беларусь стварае для Літвы стратэгічную праблему, бо яна з’яўляецца элементам геапалітычнага абшару Расіі. З другога боку, Беларусь — гэта аб’ект для непасрэднага геапалітычнага ўплыву Літвы, які з цягам часу можа стаць больш перспектыўным, бо ў выпадку палітычных перамен Літва адразу становіцца геапалітычным апірышчам і важным саюзнікам для Беларусі і новай палітычнай эліты.

Вядома, што геапалітычныя прыярытэты Беларусі цалкам залежаць ад цяперашніх інтарэсаў лукашэнкаўскага рэжыму. Перамены на палітычнай сцэне Беларусі маюць прывесці да перамен у геапалітычнай сітуацыі. Таму першая мэта, якую ставіць перад сабою Літва, — гэта дэмакратызацыя Беларусі. Другой мэтай з’яўляецца памяншэнне геапалітычнага ўздзеяння Расіі, трэцяй — уцягненне Беларусі ў сферу непасрэднага еўрапейскага ўплыву.

Такім чынам, актыўная пазіцыя ў рэгіёне — пэўная палітычная карысць і дывідэнды для Літвы:

1. Літва разглядаецца іншымі дзяржавамі рэгіёну, якія не ўваходзяць у ЕС, як саюзнік і пасярэднік у перамовах з Захадам, што павялічвае ейную палітычную значнасць.

2. Канцэнтрацыя ў Літве матэрыяльных рэсурсаў, неабходных для падтрымання працэсаў дэмакратызацыі ў рэгіёне.

3. Перспектывы стварэння асобнай геапалітычнай групы ў рамках балтыйска-чарнаморскай рэгіянальная супрацы, дзе Літва будзе займаць галоўную пазіцыю.

Сярод літоўскіх інтэлектуалаў існуюць і больш амбітныя вонкавапалітычныя тэорыі. Размова ідзе аб намаганнях папулізаваць ідэю адраджэння новай Літоўскай імперыі. «Мы павінны стварыць самадастатковую імперыю і пашыраць ейны ўплыў. Былыя тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага акрэсліваюць ейныя натуральныя межы, — піша адзін з вядомых літоўскіх гісторыкаў Гінтарас Бераснявічус, — неабходна, каб ЗША і Расія рухнулі. Тады адзінай рэальнай моцай застанецца Еўропа, і мы будзем адной з тых сілаў, якія будуць кантраляваць Еўропу»[7].

Такія сцверджанні выклікаюць крытыку і вядомы скепсіс, бо ў Літвы для іхнай рэалізацыі не хапае матэрыяльных рэсурсаў. Тым не менш, геапалітычныя абшары «новай імперыі» супадаюць з вонкавапалітычнымі кірункамі, якія Літва акрэсліла для сябе як прыярытэтныя: Беларусь, Украіна і часткова Малдова. Акрамя гэтага, яны адгрываюць практычную ролю ў пабудове геапалітычнай канцэпцыі самой Літвы і яе самаакрэслення ў геапалітычнай прасторы свету. Палітолаг Альвідас Нікжэнтайціс сцвярджае:

Літва намагаецца замацавацца на пазіцыях рэгіянальнай дзяржавы, і яе вонкавая палітыка ўсё больш набывае рысы імперскай палітыкі. Вось чаму, абмяркоўваючы сённяшнюю вонкавую палітыку, будзе справядлівым вярнуцца ў мінуўшчыну, да часу «імперскай» Літвы[8].

Літоўскі істэблішмент разглядае ВКЛ як літоўскую дзяржаву і лічыць сённяшнюю Літву пераемніцай геапалітычных традыцый ВКЛ. Таму сучасная літоўская геапалітыка мае канкрэтныя ідэалагічныя падмуркі, якія:

а) паказваюць і тлумачаць абгрунтаванасць геапалітычнай актыўнасці Літвы ў рэгіёне, бо тэрыторыі, у дачыненні да якіх рэалізуецца актыўная вонкавая палітыка, былі часткай літоўскай дзяржавы;

б) ствараюць каштоўнаснае абгрунтаванне геапалітычным амбіцыям Літвы, дзякуючы чаму становіцца зразумелая ейная гістарычная і палітычная місія. Гэтая місія заключаецца ў геапалітычнай інтэграцыі зямель ВКЛ;

[7] Lipcata, Raimundas. Nortautas Statkus Empires… P. 16.

[8] Nikžentaitis, Alvydas. The «Imperial» Diplomacy of Lithuania // Lithuanian Foreign Policy Review. 2005. № 1—2. P. 41.

в) спрыяюць выцясненню іншых геапалітычных гульцоў, якія б маглі прэтэндаваць на ролю палітычнага цэнтру такой інтэграцыі і маглі б зрабіць гэтую ідэю часткай сваёй геапалітычнай дактрыны. Напрыклад, Беларусі.

Важным механізмам у рэалізацыі гэтай ідэі павінна стаць дэмакратызацыя суседзяў, бо ўключыўшыся ў барацьбу з аўтарытарызмам і постсавецкай спадчынай, Літва зможа прышчапіць новае бачанне будучыні рэгіёну, дзе яна будзе адыгрываць галоўную ролю.

Хаця культурная памяць — гэта не тое самае, што гісторыя, але мажліва, гісторыкі павінны перайсці рубікон у імя дэмакратыі суседніх дзяржаў, з якімі Літву абагульняе мінуўшчына, і не толькі вывучаць, але таксама і ствараць новую культурную памяць. У імя Літвы[9].

Літва за апошнія гады сталася новым геапалітычным суб'ектам, які імкнецца зрабіцца цэнтрам прыцягнення для тых краінаў Усходняй Еўропы, якія яшчэ не да канца акрэсліліся ў сваім геапалітычным выбары. І хаця сама ідэя Літоўскай імперыі больш падобная да прадукту для ўнутранага карыстання, чым ейнай рэалізацыі не існуе аб'ектыўных умоваў, палітыка Літвы падаецца рацыянальнай і паспяховай, прынамсі ў межах усходняга рэгіёну.

[9] Nikžentaitis, Alvydas The «Imperial» Dimension of Lithuania… P. 47.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 11 (51) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/01/27
[image]

ТАРАС КУЗЁ

прафэсар Школы міжнародных стасункаў унівэрсытэту імя Джорджа Вашынгтона. Выкладаў ува ўнівэрсытэтах Таронта і Бірмінггэму. Аўтар вялікай колькасьці публікацыяў аб постсавецкай і ўкраінскай палітыцы, посткамуністычнай дэмакратызацыі і выбарах (гл. іх поўны сьпіс на taraskusio.net). Ягоная

Тарас Кузё Заходняя тэорыя і практыка шматкультурнасьці: наколькі яна прыдатная для постсавецкіх дзяржаваў?

Да другой паловы 90-х гг. XX ст. дасьледчыкі пераходнага пэрыяду разглядалі постсавецкія дзяржавы гэтаксама, як і іншыя посткамуністычныя краіны Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы або былыя аўтарытарныя рэжымы Лацінскай Амэрыкі ці Паўднёвай Эўропы. Іншымі словамі, у іх бачылі краіны, у якіх адбываецца дэмакратызацыя і рынкавыя рэформы — і толькі.

Тады навукоўцы пачалі заўважаць, што бракуе яшчэ чагосьці істотнага. Постсавецкія краіны атрымалі ў спадчыну толькі квазідзяржаўнасьць, яны ня мелі шмат якіх інстытутаў, традыцыйна ўласьцівых нацыянальнай дзяржаве. І тэарэтыкі пераходнага пэрыяду дадалі да дэмакратызацыі і рынкавых рэформаў яшчэ і дзяржаўнасьць. Большасьць навукоўцаў і дасюль мяркуе, што гэтымі «трыма складнікамі» вычэрпваецца сутнасьць грамадзка-палітычных трансфармацыяў у постсавецкіх краінах.

На жаль, схема «трох складнікаў пераходнага перыяду» не ў стане перадаць усёй паўнаты карціны, бо яна альбо ўвогуле абмінае ўвагай нацыянальнае пытаньне, альбо аб'ядноўвае яго зь дзяржаўнасьцю. Апроч таго, «трохскладовая» схема ня здольная патлумачыць, чаму з канца 90-х гг. XX ст. посткамуністычныя краіны падзяляюць на дзьве групы: СНД, дзе мацнеюць аўтарытарныя тэндэнцыі, і дзяржавы Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы і Балты, якія ідуць шляхам дэмакратызацыі. Для краінаў СНД дзьверы ў Эўразвязы зачыненыя, застаецца праблематычнай і іх інтэграцыя ў

ядушняў
вусіка
ўкаванне»
ня артыкул
«Памаранчавая
рэвалюцыя.
Шлях
ыцыяналізму да
ыбуху»
№ 5 за 2005
год.

Ва Ўкраіне і іншых дзяржавах СНД актыўна абмяркоўваюцца пытаньні фармаваньня нацыі, палітыкі ў дачыненьні да нацыянальных меншасьцяў, стасункаў паміж цэнтрам і пэрыфэрыяй, міжэтнічных канфліктаў і сэпаратызму, нацыянальнай сымболікі, гістарыяграфіі, зьместу «нацыянальнай ідэі», нацыянальнага самавызначэньня і арыентацыі ў замежнай палітыцы («вяртаньне ў Эўропу», «прэч ад Расеі!», «у Эўропу — з Расеяй!» і г. д.). Таму гэтыя аспэкты таксама складаюць істотную частку пераходных працэсаў у постсавецкіх краінах.

У шмат якіх зь іх, як, да прыкладу, ва Ўкраіне, цягам усяго першага дзесяцігодзьдзя па распадзе СССР найбуйнейшай палітычнай партыяй заставаліся камуністы. Камуністычная партыя ня толькі варожа ўспрымае эканамічна-палітычныя рэформы, але і, што яшчэ важней, выступае супраць дзяржаўнай незалежнасьці і за рэанімацыю СССР.

Паколькі ў 90-я гг. XX ст. рэфарматары былі ня ў стане забясьпечыць сабе падтрымку большасьці, яны абралі сабе ў хаўрусьнікі «меншае ліха» — алігархаў-цэнтрыстаў. Пра хаўрус з камуністамі і гаворкі не магло быць, бо тыя не прымалі ідэі нацыянальнай дзяржавы. Упартае нежаданьне камуністычнай партыі прызнаць злачынствы савецкага рэжыму супраць чалавечнасьці замінала ўтварэньню аб'яднанай дэмакратычнай апазыцыі. Найвялікшы рэфарматарскі блёк «Наша Ўкраіна» адмовіўся супрацоўнічаць з камуністамі, бо іхная партыя так і не рэфармавалася. Як тады ўлучыць камуністычную партыю ў схему «трох складнікаў» трансфармацыяў, калі ў ёй ня

ўлічваецца нацыянальнае пытаньне?

Гэтая схема абмінала ўвагай яшчэ адзін чыньнік: сувязь паміж нацыянальнай сьвядомасьцю, ці самавызначэньнем, і рэформамі. Большасьць дасьледчыкаў на Захадзе не адважваецца яе аналізаваць і ўлучаць у прапанаваныя імі мадэлі грамадзка-палітычных пераўтварэньняў. Заходнія навукоўцы і СМІ зазвычай лаюць нацыянал-дэмакратаў правацэнтрыстаў за «нацыяналізм». Аднак нацыянал-дэмакраты — галоўная (некамуністычная) апазыцыйная сіла, што супрацьстаіць аўтарытарнай, карумпаванай алігархіі. У 2004 г. Юшчанка перамог на выбарах у выніку дэмакратычнай Памаранчавай рэвалюцыі.

Палітычныя сілы, што часта лічацца больш схільнымі да лібэралізму, як, напрыклад, сацыял-дэмакраты і лібэралы, насамрэч кантралююцца тымі самымі алігархамі, зацікаўленымі ў захаваньні аўтарытарнай, карпаратыўнай дзяржавы. Як сказаў Віктар Юшчанка, розьніца паміж ім і кандыдатам ад улады на прэзыдэнцкіх выбарах 2004 г. у тым, што яны «па-рознаму бачаць будучыню Ўкраіны».

У Беларусі асноўным чыньнікам, што паспрыяў абраньню ў 1994 г. прэзыдэнтам Аляксандра Лукашэнкі — прасавецкага кіраўніка, які дамагаўся аб'яднаньня з Расеяй, — была слабасьць нацыянальнай сьвядомасьці. Лукашэнку, як правіла, называюць «апошнім дыктатарам Эўропы». Напрыканцы 2002 г., пасьля таго, як de facto закрылася прадстаўніцтва АБСЭ ў Менску, Эўразьвяз увёў супраць Лукашэнкі часовыя візавыя санкцыі.

У Малдове вяртаньне да ўлады камуністаў спачатку на парлямэнцкіх, а на пачатку 2001 г. і на прэзыдэнцкіх выбарах прывяло да кардынальных зьменаў у дзяржаўнай палітыцы. Малдаўскія камуністы трымаліся сфармуляванай савецкімі ўладамі думкі, што малдаване — асобная нацыя, адрозная ад румынаў. Як і ў Беларусі, у Малдове ў сыстэму адукацыі вярнулася савецкая гістарыяграфія.

Таму дасьледаваньне Кімлічкі і Апальскага[1] зьявілася своечасова: у ім больш шырока разглядаюцца грамадзкія

[1] Can Liberal Pluralism Be

палітычныя пераўтварэньні ў посткамуністычных краінах? З улікам нацыянальнай палітыкі, на якую раней дасьледчыкі звычайна не зьвярталі ўвагі. Аднак пры гэтым застаецца спрэчным улучэньне нацыянальных праблемаў у посткамуністычных грамадзтвах у кантэкст шматкультурнасьці.

Kymlicka W. Exploring the Liberal Framework / Ed. W. Kymlicka & M. Opalski // Western Political Theory and Ethnic Relations in Eastern Europe. Oxford, Oxford University Press, 2001.

ВЫЗНАЧЭНЬНЕ ТЭРМІНАЎ

Мы будзем карыстацца двума тэрмінамі: шматкультурнасьць і дзяржава-нацыяналізатар, якія почасту супрацьпастаўляюцца. Пры гэтым першай прыпісваецца лібэралізм, а другой — адсутнасьць. Большасьць дасьледчыкаў на Захадзе лічыць, што перад постсавецкімі дзяржавамі — два шляхі: шматкультурнасьць, быццам бы роўная «лібэральнаму» цывілізаванаму грамадзтву, або будаўніцтва нацыянальнай, нібыта нелібэральнай, дзяржавы. Таму ня дзіўна, што ледзь ня ўсе тэарэтыкі выказваюцца за шматкультурнасьць.

Шматкультурнасьць пакліканая палегчыць вырашэньне складанай задачы: як спалучыць нацыянальны партыкулярызм і ўнівэрсальны лібэралізм? Інакш кажучы, яна прапануе мадэль стасункаў паміж тытульнай нацыяй і нацыянальнымі меншасьцямі.

У дэмакратычным грамадзтве мэта шматкультурнасьці — навучыць грамадзянаў цаніць размаітасьць і адрозьненьні, каб гэткім чынам дапамагчы інтэграваць розныя культуры ў адзінае вялікае грамадзтва, не абрываючы сувязі зь іх (супольнай) мінуўшчынай. Калі грамадзяне згодныя на саступкі дзеля тых, з кім іх аб'ядноўвае адзінства лёсу, то гэтым мацуецца легітымнасьць нацыянальнай дзяржавы. Тады прасьцей сфармаваць агульнае «мы», што асабліва неабходна ў выпадку пагрозы звонку.

Для шматкультурнага грамадзтва тыповыя роўнасьць магчымасьцяў, адмаўленьне ад французскай асыміляцыянісцкай мадэлі нацыянальнай дзяржавы, спалучэньне падтрымкі адзінай культуры ў публічнай сфэры з культурнай талерантнасьцю — у прыватнай. У публічнай сфэры прававая,

палітычная і эканамічная сістэмы грунтуюцца на агульнай культуры нацыянальнай дзяржавы. Разам з тым, мовы меншасьцяў вольныя ад ціску асыміляцыі, а дзяржава забясьпечвае для ўсіх роўныя магчымасьці інтэграцыі ў грамадзтва.

Самым перакананым прыхільнікам шматкультурнасьці заўсёды выступае Кімлічка, таму ў яе крытычным разглядзе я буду пераважна спасылацца на ягоныя ідэі. На думку Кімлічкі, культура і нацыянальнае самаўсьведамленьне ідэальна пасуюць, каб быць стрыжнем самавызначэньня асобы, бо яго абавязковы кампанэнт — прыналежнасьць да дакладна акрэсьленай, паважанай культурнай групы. Кімлічка мяркуе, што дзяржаву немагчыма адасобіць ад ейных этнічных складнікаў.

Дасьледчык перакананы, што культура неадрыўная ад лібэральнага дзяржаўнага ладу, бо яна стварае дадатковы кантэкст, які дапамагае ўсьвядоміць сваю прыналежнасьць да прызнанай супольнасьці. Для большасьці грамадзянаў свабода і роўнасьць уяўляюць найвялікшую вартасьць перадусім у рамках іхных «культурных супольнасьцяў», акрэсьленых мовай, гісторыяй, агульнасьцю памяці і каштоўнасьцяў, інстытутаў, рэлігіі, эканомікі: «Прыналежнасьць да пэўнай культуры стварае кантэкст для разумнага выбару, надае адчуваньне ўпэўненасьці ў сваім самавызначэньні, адчуваньне далучанасьці да супольнасьці. Мы кожны раз зьвяртаемся да яе, калі задумваемся пра свае асабістыя каштоўнасьці і жыцьцёвыя мэты»[2].

Кімлічка мяркуе, што ў межах заходне- і ўсходнеэўрапейскіх нацыянальных дзяржаваў можна спалучыць нацыянальны партыкулярызм з універсальным лібэралізмам, правы супольнасьці — з правамі асобы. Нацыянальная дзяржава грунтуецца на правох асобы, можа ў рамках шматкультурнасьці забясьпечыць і правы меншасьцяў. Таму Кімлічка не згаджаецца з традыцыйным поглядам лібэралаў, ніякая дэмакратыя дзейсная толькі тады, калі ўсе грамадзяне зьяднаныя адзінай культурай, якая асымілюе ўсіх і кожнага ў адну карэнную нацыю. Лібэралы таксама не падтрымлівалі ідэі

[2] Kymlicka W. Multicultural Citizenship. Oxford: Claredon Press, 1996. P. 105.

правоў супольнасьці, бо такім чынам падкрэсьліваюцца адрознасьці і захоўваецца этнічны падзел, а гэта згубна для адзінства нацыянальнай дзяржавы. З гледзішча Кімлічкі, адрознасьці не нясуць пагрозы нацыянальнай дзяржаве, а забясьпечваюць ейнае адзінства ў сытуацыі поліэтнічнасьці.

Абаронцы ідэі правоў супольнасьці сьцьвярджаюць, што моцная самасьвядомасьць паўстае толькі ў той ці іншай культуры. Інакш кажучы, усялякая самасьвядомасьць узьнікае праз узаемасувязі ў рамках пэўнага культурнага кантэксту. Адсюль вынікае, што павага да правоў супольнасьці дазваляе дасягнуць большай палітычнай талерантнасьці, чым універсальны лібэралізм, які засяроджваецца на правох асобы без уліку ейнай культурнай прыналежнасьці.

Кімлічка слушна падкрэсьлівае, што большасьць нацыянальных дзяржаваў — поліэтнічныя, і яны ніяк ня могуць быць «нэўтральнымі» да розных нацыянальных супольнасьцяў. Карэнная (тытульная) нацыя заўсёды апынаецца ў прывілеяваным становішчы: як правіла, ейная мова — гэта мова адукацыі, суду, дзяржаўных установаў, ейныя гістарычныя міты і сьвяты маюць прыярытэт у грамадзтве, ейныя інтарэсы найперш улічваюцца пры вызначэньні ўнутраных межаў.

Пачынаючы з 60—70-х гг. XX ст. большасьць нацыянальных дзяржаваў схільная прызнаваць культурную размаітасьць. Але правы супольнасьці паважаюцца толькі ў Канадзе. Аўстралія зьвярнулася да шматкультурнасьці праз шэсьць гадоў пасьля таго, як у 1967 г. атрымалі права голасу ейныя карэнныя народнасьці. Палітыку шматкультурнасьці ў поўным аб'ёме праводзяць усяго тры нацыянальныя дзяржавы Захаду: Канада, Аўстралія і Швэцыя. Астатнія замест гэтага лібэралізуюць традыцыйную палітыку асыміляцыі ў кірунку інтэграваньня ў адзіную нацыю, а не шматкультурнасьці.

Такім чынам, большасьць нацыянальных дзяржаваў на Захадзе па-ранейшаму ставіцца да шматкультурнасьці з засьцярогамі, што яна можа падарваць нацыянальнае адзінства. Аднак гэта не замінае заходнім навукоўцам і палітстратэгам выступаць за шматкультурнасьць у посткамуністычных краінах. Пры гэтым палітыка шматкультурнасьці датычна самога Захаду ўсё больш

і больш ставіцца пад сумнеў. Пасьля тэрактаў 11 верасьня ў Заходняй Эўропе расьце заклапочанасьць недастатковай інтэграцыяй мусульманскіх меншасьцяў у грамадзтва, таму ўсё мацней гучаць галасы на карысьць пераходу ад шматкультурнасьці да палітыкі інтэграцыі.

Брубакер[3] падкрэсьлівае, што ў некаторых нацыянальных дзяржавах (асабліва ў ЗША і Францыі, але таксама ў Нямеччыне, хоць і ў меншай ступені) расьце трывога, што, мабыць, культурны плюралізм занадта далёка зайшоў. У ЗША да 60-х гг. XX ст. пераважна праводзілася палітыка асыміляцыі. Зь сярэдзіны 60-х і да сярэдзіны 80-х гг. Амэрыка рухалася ў кірунку большай культурнай размаітасьці ў прыватнасьці, калі яна не супярэчыла агульнаму самавызначэнню амэрыканца.

На думку Брубакера, вяртаньня да «бесцырымоннай асыміляцыі», як да 60-х гг. XX ст., не адбудзецца. Замест гэтага адукацыя, грамадзянства і іншыя галіны зноў зьвернуцца да палітыкі талерантнасьці да размаітасьці. Такім чынам, мяркуецца вырашыць праблемы ізаляцыі, ператварэньня пэўных раёнаў у нацыянальныя гета, маргіналізацыі нацыянальных меншасьцяў — праблемы, якія міжволі ставаў культурны плюралізм, калі дзеля яго прыносілася ўрахаванне адзінства нацыі. Брубакер даводзіць, што гэтае паяднаньне асыміляцыі і плюралізму «не выклікае нараканьняў з маральнага гледзішча», бо адрозьніваецца ад асыміляцыі, што праводзілася да 60-х гг. XX ст.

Брубакер увёў у актыўны ўжытак тэрмін «дзяржава-нацыяналізатар», які падхапіў і распрацоўваў далей шмат хто з навукоўцаў. Парадыгма Брубакера палягае на дачыненьнях паміж наступнымі трыма чыньнікамі:

— «дзяржава-нацыяналізатар» — «этнічна разнародная, але ўспрыманая як нацыянальная дзяржава, дзе паноўная эліта ў той ці іншай ступені падтрымлівае мову, культуру, дэмаграфічны стан, эканамічны росквіт і палітычную гегемонію тытульнай нацыі»[4];

— нацыянальныя меншасьці, арганізаваныя, з высокай

[3] Brubaker R. The return of assimilation. Changing perspectives on immigration and its sequels in France, Germany and the United States // Ethnic and Racial Studies. No. 24 (4). 2001. P. 531–548.

[4] Brubaker R.

нацыянальнай сьвядомасьцю, якія патрабуюць аўтаноміі і супраціўляюцца асыміляцыі;

— замежная «радзіма», якая імкнецца абараніць меншасьці ад асыміляцыі, бо пачуцьце прыналежнасьці да адной нацыі ягае цераз дзяржаўныя межы.

Брубакер паказвае, што «нацыяналізатарская» палітыка дзяржавы ніяк ня можа праводзіцца ў адрыве ад астатніх двух чыньнікаў: нацыянальных меншасьцяў і іхнай «радзімы». Уладныя эліты «дзяржавы-нацыяналізатара» часта абвінавачваюць нацыянальныя меншасьці ў «непатрыятычнасьці». «Нацыяналізатарская» палітыка вядзе да стварэньня рэальнага ці ўяўнага вобразу «рэпрэсіўнай» дзяржавы, якая спрабуе дасягнуць аднароднасьці насельніцтва і скасаваць рэгіянальныя адметнасьці. Нацыянальныя меншасьці арганізуюць супраціў «рэпрэсіўнай дзяржаве пры падтрымцы з замежнай «радзімы».

Rogers Brubaker. National minorities, nationalising states and external homelands in the new Europe // Daedalus. No. 124 (2). 1995. P. 109.

Брубакер ужывае тэрмін «дзяржава-нацыяналізатар» толькі датычна посткамуністычных краінаў, не зважаючы на асыміляцыйныя тэндэнцыі і «побытавы нацыяналізм» у заходніх дэмакратыях. У сваю чаргу, іншыя дасьледчыкі карыстаюцца гэтым паняткам яшчэ больш выбарачна: толькі датычна тых посткамуністычных краінаў, нацыянальная палітыка якіх ім недаспадобы. Напрыклад, «дзяржавай-нацыяналізатарам» ніколі не называлі Расею, але вельмі часта — Украіну.

Брубакераў канцэпт «дзяржавы-нацыяналізатара» крытыкаваўся перадусім за тое, што ён замацоўвае стэрэатып быццам бы аб'ектыўнай розьніцы паміж двума тыпамі нацыяналізму: заходнім «лібэральным» грамадзянскім і ўсходнім «антылібэральным» этнічным. Але ў рэальным жыцьці большасьць нацыянальных дзяржаваў, у тым ліку і сталыя дэмакратыі Заходняй Эўропы і Паўночнай Амэрыкі, спалучаюць элемэнты грамадзянскага і этнічнага (ці культурнага) нацыяналізму. Заходнія дзяржавы пачалі распаўсюджваць правы грамадзянства на шырокія колы сваіх насельнікаў не адразу ў 1776 або 1789 гг. — спатрэбіліся дзесяцігодзьдзі і цэлыя стагодзьдзі, каб пашырыць азначэньне «грамадзянаў». Напрыклад, з 1776 г. ЗША ўключылі ў пералік тых, хто мае

права лічыцца «амэрыканцам», каталікоў, славянаў, чарнаскурых, жанчын, азіятаў і карэнныя народы Амэрыкі. Аднак да сярэдзіны XIX ст. амэрыканцы-пратэстанты англасаксонскага паходжаньня выступалі супраць таго, каб пашырыць вызначэньне «амэрыканцаў».

ЗАГАНЫ ШМАТКУЛЬТУРНАСЬЦІ ДАТЫЧНА ПОСТСАВЕЦКІХ КРАІНАЎ

Шматкультурнасьць і краіны былога СССР

Палітыка шматкультурнасьці, прапанаваная постсавецкім дзяржавам, дапамагае замарозіць успадкаваны ад савецкай імпэрыі этнакультурны посткаляніяльны статус-кво. Калі ўвесьці дзьве дзяржаўныя мовы (тытульнай нацыі і расейскую), прызнаць расейцаў цэласным «народам», зрабіць расейцаў другой тытульнай нацыяй, збудаваць фэдэральную дзяржаву, забясьпечыць правы супольнасьцяў для нацыянальных меншасьцяў, ня ўводзіць ніякай «нацыяналістычнай гістарыяграфіі», не прымаць ніякай нацыяналістычнай сымболікі, то гэта, бадай, ніяк не паспрыяе зьяднаньню нацыі і сьціраньню няроўнасьці паміж рэгіёнамі.

Калі гэтак рэзка супрацьпастаўляюцца магчымасьці выбару: альбо шматкультурнасьць (роўная лібэральнай дзяржаве), альбо «дзяржава-нацыяналізатар» (антылібэральная, варожая да меншасьцяў), то тым самым адмаўляецца магчымасьць знайсьці «залатую сярэдзіну» паміж дзьвюма скрайнасьцямі. Я б назваў альтэрнатыўную палітыку залатой сярэдзіны «адзінствам у размаітасьці». Яна прадугледжвае, з аднаго боку, нацыянальную інтэграцыю і захады дзеля падтрымкі тытульных нацыяў у постсавецкіх краінах, і з другога — забесьпячэньне этнакультурных правоў меншасьцяў. Маё «адзінства ў размаітасьці» падобнае да прапанаванай Брубакерам «асыміляцыі спакваля».

Далей мы разгледзім праблемы, зьвязаныя з правядзеньнем

палітыкі шматкультурнасьці на постсавецкай прасторы, на прыкладах, якія шырока абмяркоўваюцца дасьледчыкамі.

Крым

Кімлічка памылкова залічвае Крым да тых рэгіёнаў былога СССР, якія страцілі аўтаномію (як у Грузіі, Азэрбайджане) або не атрымалі яе (як у Малдове). Са згоды ўкраінскіх уладаў расейская эліта Крыму падвысіла ягоны статус ад вобласьці да аўтаномнай рэспублікі. Апроч таго, з напісанага Кімлічкам пра Крым відаць, што аўтар не зусім разумее ўсіх тонкасьцяў сытуацыі на паўвысьпе. Спрэчнае пытаньне, ці падчас прэзыдэнцтва Кучмы палепшылася праз атрыманьне Крымам аўтаноміі жыцьцё татарскай і ўкраінскай меншасьцяў.

У 1945—1954 гг. Крым быў вобласьцю РСФСР, а з 1954 г. — Украінскай ССР. Крымскіх татараў выселілі ў 1944 г., пасьля чаго Крым страціў сваю аўтаномію. У студзені 1991 г. Украіна падвысіла статус Крыму да аўтаномнай рэспублікі. Аўтаноміі Крыму патрабавала расейская этнічная большасьць у адказ на рост напрыканцы савецкай эпохі ўкраінскага нацыяналізму. Бясспрэчна, гэта дапамагло вырашыць спрэчку з Кіевам мірным шляхам. У адваротным выпадку падзеі маглі пайсьці паводле малдаўскага сцэнара, калі Кішынэў адмовіўся надаць статус аўтаноміі Прыднястроўю, і ў выніку разгарэўся ўзброены канфлікт. У Грузіі на пачатку 90-х гг. XX ст. скасаваньне абхаскай аўтаноміі прывяло да грамадзянскай вайны і дзяржаўнага пераварота, у якім страціў уладу прэзыдэнт-нацыяналіст Зьвіяд Гамсахурдыя.

Існавалі яшчэ дзьве прычыны, зь якіх украінскія ўлады пагадзіліся надаць Крыму статус аўтаноміі. Па-першае, кіраўніцтва Крыму пагражала зьвярнуцца ў Вярхоўны Савет СССР з просьбай адмяніць пастанову 1954 г. аб перадачы Крыму Ўкраінскай ССР і такім чынам вярнуць паўвыспу пад уладу Расеі. Па-другое, усялякія гвалтоўныя дзеяньні ў Крыме непазьбежна перарасьлі б у расейска-ўкраінскую вайну. Яна мела б катастрафічныя наступствы як для агульнаэўрапейскай

бясьпекі, гэтак і для дэмакратызацыі ў абедзьвюх краінах. Да чэрвеня 1996 г. Украіна заставалася ядравай дзяржавай, і канфлікт паміж Расеяй і Ўкраінай быў бы канфліктам паміж дзьвюма ядравымі дзяржавамі.

Кімлічку варта асьцярожней выказвацца, адмаўляючы стратэгічную важнасьць для новых незалежных дзяржаваў суседзтва з краінамі, якія маюць да іх тэрытарыяльныя прэтэнзіі. Урэшце на Захадзе ў XIX ст., калі фармаваліся нацыі і нацыянальныя дзяржавы, таксама часта здараліся тэрытарыяльныя канфлікты. Расея доўга захоўвае за сабою права ўмешвацца ў палітыку былых рэспублік СССР, каб абараняць сваіх «суайчыньнікаў», г. зн. усё расейскамоўнае насельніцтва, а ня толькі этнічных расейцаў. У Малдове, Грузіі і Азэрбайджане расейскія ці прарасейскія сілы сапраўды падтрымлівалі сэпаратыстаў. Гэтыя сэпаратысцкія рэгіёны паранейшаму застаюцца па-за кантролем цэнтральных уладаў. У Кішынэве новае прарасейскае камуністычнае кіраўніцтва спачатку пагадзілася з прапановай Расеі ператварыць Малдову ў *de facto* канфэдэрацыю — «агульны дом» для дзьвюх розных дзяржаваў.

Расея выказвала пратэст з нагоды судовых справаў у Эстоніі і Латвіі паводле абвінавачаньня былых савецкіх энкавэдыстаў у злачынствах супраць чалавечнасьці, бо Расея працягвае афіцыйна трымацца савецкай пазыцыі: маўляў, у 1939 г. улады балтыйскіх дзяржаваў самі «запрасілі» савецкія войскі. Няўжо новыя незалежныя дзяржавы мусяць папросту не зважаць на гэтыя аспэкты расейскай палітыкі датычна г. зв. «блізкага замежжа»?

На прыкладзе Крыму добра відаць, зь якой дылемай сутыкаюцца палітстратэгі і эліта ў краінах былога СССР, спрабуючы знайсьці «сярэдзінны шлях» паміж «лібэральнай» шматкультурнасьцю і «антылібэральнай» нацыяналізатарскай палітыкай: калі ў такіх рэгіёнах, як Крым, «у лібэральным духу» падтрымліваюцца правы супольнасьці, пры гэтым часта абмінаюцца ўвагай абмежаваньні, зь якімі сутыкаюцца іншыя меншасьці ў навастворанай аўтаноміі.

У Крыме этнічна расейскае кіраўніцтва абмяжоўвае правы

ўкраінскай і татарскай меншасцяў, якія складаюць траціну насельніцтва, на адукацыю і доступ да СМІ на роднай мове. Украінцы і татары ў Крыме маюць адпаведна толькі чатыры і шэсьць школаў з 582. З 392 пэрыядычных выданьняў толькі два выходзяць на ўкраінскай і татарскай мовах.

Як падкрэсьлівае Кімлічка, «нельга ўсталёўваць сыстэму, якая дазваляе большасьці мець выгаду ад ёю ж учыненай несправядлівасьці»[5]. Большасьць этнічных расейцаў у Крыме — гэта пераважна імігранты пасьляваеннага часу, якія прыйшлі на месца выселеных крымскіх татараў. Зыходзячы зь меркаваньняў звычайнай справядлівасьці, можна было б давесьці, што, каб выправіць раней зьдзейсьненую несправядлівасьць — высяленьне крымскіх татараў з Крыму ў 1944 г., — трэба ператварыць Крым у Татарскую аўтаномную рэспубліку. У Расейскай Фэдэрацыі і Грузіі знойдзем багата прыкладаў, калі нацыянальная меншасьць і ў сваёй аўтаномнай рэспубліцы складае меншасьць.

Кімлічка сьцьвярджае, што «фэдэралізм можа служыць мэханізмам самакіраваньня толькі там, дзе нацыянальная меншасьць складае большасьць у пэўнай фэдэральнай адзінцы, як кўэбэкцы ў Кўэбэку»[6]. У ідэале, вядома, лепей, калі нацыянальная меншасьць у сваім рэгіёне ўяўляе сабой большасьць, але гэтак бывае не заўсёды, і такое становішча часам нельга нічым падставай, каб адмаўляць у правох супольнасьці карэнным этнічным групам, напрыклад абхазцам ці крымскім татарам.

[5] Kymlicka W. Multicultural Citizenship… P. 100.

[6] Тамсама. P. 29.

За часам СССР абхазцы ў сваёй аўтаномнай рэспубліцы складалі меншасьць, але цяпер, пасьля таго, як падчас кампаніі сэпаратызму 1991—1992 гг. прайшлі этнічныя чысткі грузінаў, абхазцы ёсьць большасьцю насельніцтва. У ЗША некаторыя нацыянальныя меншасьці: індзейцы наваха, чыкана, карэнныя народнасьці Гаваяў — на момант інкарпарацыі складалі большасьць на абсягу свайго пражываньня і маглі б прэтэндаваць на правы супольнасьцяў. Але калі гэтыя тэрыторыі запаланілі ангельскамоўныя перасяленцы, карэннае насельніцтва не атрымала ніякіх правоў.

Падобную палітыку праводзіць і Кітай у Сынцзяне і Тыбэце:

імкнучыся зрабіць тамтэйшыя карэнныя народы — уйгурцаў і тыбэтцаў — меншасьцямі ў іхных уласных аўтаноміях, кітайскія ўлады спрыяюць прытоку кітайскіх перасяленцаў у гэтыя рэгіёны. У былым СССР расейцаў і расейскамоўных заахвочвалі перасяляцца ў нацыянальныя рэспублікі. У выніку ў Латвіі колькасьць прадстаўнікоў тытульнай нацыі ледзь ня склала менш за 50 % насельніцтва, а ў Казахстане так яно і адбылося.

Кімлічка крытычна ставіцца да быццам распаўсюджанага толькі ў посткамуністычнай Эўропе меркаваньня, што на чале аўтаноміяў стануць «дробныя тыраны». У Канадзе палітыка шматкультурнасьці, якую гэтак падтрымлівае Кімлічка, ажыцьцяўляецца толькі ў ангельскамоўнай яе частцы. У Кўэбэку ж па-ранейшаму праводзіцца традыцыйная французская палітыка асыміляцыі. Некаторыя навукоўцы сьцьвярджаюць, што Канада зьвярнулася да шматкультурнасьці ў адказ на кўэбэцкі сэпаратызм. Хіба ў ангельскамоўных насельнікаў Кўэбэку няма падставаў для трывогі?

Ідэя аўтаноміі не карыстаецца папулярнасьцю ня толькі ва Ўсходняй Эўропе, але і на Захадзе. У Францыі, якая на заканадаўчым узроўні не прызнае «нацыянальных меншасьцяў», аўтаномію атрымала толькі Корсыка — пасьля доўгага пэрыяду сэпаратысцкіх хваляваньняў. Грэцыя заўсёды адмаўляецца нават прызнаць славянаў-македонцаў меншасьцю, ня тое што надаць ім аўтаномію.

Зусім ня факт, што ў былым СССР этнічныя анклявы, што атрымалі статус аўтаноміяў, узначаліць дэмакратычная эліта. Абхазцы правялі этнічныя чысткі грузінаў, а ўлады Аджарыі кіравалі ёю як сваім дзядзінцам — покуль прэзыдэнт Міхаіл Саакашвілі ня стаў на чале народнага руху пратэсту супраць аджарскага кіраўніцтва, паводле ўзору ягонай жа Рэвалюцыі ружаў. У шмат якіх аўтаномных рэспубліках Расейскай Фэдэрацыі, як, напрыклад, у Татарстане, мясцовую эліту не абыходзяць дэмакратычныя нормы. У Крыме расейская эліта адмаўляе ў правох меншасьцяў татарам і ўкраінцам.

Каляністы ці імігранты?

Кімлічка праводзіць адрозьненьне паміж каляністамі й імігрантамі. Напрыклад, першапасяленцы ў ЗША і Канадзе былі каляністы англасаксонскага ці французскага паходжаньня. Імігранты ў гэтых грамадзтвах, створаных каляністамі, зьявіліся пазьней. Але як вызначыць той момант, калі каляністы робяцца «карэннымі» насельнікамі? У Ольстэры пратэстанцкая («ляялісцкая») супольнасьць пераважна складаецца з шкоцкіх і ангельскіх каляністаў. Але, пражыўшы ў Паўночнай Ірляндыі некалькі стагодзьдзяў, яны прэтэндуюць на тое, каб называцца карэнным «ірляндзкім» народам. Ірляндцы-каталікі («нацыяналісты») з гэтым ня згодныя.

У былым СССР савецкая нацыянальная палітыка наўмысна заахвочвала этнічных расейцаў міграваць у нацыянальныя рэспублікі з тым, каб забясьпечыць палітычны кантроль цэнтру, а таксама русіфікацыю мясцовага насельніцтва. У Эстоніі, Латвіі, Малдове, Казахстане і Ўкраіне індустрыялізацыя і ўрбанізацыя прывялі да значнага прытоку этнічных расейцаў. Паводле зьвестак апошняга савецкага перапісу 1989 г., у гэтых пяці рэспубліках расейцы складалі адпаведна 30,3 %, 34 %, 13 %, 37,8 % і 22,1 % насельніцтва. Кім лічыць расейцаў, якія жывуць у нерасейскіх рэспубліках былога СССР: «карэнным» насельніцтвам ці каляністамі? Мабыць, да іх больш пасуе апошняе азначэньне. З гэтай прычыны, а таксама таму, што яны маюць сваю радзіму па-за межамі краіны пражываньня, для іх неабавязкова мусяць прадугледжвацца этнакультурныя правы (напрыклад, увядзеньне другой дзяржаўнай мовы — расейскай — ці канстытуцыйнае замацаваньне за расейцамі статусу другой тытульнай нацыі).

Кімлічка даводзіць, што большасьць імігрантаў (за выключэньнем, скажам, палітычных уцекачоў) вырашаюць разьвітацца са сваёй культурай добраахвотна. Этнічныя расейцы ў большасьці сваёй мігравалі не з уласнае волі — іх пасылалі ў нерасейскія рэспублікі, дзе яны атрымлівалі разнастайныя прывілеі. Вельмі мала каму зь іх прыходзіла да галавы вучыць мову мясцовага насельніцтва — дзяржаўнай мовай у былым СССР *de facto* (а з 1990 г. і *de jure*) была

расейская. Украінцы, пасланыя ў РСФСР (а яны складалі другую паводле ліку пасьля татараў нацыянальную меншасьць), не атрымалі адпаведных прывілеяў і падпалі пад русіфікацыю. Украінцы ўважаюцца за «імігрантаў», а не за тамтэйшую «нацыянальную меншасьць», што жыве на сваёй гістарычнай радзіме, як, да прыкладу, татары ці якуты, таму ўкраінцам і не нададзеныя этнакультурныя правы. Расейскія палітстратэгі даводзяць, што ўкраінцаў нельга лічыць нацыянальнай меншасьцю, бо яны маюць радзіму па-за межамі Расеі — Украіну — і ня ёсьць карэннай супольнасьцю. Калі Ўкраіна будзе кіравацца гэткім жа падыходам, тое самае можна сказаць і пра расейцаў ва Ўкраіне: яны таксама маюць радзіму па-за межамі Ўкраіны — Расею. Ці павінны ім забясьпечвацца этнакультурныя правы ў рэспубліках, падобных да Ўкраіны, калі ўкраінцы ў Расеі не карыстаюцца гэтымі правамі?

Украіна пагадзілася надаць аднаму рэгіёну — Крыму — статус тэрытарыяльнай аўтаноміі, бо там пражывае большасьць этнічных расейцаў. Апроч таго, украінская дзяржава забясьпечвае расейцам у іншых рэгіёнах Украіны правы меншасьці ў галіне адукацыі, культуры і СМІ. У дамове 1997 г. паміж Расеяй і Ўкраінай прадугледжвалася, што гэтыя правы павінны атрымаць і ўкраінцы ў Расеі, і расейцы ва Ўкраіне. Аднак насамрэч палажэньняў дамовы пакуль што трымаецца толькі ўкраінскі бок.

Расейская Фэдэрацыя праводзіць палітыку асыміляцыі ў дачыненьні да ўсіх нерасейцаў, што жывуць па-за межамі аўтаномных рэгіёнаў (напрыклад, да татараў па-за Татарстанам), і прымусова пасланых на працу ў Расею за савецкім часам (напрыклад, украінцаў). У Цюменскай вобласьці (Заходняя Сібір) жыве агульным лікам 300 000 украінцаў, а ў Маскве, паводле некаторых зьвестак, да паўмільёна жыхароў — украінскага паходжаньня. Аднак у Расейскай Фэдэрацыі няма ніводнай украінскай школы, ніводнага пэрыядычнага выданьня на ўкраінскай мове.

Праводзячы адрозьненьне паміж нацыянальнымі меншасьцямі і добраахвотнымі імігрантамі, Кімлічка выказвае думку, што апошнія, «вырашыўшы адарвацца ад сваіх каранёў…

добраахвотна адмаўляюцца ад некаторых правоў, нададзеных ім іхным нацыянальным паходжаньнем на радзіме»[7]. Так, яны мусяць карыстацца правамі меншасьцяў, але ня маюць падставаў патрабаваць правоў супольнасьці, бо не падпадаюць пад прапанаванае Кімлічкам вызначэньне «нацыі» ці «народу». Таму, на думку Кімлічкі, цалкам слушна, што дзяржава імкнецца інтэграваць гэткіх імігрантаў.

Хоць этнічным расейцам ва Ўкраіне забясьпечваюцца[7] Kymlicka меншасьці, дзяржава праз нацыятворчую і дзяржаваўдаўнічую палітыку заахвочвае іх да інтэграцыі ва ўкраінскую Multicultural Інтэграцыя, асабліва пры такой блізкасьці культураў, Citizenship… праз некалькі пакаленьняў непазьбежна прывядзе да 96. асыміляцыі некаторых этнічных расейцаў. Перапіс насельніцтва ў сьнежні 2001 г. ва Ўкраіне — першы пасьля 1989 г. — засьведчыў скарачэньне колькасьці расейцаў на 3 мільёны.

І асноўная большасьць, і імігранты павінны рабіць высілкі, каб прыстасавацца адны да адных. Асноўная большасьць у грамадзтве можа фармаваць нацыянальную палітыку з улікам патрэбаў розных этнічных групаў. Ва Ўкраіне вугорцам і румынам, якія кампактна пражываюць у Закарпацьці і ў Чарнавіцкай вобласьці, нададзеныя правы самакіраваньня. Дзяржава актыўна заахвочвае нацыянальныя меншасьці, якія падпалі пад русіфікацыю (напрыклад палякаў, баўгараў, габрэяў), адраджаць нацыянальную мову і культуру. У 2003 г. Украіна ратыфікавала Эўрапейскую хартыю «Аб мовах меншасьцяў», і прычыны супраціву ейнай ратыфікацыі палягалі менавіта ў расейскай праблеме, а не ў варожасьці да моваў нерасейскіх меншасьцяў. Прынятая напрыканцы 1994 г. дзяржаўная праграма дазволіла стала рэтрансьляваць расейскія тэлепраграмы і забясьпечыла выданьне расейскамоўных кніг і СМІ, каб задаволіць этнакультурныя патрэбы расейцаў.

Скаргі гучаць адно з боку расейскай меншасьці — і ніякай іншай. Напрыклад, лідэры габрэйскай супольнасьці нязьменна высока ацэньваюць украінскую нацыянальную палітыку як ці ня самую лібэральную ў былым СССР. Наракае толькі збольшага пасіўная расейская меншасьць. Далей у артыкуле будзе паказана, што прычынай — ня столькі дыскрымінацыя, колькі

нежаданьне разьвітацца са статусам паноўнага этнасу і перайсьці ў разрад меншасьцяў — а Эўрапейская хартыя акурат і ўмацоўвае гэты статус.

УНУТРАНЫ КАЛЯНІЯЛІЗМ І ГІСТАРЫЧНА ЗАМАЦАВАНАЯ НЯРОЎНАСЬЦЬ

Зрабіўшыся незалежнымі дзяржавамі, нацыянальныя рэспублікі былога СССР атрымалі ў спадчыну значную няроўнасьць у этнакультурнай сфэры. Хваляваньні ў Казахстане ў 1986 г. былі выкліканыя тым, што Масква паставіла кіраваць рэспублікай этнічнага расейца. Напрыканцы 80-х гг. XX ст. ва Ўкраіне ўкраінцы пераўзыходзілі колькасьцю расейцаў толькі ў двух відах дзейнасьці — у сельскай і лясной гаспадарцы. Калі нацыянальныя рэспублікі ператварыліся ў сувэрэнныя дзяржавы, іх тытульныя нацыі пачалі забіраць у расейцаў уладныя пазыцыі ў палітыцы, эканоміцы і культуры, спрабуючы пераадолець некаторыя праявы савецкага ўнутранага каляніялізму[8].

У адпаведнасьці з афіцыйнай савецкай нацыянальнай палітыкай, беларусы і ўкраінцы лічыліся не асобнымі этнічнымі групамі, а адгалінаваньнямі «рускага народу». Большасьць этнічных расейцаў дасюль трымаецца гэтай вэрсіі. Зрэшты, часам украінцы і беларусы як бы часова адасобіліся ад расейцаў, але ім было наканавана зноў зьліцца ў новую расейскую супольнасьць — стаць *homo sovieticus*. Таму этнічным расейцам больш даспадобы лічыцца другой тытульнай нацыяй, а не «нацыянальнай меншасьцю». І ў новых незалежных дзяржавах расейцы выступаюць супраць таго, каб іх вызначалі як «нацыянальную меншасьць».

Кімлічка папярэджвае, што нават у заходніх дэмакратыях, дзе ўсе групы дакладна падпадаюць пад катэгорыю альбо «нацыянальнай меншасьці», альбо «этнічнай групы»[9]. У Беларусі за прэзыдэнтам Лукашэнкам пагадзіліся з цьверджаньнем расейцаў, што беларусы — гэта адгалінаваньне «рускага народу». Там і расейцы, і беларусы маюць статус

[8] Гл. Ніжэй пра ўнутранае каляніяльнае становішча расейцаў у былых савецкіх калёніях заходніх дзяржаваў, але не ў былой савецкай імпэрыі. На

тытульных нацыяў. У сваю чаргу, слабасьць нацыянальнай сьвядомасьці замарудзіла ў Беларусі пераход да дэмакратыі.

Гэтая гістарычна абумоўленая этнакультурная няроўнасьць асабліва заўважная ў моўнай сфэры, бо ў былым СССР расейская мова знаходзілася ў прывілеяваным становішчы. Калі імігрантаў змушаюць вывучаць «дзяржаўную мову» (ангельскую — у Паўночнай Амэрыцы, украінскую — ва Ўкраіне, эстонскую — у Эстоніі), гэта не азначае, што яны мусяць адмовіцца ад сваёй роднай мовы. Колішнія каляністы/імігранты могуць зрабіцца білінгвамі, асабліва ў такіх дзяржавах, як Украіна, дзе мясцовая мова падобная да расейскай і дзьвюхмоўе ўжо было пашыранай зьявай. Патрабаваньне, каб прадстаўнікі нятытульных нацыяў валодалі дзяржаўнай мовай, нельга аўтаматычна расцэньваць як сьведчаньне антылібэралізму дзяржавы-нацыяналізатара.

Сыстэма дзяржаўнай падтрымкі тытульнай нацыі заслугоўвае на асуджэньне толькі ў тым разе, калі яна мае на мэце пры стварэньні нацыянальнай дзяржавы не забясьпечваць правоў меншасьцяў іншым этнічным групам. Вось такую палітыку я назваў бы антылібэралізмам дзяржавы-нацыяналізатара. Яна-то, як правіла, і ўважаецца за поўную супрацьлегласьць шматкультурнасьці.

Можа, на першы погляд здаецца, што наданьне расейскай мове статусу дзяржаўнай — гэта ў духу лібэральнай палітыкі (або «цывілізаванай» дзяржавы). Аднак паколькі ў шмат якіх краінах былога СССР доўгі час панавала расейская мова, насамрэч гэта прывядзе да замацаваньня няроўнасьці. У Беларусі паводле вынікаў травеньскага рэфэрэндуму 1995 г. расейская мова атрымала статус дзяржаўнай, але гэта не прывяло да роўнасьці беларускай і расейскай моваў. Кімлічка памыляецца, калі станоўча ацэньвае гэты крок да «афіцыйнага дзьвюхмоўя». Лукашэнка ніколі ня меў на мэце дасягнуць роўнасьці моваў. Наадварот, ён хоча вярнуць савецкі час, калі расейская была *lingua franca*, а беларусаў спрэс русіфікавалі. Лукашэнка заявіў, што «ў сьвеце ёсьць толькі дзьве вялікія мовы: расейская і ангельская». З усіх краінаў былога СССР Беларусь — самая дэнацыяналізаваная, а беларуская мова ў найбольшай ступені

жаль, гэтую праблему пакуль не ўдалося вынесьці на шырокае навуковае абмеркаваньне, бо «постакаляніялісты» не ўключае ў сваё поле досьледаў СССР, а таксама ірляндыю.

Kymlicka W. Multicultural Citizenship... P. 131.

падпала пад русіфікацыю. Беларуская мова ня ў стане канкураваць з расейскай, і прэзыдэнт Лукашэнка, які ёю адкрыта пагарджае, вельмі добра гэта разумеў, калі праводзіў у 1995 г. моўны рэфэрэндум.

Мовы тытульных нацыяў у краінах былога СССР могуць мець нейкі спадзеў выстаяць у канкурэнцыі з расейскай толькі пасьля пэўнага пэрыяду дзяржаўнай падтрымкі, у тым ліку і праз наданьне ім статусу адзінай дзяржаўнай мовы. Калі ўкраінская мова мае прывілей быць адзінай дзяржаўнай, калі ёю стала карыстаюцца ў дзяржаўных установах, гэта ўздымае ейны прэстыж. Кімлічка заўсёды выступаў за дзяржаўную падтрымку французкай мовы і культуры ў Канадзе. Тады чаму ён супраць, калі падобнае робіцца ў былым СССР? Такая палітыка цалкам адпавядала б ягоным уласным поглядам: «У сучасным індустрыяльным грамадзтве, калі мова не выкарыстоўваецца ў публічнай сфэры, ёй вельмі цяжка выжыць. Беручы пад увагу пашырэньне адзіных адукацыйных нормаў, высокія патрабаваньні да ўзроўню пісьменнасьці на працы, шырокае ўзаемадзеяньне зь дзяржаўнымі ўстановамі, усялякая мова, якая не ўжываецца ў публічнай сфэры, настолькі маргіналізуецца, што можа выжыць толькі ў вузкім асяродку эліты альбо захоўвацца ў рытуалізаванай форме, але не як жывая разьвітая мова — падмурак багатай культуры»[10].

Зрабіўшы расейскую мову другой дзяржаўнай, прэзыдэнт Лукашэнка вынес сьмяротны вырак беларускай мове. У такой сытуацыі Кімлічка мае рацыю: калі культуры «паграмаюць заняпад, трэба рабіць захады ў яе абарону»[11]. Аднак ягоны падыход мусіць ажыцьцяўляцца ня толькі ў заходніх дэмакратыях, але і ў посткаляніяльных рэспубліках былога СССР.

[10] Kymlicka W. Multicultural Citizenship… P. 78.

[11] Тамсама. P. 83.

Ці «нацыянальнасьць» — моўныя групы?

Ці трэба ў рэчышчы палітыкі шматкультурнасьці надаваць пэўныя прывілеі моўным групам? Некаторыя заходнія навукоўцы — і перадусім расейскі ўрад — у спробе абараніць правы расейскамоўных у СНД сьцьвярджаюць, што так, трэба.

Аднак Кімлічка перасьцерагае супраць гэтага, бо групы, настолькі аморфныя, складана акрэсьліць. У Злучаных Штатах варта з асьцярогай ужываць панятак «гішпанскамоўныя», бо ён найперш асацыюецца з нацыянальным самавызначэньнем.

Такім чынам, «гішпанскамоўныя» (як і «расейскамоўныя») — гэта «ня болей як статыстычная катэгорыя, пад якую падпадае шэраг меншасьцяў, імігранты і выгнаньнікі, і ў кожнай з гэтых групаў — сваё самаўсьведамленьне і свае патрэбы»[12]. Што да французскамоўных у Канадзе, дык тут іншы выпадак, бо гэты панятак пераважна тычыцца тых, хто лічыць сябе французскамоўнымі канадцамі ў дзяржаве, якая мае дзьве афіцыйныя мовы: ангельскую і французскую. Адрозна ад дзьвюх нацыяў каляністаў-заснавальнікаў: брытанцаў і французаў — імігранты і нацыянальныя меншасьці (карэнныя індзейскія плямёны) ня маюць адпаведных моўных правоў. Таму заўсёды было няслушна аб'ядноўваць «расейскамоўных» у адзіную групу. Апошнім часам дасьледчыкі пачалі заўважаць неадпаведнасьць панятку. Але пра гэта — далей.

[12] Тамсама. Р. 16—17.

Зьяднаньне нацыі і самапавага

Вельмі важкай прычынай, чаму нацыянальныя рэспублікі былога СССР зьвярнуліся да дзяржаўнай падтрымкі сваёй мовы і культуры, была патрэба вярнуць самапавагу. Напрыклад, ва Ўкраіне за савецкім часам з украінскай мовы ўсяляк кпілі, як зь сялянскай, грубай, непрыдатнай для дзяржаўнай палітыкі і эканомікі. Украінцам, якія размаўлялі па-ўкраінску, часам даводзілася чуць: «Гавары па-чалавечы», г. зн. па-расейску. Сто гадоў таму ў Аб'яднаным каралеўстве гэтак сама глядзелі на валійскую і ірляндзкую мовы, а ў Францыі — на брэтонскую. Ангельская і французская лічыліся «вышэйшымі», «больш культурнымі».

Асоба зь нізкай самапавагай можа страціць сваё самаўсьведамленьне, шчыльна зьвязанае з культурай. Самапавага народу самым непасрэдным чынам залежыць ад месца, якое ён займае ў грамадзтве. Як піша Кімлічка, «калі няма павагі да культуры, годнасьць і самапавага яе носьбітаў

таксама будуць пад пагрозай»[13].

Калі розныя этнічныя групы надзеленыя правамі меншасьцяў, іх зьнікае страх асыміляцыі. Гэта спрыяе іх інтэграваньню і ўлучэньню ў адзіную палітычную супольнасьць. Таму палітыка фармаваньня нацыі і пабудовы нацыянальнай дзяржавы можна спалучыць з прызнаньнем поліэтнічнасьці і плюралізму. Калі няма павагі да адрознасьцяў, да таго ж і большасьць, і меншасьці ня схільныя да кампрамісу, стварыць агульнае самавызначэньне будзе, безумоўна, цяжка. На думку Кімлічкі, «прадстаўнікі розных нацыянальных супольнасьцяў выяўляюць адданасьць большаму дзяржаўнаму ўтварэньню, толькі калі бачаць у ім кантэкст, у якім іх нацыянальнасьць усяляк падтрымліваецца, а не ўдушаецца»[14].

Фурнье ў сваім дасьледаваньні выявіў, што супраціў расейцаў новай моўнай палітыцы ва Ўкраіне зьвязаны не з адчуваньнем дыскрымінацыі[15]. Расейцы супраціўляюцца таму, што ім надаюць статус этнічнай групы і нацыянальнай меншасьці. Ім больш даспадобы лічыцца часткай «расейскай этналінгвістычнай супольнасьці», г. зн. «суайчыньнікамі» грамадзянаў Расеі. Як меншасьць яны застаюцца адрэзанымі ад расейскамоўных іншых нацыянальнасьцяў, якіх заахвочваюць наноў вучыць сваю родную мову. Таму расейцы выступаюць за «спароджаную імпэрыяй» гібрыднасьць, паводле фармулёўкі Фурнье. А такая гібрыднасьць не спрыяе ўвядзеньню палітыкі шматкультурнасьці.

Фурнье таксама лічыць няўдалым гэтае неабдымнае вызначэньне — «расейскамоўныя». Размаўляць па-расейску могуць і ўкраінцы, але яны ўсё ж адчуваюць эмацыйную прывязанасьць да роднае мовы. А ў пэўных сытуацыях шмат хто зь іх можа і карыстацца ёю. Падобная суб’ектыўная прыхільнасьць да гэльскае мовы назіраецца і ў Ірляндыі, хоць спробы моўнага адраджэньня збольшага не прынесьлі плёну.

Сярод украінацаў шмат білінгваў. У Кіеве на вуліцах мала размаўляюць па-ўкраінску. Але на пачатку і ў сярэдзіне 90-х гг. XX ст. 80—90 % школаў перайшлі на ўкраінскую мову навучаньня. І працэс украінізацыі не суправаджаўся ніякімі пратэстамі. Фурнье разглядае пяць розных фрагмэнтаў

[13] Kymlicka, W. Multicultural Citizenship. P. 89.

[14] Тамсама. P. 189.

[15] Fournier A. Mapping identities: Russian resistance to linguistic Ukrainisation in central and eastern Ukraine // Europe-Asia Studies. No. 54 (3). 2002. P. 415—433.

дыскурсу супраціву расейцамі моўнай і нацыянальнай палітыцы ва Ўкраіне. Вось яны: скрайняя непрыхільнасьць да падзелу двух народаў: расейскага і ўкраінскага; украінская мова — «адсталая», не адпавядае ўзроўню дзяржаўнай мовы; супраціў таму, што расейская мова ва Ўкраіне пераводзіцца ў катэгорыю «замежных»; пратэсты супраць таго, што расейская мова нібыта выштурхоўваецца з Украіны; меркаваньне, што этнакультурная прыналежнасьць «расейскамоўных» павінна вызначацца паводле моўнай, а не этнічнай прыкметы.

На думку Фурнье, гэты супраціў абумоўлены імпэрскай спадчынай: расейцы супраць таго, каб быць часткай расейскамоўных «парэшткаў імпэрыі». Украінская мова і культура лічацца «ніжэйшымі» за расейскую. Падтрымліваючы «афіцыйнае дзьвюхмоўе», Кімлічка павінен заўважыць, што расейцы дамагаюцца ня роўнасьці іх мовы з украінскай ці беларускай, а вяртаньня да савецкага часу, калі ў герархіі ўсходнеславянскіх моваў на вяршыні знаходзілася расейская. Як адзначае Фурнье, «расейцы імкнуцца вярнуць расейскай мове яе паноўны статус, а не дамагчыся яе роўнасьці з украінскай».

Уяўленьне пра «ніжэйшасьць» украінскай і беларускай моваў у параўнаньні з расейскай грунтуецца на савецкай ідэалёгіі «славянскага братэрства» і на расейскім нацыяналізьме — яны панавалі ў СССР зь сярэдзіны 30-х гг. ХХ ст. Шмат савецкіх людзей, асабліва русіфікаваных, прынялі гэткае меркаваньне. Яго дасюль трымаюцца камуністычныя партыі ў постсавецкіх дзяржавах. У Беларусі Лукашэнка, які пагарджае беларускай мовай, выступае жывым увасабленьнем падобных поглядаў. У Малдове, дзе з пачатку 2001 г. на чале дзяржавы стаіць парлямэнт, у якім камуністы маюць большасьць, і прэзыдэнт — камуніст, адбыўся перагляд нацыянальнай палітыкі: малдаване, зусім як за савецкім часам, лічацца асобнай ад румынаў нацыяй, да таго ж гучаць прапановы надаць расейскай мове статус другой дзяржаўнай. І ў Беларусі, і ў Малдове вернутая савецкая гістарыяграфія, якая падкрэсьлівае вышэйшасьць расейскай мовы і культуры і абапіраецца на савецкі інтэрнацыяналізм і расейскі нацыяналізм.

Праблемы з вызначэньнем нацыянальных меншасьцяў

Галоўная праблема з дастасаваньнем заходняй палітыкі шматкультурнасьці да краінаў былога СССР у тым, каб вызначыць, якія нацыянальныя меншасьці і этнічныя групы маюць асобную культурную прыналежнасьць. І як у рэчышчы шматкультурнасьці даць рады з тымі, у каго ўзьнікаюць складанасьці з вызначэньнем сваёй прыналежнасьці? Сапраўды, як праводзіць палітыку шматкультурнасьці датычна тых, хто лічыць сябе «савецкім», або тых, хто называе сябе перадусім патрыётам свайго рэгіёну, а не дзяржавы? А пад гэтыя катэгорыі падпадае шмат украінцаў і беларусаў. Ад іх нельга чакаць, каб яны дзейнічалі і галасавалі як удзельнікі «супольнасьцяў інтарэсаў».

Палітыка шматкультурнасьці зыходзіць з таго, што асоба атаясамлівае сябе з пэўнай культурнай групай і мае пачуцьце прыналежнасьці да дакладна акрэсьленай групы — іншымі словамі, што паміж іх супольнасьцю і «дамінантнай» культурай існуе дыскурс «іншасьці». Аднак расейскамоўныя ва Ўкраіне не ўтвараюць адзінай групы ці «супольнасьці інтарэсаў». У панятак «расейскамоўныя» ўваходзяць і этнічныя расейцы, і расейскамоўныя/зрусіфікаваныя ўкраінцы, і габрэі, і беларусы, і шмат хто яшчэ. Поп і Гагендорн, якія вывучалі расейскамоўнае насельніцтва былога СССР, даводзяць, што па-за межамі Расеі ў постсавецкіх краінах не існуе агульнага для ўсіх расейцаў самаўсьведамленьня і што «малаверагодна, каб расейцы і іншыя расейскамоўныя прадстаўнікі нятытульных нацыяў сталі атаясамліваць сябе з адзінай групай»[16]. Таму ў краінах былога СССР расейскамоўныя і нават расейцы не ўяўляюць сабою дыяспары.

Барынгтан прааналізаваў багата найноўшай крытычнай літаратуры што да вылучэньня расейскамоўных у адзіную групу, здольную стаць нацыянальнасьцю. На ягоную думку, наўрад ці ў былым СССР паўстане нацыянальнасьць расейскамоўных. Насельніцтва постсавецкіх краінаў усё больш схільнае вызначаць сябе паводле грамадзянства ці этнічнай прыналежнасьці. Магчыма, другое адлюстроўвае іх спрадвечную прывязанасьць да свайго этнасу, якая застаецца з

[16] Pop E., Hagendoorn L., Tumarkin A. Russian identification in the 'Near Abroad' // Journal of Ethnic and Migration Studies. 2006. Vol. 32. No. 6. P. 1039–1060.

савецкага часу. Як сьцьвярджае Барынгтан, грамадзянства таксама стала «новым магутным сродкам фармавання самасьвядомасьці на постсавецкай прасторы». Як чыннік самавызначэньня грамадзянства згадваецца значна радзей за ўсе астатнія фактары.

Europe-Asia Studies. No. 53 (1). 2001. P. 89–106.

На час распаду СССР большасьць ягоных жыхароў, якія раз на дзесяць гадоў пры правядзеньні перапісаў называлі сябе «ўкраінцамі» або «расейцамі», ня мела сучаснай нацыянальнай самасьвядомасьці ў нашым разуменьні. Яна ў іх і цяпер досыць часта хісткая, што ня дзіўна для посткаляніяльных дзяржаваў. Перапіс 2001 г. ва Ўкраіне засьведчыў істотнае скарачэньне колькасьці этнічных расейцаў — яны ўжо называлі сябе ўкраінцамі. Раней тое самае зрабіў былы прэзыдэнт Кучма. Калі ў сакавіку 1990 г. ён абіраўся ва ўкраінскі парлямэнт, у ягонай біяграфіі значылася: «расеец». На той час, як ён у 1992 г. стаў прэм'ер-міністрам Украіны, Кучма ўжо быў «украінцам».

Пры правядзеньні савецкіх перапісаў апытаныя мусілі выбіраць нацыянальнасьць аднаго з бацькоў. Ва Ўкраіне, да прыкладу, чвэрць шлюбаў бралі прадстаўнікі розных нацыянальнасьцяў. За савецкім часам 58,9 % расейцаў і 74,7 % габрэяў жаніліся не са сваімі супляменьнікамі. Расейская мова зьвязвалася з уздымам па сацыяльнай лесьвіцы, і таму шмат хто зь дзяцей ад зьмяшаных шлюбаў абіраў расейскую нацыянальнасьць. Яна і запісвалася ў савецкіх пашпартох і ўносілася ў блянкі перапісаў. У сучасных агульнаграмадзянскіх пашпартох няма графы «нацыянальнасьць».

Зьмены нацыянальнага складу тлумачацца вышэйшым узроўнем нараджальнасьці сярод украінцаў — яны складаюць большасьць у сельскіх раёнах, дзе нараджальнасьць вышэйшая, чым у горадзе (87,5 % расейцаў жывуць у гарадох, між тым як сярод украінцаў гэтая лічба складае 60,3 %). Але асноўная прычына скарачэньня колькасьці расейцаў ва Ўкраіне ў тым, што шмат хто зь іх зьмяніў сваю нацыянальную прыналежнасьць і стаўся ўкраінцам. Трэба меркаваць, яны зыходзілі з таго, што ў незалежнай Украіне, адрозна ад былога СССР, лепей быць украінцам. У большасьці тых, хто за савецкім часам называў сябе ўкраінцамі, бацькі былі тае ж

нацыянальнасьці, а прыблізна палова тых, хто называў сябе расейцамі, паходзілі з расейска-ўкраінскіх сем'яў. Цяпер шмат хто зь іх вызнае сябе «ўкраінцамі», што і пацьвердзілі вынікі перапісу 2001 г.

ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ

Кімлічка выяўляе залішні аптымізм наконт пэрспэктываў палітыкі шматкультурнасьці на постсавецкай прасторы. Як правіла, ён падтрымлівае тыя захады, што трапляюць пад азначэньне «шматкультурнасьці», але застаюцца малапрыдатныя для постсавецкіх дзяржаваў. Аднак гэта не выключае прызнаньня размаітасьці ў посткамуністычных краінах на інстытуцыйным, заканадаўчым, канстытуцыйным узроўнях. І правядзеньне палітыкі асыміляцыі таксама падаецца малаверагодным: там, дзе рабіліся падобныя спробы — у Грузіі, Сэрбіі, — замест чаканых вынікаў яны спарадзілі міжнацыянальныя канфлікты.

У артыкуле абмяркоўвалася, наколькі прыдатная заходняя палітыка шматкультурнасьці для дзяржаваў былога СССР: вывучалася становішча тэрытарыяльных аўтаноміяў у параўнаньні з нацыянальнымі (на прыкладах Крыму, Абхазіі, Прыднястроўя), разглядаліся цяжкасьці з вызначэньнем «каляністаў», «мігрантаў» і «меншасьцяў». У гэтай працы выказваецца крытычны падыход да ідэі разглядаць моўныя групы як пачаткі нацыянальнасьцяў. У ёй таксама сьцьвярджаецца, што калі на Захадзе маральна апраўданая сыстэма дзяржаўнай падтрымкі пэўных супольнасьцяў (згадайма Кўэбэк), дык датычна постсавецкіх дзяржаваў, дзе гістарычна склалася этнакультурная няроўнасьць, нельга ўжываць палітыку падвоеных стандартаў.

І з традыцыйнымі досьледамі нацыяналізму, і з больш сучаснымі працамі (напрыклад, Кімлічкі) цяжка стасуецца беларускі выпадак, калі дзяржава дыскрымінуе найвялікшую этнічную супольнасьць — беларусаў. Апроч таго, краіны былога СССР не ўключаюцца ў поле досьледаў посткаляніялістыкі. Таму шмат якім заходнім навукоўцам

цяжка ўсьвядоміць: там адбываюцца тыя ж працэсы, што і ў іншых посткаляніяльных краінах — дзейнічае сыстэма дзяржаўнай падтрымкі тых нацыянальных супольнасьцяў, што раней дыскрымінаваліся, а цяпер набылі сваю дзяржаўнасьць. Замест гэтага дасьледчыкі на Захадзе надаюць увагу (і суперажываюць) найперш нятытульным групам, да прыкладу, нацыянальным меншасьцям. У выпадку з Украінай відаць, што расейцы супраціўляюцца пераходу ў стан «нацыянальнай меншасьці», бо гэта азначае страту іх паноўнага статусу на тэрыторыі былой савецкай імпэрыі.

Правядзеньне палітыкі шматкультурнасьці на постсавецкай прасторы падаецца немагчымым ці, у найлепшым разе, складаным, пакуль няпэўнае, рэгіянальнае і савецкае самавызначэньне ня зьменіцца атаясамліваньнем з супольнасьцю, якая мае прыкметы «нацыі» ці «народу». Палітыку шматкультурнасьці можна праводзіць толькі ў тых дзяржавах, якія ўжо дасягнулі пэўнага ўзроўню мадэрнасьці. А постсавецкім краінам, якія праходзяць праз пэрыяд «чатырохскладовых» грамадзка-палітычных пераўтварэньняў, да гэтага ўзроўню яшчэ далёка.

Таму было б памылкай сьцьвярджаць, што перад постсавецкімі дзяржавамі — жорсткая альтэрнатыва: або «лібэральная» шматкультурнасьць, або «антылібэральная» дзяржава-нацыяналізатар. Першае падаецца непрыдатным і шкодзіць зьяднаньню нацыі. Другое жорстка крытыкуецца, вядзе да міжнацыянальнай напружанасьці і таксама шкодзіць зьяднаньню нацыі. Постсавецкім дзяржавам трэба шукаць трэці шлях, залатую сярэдзіну — я б назваў яго «адзінствам у размаітасьці». Падобны падыход робіцца ўсё больш папулярны і на Захадзе. Найлепшым выйсьцем для краінаў былога СССР была б нацыянальная палітыка, што прызнае правы і тытульнай нацыі, якая пераадольвае каляніяльную спадчыну, і нацыянальных меншасьцяў, палітыка, якая спрыяе зьяднаньню нацыі і не дапускае асыміляцыі і дыскрымінацыі. Гэта, на маю думку, і ёсьць «адзінства ў размаітасьці». А шматкультурнасьць і «нацыяналізатарская» палітыка вядуць аблудным шляхам.

Зь невялікімі скарачэньнямі пераклала з ангельскай Сьвятлана

Несьцярук паводле: Kuzio, Taras. Western Multicultural Theory and Practice and its Applicability to the Post-Soviet States // Journal of Contemporary European Studies. Vol. 13. No. 2. August 2005. P. 221—237

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].

Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: **2007/01/27**

[image]

[image] [image] [image]

ЛУКАН Э.
ЎЭЙ
прафэсар паліталогіі Храмавага ўнівэрсытэту (Temple University), што ў Філадэльфіі, у 2004—2005 г. — стажэр Гарвардзкае акадэміі — міжнародных і рэгіянальных дасьледаваньняў.

Лукан Э.
Ўэй
Аўтарытарызм і палітычная лібэралізацыя на захадзе былога СССР у 1992–2004 гг.*

УВОДЗІНЫ

На пачатку 1990-х у Беларусі, Малдове, Расеі і Ўкраіне існавала адносна свабодная палітычная канкурэнцыя. І гэта — нягледзячы на сур'ёзныя перашкоды: кіраўнікі дзяржавы былі выхадцамі з старой намэнклятуры, далёкімі ад дэмакратычных ідэалаў, краіны ня мелі трывалай традыцыі дэмакратыі і разьвітай грамадзянскай супольнасьці, у іх не ўсталявалася вяршэнства закону і існавалі яны ў адноснай міжнароднай ізаляцыі. Пры канцы 1990-х і на пачатку 2000-х гг. палітычная канкурэнцыя ўва ўсіх чатырох дзяржавах заўважна аслабілася, хоць і ў рознай ступені: ад надзвычай закрытых рэжымаў у Беларусі ды Расеі да больш адкрытых — у Малдове і Ўкраіне. Я спынюся на дзьвюх вельмі важных загадках. Па-першае, чаму на пачатку 1990-х усе чатыры краіны былі адносна адкрытымі, нягледзячы на сур'ёзныя перашкоды, але зь цягам часу зрабіліся больш закрытымі? Па-другое, чаму на пачатку XXI ст. у гэтых краінах палітычная канкурэнцыя прысутнічае не ў

Апошнім часам пачаў вучыць беларускую мову. У сфэру яго навуковых інтарэсаў уваходзіць тыпалёгія і шляхі

аднолькавай ступені?

Вывучэньне мэханізмаў фармаваньня і адтварэньня палітычных сыстэмаў на прыкладзе гэтых чатырох краінаў сьведчыць, што нам трэба перагледзець сваё разуменьне пераходнага этапу, калі эліта не выяўляе адданасьці дэмакратыі. Апошнім часам дыскусіі пра пераўтварэньне дзяржаўнага ладу пераважна засяроджваюцца на дэмакратычнай частцы спэктру. Гэта стварае праблему, і ня толькі таму, што ў выніку нас ахоплівае беспадстаўны аптымізм. Што яшчэ больш істотна, даследнікі схільныя не зважаць на цэлыя працэсы і інстытуты — як эфэктыўнасьць прымусу альбо здольнасьць лідэраў трымаць пад кантролем хаўрусьнікаў, — малаістотныя пры пабудове дэмакратыі, але надзвычай важныя для ўмацаваньня аўтакратыі. Менавіта таму, што ў свой час мы надавалі мала ўвагі аўтарытарызму, нам было цяжка зразумець, чаму там, дзе, як шмат хто меркаваў, няма месца палітычнай канкурэнцыі, усталяваліся досыць адкрытыя палітычныя сыстэмы.

Пэўны запісаньні гэтага артыкулу мне вельмі дапамаглі маю сябры і калегі: Ігар Бакан, Сэмюэль Гантынгтан, Анна Гжымала-Бусэ, Ларыса Дайманд, Кейт Дардэн, Маліна Джонз Лубонг, Рычард Ды, Чарлз Кінг, Тым Колтан, Тарас Кузьо, Стыўэн Левіцкі, Майкл Макфол, Марк Плетнэр, Рычард Роўс, Уладзімер Сапянары, Віталь Сяліцкі, Рычард Снайдэр, Брэнда Уэзі, Джозэф Шварц і Аксана Шэвель.

Пераклад з англійскай мовы Ірыны Шчарбакавай.

Першапачатковая публікацыя: Journal of Democracy. — 2005. — Vol. 16. — No. 3. — P. 5–18.

У 1990-х і на пачатку 2000-х гг. найбольш палітычнае канкурэнтнае ў Беларусі, Малдове, Расеі і ва Украіне было звязанае ня з існаваньнем разьвітай грамадзянскай супольнасьці, моцных дэмакратычных інстытутаў і дэмакратычнага кіраўніцтва. Яна тлумачылася тым, што *першыя асобы дзяржавы не маглі ўтрымліваць уладу і засяроджваць у сваіх руках палітычны кантроль*, захоўваючы адзінства эліты, кантралюючы выбарчы працэс, а таксама СМІ і/ці ўжываючы гвалт супраць апанэнтаў. Не маглі, бо ў гэтых краінах на той час расла нацыянальная сьвядомасьць, скіраваная супраць першай найвышэйшай службовай асобы. Не маглі, бо самі былі слабыя: ня мелі неабходных навыкаў (ноў-хаў), эфэктыўнай арганізацыі намэнклятуры і/ці моцнай дзяржаўнай улады (яна залежыць ад памераў дзяржавы, цэнтралізаванага дзяржаўнага кантролю і аб'ёму рэальных паўнамоцтваў дзяржавы). Шляхі разьвіцьця дзяржавы вызначала моц (або слабасьць) першай асобы, бо ад яе залежала здольнасьць улады кантраляваць палітычныя працэсы і ўмацоўваць той ці іншы палітычны лад — дэ *альбо* аўтарытарызм. У сваю чаргу, высокі ўзровень нацыянальнай

трансфармацыі недэмакратычных рэжымаў, а таксама палітычныя працэсы у посткамуністычных краінах. Апошняя публікацыя у «АКОНЕ» — аналіз «Рэвалюцыя ў крах кучмавага аўтарытарызму» (5/2005).

сьвядомасьці грамадзтва, скіраванай супраць найвышэйшай службовай асобы, падрываў яе моц і дапамагаў зьяднацца апазыцыі нават пры слабой грамадзянскай супольнасьці.

На раньніх этапах зьяўленьню палітычнай канкурэнцыі ўва ўсіх чатырох краінах паспрыяў надзвычай раптоўны распад савецкай дзяржавы ў 1990—1991 гг. Ён прывёў да таго, што кіраўнікі дзяржавы засталіся без арганізаванай намэнклятуры, ня мелі належных навыкаў і фінансавых сродкаў, каб утрымліваць уладу і/ці засяродзіць у сваіх руках палітычны кантроль. Праз слабасьць альбо адсутнасьць такіх фармальных альбо нефармальных арганізацыяў эліты, як партыі ўлады альбо трывалыя неафіцыйныя структуры, першым асобам было цяжэй не дапусьціць пераходу на бок апазыцыі прэм'ер-міністраў, віцэ-прэзыдэнтаў, іншых галоўных хаўрусьнікаў. Апроч таго, кіраўнікі дзяржавы ня мелі ў сваіх руках моцнай улады, таму для іх ускладнялася задача пусьціць у ход службы бясьпекі і іншыя дзяржаўныя структуры, каб захапіць палітычны кантроль — праз выбарчыя махінацыі альбо гвалт супраць апанэнтаў. Да таго ж, асабліва ў Беларусі, першым асобам часьцяком проста не хапала досьведу і элемэнтарных навыкаў (напрыклад, уменьня прамаўляць перад тэлекамэрамі), безь якіх ня даць рады нават з адносна слабой апазыцыяй. Таму ўва ўсіх чатырох краінах на пачатку 1990-х ішло бурлівае палітычнае жыцьцё, адбывалася рэальная барацьба за ўладу. У трох з чатырох выпадкаў яна скончылася зьменай кіраўніцтва на выбарах.

Аднак з паляпшэньнем фінансавага становішча дзяржавы, удасканаленьнем арганізацыі намэнклятуры і набыцьцём досьведу палітычнай канкурэнцыі ўзрасла моц першых дзяржаўных асобаў. Тым ня менш, Захад не рабіў на іх пасьлядоўнага ціску праз Эўразьвяз ці іншыя інстытуты. У выніку ўва ўсіх чатырох краінах — хоць і ў вельмі рознай ступені — на пачатку XXI ст. склаліся ўмовы для ўзмацненьня аўтарытарызму. Лукашэнку ў Беларусі і Пуціну ў Расеі было прасьцей зрабіць палітычную сыстэму больш закрытай, бо, па-першае, у гэтых краінах нацыянальная сьвядомасьць, зьвернутая супраць кіраўніка дзяржавы, заставалася досыць слабой; па-другое, іх лідэры здолелі захаваць (у Беларусі)

альбо аднавіць (у Расеі) маштаб узьдзеяньня дзяржаўнай улады на эканоміку і эканамічныя суб'екты. І наадварот, у Малдове і ўва Ўкраіне склалася мацнейшая нацыянальная сьвядомасьць, зьвернутая супраць кіраўніка дзяржавы, а маштаб дзяржаўнага кантролю над эканамічнымі суб'ектамі быў меншы. Гэта не дазволіла стварыць больш аўтарытарную сыстэму і зьвесьці да мінімуму рэальную палітычную канкурэнцыю. У Малдове і Ўкраіне новыя лідэры апазыцыі здолелі скіраваць пра-, а тады антырасейскую нацыянальную сьвядомасьць супраць новых найвышэйшых дзяржаўных чыноўнікаў. У той жа час ува Ўкраіне намэнклятура была больш дэзарганізаваныя, чым у Малдове, таму кіраўнікі ўкраінскай дзяржавы сутыкнуліся з крыху вастрэйшай палітычнай канкурэнцыяй, чым іх малдаўскія калегі.

МОЦНЫ КІРАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ І АЎТАРЫТАРЫЗМ

Каб стварыць і ўтрымліваць аўтарытарную ўладу, кіраўнік дзяржавы мусіць быць у належнай ступені моцным. За некалькімі адметнымі выключэньнямі ў літаратуры, прысьвечанай разьвіццю палітычных сыстэмаў у посткамуністычных краінах, на гэты чыньнік дасюль практычна не зьвярталася ўвагі. Пасьля халоднай вайны намаганьні аўтакратаў захаваць уладу і/ці засяродзіць у сваіх руках палітычны кантроль сутыкаюцца з сур'ёзнымі перашкодамі. Перш за ўсё, лідэры павінны ўмець трымаць пад кантролем сваіх хаўрусьнікаў. Так, дэмакратызацыя почасту апынаецца пад пагрозай, бо сярод эліты няма адзінства што да пэўных працэдурных нормаў. Але ўмацаваньню аўтарытарнай улады амаль заўжды пагражае адсутнасьць згуртаванасьці вакол кіроўнай партыі ці самога аўтакрата сярод ягоных хаўрусьнікаў. Апроч таго, міжнародная супольнасьць патрабуе прынамсі намінальнага выкананьня дэмакратычных працэдураў, таму аўтакрат павінен умець маніпуляваць вынікамі выбараў, а таксама запалохваць апазыцыю, кантраляваць СМІ і не даваць эканамічным суб'ектам падтрымліваць яго палітычных супернікаў. Калі ў міжнароднай палітыцы вядзе рэй лібэралізм, а аўтакрат няздольны выканаць

згаданых захадаў, у выніку ў краіне часьцяком здараюцца ўспышкі палітычнай канкурэнцыі. Яе нярэдка называюць няўстойлівай дэмакратыяй — але, бадай, ня менш пасуе і азначэньне «няўстойлівы аўтарытарызм».

Моц кіраўніка дзяржавы вызначаецца паводле трох узаемазьвязаных паказьнікаў: 1) аўтарытарызм дзяржаўнай улады, 2) арганізаванасьць намэнклятуры і 3) належныя навыкі (ноў-хаў).

Па-першае, для захаваньня недэмакратычнага кіраваньня вырашальнае значэньне мае моцная дзяржава. Апошнім часам навуковая супольнасьць актыўна абмяркоўвае пытаньні вяршэнства закону і моцнай дзяржавы як перадумовы дэмакратыі. Але іншыя складнікі дзяржаўнай улады маюць вырашальнае значэньне для ўсталяваньня аўтарытарызму. Аўтарытарызм дзяржаўнай улады можна вызначыць паводле трох крытэраў: *ступень кантролю, аб'ём уладных паўнамоцтваў* і *памеры дзяржавы*. Ступень кантролю паказвае, наколькі загады найвышэйшых дзяржаўных чыноўнікаў выконваюцца іх падначаленымі. Сапраўды: да якой ступені кіраўнікі дзяржавы могуць разьлічваць, што іх падначаленыя ў рэпрэсіўных структурах і мясцовых органах кіраваньня будуць удушаць апазыцыю і фальсыфікаваць вынікі выбараў? У сваю чаргу, на ступень кантролю наўпрост уплывае фінансавае становішча дзяржавы, бо ад яго залежыць, наколькі кіраўніцтва дзяржавы здольнае выплачваць заробкі і/ці прыцягваць на свой бок патэнцыйныя сілы апазыцыі грашовымі падачкамі. Здольнасьці лідэра ўсталяваць і ўтрымліваць аўтарытарную ўладу залежаць таксама ад *аб'ёму* ягоных *адзінаасобных* паўнамоцтваў[1]. У прыватнасьці, чым больш падпарадкаваная дзяржаве эканоміка, тым прасьцей аўтакрату не дапусьціць зьяўленьня апазыцыі. Адпаведна, пры роўных іншых умовах усталяваць і захаваць аўтакратызм цяжэй (але, вядома ж, магчыма) там, дзе праведзеная больш маштабная прыватызацыя эканомікі. Як ужо адзначалі шмат дасьледчыкаў, калі існуе моцны прыватны сэктар, незалежныя СМІ, і апазыцыйныя прэтэндэнты на ўладу могуць прыцягнуць больш рэсурсаў. Нарэшце, *памеры* дзяржавы ўплываюць на тое, наколькі кіраўнік дзяржавы паддаецца ціску з боку Захаду. Адпаведна, на лідэраў Расеі (і Кітаю) ціск Захаду

дзейнічае ў меншай ступені, чым на лідэраў драбнейшых краінаў. Аднак іншыя буйныя дзяржавы празь фінансавую (і ня толькі) падтрымку могуць зьнізіць дзейснасьць ціску на невялікія краіны з боку заходніх дзяржаваў.

Па-другое, фармальная й нефармальная *арганізацыя* намэнклятуры можа таксама адыграць ключавую ролю, каб не дапусьціць пераходу эліты ў лягер апазыцыі, падрывае ўстойлівасьць аўтакратычнага рэжыму. Прыхільнікі дзяржавы часта зручней, чым каму іншаму, прыцягваць (дзякуючы доступу да дзяржаўных СМІ) дабівацца папулярнасьці. А гэтым можна скарыстацца, каб кінуць уладзе лідэра. Моцныя фармальныя ці нефармальныя арганізацыі: палітычныя партыі, трывалая сыстэма ад «дабрадзея» альбо разгалінаваныя «сямейныя» нярэдка рабіліся важнымі мэханізмамі, каб зьменшыць «перабеглых». І наадварот, адсутнасьць альбо слабасьць арганізацыяў можа павялічваць раскольніцкія настрояў хаўрусьнікаў, расьце верагоднасьць, што яны пярэйдуць другі бок, калі становішча кіраўніка дзяржавы захіснецца.[1] Я падкрэсьліваю, што дзіўна, прыхільнікі і іхнікай ціск на кіраўніка, каб ён ці яна ўнамоцтваў ці ад ўлады, ці ў выніку ліку ўнутраных ці знешніх краінах.

І ўрэшце, пры абмеркаваньні праблемаў «пабудовы» і пераходу да дэмакратыі цэнтральнае месца адводзіцца палітычным навыкам. Але яны ня менш істотныя і для стварэньня аўтарытарных рэжымаў. Роля навыкаў (ноў-хаў) асабліва ўзрасла пасьля распаду Савецкага Саюзу. Па сканчэньні халоднай вайны перад аўтакратамі, звыклымі да падтрымкі звонку, амаль поўнай адсутнасьці і ўнутранай апазыцыі, і міжнароднага ціску, паўсталі прынцыпова новыя праблемы. У гэтых новых умовах лідэры мусілі навучыцца выкарыстоўваць наяўныя рэсурсы, каб пасьпяхова канкураваць у часткова свабоднай палітычнай барацьбе, кантраляваць сваіх хаўрусьнікаў і стрымліваць апазыцыю, не выклікаючы міжнароднай рэакцыі.

Праблема з вызначэньнем ролі гэтых навыкаў у тым, што існуе спакуса разглядаць іх альбо «наастачу» (г. зн. прызнаваць іх толькі там, дзе вынікі немагчыма патлумачыць нічым іншым), альбо, наадварот, аб'ядноўваць іх з самім вынікам (г. зн. у

[1] Я

самім факце пасьпяховага ўсталяваньня аўтарытарызму бачыць доказ валоданьня належнымі навыкамі). Каб пазьбегнуць гэтых пастак, я буду разглядаць «навыкі» (ноў-хаў) як досьвед пасьпяховага ўдзелу ў агульнанацыянальных выбарах у посткамуністычную эпоху. У іх ходзе першыя асобы зразумелі, як можна маніпуляваць вынікамі выбараў і выходзіць зь іх пераможцамі. Апроч таго, я спынюся на некаторых асобных навыках, каб паказаць, як іх наяўнасьць/адсутнасьць адбівалася на выніках.

Гэтыя тры чыньнікі, ад якіх залежыць моц кіраўніка дзяржавы: аўтарытарызм дзяржаўнай улады, арганізаванасьць намэнклятуры і належныя навыкі — разглядаюцца ў гэтым артыкуле ў сукупнасьці, а не паасобку, бо яны ўзаемазьвязаныя, і адзін зь іх можа ў пэўных выпадках кампэнсоўваць слабасьць іншага. Перш за ўсё, арганізаванасьць намэнклятуры не заўсёды адыгрывае аднолькавую ролю — яна зьвязаная з аб'ёмам аўтарытарнай дзяржаўнай улады (пра гэта згадвалася вышэй). Калі аб'ём дзяржаўнай улады абмежаваны, тады арганізаванасьць намэнклятуры набывае дадатковую вагу: яна дапамагае пазьбегнуць адкрытага дэзэртэрства хаўрусьнікаў і прызначэнцаў. Чаму? Пры больш абмежаванай уладзе кіраўніка дзяржавы былыя паплечнікі, што пераходзяць у апазыцыю, здольныя прыцягнуць больш сродкаў з большай колькасьці крыніцаў, знайсьці больш хаўрусьнікаў. У прыватнасьці, калі доля ўмяшаньня дзяржавы ў эканоміку меншая (і, адпаведна, больш разьвіты прыватны сэктар), былым хаўрусьнікам будзе лягчэй наладзіць і падтрымліваць фінансавае забесьпячэньне апазыцыі. І наадварот, пры шырэйшым дзяржаўным умяшаньні ў эканоміку такія мажлівасьці будуць больш абмежаваныя. Таму ў такіх краінах роля арганізацыі намэнклятуры будзе меншая. Далей мы пакажам, што больш абмежаваныя маштабы прыватызацыі ў Беларусі за Лукашэнкам часткова вызвалілі яго ад неабходнасьці ствараць моцную фармальную ці нефармальную арганізацыю намэнклятуры. І наадварот, у Малдове, Расеі і Ўкраіне, дзе маштабы кантролю дзяржавы над эканомікай меншыя, арганізацыя намэнклятуры мела асаблівую значнасьць для ўмацаваньня аўтакратыі. У гэтых выпадках большая разгрупаванасьць рэсурсаў па-за межамі дзяржаўнай сыстэмы

павялічвала магчымасьці пераходу эліты ў лягер апазыцыі.

Да таго ж валоданьне належнымі навыкамі (ноў-хаў) у пэўнай ступені можа — прынамсі, на кароткі час — кампэнсаваць адсутнасьць альбо слабасьць арганізацыі намэнклятуры. Таму лідэры з досьведам палітычнай канкурэнцыі ў часткова свабодных умовах могуць утрымліваць уладу, пакуль здольныя вызначаць і нэўтралізоўваць патэнцыйных супернікаў зь ліку сваіх хаўрусьнікаў, перш чым тыя пасьпеюць прарасьці ў сур'ёзную пагрозу. Аднак можна чакаць, што сама сабою гэтая здольнасьць, асабліва пры абмежаваным дзяржаўным кантролі, — досыць нетрывалы падмурак для захаваньня аўтакратыі.

У сваю чаргу, калі намэнклятура слаба арганізаваная, а дзяржаўная ўлада абмежаваная, адкрытая барацьба эліты, хутчэй за ўсё, будзе падрываць ступень кантролю аўтакратаў над дзяржавай. На тое ёсьць некалькі прычынаў. Змаганьне эліты, якое выяўляецца ў росьце колькасьці ўзаемна супярэчлівых законаў і ўказаў выканаўчай улады, міністэрстваў і заканадаўчай улады. Гэта блякуе іх выкананьне, бо падначаленыя зьбітыя з панталыку: які ж загад ім выконваць? Нязгода ў вярхах можа таксама дазволіць падначаленым дасягнуць пэўнай самастойнасьці, гуляючы на рознагалосьсях. Нарэшце, адкрытая барацьба ўладных элітаў можа стварыць настолькі няпэўную атмасфэру, што падначаленыя палічаць за лепшае не рызыкаваць і не прымаць ніводнага з бакоў. Верагодна, калі магчымая перамога супраціўнага боку, падначаленыя будуць схільныя хутчэй гуляць асьцярожна і нічога не рабіць, чым рызыкаваць настроіць супраць сябе тую ці іншую фракцыю ў кіраўніцтве дзяржавы. Таму надзвычайная разьяднанасьць эліты, хутчэй за ўсё, падрывае ўстойлівасьць аўтарытарнай улады, бо зьмяншае ступень кантролю кіраўніка дзяржавы над падпарадкаванымі яму дзяржаўнымі органамі. А без адпаведнага кантролю нельга навязаць недэмакратычныя правілы гульні. Падвышаецца верагоднасьць, што СМІ ня стануць выконваць загадаў перадузята асьвятляць падзеі, органы бясьпекі — удушаць апазыцыю, а мясцовыя органы кіраваньня — фальсыфікаваць вынікі галасаваньня. І наадварот, у лідэра, які абапіраецца на аб'яднаную эліту, цалкам разьвязаныя рукі ў выкарыстаньні дзяржаўнага апарату,

каб скасаваць усялякую пагрозу сваёй уладзе.

Такім чынам, калі эліта далёкая ад прынцыпаў дэмакратыі, ад моцы найвышэйшага дзяржчыноўніка (а яна вызначаецца аўтарытарызмам дзяржаўнай улады, арганізаванасьцю намэнклятуры і належнымі навыкамі) істотна залежыць ступень палітычнай канкурэнцыі. На яе наўпрост уплываюць усе тры згаданыя чыньнікі: яны вызначаюць, у якой ступені магчымая адкрытая барацьба эліты і на якія адміністрацыйныя і матэрыяльныя рэсурсы можа абапірацца аўтакрат, што прагне захаваць сваю ўладу. Разам з тым, гэтыя тры чыньнікі ўзаемазьвязаныя. Шырокі дзяржаўны кантроль над эканомікай і, у значна меншай ступені, навыкі могуць ураўнаважыць слабую арганізаванасьць намэнклятуры, калі трэба не дапусьціць адкрытага пераходу эліты ў апазыцыю. А ён магчымы пры зьмяншэньні дзяржаўнага кантролю, слабой арганізацыі намэнклятуры і/ці адсутнасьці ў лідэра адпаведных навыкаў і здольны наўпрост падрываць аўтарытарызм дзяржаўнай улады, бо падначаленыя могуць не выконваць загадаў цэнтру.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ СЬВЯДОМАСЬЦЬ, ЗЬВЕРНУТАЯ СУПРАЦЬ КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ, І ЎМАЦАВАНЬНЕ АЎТАКРАТЫІ

Другі важны чыньнік, што ўплывае на ступень палітычнай канкурэнцыі — нацыянальная сьвядомасьць, зьвернутая супраць дзейнага кіраўніка дзяржавы. Яе выразная прысутнасьць і спрыяе мабілізацыі апазыцыі, і аслабляе найвышэйшага дзяржаўнага чыноўніка. Апазыцыйным лідэрам лягчэй арганізаваць рух пратэсту, калі яны могуць пераканаўча выявіць кіраўніка дзяржавы супраціўнікам нацыянальнай культуры ці сьветапогляду. Вядома, што праз такі зварот да эмоцыяў прасьцей абудзіць самаахвярнасьць і стварыць кааліцыю розных сацыяльных слаёў, нават пры адносна слабой грамадзянскай супольнасьці.

Высокі ўзровень нацыянальнай сьвядомасьці, зьвернуты супраць кіраўніка дзяржавы, можа істотна яго аслабіць. Па-першае, яе ўздым у пэўных рэгіёнах краіны можа зьнізіць там дзяржаўны кантроль цэнтру. У выніку кіраўніку дзяржавы будзе цяжэй фальсыфікаваць вынікі галасаваньня альбо ўжыць сілу. Па-другое, уздым нацыянальнай сьвядомасьці, зьвернутай супраць кіраўніка дзяржавы, можа перашкодзіць яму зьвярнуцца па дапамогу звонку, калі ў ёй бачыцца пагроза для нацыянальнай культуры і/ці ладу жыцьця. Так расейскае ўмяшаньне ў Малдове і Ўкраіне выклікала адмоўную рэакцыю ў гэтых краінах.

Найчасьцей — як у дэкалянізаваных афрыканскіх краінах у 1950—1960-х гг., так і ў Цэнтральнай Эўропе пры канцы 1980-х, нацыянальная сьвядомасьць, зьвернутая супраць кіраўніка дзяржавы, аб'ядноўвае большасьць насельніцтва вакол лідэраў нацыянальнай апазыцыі. Радзей здараюцца выпадкі, як, напрыклад, у Малдове і Ўкраіне, калі дзьве спаборныя нацыянальныя ідэі аслабляюць кіраўніка дзяржавы і могуць выкарыстоўвацца абодвума бакамі. У такіх выпадках першая асоба, якую б нацыянальную ідэю яна ні падтрымлівала, сутыкаецца з сур'ёзнымі перашкодамі пры ўмацаваньні сваёй улады.

ЗАГАДКА: ШЛЯХІ РАЗЬВІЦЬЦЯ ПАЛІТЫЧНЫХ СЫСТЭМАЎ У БЕЛАРУСІ, МАЛДОВЕ, РАСЕІ І ЎКРАІНЕ

Пабачыць, наколькі вызначаюць шляхі разьвіцьця дзяржаўнага ладу моц кіраўніка дзяржавы і наяўнасьць зьвернутай супраць яго нацыянальнай сьвядомасьці, можна на прыкладзе Беларусі, Малдовы, Расеі і Ўкраіны. Гэтыя краіны мелі цэлы шэраг блізкіх паказьнікаў, што, як прынята меркаваць, перадвызначаюць разьвіцьцё палітычнай сыстэмы. Па-першае, усе чатыры краіны ў 1990-х гг. прынялі канстытуцыі, што надавалі прэзыдэнтам даволі шырокія паўнамоцтвы. Па-другое, ніводная з гэтых краінаў да 1991 г. ня ведала дэмакратычнага кіраваньня. Па-трэцяе, ва ўсіх краінах на найвышэйшых

дзяржаўных пасадах знаходзіліся высокапастаўленыя савецкія чыноўнікі, гатовыя ўжыць антыдэмакратычныя сродкі, абы толькі захаваць уладу. Па-чацьвёртае, у параўнаньні з краінамі Цэнтральнай Эўропы, з аднаго боку, і Сярэдняй Азіі, з другога, усе чатыры дзяржавы мелі прыкладна аднолькава шчыльныя сувязі з Заходняй Эўропай. Па-пятае, усе чатыры краіны ўваходзяць у Раду Эўропы*, але да 2004 г. ніколі не разглядалася магчымасьць іх далучэньня да Эўразьвязу. Па-шостае, ва ўсіх чатырох выпадках сілы апазыцыі на пачатку 1990-х гг. — калі меркаваць паводле колькасьці дэмакратаў-апазыцыянэраў, абраных у нацыянальныя парлямэнты ў 1990 г. — былі прыблізна аднолькавыя (ува ўсіх чатырох выпадках дэмакраты кантралявалі ў 1990 г. каля траціны месцаў у парлямэнце). Што гэтыя фактары вызначаюць шляхі разьвіцьця палітычных сыстэмаў, паказана ў асобных аналітычных працах, таму я разглядаю іх тут толькі павярхоўна. Нарэшце, у сфэры, дзе існуюць сапраўды важныя адрозьненьні — ува ўзроўні эканамічнага разьвіцьця — вынікі супярэчаць тэорыі. Так, велічыня ВУП на душу насельніцтва была значна ніжэйшая ў тых дзьвюх краінах, дзе больш прысутнічала палітычная канкурэнцыя (520 даляраў ЗША ў Малдове і 1133 даляры ўва Ўкраіне), чым у больш аўтакратычных (2248 даляраў ЗША ў Беларусі і 3528 даляраў у Расеі)[2].

Дасьледаваньне разьвіцьця палітычнай канкурэнцыі ўзарыенціравана выяўляе дзьве асаблівасьці, якія вымагаюць тлумачэньня: 1) на пачатку 1990-х гг. ува ўсіх чатырох краінах адбывалася актыўная палітычная канкурэнцыя, але зь цягам часу яна зьменшылася; 2) разам з тым, усе чатыры дзяржавы ўступілі ў XXI ст. з рознымі ўзроўнямі закрытасьці.

Я ацэньваю ўзровень палітычнай канкурэнцыі/закрытасьці па распадзе Савецкага Саюзу паводле чатырох крытэраў. Першае — гэта ўзровень выбарчых махінацыяў на карысьць кіраўніка дзяржавы. Гэты паказьнік сьведчыць, да якой ступені перамогі дзяржслужбоўца маніпулюе падлікам галасоў, удушае апазыцыйных кандыдатаў і/ці постфактум скрадае перамогі апазыцыі[4]. Другі крытэр — манапалізацыя кіраўніком дзяржавы СМІ — адлюстроўвае, наколькі электронныя СМІ зь

* Беларусь была прынята ў Раду Эўропы ў 1997 г. пасьля таго, як яе ўлады ігнаравалі шматлікія заклікі спыніць перасьлед апазыцыянэраў і правесьці свабодныя і сумленныя выбары. Гл. Council of Europe, Parliamentary Assembly, Opinion 193 (1996) on Belarus's application for membership of the Council of Europe. — Прым. рэд.

[2] Для параўнаньня: ВУП на душу насельніцтва ў Польшчы ў 2003 г. складаў 12 570 даляраў ЗША. Гл. World Bank, World Development Indicators Online (WDI Online). Курс даляра паводле стану на 1995 г. (WDI Online).

[3] Мінай гэтыя тэрміны ўжываюцца ў навуковай літаратуры. Гл. Freedom House, Nations in Transit 2004: Methodology. — Прым. рэд.

[4] Гл. Mikhail Myagkov, Peter C. Ordeshook, Dimitri Shakin, The Forensics of Election Fraud: Russia and Ukraine, Cambridge University Press, 2009. — Прым. рэд.

[5] Гл. Timothy Frye, Ora John Reuter, David Szakonyi, Political Machines at Work: Voter Mobilization and Electoral Subversion in the Workplace, World Politics, 66, 2014, 195–228. — Прым. рэд.

сярэдзіны 1990-х гг. — гэта значнасць ці доступ медыі фінансавых і/ці арганізацыйных рэсурсаў. Выкалі крытэрыі закрытасьці — фактычны кантроль вокладаў чаго ўлады і адпаведнага рэжыму. Вынікі паказаў, што Беларусь, Расея і Украіна ўлагоджаюць у свой уладзе закладкі ўсіх рэжымаў, так што ў парлямэнце фактычна не кажа сьведчыць, што прэзыдэнт кіраўніку дзяржавы «Сярэдні» дасягнік сьведчыць, што бяз кантролю эфэктыўны, каб вяскі ўлады элементы на карачаны ў найбарчым працэсе. «Сярэдні», тым не менш, сьведчыць, што прыкладна ў 1990-х гг. ўладай захаваў ужываецца дастаткова ісьцю, каб сур'ёзна пытаньня, ектуацыя чэнкі дзяржаўнай ўніцыі ўяркаўці — але не настолькі, каб абсалютна пазбавіць «Сярэдні» кантролю над гарэнцыі. Напрыклад, «сярэдні» паказьнік адлюстроўвае ўзровень 1994—1999 гг. і Украіне ў 1995—2004 гг. Хоць выбарчыя махінацыі з памерам 5—10 % прасоў (як у Сэрбіі ў 1990-х гг. і ў Украіне за часам Кузьмы), якія пачаты, ідзе сур'ёзна мяненасьці апазыцыі эфэктыўную — адрозьніць ад выбарчых махінацыі ў 40—60 % сувэдэрбай, што ў Беларусі выразна выбары фактычна бесэнсоўным. Прыкладам можа быць Украіна ў 1992—1994 гг., калі парлямэнт упарта блакаваў апазыцыйныя ініцыятывы ў электронных СМІ. «Сярэдні» — што дапрыкладам электронных СМІ выбараў Малдавіі ў 1993—2000 гг. дзяржавы, але бяз прыкладам ідзе ў бойнае кантролю адкрытай чарыгаю ў заканадаўчай: парлямэнт тады дамогся ўнясеньня ў слабая ацэнкі фактычна пазбаўленай прост фінансавай ці рэзыдэнтацыйных рэсурсаў. Пры ўсярэдні або паказваньні ў абнародных выбараў прызначэньня фінансавыя й арганізацыйныя рэсурсы, але яна сур'ёзна саступае намэнклятуры. Нарэшце, «нізкі» паказьнік сьведчыць, што апазыцыя мае прыблізна такія самыя ці нават большыя фінансавыя і арганізацыйныя рэсурсы, як і кіраўнік дзяржавы.

Табліца 1

Прыблізны ўзровень закрытасьці рэжымаў у Беларусі, Малдове, Расеі і Украіне ў 1992—2004 гг.

Пачатак — сярэдзіна 1990-х гг.	**Беларусь** 1992–1996	**Малдова** 1992–2000	**Расея** 1992–1999	**Украіна** 1992–1995
Выбарчыя махінацыі з боку ўладаў	Сярэдні	Нізкі	Сярэдні	Нізкі
Манапалізацыя СМІ кіраўніком	Сярэдні	Нізкі	Сярэдні	Сярэдні

дзяржавы				
Слабасць апазыцыі	Сярэдні	Нізкі	Сярэдні	Нізкі
Фактычны кантроль выканаўчай улады над парлямэнтам	Сярэдні	Нізкі	Сярэдні	Нізкі
Канец 1990-х — пачатак 2000-х гг.	1997–2004	2001–2004	2000–2004	1996–2004
Выбарчыя махінацыі з боку ўладаў	Высокі	Сярэдні	Сярэдні	Сярэдні
Манапалізацыя ўладай электронных СМІ	Высокі	Высокі	Высокі	Высокі
Слабасць апазыцыі	Высокі	Сярэдні	Высокі	Сярэдні
Фактычны кантроль выканаўчай улады над парлямэнтам	Высокі	Высокі	Высокі	Сярэдні

У Табліцы 1 адлюстраваны ўзровень закрытасьці кожнага з рэжымаў пасьля распаду Савецкага Саюзу ў 1991 г. На пачатку 1990-х ува ўсіх чатырох краінах назіраўся высокі ўзровень палітычнай канкурэнцыі. Асабліва варта адзначыць, што ўва ўсіх чатырох выпадках кіраўнікі дзяржаваў сутыкнуліся падчас прэзыдэнцкіх выбараў 1994—1996 гг. з жорсткай канкурэнцыяй і ўсюды, апроч Расеі, страцілі ўладу. Адначасова апазыцыя карысталася адноснай свабодай арганізацыйнай дзейнасьці; існаваў параўнальна моцны парлямэнт, а ў СМІ, нягледзячы на нярэдка тэндэнцыйнае асьвятленьне падзеяў на карысьць дзейнага кіраўніка дзяржавы, адзначаўся і сур'ёзны ўзровень адкрытага іншадумства.

У другой палове 1990-х гг. палітычнае жыццё ва ўсіх чатырох краінах стала больш закрытым — хоць і ў рознай ступені. Сьпярша ў Беларусі Лукашэнка, які ў 1994 г. перамог на прэзыдэнцкіх выбарах тагачаснага кіраўніка дзяржавы прэм'ер-міністра Кебіча, усталяваў, пачынаючы з 1997 г., надзвычай закрыты рэжым з цалкам паслухмянымі заканадаўчай уладай, СМІ і судовай сыстэмай. Расея таксама зрабілася больш аўтакратычнай. На пачатку 2000-х гг. Пуцін змог узяць пад досыць жорсткі кантроль парлямэнт і абмежаваць свабоду СМІ, закрыўшы адзін за адным незалежныя тэлевізійныя каналы. На працягу 1990-х гг. з усіх чатырох краінаў найбольш свабоднае і дынамічнае палітычнае жыццё вялося ў Малдове. Існавала моцная заканадаўчая ўлада, разнастайныя СМІ, абмежаваньні для палітычных арганізацыяў былі нязначныя, і двойчы адбылася дэмакратычная зьмена ўлады — больш, чым у любой зь небалтыйскіх постсавецкіх краінаў у 1990-х гг. Паводле іроніі лёсу, Малдова пачала хіліцца ў бок аўтакратызму пасьля таго, як стала парлямэнцкай рэспублікай, а камуністычная партыя атрымала на выбарах 2001 г. 70 % месцаў у парлямэнце. Камуністычны ўрад узмацніў кантроль над сродкамі масавай інфармацыі ды судамі. Але ў той самы час апазыцыя працягвае кантраляваць сталіцу і атрымліваць значнае фінансаваньне. Украіна таксама на працягу 1990-х і на пачатку 2000-х гг. рухалася да ўсё большага аўтакратызму. Леанід Кучма, што зьмяніў у 1994 г. Леаніда Краўчука на пасадзе прэзыдэнта, узмацніў кантроль над парлямэнтам, узьвёў у сыстэму выбарчыя махінацыі і перасьлед апазыцыі. Аднак Кучма, адрозна ад сваіх калегаў зь Беларусі й Расеі, сутыкнуўся з сур'ёзным супрацівам сваёй уладзе і ў 2004 г. мусіў сысьці.

Такім чынам, разгледзеўшы гэтыя прыклады, мы апынаемся перад дзьвюма загадкамі: 1. Чым можна патлумачыць, што ўва ўсіх чатырох краінах на пачатку 1990-х гг. існавала досыць актыўная палітычная канкурэнцыя, але зь цягам часу яна зьменшылася? 2. Чаму гэтыя краіны ўступілі ў XXI ст. з такім розным узроўнем закрытасьці?

АДГАДКА ТАЯМНІЦЫ ПАЛІТЫЧНАЙ КАНКУРЭНЦЫІ НА ЗАХАДЗЕ БЫЛОГА СССР

У 1990-х гг. рэгіён вызначаўся надзвычай актыўнай і трывалай палітычнай канкурэнцыяй, калі браць пад увагу ўвесь спэктар неспрыяльных для разьвіцьця дэмакратыі чыньнікаў. Інстытуцыйная спадчына старога рэжыму: адсутнасьць традыцыяў дэмакратыі і прававой дзяржавы, слабасьць грамадзянскай супольнасьці — істотна абцяжарвала разьвіцьцё дэмакратыі. Дык як жа патлумачыць існаваньне сапраўднай, хай сабе і далёкай ад дасканаласьці палітычнай канкурэнцыі ў краінах рэгіёну?

Па-першае, здаецца, што інстытуцыйнымі трактоўкамі, якія цяпер пераважаюць у досьледах палітычных сыстэмаў, не патлумачыць шляхоў разьвіцьця дзяржаўнага ладу ў гэтым рэгіёне. Як ужо адзначалася вышэй, з інстытуцыйнага гледзішча нельга абгрунтаваць адрознасьці паміж гэтымі чатырма краінамі, бо ўсе яны на пачатку 1990-х гг. былі паўпрэзыдэнцкімі рэспублікамі. Гэтаксама з інстытуцыйнага гледзішча немагчыма зразумець зьмены, што адбываліся зь цягам часу ў кожнай з гэтых краінаў[7]. Напрыклад, Малдова пачала хіліцца да закрытасьці *пасьля* таго, як стала парлямэнцкай рэспублікай. Апроч таго, ва ўмовах слабасьці і крохкасьці палітычных інстытутаў, канстытуцыя і іншыя палітычныя інструмэнты почасту выступаюць хутчэй *адлюстраваньнем*, а не *перадумовай* улады вышэйшай службовай асобы. Так, прэзыдэнт Ельцын увёў звышпрэзыдэнцкую канстытуцыю *пасьля* таго, як у 1993 г. разагнаў парлямэнт.

Па-другое, наяўнасьць палітычнай канкурэнцыі часам разглядаецца як вынік прыхільнасьці кіраўніка дзяржавы да дэмакратыі. Такі падыход таксама не стасуецца да ня[illegible] выпадкаў. Так, у 1990-х гг. большасьць лідэраў у нав[illegible] рэгіёне не спрабавалі ўсталёўваць надзвычай рэпрэсіўную і закрытую ўладу, як у некаторых краінах Сярэдняй Азіі, а выканаўчая ўлада ўва ўсіх чатырох краінах — прадстаўнікі былой камуністычнай эліты, далёкія ад уплыву з Захаду — выявіла гатовасьць выходзіць па-за рамкі закону, абы[illegible]

[7] Адзінае ж[illegible] Беларусь, якая ў[illegible] Адзін[illegible] статыстычнай хаду[illegible] ты[illegible] ца

ўва ўладзе і/ці абмежаваць публічную крытыку на сваю адрасу. У Расеі, напрыклад, Ельцын у 1993 г. расстраляў непакорлівы парлямэнт, а ў 1996 г. ледзь не адмяніў прэзыдэнцкія выбары, якія ён мог прайграць. У Малдове першы прэзыдэнт краіны Сьнегур у 1991 г. перакройваў выбарчае заканадаўства, каб стаць адзіным кандыдатам на першых прэзыдэнцкіх выбарах, напярэдадні распаду СССР, а неўзабаве пасьля гэтага ўвёў закон, што прадугледжваў неверагодна высокія штрафы і нават турэмнае зьняволеньне за «паклёп» на прэзыдэнта альбо старшыню парлямэнту (аднак у далейшым Сьнегур ініцыяваў, дамагчыся пераабраньня на другі тэрмін і сутыкнуўся на надзвычай вострай крытыкай у мас-мэдыях і моцным парлямэнтам, які, у прынцыпе, прадыктаваў яму ўмовы Канстытуцыі 1994 г.). Ува Ўкраіне Краўчук закрыў у 1994 г. антыпрэзыдэнцкі тэлеканал, а ў 1993-м ледзьве не разагнаў апазыцыйны парлямэнт пры дапамозе вайсковай сілы. Урэшце, прэм'ер-міністар Кебіч у Беларусі зачыняў вочы на настроеныя да яго СМІ і фальсыфікаваў галасы падчас прэзыдэнцкіх выбараў 1994 г.[9]. Такія дзеяньні прымушаюць сур'ёзна задумацца, наколькі наяўнасьць палітычнай канкурэнцыі ў гэтых краінах можна вытлумачыць прыхільнасьцю кіраўніцтва да дэмакратыі.

Больш за тое, не пацьвярджаецца і тэза, што выхад разрушаў палітычнай сыстэмы залежыць ад узроўню народнай падтрымкі дэмакратыі. Насамрэч праведзеныя ў 1990-х гг. апытаньні паказваюць, што дэмакратычныя інстытуты мелі *самую высокую* народную падтрымку ў Беларусі (на ўзроўні 80%), а *самую нізкую* — у Малдове. Балты), а

Аднак каб стаць адзіным кандыдатам на першых прэзыдэнцкіх выбарах, напярэдадні распаду СССР, а неўзабаве пасьля гэтага ўвёў закон, што прадугледжваў неверагодна высокія штрафы і нават турэмнае зьняволеньне за «паклёп» на прэзыдэнта альбо старшыню парлямэнту (аднак у далейшым Сьнегур ініцыяваў, дамагчыся пераабраньня на другі тэрмін і сутыкнуўся на надзвычай вострай крытыкай у мас-мэдыях і моцным парлямэнтам, які, у прынцыпе, прадыктаваў яму ўмовы Канстытуцыі 1994 г.). Ува Ўкраіне Краўчук закрыў у 1994 г. антыпрэзыдэнцкі тэлеканал, а ў 1993-м ледзьве не разагнаў апазыцыйны парлямэнт пры дапамозе вайсковай сілы. Урэшце, прэм'ер-міністар Кебіч у Беларусі зачыняў вочы на настроеныя да яго СМІ і фальсыфікаваў галасы падчас прэзыдэнцкіх выбараў 1994 г.[9]. Такія дзеяньні прымушаюць сур'ёзна задумацца, наколькі наяўнасьць палітычнай канкурэнцыі ў гэтых краінах можна вытлумачыць прыхільнасьцю кіраўніцтва да дэмакратыі.

Больш за тое, не пацьвярджаецца і тэза, што выхад разрушаў палітычнай сыстэмы залежыць ад узроўню народнай падтрымкі дэмакратыі. Насамрэч праведзеныя ў 1990-х гг. апытаньні паказваюць, што дэмакратычныя інстытуты мелі *самую высокую* народную падтрымку ў Беларусі (на ўзроўні 80%), а *самую нізкую* — у Малдове. Балты),

9 Гл. пра гэта: Astrov V. Democratic Consolidation and Nation-Building in Belarus // Nationalities Papers. 2002. Vol. 30. No. 2. P. 277—278.

прозвішчы іх былі ў 1990-х гг. Радасць, верагодна, прывёў да таго, што ў сусьветнай палітыцы запанаваў заходні лібэралізм. У выніку мы назіралі надзвычай шырокае фармальнае, хоць і далёка не заўсёды дзейснае ўкараненьне дэмакратычных інстытутаў. Нядаўна некаторыя аўтары зьвярнулі ўвагу, што эфэктыўнасьць ціску з Захаду, каб прымусіць посткамуністычныя краіны праводзіць дэмакратызацыю, залежыць ад ступені сувязяў гэтых краінаў з Захадам. Так, гэтым чыньнікам можна абгрунтаваць адрозьненьні паміж названым рэгіёнам і іншымі, напрыклад, Сярэдняй Азіяй. Але сувязі з Захадам не тлумачаць адрозьненьняў паміж самімі гэтымі краінамі, бо, як адзначалася вышэй, усе яны мелі прыкладна аднолькавы ўзровень кантактаў з Захадам. І аб'ём гэтых сувязяў зь цягам часу *павялічыўся*, што ніяк не стасуецца з параўнальным *зьніжэньнем* палітычнай канкурэнцыі.

МОЦ КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ, ЗЬВЕРНУТАЯ СУПРАЦЬ ЯГО НАЦЫЯНАЛЬНАЯ СЬВЯДОМАСЬЦЬ І ЎЗРОВЕНЬ ПАЛІТЫЧНАЙ КАНКУРЭНЦЫІ

У значнай ступені адрозьненьні ўва ўзроўні палітычнай канкурэнцыі — паміж асобнымі краінамі і ў кожнай зь іх на працягу канкрэтнага часу — можна наўпрост суаднесьці з адрозьненьнямі ў тым, наколькі моцны кіраўнік дзяржавы і наколькі магутная зьвернутая супраць яго нацыянальная сьвядомасьць. Адпаведныя паказьнікі для кожнай краіны падсумаваныя ў Табліцы 2[10].

Табліца 2. Моц кіраўніка дзяржавы і зьвернутая супраць яго нацыянальная сьвядомасьць

Пачатак — сярэдзіна 1990-х гг.	Беларусь 1992–1996	Малдова 1992–2000	Расея 1992–1999	Украіна 1992–1995
Моц кіраўніка дзяржавы	Досьвед	Нізкі	Сярэдні	Сярэдні
Арганізаваць насьць	Сярэдні	Сярэдні	Сярэдні	Нізкі

[10] Досьвед вымяраецца колькасьцю альтэрнатыўных агульнанацыянальн выбараў, у якіх Сярэдні удзельнічаў кіраўнік дзяржавы альбо ягоная

намэнклатуры					партыя (няма
Аўтарытарызм дзяржаўнай улады	Сярэдні	Нізкі	Сярэдні	Нізкі	досьведу агульнанацыянальн
Нацыянальная сьвядомасьць, зьвернутая супраць кіраўніка дзяржавы	Нізкі	Высокі	Нізкі	Высокі	выбараў — «нізкі», адны выбары — «сярэдні», больш за адны — «высокі»).
Канец 1990-х — пачатак 2000-х гг.	1997–2004	2001–2004	2000–2004	1996–2004	«Арганізаванасьць намэнклатуры» адлюстроўвае,
Моц кіраўніка дзяржавы	Досьвед	Высокі	Высокі	Высокі	у якой ступені першая
Арганізаванасьць намэнклатуры	Сярэдні	Высокі	Высокі	Сярэдні	асоба можа разьлічваць на свае
Аўтарытарызм дзяржаўнай улады	Высокі	Сярэдні	Высокі	Сярэдні	структуры ў захаваньні ўлады.
Нацыянальная сьвядомасьць, зьвернутая супраць кіраўніка дзяржавы	Нізкі	Высокі	Нізкі	Высокі	«Нізкі» паказьнік — фактычная адсутнасьць любых фармальных альбо нефармальных аб'яднаньняў,

Зыходзячы з паказьнікаў Табліцы 2, нам варта было б чакаць: 1) большае закрытасьці палітычнай сыстэмы ва ўсіх чатырох краінах у пазьнейшы пэрыяд, бо зь цягам часу павялічылася моц кіраўнікоў дзяржавы, і 2) меншай закрытасьці ў Малдове і Ўкраіне ў параўнаньні зь Беларусьсю й Расеяй, бо ў першых дзьвюх краінах прысутнічае нацыянальная сьвядомасьць, зьвернутая супраць кіраўніка дзяржавы, а самі найвышэйшыя дзяржаўныя чыноўнікі слабейшыя, чым іх беларускія і расейскія калегі. Як мы бачым, акурат так яно і ёсьць. У наступным разьдзеле разглядаюцца мэханізмы, праз якія

што найпрост падтрымліваюць кіраўніка дзяржавы. «Сярэдні» — ўстанаваньне шматлікіх,

кожны з згаданых чыньнікаў уплывае на ўзровень палітычнай канкурэнцыі ў краіне. Далей я пакажу, як у кожнай з краін дзяржаваў розныя варыянты, у якіх моц кіраўніка дзяржавы спалучаецца са зьвернутай супраць яго нацыянальнай сьвядомасьцю, прывялі да розных вынікаў.

МОЦ КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ

Пераўтварэньні ўва ўзроўні палітычнай канкурэнцыі за цягам часу абумоўленыя тым, як зьмянялася моц кіраўніка дзяржавы. На пачатку 1990-х гг., адразу па распадзе СССР, зьменшыліся магчымасьці эліты засяроджваць у сваіх руках уладу і выходзіць за рамкі прававога поля. І гэта — нягледзячы на практычна неабмежаваны доступ да дзяржаўных рэсурсаў і слабасьць фармальна арганізаванай грамадзянскай супольнасьці. Па-першае, роспуск камуністычнай партыі — асноўнай *арганізацыі намэнклятуры* — азначаў, што эліта ў былым Савецкім Саюзе, каб каардынаваць сваю дзейнасьць і трымаць сытуацыю пад кантролем, мусіла разьлічваць на нефармальныя сувязі. Аднак нефармальныя структуры эліт у Беларусі, Малдове, Расеі і Ўкраіне — прынамсі на пачатку 1990-х, а можа і пазьней — былі параўнальна слабыя. Раптам апынуўшыся на чале новых дзяржаваў, кіраўнікі выканаўчай улады часьцяком мусілі прыцягваць у сваю адміністрацыю «чужынцаў», «людзей з боку». Адначасова неафіцыйныя патрабаваньні ляяльнасьці да свайго «патрона», прынятыя за савецкім часам, у постсавецкі пэрыяд нярэдка не выконваліся. Акурат таму ў 1990-х гг. і ўзьнікла сур'ёзная палітычная канкурэнцыя. Нямала палохаючы кіраўнікоў дзяржавы, высокапастаўленыя прызначэнцы часта кідалі сваіх патронаў. Напрыклад, першы прэзыдэнт Малдовы Сьнегур у размове з аўтарам наракаў, што ў 1996 г. прызначаны Сьнегурам прэм'ер-міністар вырашыў выставіць супраць яго сваю кандыдатуру на прэзыдэнцкіх выбарах, нягледзячы на тое, што Сьнегур *«яго цягнуў»*[11]. У Расеі і Ўкраіне самымі сур'ёзнымі супернікамі дзейных прэзыдэнтаў таксама выступалі не «чужанінцы», а іхныя ж былыя хаўрусьнікі і/ці прызначэнцы: віцэ-прэзыдэнт Рункой і мэр Масквы Юры Лужкоў у Расеі; прэм'ер-міністры Кучма,

Палітычныя зьмяненьні ў краінах зьмяшчаюць групаў, што падтрымліваюць выканаўчую ўладу. «Высокі» — адзіная вэртыкальна выбудаваная фармальная ці нефармальная высокадысцыплінаваная арганізацыя, шчыльна зьвязаная з кіраўніком дзяржавы. Нарэшце, паказьнік «аўтарытарызм дзяржаўнай улады» адлюстроўвае памеры дзяржавы; ступень цэнтралізаванага кантролю над органамі вясьпекі і мясцовай уладай (вымяраецца паводле неспадзяванасьці чыноўнікаў

Лазарэнка і Юшчанка ўва Ўкраіне. Гэта ўсё адно, што ў выбарах 2004 г. у ЗША Джорджу Бушу супрацьстаяў бы ўсё ня Джон Керы, а Дык Чэйні. У дадатак ува ўсіх чатырох краінах слабая арганізацыя ўладнай эліты спрычынілася да каёф паміж парлямэнтам і выканаўчай уладай — дарма што дэпутатаў залежалі альбо былі гатовыя прыняць залежнасьць ад выканаўчай улады. У кожнай з гэтых краінаў выканаўчая ўлада напачатку ня здолела арганізаваць у парлямэнце эфэктыўную ўладную кааліцыю, якая магла б праводзіць праграму выканаўчай улады і *de facto* засяродзіць у сваіх руках уладу.

ніжэйшага ўзроўню); а таксама б'ём ліктаў дзяржаўнага кантролю над эканамічнымі суб'ектамі). Уздым нацыянальнай сьвядомасьці, зьвернутай супраць кіраўніка дзяржавы, ацэньваецца паводле падтрымкі элітай і народам нацыянальнай ідэі, якую можна скіраваць супраць кіраўніка дзяржавы (гл. тлумачэньне

ніжэй).

У Малдове, Украіне і Расеі ўзмацненьне фармальных і нефармальных арганізацыяў намэнклятуры пры канцы 1990-х і на пачатку 2000-х гг. наўпрост вяло да большай закрытасці рэжымаў. У Малдове ўпэўненая перамога ў 2001 г. Кішынэў, высокадысцыплінаванай і цэнтралізаванай камуністычнай партыі фактычна абярнулася пераходам паўнамоцтваў заканадаўчай улады да партыйнага кіраўніцтва. У Расеі Пуцін празь сетку спэцслужбаў і досыць дысцыплінаваную кіроўную партыю забясьпечыў сабе кантроль як над парлямэнтам, так і над дзяржапаратам. Ува Ўкраіне прэзыдэнт Кучма паставіў у залежнасьць шэраг разрозьненых прапрэзыдэнцкіх партыяў у парлямэнце і стварыў адносна разгалінаваную сыстэму шантажу, каб трымаць пад кантролем хаўрусьнікаў.

Па-другое, на пачатку 1990-х гг. распад савецкай дзяржавы і фінансавая крыза аслабілі аўтарытарызм дзяржаўнай улады. Увогуле дзяржаўныя лідэры на той час фармальна мелі шырэйшыя ўладныя паўнамоцтвы, чым пазьней. Але слабасьць вэртыкальнага кантролю, выкліканая нявыплатай заробкаў альбо субсыдыяў мясцовым органам кіраваньня, пазбавіла ўладу лідэраў рэальнага зьместу. Празь фінансавыя праблемы дзяржавы побач з адкрытым супрацьстаяньнем на вышэйшым узроўні аслабіўся кантроль над органамі бясьпекі й выведкай. Само падзеньне Савецкага Саюзу можна часткова патлумачыць стратай кантролю над войскам, міліцыяй і КГБ, якія ў 1991 г. адмовіліся падтрымаць путчыстаў. У постсавецкі пэрыяд выканаўчай уладзе ўва ўсіх чатырох краінах было няпроста змушаць органы бясьпекі чыніць ціск на апазыцыю. Ува Ўкраіне, напрыклад, прэзыдэнту Краўчуку ў 1993 г. давялося адмовіцца ад плянаў распусьціць парлямэнт, калі ён сутыкнуўся з супрацівам галавы МУС. «[Распусьціць парлямэнт] без падтрымкі міліцыі, — прызнае ў сваіх мэмуарах Краўчук, — было б занадта рызыкоўна»[12].

Слабы кантроль над мясцовымі органамі кіраваньня на пачатку 1990-х гг. таксама замінаў займацца выбарчымі махлярствамі. Калі на выбарах 1996 г. у Малдове за пасаду прэзыдэнта змагаліся прэм'ер-міністар, старшыня парлямэнту і дэпутаты, прэзыдэнт, ніводны з кандыдатаў ня змог атрымаць 28 адсоткаў

[11] Інтэрвію з Мігранам і Сыноўцам, Малдова, 8 жніўня 2002 г.

[12] Краўчуку, Леанідзе Мацвееўне. С. 228.

падтрымкі мясцовай улады. Пры гэтым аслабляўся і кантроль цэнтру над рэгіянальнымі СМІ, бо яны, як правіла, залежалі ад мясцовых органаў кіраваньня. Так, напрыклад, у Расеі падчас парлямэнцкіх выбараў 1999 г. падкантрольны ўраду Масквы канал «ТВ-Центр» быў галоўнай крыніцай інфармацыі, якая асьвятляла падзеі з антыкрамлёўскіх пазыцыяў (хоць, урэшце, і беспасьпяхова). Падобным чынам ува Ўкраіне ў 1994 г. кантроль Краўчука над цэнтральнымі дзяржаўнымі мэдыямі ўраўнаважваўся праапазыцыйнымі СМІ на ўсходзе краіны, падкантрольнымі мясцовай уладзе. Нарэшце, слабы кантроль кіраўнікоў дзяржавы над сталіцай у Малдове і Ўкраіне на пачатку 2000-х гг. ня даў задушыць антыўрадавыя дэманстрацыі.

Апроч таго, у сярэдзіне 1990-х гг. урады Малдовы, Расеі і Ўкраіны (але не Беларусі) распачалі праграмы прыватызацыі. У выніку скараціўся *аб'ём* непасрэднай дзяржаўнай улады над эканомікай, што спрыяла разьвіццю палітычнай канкурэнцыі. Але прынцыпы прававой дзяржавы ў гэтых краінах былі надзвычай слабыя. Таму рэформы стварылі *не* самастойную бізнэс-клясу, як на Захадзе, а групу вельмі заможных «алігархаў», па-ранейшаму залежных ад сваіх «сувязяў» ува ўладзе. У Малдове за Лучынскім, у Расеі за Ельцыным і ўва Ўкраіне за Кучмам выканаўчая ўлада імкнулася праз гэтую залежнасьць купіць сабе падтрымку асобных алігархаў, сутыкаючы міжсобку розныя групоўкі. Аднак пры адсутнасьці моцнага прапрэзыдэнцкага (фармальнага альбо нефармальнага) палітычнага аб'яднаньня такая стратэгія аказалася ў сярэднетэрміновай пэрспэктыве ненадзейная. Алігархі ў ключавых момантах адступаліся ад кіраўніка дзяржавы — фінансавалі апазыцыйныя палітычныя партыі і СМІ. Найбольш адметны ўкраінскі выпадак, дзе ў 2004 г. апазыцыйны кандыдат Віктар Юшчанка змог атрымаць велізарную падтрымку ад бізнэсоўцаў, яшчэ некалькі гадоў таму шчыльна зьвязаных з рэжымам Кучмы.

Ува ўсіх чатырох краінах паляпшэньне фінансавага становішча дзяржавы, а таксама аслабленьне барацьбы ў асяродзьдзі эліты далі магчымасьць узмацніць кантроль цэнтру і, адпаведна, шырэй маніпуляваць СМІ і выбарчым працэсам. У Расеі Пуцін

таксама няўхільна пашыраў аб'ём фармальнай і нефармальнай дзяржаўнай улады над эканомікай, што ў сваю чаргу абмяжоўвала рэсурсы лідэраў апазыцыі і іх партыяў.

Нарэшце, захаваць уладу і/ці засяродзіць у сваіх руках палітычны кантроль замінала недасьведчанасьць, адсутнасьць адпаведных навыкаў. Калі раптам распаўся СССР, кіраўнікі новых дзяржаваў, якія да таго ўдзельнічалі выключна ў дэкаратыўных савецкіх выбарах, проста ня ведалі, як даць рады з апазыцыяй, нягледзячы на, бадай, неабмежаваны доступ да арганізацыйных і матэрыяльных рэсурсаў. Аднак зь цягам часу дзяржаўныя лідэры альбо навучыліся маніпуляваць грамадзкай думкай і спыняць дэзэртэрства эліты, альбо ім на зьмену прыйшлі новыя людзі, дасьведчаныя ў гэтай справе. Іронія лёсу ў тым, што яны эфэктыўна скарысталі шмат якія навыкі, неабходныя палітыкам у сталых дэмакратыях, як то палітычны маркетынг, дзеля мэтаў, надзвычай далёкіх ад дэмакратыі.

Наступствы недасьведчанасьці ў палітычнай канкурэнцыі асабліва праявіліся ў Беларусі. Адрозна ад іншых краінаў, яе ўрад з савецкіх часоў амаль не зьмяніўся, і выканаўчая ўлада да 1994 г. не сутыкалася з агульнанацыянальнымі выбарамі. Дарма што ў часе прэзыдэнцкіх выбараў 1994 г. прэм'ер-міністар Кебіч меў падтрымку СМІ, большасьці рэгіянальных органаў кіраваньня і большасьці дэпутатаў парлямэнту, праз сваю недасьведчанасьць ён не заўважыў пагрозы з боку Лукашэнкі, пакуль ужо не было запозна. Самае недаравальнае, што Кебіч у 1993 г., маючы на сваім баку трывалую парлямэнцкую большасьць, нічога не зрабіў, каб ня даць Лукашэнку, тады параўнальна невядомаму правінцыйнаму дэпутату, узначаліць адзін з галоўных парлямэнцкіх камітэтаў — расьсьледаваньня карупцыі ўва ўрадзе. Як казаў адзін блізкі паплечнік Кебіча, «ніхто з нас ня думаў, што нейкі неадукаваны дырэктар саўгасу [Лукашэнка] зможа зразумець тонкасьці дзяржаўных фінансаў. Мы не прадбачылі, як праз гэты камітэт можна раскруціцца. Мы проста ня мелі такога досьведу»[13]. Кебіч нават пяць месяцаў дазваляў Лукашэнку карыстацца ўрадавымі памяшканьнямі ў цэнтры Менску — амаль да самых выбараў, калі ўжо стала ясна, што Лукашэнка ўяўляе сабой рэальную пагрозу[14]. У выніку Лукашэнка праславіўся як змагар

з карупцыяй і нечакана атрымаў на прэзыдэнцкіх выбарах ашаламляльную перамогу.

Назапашаны досьвед у многіх выпадках пераканаў лідэраў у неабходнасьці вучыцца на мінулых памылках і больш эфэктыўна засяроджваць уладу ў сваіх руках. У Беларусі Лукашэнка ўлічыў фатальную памылку Кебіча, які не пашаніў патэнцыйнага апанэнта. Новы кіраўнік дзяржавы фактычна стаў душыць яшчэ ў зародку ўсялякую апазыцыйнасьць сярод эліты. Зусім нядаўна Лукашэнка пасадзіў у турму Мікалая Марыніча, баючыся, што той робіцца занадта папулярным. У Расеі арганізатары «Адзінства» ўлічылі папярэднія помылкі, стварыць партыю ўлады. Яны пасьпяхова стварылі пракрамлёўскай групоўцы імідж маладога антымаскоўскага руху, што дапамагло партыі дабіцца нечакана добрых вынікаў на парлямэнцкіх выбарах 1999 г.

[13] Інтэрвію з Аляксандрам Фядутам, чальном перадвыбарчага штабу Лукашэнкі ў 1994 г., Менск, 23 чэрвеня 2004 г.

[14] Інтэрвію з Аляксандрам Фядутам, чальном перадвыбарчага штабу Лукашэнкі ў 1994 г., Менск, 23 чэрвеня 2004 г.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ СЬВЯДОМАСЬЦЬ, ЗЬВЕРНУТАЯ СУПРАЦЬ КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ

Пры канцы 1990-х і на пачатку 2000-х гг. ува ўсіх краінах — Беларусі, Малдове, Расеі, Украіне — паляпшэньне фінансавага становішча дзяржавы, умацаваньне дзяржаўнага кантролю, лепшая арганізаванасьць эліты і набыцьцё кіраўнікамі дзяржавы адпаведных навыкаў стварылі магчымасьць усталяваць мацнейшы палітычны кантроль. Аднак на пачатку XXI ст. у кожнай краіне назіраецца розны ўзровень закрытасьці: палітычная канкурэнцыя захавалася ў Малдове ды Ўкраіне ў большай ступені, чым у Беларусі і Расеі. Часткова гэтыя адрозьненьні можна патлумачыць, параўнаўшы нацыянальную сьвядомасьць, зьвернутую супраць кіраўніка дзяржавы, у гэтых чатырох выпадках. У Малдове і Ўкраіне раскол нацыянальнай сьвядомасьці азначаў, што новым кіраўнікам дзяржавы з абодвух бакоў пагражала досыць сур’ёзная небясьпека ў выглядзе дыямэтральна супрацьлеглых нацыянальных ідэяў. Адрозна ад Беларусі й Расеі (і, збольшага, усіх астатніх былых савецкіх рэспублік), Малдова і Ўкраіна маюць у сваім складзе значныя тэрыторыі, у насельніцтва якіх яшчэ да іх уключэньня ў Савецкі Саюз сфармавалася моцная антырасейская

(антысавецкая) нацыянальная сьвядомасьць. У выніку тамтэйшыя жыхары вызначаюцца даволі моцнай антысавецкай і «праэўрапейскай» нацыянальнай сьвядомасьцю. Разам з тым, у склад гэтых краінаў уваходзяць і іншыя тэрыторыі, дзе на момант распаду Савецкага Саюзу моцна ўкаранілася савецкая сьвядомасьць. Гэтыя супярэчнасьці дазволілі апазыцыі (як пра-, гэтак і антырасейскай/антысавецкай) скіраваць тую ці іншую вэрсію нацыянальнай сьвядомасьці супраць вышэйшай службовай асобы. Гэта паспрыяла мабілізацыі масаў нават пры адсутнасьці фармальна арганізаванай грамадзянскай супольнасьці, а таксама пазбавіла кіраўніка дзяржавы інструмэнтаў кантролю і некаторых выгодаў ад падтрымкі звонку. І наадварот, адносная слабасьць антысавецкай нацыянальнай сьвядомасьці ў Беларусі і непапулярнасьць ідэі распаду Расеі пазбавіла апазыцыю гэтага важнага інструмэнту мабілізацыі масаў. Далей мы разгледзім, як у кожнай краіне спалучаліся моц кіраўніка дзяржавы і зьвернутая супраць яго нацыянальная сьвядомасьць, што прывяло да розных вынікаў у разьвіцьці палітычных сыстэмаў.

МАЛДОВА: РАСКОЛ, ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ Й ПАЛІТЫЧНАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ

Разьвіцьцё палітычнай сыстэмы ў Малдове пасьля халоднай вайны абумоўлівалася існаваньнем нацыянальнай сьвядомасьці, зьвернутай супраць кіраўніка дзяржавы, і кардынальнымі зьменамі ў арганізацыі намэнклятуры. У 1990-х гг. слабая арганізаванасьць намэнклятуры, невялікія магчымасьці для дзяржаўнага аўтарытарызму і адносная моц як пра-, гэтак і антырасейскай сьвядомасьці спрычыніліся да вельмі актыўнай палітычнай канкурэнцыі. Аднак прыход да ўлады на пачатку 2000-х гг. надзвычай згураванай камуністычнай партыі прывёў да большай закрытасьці палітычнай сыстэмы.

Самі асаблівасьці ўлучэньня Малдовы ў склад СССР стварылі моцную базу як для антырасейскай, так і для антымалдаўскай/антырумынскай нацыянальнай сьвядомасьці. Малдова ўзьнікла з румынскай тэрыторыі, захопленай Савецкім Саюзам у рамках

пакту Молатава—Рыбэнтропа 1939 г. У постсавецкі пэрыяд гэта выклікала жорсткія спрэчкі вакол нацыянальнага самавызначэньня: некаторыя нацыяналісты імкнуліся да аб'яднаньня з Румыніяй, між тым як іншыя хацелі разьвіваць больш шчыльныя сувязі з Расеяй. Выбухованебясьпечная сіла нацыянальнай сьвядомасьці, зьвернутай супраць кіраўніка дзяржавы, замінала захоўваць уладу і/ці засяроджваць у сваіх руках палітычны кантроль. Першы прэзыдэнт краіны Мірча Сьнегур прыйшоў да ўлады на пачатку 1990-х гг. на хвалі антысавецкіх настрояў. Аднак ягоная асоба асацыявалася з надзвычай непапулярным прарумынскім нацыяналізмам і ўзброеным канфліктам у Прыднястроўі на ўсходзе Малдовы. Таму ў значнай часткі эліты і насельніцтва расла няпрыязь да Сьнегура, і на прэзыдэнцкіх выбарах 1996 г. ён пацярпеў паразу ад прарасейскага кандыдата Пэтру Лучынскага. Адначасова існаваньне нацыянальнай сьвядомасьці, зьвернутай супраць кіраўніка дзяржавы, перашкаджала ўзмацненьню прэзыдэнцкай улады. На працягу 1990-х гг. малдаўскія лідэры былі між молатам і кавадлам: прарумынскім нацыяналістычным рухам, з аднаго боку, і прарасейскімі сіламі, з другога. Так, напрыклад, на пачатку 1990-х гг. прарумынскія нацыяналісты адмовіліся падтрымаць намаганьні Сьнегура пашырыць паўнамоцтвы прэзыдэнта, бо ён не пагаджаўся на аб'яднаньне з Румыніяй. Ягоны наступнік, прэзыдэнт Лучынскі, таксама сутыкнуўся з моцнай апазыцыяй як з боку нацыяналістаў, так і з боку прарасейскіх камуністаў. У адказ на спробы Лучынскага ўсталяваць прэзыдэнцкую ўладу, якая, паводле меркаваньня Вэнэцыянскай камісіі, «супярэчыла эўрапейскім прынцыпам дэмакратыі», гэтыя супрацьлеглыя групоўкі аб'ядналіся і ператварылі Малдову ў парлямэнцкую рэспубліку.

Прыход да ўлады высокаарганізаванай і згуртаванай камуністычнай партыі абярнуўся большай закрытасьцю, нягледзячы на ўсталяваньне парлямэнцкай сыстэмы. Так, партыя, што ў 2001 г. атрымала 70 % месцаў у парлямэнце, скарысталася сваім паноўным становішчам і маналітнасьцю, каб фактычна паставіць пад свой аднаасобны кантроль дзяржаўныя СМІ і судовую сыстэму, якія на працягу 1990-х захоўвалі самастойнасьць, выкарыстоўваючы супярэчнасьці паміж рознымі палітычнымі сіламі. Да таго ж — і ў гэтым

кардынальнае адрозьненьне ад Украіны, — надзвычай згуртаваная парлямэнцкая фракцыя малдаўскіх камуністаў, у складзе якой шмат прадстаўнікоў ніжэйшых сацыяльных слаёў: настаўнікаў, кіроўцаў, — што страцілі б усё, калі б пакінулі партыю, амаль цалкам пазьбегла пераходаў на іншы бок.

Аднак нацыянальная сьвядомасьць, зьвернутая супраць кіраўніка дзяржавы, па-ранейшаму аслабляе ўладу. Узімку 2002 г. камуністы адмовіліся ад плянаў пашырыць выкладаньне расейскай мовы ў школах, калі нацыяналісты на працягу некалькіх месяцаў ладзілі ў малдаўскай сталіцы акцыі пратэсту з прыцягненьнем 50 000—80 000 чалавек, пры тым што ў Кішынэве пражывае толькі 670 000 чалавек. За апошні час канфлікт з Расеяй з-за Прыднястроўя прывёў да таго, што малдаўскія ўлады апынуліся ў моцнай залежнасьці ад падтрымкі ЗША і Эўразьвязу. І расейскі ўрад пачаў падтрымліваць апазыцыйныя ўраду групоўкі.

СЛАБАСЬЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СЬВЯДОМАСЬЦІ, ЗЬВЕРНУТАЙ СУПРАЦЬ КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ, І АЎТАРЫТАРЫЗМ У БЕЛАРУСІ

У Беларусі слабасьць антысавецкай беларускай нацыянальнай сьвядомасьці і захаваньне аўтарытарнай дзяржаўнай улады ў значнай ступені дапамаглі Аляксандру Лукашэнку ўмацаваць аўтарытарную сыстэму. Хоць у Беларусі народ падтрымліваў дэмакратыю і дэмакратаў ня менш (а мо і больш), чым у Малдове альбо Ўкраіне, але антырасейская/антысавецкая альбо праэўрапейская беларуская сьвядомасьць заставалася слабой. Як і ў трох астатніх краінах, дэмакратычная апазыцыя атрымала прыблізна траціну месцаў у парлямэнце на выбарах 1990 г. Аднак, адрозна ад Малдовы і Ўкраіны, антысавецкія беларускія нацыяналісты складалі толькі невялікую частку дэпутатаў (5—8 %). На наступных выбарах 1995 г. яны не змаглі атрымаць *аніводнага* мандата.

Слабасьць антырасейскай і праэўрапейскай беларускай нацыянальнай сьвядомасьці спрыяла умацаваньню аўтакратыі некалькімі спосабамі. Па-першае, праз адсутнасьць папулярнай

15 Інтэрвію з У.Ладзімерам Навасядлам, дэпутатам парлямэнту ў 1995—1996 гг., Менск, 8 ліпеня 2004 г. Інтэрвію з Паўлам

Дэпутаты ўнаўтварэнні 1995–1996 гг. (Менск, 6 Масква, 2004 Украіны — было значна цяжэй арганізаваць масавыя пратэсты супраць рэферэндуму, які ініцыяваў Лукашэнка, таму што ў 1996 г. парламентаўтару, што яны адчувалі сябе ізаляванымі й

[15] Belarus and Russia: Between Moscow and Brussels. London: Federal Trust, 2002. P. 182.

[16] Нягледзячы на дэпутатаў парламенту, Лукашэнку ўдалося правесці рэферэндум, і ён атрымаў Інтэрнэт-рэсурсы

[17] Bohdan Krawchenko, Andrew Wilson. Belarus: Economic Model Viable? // The EU and Belarus: Between Moscow and Brussels. London: Federal Trust, 2002. P. 182.

[18] Нарабыкаў, Андрэй. Дэпутаты парламенту Лукашэнку ўзмацняюць // Радыё Свабода. 2004. 6 ліст.

[19] Белавенцаў, Віктар. Беларускі прэзідэнт. Масква, 1994. С. 386.

[20] Ельцин, Борис. Записки президента. Москва, 1994. С. 11—12.

[21] Быкаў, Васіль. Пакаранне смерцю. Мінск, 2000. С. 32.

Мы ніяк не можам супрацьстаяць Расіі, таму Беларусь мае права на самастойны рэферэндум, вынікі якога будуць ёю выкананы.

Аляксандр Лукашэнка

Ён прапанаваў аб'яднаць Беларусь і Расію ў канфедэратыўную дзяржаву, у якой Беларусь будзе мець 6 галасоў, а Расія — 100. Нягледзячы на тое, што Лукашэнка ў 1996 г. атрымаў права на самастойны рэферэндум, вынікі якога будуць ёю выкананы, у Беларусі не было ніякіх прэцэдэнтаў, каб прэзідэнт ігнараваў рашэнні парламенту. Нягледзячы на тое, што Лукашэнка ў 2004

адрозьнівалася ад ягоных калегаў у трох астатніх краінах: яму ніколі не даводзілася сутыкацца з магутнай, амаль незалежнай клясай алігархаў. Нацыянальнае адзінства і захаваньне ўсёабдымнага дзяржаўнага кантролю над эканомікай пазбавілі Лукашэнку ад колькі-небудзь сур'ёзнай пагрозы ягонай уладзе нават бяз моцнай фармальнай ці нефармальнай арганізацыі намэнклятуры. Па сутнасьці, большасьць назіральнікаў згодныя, што самае слабое месца рэжыму Лукашэнкі — ягоная залежнасьць ад Расеі. Хоць Расея абараняе параўнальна невялікую беларускую дзяржаву ад ціску звонку, але гэтая сытуацыя стварае патэнцыйную небясьпеку для рэжыму Лукашэнкі ў будучыні, калі Пуцін вырашыць ад яго адмовіцца.

МОЦ КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДЗІНСТВА Ў РАСЕІ

У Расеі дынаміка разьвіцьця палітычнай сыстэмы вызначалася памерамі самой краіны, а таксама зьменамі ў аб'ёме ўладных паўнамоцтваў дзяржавы і ў арганізаванасьці намэнклятуры. Першы і найбольш відавочны момант — дзякуючы сваім памерам і магутнасьці, Расея менш паддаецца ціску звонку, чым астатнія тры краіны. Аднак на пачатку 1990-х гг. фінансавая і эканамічная крыза моцна аслабілі дзяржаву, і ціск на ўлады быў значна больш эфэктыўны. Да таго ж Ельцын, як і ягоныя калегі ў астатніх краінах, ня меў моцнай арганізацыі намэнклятуры (фармальнай ці нефармальнай). Прыняўшы рашэньне выйсьці з партыі, Ельцын застаўся без арганізацыі, пры дапамозе якой ён мог бы трымаць пад кантролем сваіх хаўрусьнікаў і падначаленых. Напачатку пры фармаваньні ўраду Ельцын спрабаваў абаперціся на сваё нефармальнае сьвярдлоўскае кола, аднак пазьней яму давялося прыцягнуць значна больш службоўцаў, якіх ён часьцяком нават ня ведаў. Часткова і з гэтай прычыны шмат хто зь ягоных прызначэнцаў і хаўрусьнікаў на пачатку 1990-х гг. — у тым ліку перадусім Аляксандар Руцкой і Руслан Хасбулатаў — не выяўлялі лаяльнасьці і неўзабаве выступілі супраць яго. Апроч таго, Ельцын ня меў у парлямэнце трывалай падтрымкі. А падчас фінансавай крызы 1998 г. многія з тых, хто раней

падтрымліваў прэзыдэнта, адышлі ад яго. У выніку прапанаваную Ельцыным кандыдатуру на пасаду прэм'ер-міністра адхілілі, і ён мусіў пагадзіцца з прызначэннем Яўгена Прымакова, які ў далейшым падтрымаў у 1999 г. асноўныя апазыцыйныя антыкрамлёўскія сілы. У сваю чаргу, канчатковае рашэньне Ельцына абраць сабе пераемнікам Уладзімера Пуціна тлумачылася, відаць, пуцінскай ляяльнасьцю.

Ельцыну таксама было няпроста нарошчваць аўтарытарызм дзяржаўнай улады. У 1993 г. ён ледзьве здолеў пераканаць сілавыя структуры выступіць супраць парлямэнту. І ён сустрэў адкрыты супраціў з боку спэцслужбаў, калі паспрабаваў у 1996 г. адкласьці прэзыдэнцкія выбары[19]. Магчыма, галоўнае ў тым, што ельцынская агрэсіўная праграма прыватызацыі значна зьменшыла *аб'ём* дзяржаўнага кантролю над эканомікай. Хоць алігархі, якія зьявіліся ў выніку прыватызацыі, значна больш залежалі ад дзяржавы, чым заходнія бізнэсмэны, але яны выявіліся вельмі ненадзейнымі хаўрусьнікамі ўлады і найперш дбалі пра ўласныя інтарэсы. Адметна, што Ўладзімер Гусінскі, якому належала тэлекампанія НТВ, атрымліваў ільготныя крэдыты і шырокія правы на вяшчаньне за адкрытую падтрымку ягоным каналам у 1996 г. выбарчай кампаніі Ельцына. Аднак гэта не перашкодзіла Гусінскаму стаць на бок асноўных апазыцыйных Крамлю сілаў падчас парлямэнцкіх выбараў 1999 г.

Пры Пуціну аўтарытарызм дзяржаўнай улады рэзка вырас. Эканамічны рост і падвышэньне цэнаў на нафту палепшылі фінансавае становішча дзяржавы і павялічылі грамадзкую падтрымку ўраду. У той жа час Пуцін значна сур'ёзьней паставіўся да стварэньня арганізацыі намэнклятуры, чым Ельцын за амаль увесь свой прэзыдэнцкі тэрмін. Пуціну ўдалося стварыць і раскруціць прапрэзыдэнцкую партыю «Адзіная Расея», якая цяпер кантралюе 2/3 месцаў у парлямэнце. Значна больш дысцыплінаваная, чым папярэднія партыі ўлады, яна забясьпечвае поўнае падпарадкаваньне расейскай заканадаўчай улады ўсім пажаданьням выканаўчай. Што, бадай, яшчэ больш істотна, каб вярнуць сабе ўсю моц дзяржаўнай улады, Пуцін прыцягнуў адносна паслухмяныя, збудаваныя на прынцыпе жорсткай герархіі спэцслужбы. Так,

на дзяржаўныя пасады і ў рэгіянальныя органы дзяржаўнага кіраваньня прэзыдэнт прызначыў безьліч былых вайскоўцаў і супрацоўнікаў спэцслужбаў. Гэтая стратэгія значна ўзмацніла падпарадкаваньне цэнтру з боку рэгіянальных уладаў і павялічыла маштабы дзяржаўнага кантролю над эканомікай. У 2000—2003 гг. Пуцін, падпарадкаваўшы сабе спэцслужбы і суды, абмежаваў незалежнасьць алігархаў — кульмінацыяй стаў арышт Міхаіла Ходаркоўскага і захоп «Юкасу». У выніку рэзка зьнізілася палітычная канкурэнцыя. У 2003 г., адрозна ад 1999 г., усе нацыянальныя тэлекампаніі, а таксама некаторыя рэгіянальныя каналы, як то Маскоўскі «ТВ-Центр», знаходзіліся пад кантролем Крамля. Адрозна ад сваіх калегаў з Малдовы і Ўкраіны, Пуцін дамогся, каб алігархі на парлямэнцкіх выбарах 2003 г. падтрымлівалі толькі праўрадавыя партыі.

Нарэшце, калі ў Малдове і Ўкраіне нацыянальная сьвядомасьць стала зброяй апазыцыі, дык у пуцінскай Расеі яна мацавала ўладу кіраўніка дзяржавы. Так, вайна супраць Чачэніі, якая хацела выйсьці са складу Расеі, дазволіла Пуціну падчас перадвыбарнай кампаніі 2000 г. падаваць сябе «абаронцам радзімы». Лідэры Малдовы і асабліва Ўкраіны, наадварот, мелі значна больш абмежаваныя магчымасьці ў выкарыстаньні расколу ў сваіх краінах, каб дамагчыся народнай падтрымкі. Да таго ж, Пуцін здолеў скарыстацца адзінай паноўнай расейскай нацыянальнай ідэяй, каб дыскрэдытаваць апазыцыю — у тым ліку алігархаў пераважна габрэйскага паходжаньня, прыкладам, Міхаіла Ходаркоўскага альбо апазыцыйнага лідэра Рыгора Яўлінскага. У выніку апазыцыя ўладзе Пуціна цяпер адносна слабая.

НАЦЫЯНАЛІЗМ, ЗЬВЕРНУТЫ СУПРАЦЬ КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ, СЛАБАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ НАМЭНКЛЯТУРЫ І ЎСТОЙЛІВАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ ЎВА ЎКРАІНЕ

Ува Ўкраіне падзел на захад і ўсход, слабая арганізацыя партыі ўлады і слабасьць аўтарытарнай дзяржавы цягам усяго постсавецкага пэрыяду заміналі спробам умацаваць

аўтарытарызм. У заходняй Украіне, якая ў XIX — пачатку XX ст. уваходзіла ў склад Аўстра-Вугорскай імпэрыі, сфармавалася моцная ўкраінская нацыянальная сьвядомасьць. А ўсходняя Ўкраіна бліжэйшая ў культурным пляне да Расеі. Першы прэзыдэнт Украіны Леанід Краўчук прыйшоў да ўлады ў хаўрусе з нацыяналістамі, падтрымліваючы ідэю незалежнасьці ад Савецкага Саюзу. Аднак у выніку рэзкага эканамічнага спаду пачатку 1990-х гг. прамысловая эліта на ўсходзе ставілася да Краўчука ўсё больш непрыхільна. На выбарах 1994 г. вялікая частка дзяржаўнага апарату ўва ўсходняй Украіне актыўна супрацьдзейнічала кампаніі Краўчука і падтрымлівала Кучму, які ў той час выступаў за больш шчыльныя стасункі з Расеяй. У далейшым украінскія нацыяналісты, адрозна ад сваіх малдаўскіх калегаў, падтрымалі спробы Кучмы ўзмацніць прэзыдэнцкую ўладу, калі ён пачаў адстойваць большую незалежнасьць Украіны. У выніку ўва Ўкраіне ўсталявалася мацнейшая, у параўнаньні з Малдовай, прэзыдэнцкая ўлада. Аднак ухіл прэзыдэнта ў бок украінскага нацыяналізму выклікаў моцную рэакцыю добра арганізаваных левых партыяў. У 1990-х гг. яны стаялі на чале парлямэнту, таму той адхіляў шмат якія прапанаваныя Кучмам захады дзеля рэфармаваньня эканомікі.

Кучмавым спробам умацаваць сваю антыдэмакратычную ўладу таксама замінала слабая арганізаванасьць намэнклятуры і абмежаваньне дзяржаўнага ўмяшаньня ў эканоміку ў выніку прыватызацыі. Па-першае, Кучма, як і Ельцын, кантраляваў ход прыватызацыі і стварэньня надзвычай багатай групы квазісамастойных бізнэсоўцаў-алігархаў, якія часткова залежалі ад дзяржаўнай падтрымкі, але, тым ня менш, назапасілі вялізныя капіталы. У дадатак, падобна Ельцыну і адрозна ад Пуціна і Вароніна ў Малдове, Кучма заўсёды абапіраўся не на нейкую адну партыю, а на разьяднаную й вельмі хісткую кааліцыю алігархаў, што часта варагавалі паміж сабой. У выніку Кучму, як і Ельцыну, было цяжка трымаць у падпарадкаваньні сваіх хаўрусьнікаў. Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2004 г. апазыцыйны кандыдат Віктар Юшчанка — а ў 1999—2001 гг. прэм'ер-міністар, прызначаны самім жа Кучмам, — скарыстаўся велізарнай фінансавай і арганізацыйнай падтрымкай каманды алігархаў і былых міністраў, усяго

некалькі гадоў таму шчыльна зьвязаных з прэзыдэнтам. У далейшым, дарма што Кучму ў 2002—2004 гг. падтрымлівала парлямэнцкая большасьць, ключавыя фігуры, у тым ліку старшыня парлямэнту і былы кіраўнік адміністрацыі, адышлі ад яго перад самымі выбарамі.

Адсутнасьць адзінства ў вярхах, у сваю чаргу, скончылася крахам аўтарытарнай герархіі дзяржаўнай улады пасьля спробаў сфальсыфікаваць вынікі прэзыдэнцкіх выбараў 21 лістапада 2004 г. Слабы кантроль цэнтру наўпрост спрычыніўся да таго, што апазыцыя здолела правесьці ў Кіеве пры канцы 2004 г. буйнамаштабныя акцыі пратэсту. Па-першае, як аўтар бачыў на ўласныя вочы па дарозе ў Кіеў у першы ж дзень Памаранчавай рэвалюцыі, камандаваньне міліцыі было спаралюшаванае, і аўтаінспэкцыя амаль не перашкаджала руху калёнаў аўтобусаў, у якіх у Кіеў ехалі ўдзельнікі пратэстаў[20]. Адвярнуліся ад ураду і некаторыя аддзяленьні дзяржаўнай чыгункі, якія перавозілі ў сталіцу тысячы дэманстрантаў. Гэта дазволіла вялікай колькасьці найбольш адданых прыхільнікаў Юшчанкі з заходняй Украіны вельмі хутка трапіць у Кіеў. У дадатак да ўсяго, паколькі адміністрацыя ўкраінскай сталіцы прыняла бок апазыцыі, падчас акцыяў была забясьпечаная работа гарадзкой інфраструктуры, у тым ліку электрасетак, каналізацыі, водазабесьпячэньня і службаў вывазу сьмецьця. Да таго ж асноўныя сілы міліцыі, войска й службаў бясьпекі хутка перайшлі на бок апазыцыі.

Нарэшце, апазыцыя скарысталася нацыянальнай сьвядомасьцю, зьвернутай супраць кіраўніка дзяржавы. Адрозна адчыніў аднадумцаў у Маскве і Менску, кіеўскія лібэралы маліі разьлічваць на моцную падтрымку заходняга рэгіёну ў барацьбе супраць антыўкраінскага, на думку многіх, рэжыму. Відаць, гэтае эмацыйнае нацыянальнае пачуцьцё як асноўнае падтрымкі Юшчанкі дадавала актывістам рашучасьці амаль тры тыдні трымацца на вуліцах сталіцы пры мінусавых тэмпэратурах. А паколькі ўва Ўкраіне выразна выяўлялася праэўрапейская нацыянальная сьвядомасьць, адкрытая расейская падтрымка, што спрацавала ў Беларусі ў апазыцыйныя выклікала адваротную рэакцыю ўкраінскіх нацыянальнасьцяў. Разам з тым верагодна, што прарасейскія настроі ў іншых

[20] Імпэрыю з сваіх блізкім да Юліі Цімашэнкі.

[28] Кожна 2004 г., Кіеў. Ён сьцьвярджаў, што 1996 г., дэпутаты змаглі

рэгіёнах Украіны перашкодзяць любым будучым спробам Юшчанкі альбо ягоных хаўрусьнікаў усталяваць недэмакратычнае кіраваньне. Усё ж нават дарма што дзяржаўныя СМІ перад апошнім турам галасаваньня ў тыдняў падавалі асобу Юшчанкі ў станоўчым сьвятле, ён набраць толькі 52 % галасоў.

ВЫСНОВЫ

У гэтым артыкуле на прыкладзе чатырох постсавецкіх краінаў дасьледуюцца падставы палітычнай канкурэнцыі ў неспрыяльных умовах: пры адноснай міжнароднай ізаляцыі, слабой грамадзянскай супольнасьці, адсутнасьці дэмакратычнага кіраваньня і прававой дзяржавы, калі на чале дзяржавы стаяць лідэры, гатовыя да антыдэмакратычных захадаў, абы ўтрымацца ва ўладзе. Адна і тасовы развал ССР і пачатковы пратэсту. падтрымкі ў Беларусі, Малдове, Расеі і ў Ўкраіне замінаў спробам кіраўнікоў дзяржавы захаваць уладу і ізаляваць апазыцыю, гэтага раньняга перабудовы, калі дзяржаўныя лідэры былі асабістымі рамтоўным ладам Савецкага Саюзу, ва ўсіх чатырох краінах назіраецца даволі моцная палітычная канкурэнцыя. Назіраецца рост арганізаванасьці намэнклятуры, палітычнае фінансаванага стаіну дзяржавы і досьведу кіраваньня ва умовах часткова свабоднай канкурэнцыі спрыяла больш закрытасьці ўлады. У сваю чаргу выразная нацыянальная сьвядомасьць, зьвернутая супраць кіраўніка дзяржавы, у Малдове і Ўкраіне перашкодзіла спробам усталяваць антыдэмакратычнае кіраваньне на доўгатэрміновую пэрспэктыву.

Папярэднія дасьледаваньні дазваляюць меркаваць, што слабасьць кіраўніка дзяржавы і зьвернутая супраць яго нацыянальная сьвядомасьць робяцца перашкодай для ўмацаваньня аўтарытарызму і ў іншых краінах, дзе эліта не выяўляе прыхільнасьці да дэмакратыі.

У іншых постсавецкіх краінах, дзе нацыянальная ідэя, зьвернутая супраць кіраўніка дзяржавы, выявілася слабейшай,

пераканаць міліцыю прыбраць усе некалькі перашкоды на дарогах на працягу паўтара дня пасьля пачатку кіраўнікоў

21 Нягледзячы на вялікую колькасць расейскага насельніцтва ў Казахстане, краіна не сутыкнулася з такім расколам, як ва Украіне і Малдове, бо перад уключэньнем краіны ў Савецкі Саюз казацкая нацыянальная сьвядомасьць не была сфарміраванай.

22 McClinchey, Eric M. Paying for Patronage: Regime Change in Post-Soviet Central Asia. PhD dissertation, Princeton University, 2003. P. 13. Існуюць таксама некаторыя доказы сувязі паміж тым, колькі моцны кіраўнік дзяржавы і палітычнай канкурэнцыяй у небагатых краінах былога Савецкага Саюзу ёмкуле. Так, назіраецца пазітыўная сувязь (0,81) паміж глыбінёй эканамічнай крызы ў 1990—2003 гг. і ўзроўнем палітычнай канкурэнцыі (паводле ацэнак арганізацыі «Freedom House» за 2002—2003 гг.).

разыходжаньні ў ступені палітычнай канкурэнцыі часткова тлумачацца розьніцай у моцы кіраўнікоў дзяржавы. На Каўказе, напрыклад, краіна з найслабейшай дзяржаўнай уладай — Грузія — мела таксама найбольш дынамічную палітычную сыстэму з моцным парлямэнтам і адносна вольнымі СМІ. Адрозна ад Азэрбайджану, Грузія не атрымлівала выгады ад доступу да багатых прыродных рэсурсаў, і эканоміка краіны пяражыла адну з найцяжэйшых крызаў на тэрыторыі ўсяго былога СССР. У той жа час грузінскія ўлады значна слабей кантралявалі свае спэцслужбы й мясцовыя органы кіраваньня, чым у Армэніі. Так, армянскае войска, якое на пачатку 1990-х гг. заваявала 20 % тэрыторыі Азэрбайджану, змагло задушыць 150-тысячныя акцыі пратэсту армянскай апазыцыі пасьля фальсыфікацыі вынікаў выбараў у 1996 г. Адрозна ад Армэніі, напрыканцы 2003 г. органы бясьпекі Грузіі адвярнуліся ад Шэварднадзэ падчас значна менш маштабных — усяго 20 000—40 000 чалавек — акцыяў пратэсту. Разыходжаньні паміж сярэднеазіяцкімі рэжымамі таксама можна часткова патлумачыць розьніцай у моцы кіраўніка дзяржавы. Так, нечакана шырокая палітычная лібэралізацыя на пачатку 1990-х гг. у Кыргызстане была зьвязаная з абмежаванасьцю дзяржаўных рэсурсаў. Таму, адрозна ад Казахстану[21], «кіраўніцтва краіны ня мела магчымасьці купляць згоду палітычнай эліты альбо прымушаць яе да згоды»[22].

Падсумоўваючы, адзначым, што засяродзіць увагу на аўтарытарнай частцы спэктру палітычных сыстэмаў — гэта значыць ня проста сказаць: «Шклянка напалову пустая», — калі астатнія кажуць: «Шклянка напалову поўная». Аналізуючы крыніцы аўтарытарызму, мы зьвяртаемся да цэлага шэрагу праблемаў — у тым ліку і мэханізму рэпрэсіяў і згуртаванасьці эліты вакол аўтакрата альбо партыі, — якім надаецца вобмаль увагі ў літаратуры, прысьвечанай перадумовам дэмакратычнага кіраваньня. Гэткая ўвага да аўтарытарызму важная ня толькі сама сабою. Калі кіраўнік аўтарытарнай дзяржавы не дае рады асноватворным праблемам антыдэмакратычнага кіраваньня ў сучасным сьвеце, тым самым ствараюцца істотныя падставы для росту і разьвіцьця палітычнай канкурэнцыі.

Пераклаў з ангельскай Сяргей Богдан
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/01/28
[image]

[image] [image] [image]

ВАЛЯНЦІН ГРЫЦКЕВІЧ
доктар культуралёгіі, радны Беларускай Народнай Рэспублікі на выгнаньні, ганаровы чалец Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына», ганаровы чалец Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, сябра Беларускага ПЭН-цэнтру.

Валянцін Грыцкевіч Справа аб замаху Барыса Каверды на Пятра Войкава Яшчэ адзін міт пра этнічнага беларуса

Не аднойчы аўтар гэтага артыкулу зьвяртаў увагу на неабходнасьць дасканаліць мэтодыку вывучэньня гістарычных крыніцаў і спосабы гістарыяграфічных досьледаў[1]. На жаль, у нас часта пануе спажывецкі падыход да крыніцаў, калі яны падганяюцца пад канцэпцыі навукоўца. Я ўпэўнены: пераходу да іх сур'ёзнага вывучэньня з аналізам і сынтэзам, у адпаведнасьці з распрацаванай за некалькі апошніх стагодзьдзяў мэтодыкай[2], вырашальных зьменаў у беларускай гістарычнай навуцы не адбудзецца. Апрацоўка і асэнсаваньне біяграфіі аднаго гістарычнага пэрсанажа — Барыса Каверды, — як мне здаецца, можа быць спробай падобнага досьледу.

Гэта адбылося восем дзясяткаў гадоў таму. Адзін юнак зь Вільні (звалі яго Барысам Кавердам) вырашыўся на адчайны

[1] Гл.: Грыцкевіч В. Якой быць беларускай гістарычнай навуцы. Полымя. 1992. № 5. С. 202—228; Грыцкевіч В. Гісторыя і міфы. — Мінск: БелФранс, 2000. — 205 с.

[2] Гл.: Гришкевич В. П., Каун С. В., Ходин С. Н. Теория и методика источниковедения. Минск: БГУ, 2000. Асабліва с. 61



кроп. Зрабіў ён гэта прылюдна — на пэроне галоўнага вакзалу Варшавы 7 траўня 1927 г. пляцадзёна за стрэлу паўз з моцнага прадстаўніка[3] Савецкага Саюзу ў Польшчы Пятра Лазаравіча Войкава. Заматовец, даўся ў Кіпелі шыгаламі Я (№ 155—163 за 8—16 Парыж. 1927 г.), у прафільмі як асуджаў Барыса Каверду на найбільшую ўзыкатарыю.

[3] Савецкі 7 траўня 1927 г. пляцадзёна за стрэлу паўз з моцнага прадстаўніка[3] Савецкага Саюзу ў Польшчы Пятра Лазаравіча Войкава. Заматовец, даўся ў Кіпелі шыгаламі Я (№ 155—163 за 8—16 Парыж. 1927 г.), у прафільмі як асуджаў Барыса Каверду на найбільшую ўзыкатарыю.

[4] Гэтыя падзеі асьвятляліся ў тагачасных газэтах[4]. (Іншыя вельмі нагадваў забойства іншым юнаком спадкаемцы імператарскага пасаду Аўстра Вугорыччыны эрцэрцага Франца Фэрдынанда на 13 гадоў раней і забойства ў Швайцарыі савецкага дыпламата Вацлава Вароўскага белаэмігрантам Конрадзі ў 1923 г.)

[5] Sprawa Borysa Kowerdy. Zabójstwo posła Z.S.S.R. Piotra Wojkowa. — Warszawa: Skład Główny w Księgarni I. Hoesicke, 1927. — 84 s. — (Polski Związek prawników kresowych).

[6] Убийство Войкова / Пер. с польск. и дополн. W. (С. Войцеховский). — Париж: Возрождение, [б. г. Дата издания 1927 г.]. — 118 с.

[7] Убийца товарища Войкова перед польским судом / Пер. с польск. по стенографическому отчету судебного процесса Н. Седельникова. — Москва, Ленинград: Госиздат, 1927. — 116 с.

[8] Губенко Г. Н. Петр Лазаревич Войков. Краткий биографический очерк. — Симферополь: Крымиздат, 1959. — 48 с., Захаров С. А. Комиссар-дипломат (Петр Лазаревич Войков). — [Свердловск]: Свердловское книжное издательство, 1962. — 71 с.

[9] Коверда Б. С. Покушение на полпреда Войкова 7 июня 1927 года. Свидетельское показание // Русская мысль. № 3505. Париж, 1984. 23 февраля. С. 9; [Тамсама.] № 3506. 1984. 1 марта. С. 9. Перадрук: Коверда Б. Покушение на полпреда Войкова // Часовой. № 647 (1). Брюссель, 1984. С. 11—18.

[10] Орехов В. Б. С. Коверда // Часовой. № 665 (3). 1987. Апрель. С. 30; Самарин В. Звёздный час. (Памяти Б. С. Коверды) // Вече. Т. 25. Мюнхен, 1987. С. 175—179.

[11] Боголюбов А. Борис Коверда. Выстрел на Варшавском вокзале // Вече. Т. 34. 1989. С. 174—199. Усе трыуаўсоры (нэкралёгаў і біяграфічнага нарысу), мяркуючы паводле тэкстаў іхных працаў, добра ведалі Б. Каверду.

[12] Мститель // Родина. 1992. № 4. С. 15—18.

[13] Стужынская Н. І. Беларусь мяцежная. З гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціву. 20-я гады XX стагоддзя. Вільня: Беларускія ваенныя літаратары. 2000. С. 134.

[14] Карус Чак І. Тэрарыст ці акруўдаў на доўгія захоўваюцца ў Стэрэнскай ўдасцюнцкая думка. 1999. № 5. С. 27—29.

на Набыла ўсё тое ж // Наша слова. № 51, 2002, 17 чэрвеня.
[16] Стужынская Ірына. Цецярынскі. Нацыянальны. С. 128.
[17] Там жа. С. 136.
[18] Гарэнка Анатоль. Чалавек // Народная воля. 2002. № 330, 5 кастрычніка.

забойцу царя-вызваліцеля Аляксандра II Ігнатая Грынявіцкага, які ў 1936 г. быў расстраляны ў Беларусі (КПЗБ) Сяргея Прытыцкага. Зьдзейсьненае ім забойства сьведкі на судзе ў 1936 г. праславіла на ўвесь Савецкі Саюз кінастужка Беларусьфільму «Чырвонае лісьце». Пасьля прыходу Чырвонай Арміі на заходнебеларускія землі С. Прытыцкі спатрэбіўся савецкаму рэжыму, каб цэнтар мог дэманстраваць уяўную прыхільнасьць да рэштак КПЗБ, што цудам ацалелі падчас вялікага тэрору 30-х гг. ХХ ст. Прытыцкага ўлучылі ў савецкую ўладную сыстэму.

Не дачакаўся на такую кар'еру іншы актывіст КПЗБ Сяргей Клінцэвіч, які з дапамогай Андрэя Капуцкага — таксама чальца КПЗБ — раней за С. Прытыцкага ўчыніў падобнае. Яшчэ ў 1928 г. ён забіў дзеяча КПЗБ Міхала Гурына-Маразоўскага. С. Клінцэвіча і А. Капуцкага расстралялі ў 1937 г. органы НКВД, як дзеячаў Камуністычнай партыі Польшчы (КПЗБ была яе філіяй), абвешчанай Сталіным «партыяй здраднікаў».

Цікава, што аніводзін з гэтых тэрарыстаў ня помсьціў сваім ахвярам за крыўду ў дачыненьні да беларускай нацыі. У нашым нацыянальным друку роля падобнага мсьціўцы апошнім часам пачала адводзіцца Барысу Каверду. Ніна Стужынская ў сваёй кнізе «Беларусь мяцежная» выказвае меркаваньне, што «беларуская справа была сямейнай справаю Кавердаў»[13]. Ейную думку падзяляе Ірына Кашталян[14]. Відаць, з гэтай вэрсіі ўчынку Б. Каверды зыходзіць аўтар ананімнай нататкі ў газэце «Наша свабода» ў рубрыцы «Нагода ўспомніць»[15]:

1927. Віленскі беларус 17-гадовы гімназіст Барыс Каверда на варшаўскім вакзале забіў паўнамоцнага прадстаўніка СССР Пінхуса Вайкова (так у тэксьце. — **В. Г.**) *(Вайнера). За гэта Каверда быў асуджаны польскімі ўладамі на 15 гадоў зьняволеньня, але праз чатыры гады ў камэры скончыў жыцьцё самагубствам.*

У тэксьце некалькі памылак. Першае: Н. Стужынская называе П. Войкава «Навумам Вейкіным»[16], а ня «Пінхусам Вайнерам».

Другое: Б. Каверду асудзілі не на 15-гадовае зьняволеньне, а на пажыцьцёвае. Трэцяе: Б. Каверда не загінуў у турме — яго выратавалі[17].

У тым жа 2002 г. А. Татарэнка ў газэце «Народная Воля» напісаў, што «Пётар Войкаў, сапраўднае імя якога было Навум Вейкін, (…) свой бясслаўны канец (…) знайшоў ад кулі, пасланай рукою 19-гадовага беларускага хлопца. На жаль, вядома пра яго так мала, што ягоная асоба ўсё яшчэ застаецца для нас таямніцай, прыгожай легендай. Хто ж ён, гэты вядомы і ў той жа час невядомы герой?»[18].

Далей А.Татарэнка крочыць за вэрсіяй біяграфіі Б. Каверды, выкладзенай Н. Стужынскай. Дасьледчыца ў заўвагах да разьдзелу пра жыцьцё Б. Каверды з 1907 па 1931 г. (год спробы ягонага самагубства) у кнізе «Беларусь мяцежная» спасылаецца на асноўную крыніцу, якой яна карысталася. Гэта згаданы намі вышэй пераклад на расейскую мову кнігі з матэрыяламі сьледзтва і суду над Б. Кавердам, зроблены Сяргеем Вайцяхоўскім і выдадзены ў Парыжы варшаўскім журналістам. Н. Стужынская выкарыстала таксама некаторыя расейскія эмігранцкія газэты.

Аднак дасьледчыца не ўлічыла, што судовая справа як крыніца мае спэцыфічны характар. Судовы працэс у сваёй сутнасьці спаборны. Бакі, якія прымаюць у ім удзел, абавязкова нешта недагаворваюць, нешта хаваюць. Таму паказаньні патрабуюць крытычнага стаўленьня з боку гісторыкаў.

Зьдзіўляе, што Н. Стужынская абмінула ўвагай успаміны Б. Каверды — бадай, самую значную крыніцу па тэме. А іх аўтар тлумачыць складаньне сваіх мэмуараў наступным чынам:

Вакол гэтай тэмы (замаху на П. Войкава. — **В. Г.**) *узьнік шэраг легендаў і загадак, якія ў большасьці выпадкаў не адпавядаюць рэчаіснасьці або давалі няпоўны ці аднабаковы вобраз таго, што адбылося. Апрача таго лічу, што ня трэба замоўчваць удзелу ў справе іншых асобаў*[19].

Дакладнасьць дэталяў: падрыхтоўка да замаху, нават Каверда

вопраткі ахвяры і зьнешні выгляд сьведкаў падзеяў, Брэплікі паліцыянтаў і сьледчых пасьля замаху і інш. — сьведчаньне толькі пра добрую памяць Б. Каверды, але і пра тое, што пры складаньні тэксту ўспамінаў ён карыстаўся дадатковымі крыніцамі (не ў апошнюю чаргу газэтнымі публікацыямі).

Перафразуючы словы Юр'я Тынянава, адзначу, што там, дзе спыняе пошук адзін навукоўца, пачынаюць іншыя. Мяне, як дасьледчыка мэтодыкі гістарычнага пошуку і аналізу крыніцаў, а таксама тэмы «Гісторыя і міты», крыху зьдзівіла, што ў згаданых беларускіх публікацыях лёс Б. Каверды прасочаны толькі да 1931 г.[20].

У нашае поле зроку названыя вышэй крыніцы трапілі ўпершыню з сярэдзіне 90-х гг. XX ст. падчас суцэльнага агляду расейскага эмігранцкага друку ў пошуках зьвестак пра Беларусь і беларусаў зь Беларусі. Па сутнасьці, гэта самы традыцыйны дасьледчыцкі пошуку крыніцаў і дасьледаваньняў шлях уліку ўсіх матэрыялаў па тэме. І ім ня проста можа, але, з майго пункту гледжаньня, абавязкова павінен ісьці кожны гісторык.

Праз пэўны час пры чарговым франтальным аглядзе літаратуры знайшлася яшчэ адна (мо і ня надта значная) крыніна, што выйшла з-пад пяра Б. Каверды: ягоны ліст ад 18 ліпеня 1927 г. з варшаўскай турмы расейскаму пісьменьніку А. Амфітэатраву (той у свой час эміграваў у Варшаву)[22]. Улетку 2005 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы ў Варшаве я азнаёміўся з арыгіналам, а не перакладам выданьня тэксту судовай справы Б. Каверды і мікрафільмам газэты «Kurjer Warszawski» за чэрвень 1927 г. са зьвесткамі пра ход гэтай справы[23].

Усё гэта дало магчымасьць супаставіць польскамоўны тэкст судовай справы з расейскім перакладам С. Вайцяхоўскага, на які спасылалася Н. Стужынская, і з расейскім перакладам Н. Сядзельнікава, надрукаваным у СССР, але абмінутым увагай дасьледчыцы (як і польскі арыгінал). Выявілася, што тэксты польскага і двух расейскіх выданьняў адрозьніваюцца, у іх сустракаюцца дадаткі перакладчыкаў, якія часам адступаюць ад арыгіналу.

З нэкралёгу ў памяць Б. Каверды я даведаўся, што прозьвішча

[20] Дакладнае ...; Грыцкевіч В. Беларускі пытаньні ў Польшчы (1921–1939). С. 136).

[21] Гл. таксама: Грыцкевіч В. Беларускі пытаньні ў Польшчы (1921–1939). С. 136).

[22] Гл. таксама: Грыцкевіч В. Беларускі пытаньні ў Польшчы (1921–1939). С. 136).

[23] Гл. таксама: Грыцкевіч В. Беларускі пытаньні ў Польшчы (1921–1939). С. 136).

ягонай дачкі, Натальлі Барысаўны, па мужу — Мантавілавай. Прозьвішча даволі рэдкае. Маю ў Німе (дэпартамэнт Гар, Францыя) старога знаёмага прафэсара-эмэрыта мясцовага ўнівэрсытэту Міхаіла Віктаравіча Мантавілава. Міхаіл Віктаравіч ласкава пераслаў мне электронны адрас сваёй нявесткі Наталлі Барысаўны Мантавілавай, якая жыве ў Фолз-Чэрч, штат Вірджынія, ЗША. Яна пацьвердзіла вядомыя мне біяграфічныя зьвесткі пра свайго бацьку. Паводле яе, ягоны сьведчаньні, той быў «вельмі сьціплым чалавекам», амаль ніколі не размаўляў з дачкою пра сваё мінулае і «не любіў, каб яго расьпытвалі пра гэта»[24].

Толькі тады я даведаўся пра Б. Каверду і пра ягонае не такое ўжо і простае стаўленьне да беларускасьці трохі больш-менш папярэднікаў па тэме. Таму і вырашыў перадаць сваё меркаваньні на прысуд чытача.

Зьвернемся да фактаў зь біяграфіі Барыса Каверды.

12 жніўня 1907 г. у сялянскай сям'і Сапрона і Ганны Каверданаў нарадзіўся сын Барыс[25].

У Вільні Сапрон Каверда ўваходзіў у расейскую партыю эсэраў, удзельнічаў у нелегальнай працы. Падчас Першай сусьветнай вайны ён ваяваў на германскім фронце. Пасьля рэвалюцыі Сапрон Каверда служыў у Чырвонай Арміі камандзірам, ваяваў перайшоў савецка-польскую мяжу і пасяліўся асобна ад сям'і дзяцей на Падляшшы.

Маці Барыса Ганна Каверда разам з трыма дзецьмі ў 1915 г. эвакуавалася спачатку ў Тамбоў, а потым у пасёлак Зубчанінава пад Самарай. У гэты горад на заняткі ў рэальнае вучылішча за сямнаццаць вёрстаў ездзіў цягніком Барыс Каверда. Падлетак стаўся сьведкам жахлівых падзеяў: гвалту і забойстваў з боку чырвоных падчас рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

У 1921 г. Ганна Каверда зь дзецьмі вярнулася ў Вільню. Там яна ўзначаліла беларускі прытулак для дзяцей-сіротаў. Барыс Каверда, як і ягоныя дзьве сястры, спачатку навучаўся ў Віленскай беларускай гімназіі. Паводле ягоных сьведчаньняў,

Гл.: Барысевіч І. Прозьвішча Каверда // Наша ніва. 2003. 1–7 ліпеня. С. 15.

[21] Гл.: Гриценевич В. П., Кауп С. В., Ходин С. Н. Теория и история источниковедения. Минск: БГУ, 2000. С. 78–79.

[22] Амфитеатров и русские в Польше (1922 – 1932) / Публ. Л. И. Зубарева // Минувшее. Т. 22. Санкт-Петербург: Atheneum — Феникс, 1997. С. 464–465.

[23] Kurier warszawski. 1927. №№ 155–163, 8–16 czerwca: Sprawa Borysa Kowerdy. Zabójstwo posła Z.S.S.R. Piotra Wojkowa…

[24] Электронны ліст Н. Б. Мантавілавай да аўтара артыкулу ад 22 ліпеня 2005 г.

[25] Усе сэраў, сустрэтыя ў тэкстах пра Б. Каверду, адзначаюць, што ён нарадзіўся ў Віленскай губэрні, а Н. Стужынская дадае, што яго хрысьцілі ў праваслаўнай царкве ў Індуры. Гэта 25 км на поўдзень ад

юнак адчуваў сябе там дрэнна і паказваў на судзе, што разам з імі, зь якімі я навучаўся, былі камуністамі, і калі падчас вучняў, зь якімі я навучаўся, я даў неспрыяльныя для паказаньні, мяне пачалі цкаваць». Зь беларускай гімназіі Барысу Каверду давялося перайсьці ў гімназію Віленскага расейскага таварыства, але беднасьць не дазваляла плаціць за навучаньне, ён прапускаў заняткі, за што і быў выключаны.

Бацька не дапамагаў сям'і. Барыс Каверда пачаў працаваць экспэдытарам беларускай газэты «Наша думка». Маладзён палічыў, што яна «была кірунку не зусім камуністычнага, але блізкага да камуністаў». На судзе ён сьведчыў: «Нешта мне падказвала, што гэта праца на чырвонцы, атрыманыя ад продажу царкоўных рэчаў»[26].

Юнак перайшоў у рэдакцыю газэты антыкамуністычнай арыентацыі «Грамадзкі голас» на пасаду экспэдытара, а фактычна карэктара. У студзені-лютым 1926 г. выдавец Арсень Паўлюкевіч, перайменаваў сваё выданьне ў «Беларускае слова».

А. Паўлюкевіч нарадзіўся ў Слуцкім павеце, працаваў у Слуцку, у лістападзе 1920 г. узначаліў Белнацкам Случчыны. На зьезьдзе Случчыны ў тым жа месяцы ён беспасьпяхова спрабаваў узначаліць Беларускую раду Случчыны, пытаў збройнага чыну загадваў шпіталем для яго ўдзельнікаў.

Як прадстаўнік рады, А. Паўлюкевіч браў удзел у Праскай агульнанацыянальнай палітычнай канфэрэнцыі ў верасьні 1921 г. Ён выступаў з прапольскіх пазыцыяў, апанэнтам левых і цэнтрысцкіх беларускіх арганізацыяў[27].

Паводле сьведчаньня Б. Каверды, А. Паўлюкевіч быў радым «антыкамуністам». Ён паўплываў на фармаваньне поглядаў юнака. Пазьней Б. Каверда прыгадваў, што іх зьвязвалі не толькі службовыя, але і сяброўскія стасункі[28].

Адначасова ў Б. Каверды «ўзьніклі сувязі і знаёмствы з прадстаўнікамі расейскіх антыбальшавіцкіх колаў у прыватнасьці, — успамінаў ён, — у мяне наладзіліся сяброўскія дачыненьні зь есаулам Міхаілам Ільлічом Якаўлевым, які

[26] S. Sprawa Borysa Kewlerdżar Zbójstwo posła Z.S.S.R. Piotra Wojkowa… S. 27; Убийство Войкова… С. 29.

[27] Пра А. Паўлюкевіча гл.: Грицкевич А. П. Борьба с контрреволюцией в Вільні». «У

пражываў на той час у Вільні, а падчас грамадзянскай вайны быў камандзірам так званага «Валчанскага атраду» ў поспехі Ўкраіны і Расеі, ён дзейнічаў падчас польска-савецкай вайны на польскім баку (1920) як начальнік штабу падраздзялення С. Булак-Балаховіча. М. І. Якаўлеў выдаваў у Вільні штотыднёвую газэту «Новая Россия»[29].

Якімі ж былі ідэйныя матывы замаху Б. Каверды на П. Войкава? Пэўныя расейскія эмігранцкія пэрыядычныя выданьні ў чэрвені 1926 г. называлі яго «манархістам». У савецкіх выданьнях ён быў «белагвардзейцам» і «манархістам».

Белагвардзейцам Б. Каверда быць ня мог, таму што падчас грамадзянскай вайны яму было 10—13 гадоў. Адпадае і другая вэрсія савецкага друку. На судовым працэсе абвінавачаны паказаў: «Частка пэрыёдыкаў называе мяне манархістам. Я не манархіст. (…) Я дэмакрат»[30]. Як нам здаецца, мае рацыю Л. Зубараў, прыводзячы тэкст ліста Б. Каверды да А. Амфітэатрава ад 19 ліпеня 1927 г. са сьледчага ізалятару Павяк: «Аўтограф ліста, які публікуецца тут, напісаны новай, гэта значыць савецкай артаграфіяй — рэч для манархіста немагчымая; супраць бальшавіцкага правапісу ўвесь манархічны друк вёў бязьлітасную вайну»[31]. (Між іншым, пераклад С. Вайцяхоўскім судовай справы Б. Каверды выйшаў у Парыжы ў 1927 г. менавіта старой артаграфіяй.)

Трэцюю вэрсію матываў учынку Б. Каверды выклала Н. Стужынская: «Як засьведчыла пані Ганна (Каверда. — **В. Г.**) на судзе: «Мы былі рускімі паводле культуры. Але Беларусь ніколі часткай Расеі намі не лічылася»[32]. Гэта няпоўная і не зусім дакладная цытата. Насамрэч Г. Каверда казала трохі інакш: «Дома мы размаўлялі толькі па-расейску. Мы лічым сябе рускімі паводле культуры. Беларусь я Расеяй не лічу»[33]. У кнізе «Беларусь мяцежная» Н. Стужынская цытуе паказаньні Сапрона Каверды: «Я беларус, жонка мая таксама. Дома мы размаўлялі па-беларуску, па-руску, па-польску». Н. Стужынская прыводзіць зьвесткі, што дзейнасьць Сапрона Каверды цікавіла спэцслужбы (…), паколькі Каверда-старэйшы ў 1924—1925 гадах актыўна займаўся вэрбоўкай баевікоў-добраахвотнікаў у «Зялёны дуб». На гэтай падставе гісторык робіць выснову пра

[29] Коверда В. Покушение на полпреда Войкова… С. 13.

Бейтварухи в послевоенной Европе. Вторая мировая война и гражданская война // Acta Baltico-Slavica. T. 9. Wrocław—Warszawa—Kraków, 1976. S. 247, 251, 252, 265; Слуцкі зборны чын у дакументах і успамінах. Мінск: Энцыклапедыкс, 2001. С. 35, 36, 180, 183, 201—203, 221, 227, 228, 301, 317, 318; Ляхоўскі У., Чарнякевіч А., Паўлюкевіч А. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6. Кн. 2. Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2003. С. 422.

29 Справа Барыса Коверды. Забойства пасла Р.С.С.Р. Пятра Войкава… С. 30; Коверда Б. Покушение на полпреда Войкова… С. 13.

30 Убийство Войкова… С. 51; Мститель… С. 16.

31 Амфитеатров и русские в Польше… С. 395.

32 Убийство Войкова… С. 29.

33 Справа Барыса Коверды. Забойства пасла Р.С.С.Р. Пятра Войкава… С. 11; Убийство Войкова… С. 29.

34 Стужынская Н. Беларусь мяцежная… С. 134.

35 Справа Барыса Коверды. Забойства пасла Р.С.С.Р. Пятра Войкава… С. 23; Убийство Войкова… С. 42; Убийца товарища Войкова перед польским судом… С. 37.

36 Справа Барыса Коверды. Забойства пасла Р.С.С.Р. Пятра Войкава… С. 27—30; Убийство Войкова… С. 45; Убийца товарища Войкова перед польским судом… С. 48.

37 Справа Барыса Коверды. Забойства пасла Р.С.С.Р. Пятра Войкава… С. 29.

38 Стужынская Н. Беларусь мяцежная… С. 134.

39 Коверда Б. Покушение на полпреда Войкова… С. 13.

40 Стужынская Н. Беларусь мяцежная… С. 129.

41 [Бурцев В. Л.] Наше несчастие и наш позор (1917) [Перадрук] // Вече. 1982. № 6. С. 114.

42 Пра асаблівасьці афіцыйных дакумэнтаў рэвалюцыянэраў гл. падрабязьней: Грицкевич В. П., Каун С. Б., Ходин С. Н. Теория и история канспирации. С. 173.

43 Стужынская Н. Беларусь мяцежная… С. 128.

44 Амфитеатров А. В. Борис Коверда. Выстрел на Варшавском вокзале… С. 194). У аналягічных кавэцкіх біяграфіях П. Войкава (Губенко Г. Н. Петр Лазаревич Войков. Краткий биографический очерк…; Захаров С. А. Комиссар-дипломат (Петр Лазаревич Войков)…) аб ягоным габрэйскім паходжаньні нічога няма. Рэзка адмоўную характарыстыку П. Войкаву даў у сваіх успамінах савецкі дыпляматычны дзеяч Ф. Раскольнікаў, які служыў разам з Войкавым у Варшаве, а потым у Парыжы ўцёк з савецкага пасольства і застаўся на Захадзе. Ён сьведчыць, што пра бацьку П. Войкава сярод дыпляматычнага пэрсаналу пасольства ў Варшаве хадзілі плёткі, нібыта той быў у свой час пальцовым Саюзу рускага народу (Беседовский Г. З. На путях к термидору. Москва: Современник, 1997. С. 34).

Цяпер мы ведаем, што Войкаў быў савецкім разьведчыкам. Ці ведаў пра гэта Коверда?

Што ж, шмат беларускіх сем'яў, якія ўцалелі ў 1917—1920 гг., ня ведаюць пра тое, што іхныя продкі ратаваліся ад бальшавікоў дзякуючы Войкаву.

Ці ня лепш зазірнуць у паказаньні Б. Каверды на судзе? А ён тым часам...

Забываючы Войкава, я хачу помсьціць за мільёны, аказаць паслугу бацькаўшчыне. (...) Я ж жадаю, каб у Расеі быў калі-небудзь урад, толькі не бальшавікі, не камуністычны, ня банда разбойнікаў, якая зьнішчыла мільёны рускага народу[37].

Цяпер мы ведаем, што Войкаў быў савецкім разьведчыкам. Ці ведаў пра гэта Коверда?

Што ж, шмат беларускіх сем'яў, якія ўцалелі ў 1917—1920 гг., ня ведаюць пра тое, што іхныя продкі ратаваліся ад бальшавікоў дзякуючы Войкаву.

Ці ня лепш зазірнуць у паказаньні Б. Каверды на судзе? А ён тым часам...

Забываючы Войкава, я хачу помсьціць за мільёны, аказаць паслугу бацькаўшчыне. (...) Я ж жадаю, каб у Расеі быў калі-небудзь урад, толькі не бальшавікі, не камуністычны, ня банда разбойнікаў, якая зьнішчыла мільёны рускага народу[37].

1997. С. 104–137.

ня іхныя псэўданімы (падобна прадстаўнікам крымінальнага сьвету, яны звычайна мелі некалькі мянушак)[42].

Прагляд сьпісаў абвяргае думку і Н. Стужынскай, што нібыта «Войкаў» — гэта псэўданім Навума Вейкіна, аўтара нататкі пра Б. Каверду ў «Нашай свабодзе» і А. Татарэнкі датычна сапраўднага імя П. Войкава. Аніякіх «Навумаў Вейкіных» або «Пінхусаў Вайнераў» у сьпісах няма. Ёсьць толькі Пятро Войкаў, хоць побач поўна габрэйскіх імёнаў і прозьвішчаў[43].

Ва ўспамінах Барыс Каверда нагадаў, што думка пра замах на адыёзную фігуру новага дыплямата СССР гучала ў ягоных размовах з А. Паўлюкевічам і М. Якаўлевым усё часьцей, і на пачатку 1927 г. юнак выказаў жаданьне зьдзейсьніць гэты ўчынак. Б. Каверда атрымаў ад першага дзьвесьце злотых на праезд і пражываньне ў Варшаве, а ад другога — стары маўзэр з патронамі. Есаул навучыў Б. Каверду страляць.

22 траўня 1927 г. Б. Каверда паехаў у Варшаву. Там ён адзін высочваў П. Войкава. На трэці дзень па прыезьдзе Б. Каверда зьявіўся ў консульства прасіць візу на праезд у СССР, нібыта каб вучыцца там, і нечакана для яго ў прыёмнай консульства зьявіўся П. Войкаў, вядомы Б. Каверду з фатагарафіі ў друку. Але той быў у прыёмнай занадта мала, каб юнак мог выканаць свой намер.

Грошы ў маладога віленчука канчаліся. Ён ужо думаў вярнуцца дадому, але ў адной з газэтаў прачытаў, што «пасол Войкаў ад'яжджае ў Маскву». Потым высьветлілася, што інфармацыя была няслушная.

Б. Каверда стаў прыходзіць на пэрон вакзалу ў чаканьні адыходу цягніка на Маскву а 9.55 зранку. Так прайшлі тры дні.

7 чэрвеня маладзён вырашыў апошні раз прыйсьці на пэрон Варшаўскага вакзалу. Б. Каверда зьбіраўся ўжо вярнуцца ў Вільню, калі не сустрэне паўнамоцнага прадстаўніка СССР. Зусім нечакана за пяцьдзясят хвілінаў да адыходу цягніка Барыс Каверда ўбачыў савецкага дыплямата, які чамусьці ішоў не да цягніка, а наадварот, з пэрону ў памяшканьне вакзалу. Ён быў у кацялку і зялёным вясновым паліто. Даволі хутка П.

Войкаў разам са сваім спадарожнікам, зь якім ён ішоў і ад цягніка ў вакзал, вярнуліся на пэрон.

Пазьней Б. Каверда даведаўся, што П. Войкаў не зьбіраўся ў Маскву, а прыйшоў на вакзал сустрэцца з гандлёвым прадстаўніком СССР у Брытаніі Аркадзем Разэнгольцам — брытанскія ўлады выслалі яго з краіны, і ён вяртаўся ў Маскву. Менавіта на гэтую сустрэчу і прыехаў у нядобры для сябе час Пятро Войкаў.

Б. Каверда ўспамінаў: «Такім чынам, мая сустрэча з Войкавым на варшаўскім вакзале, хоць я яе і шукаў, была цалкам выпадковасьцю. Быў тут нейкі фатум. Калі б Разэнгольц праяжджаў праз Варшаву нават днём пазьней, то замаху не было б. Грошы ў мяне (…) скончыліся. Каб набыць пэронны білет, я патраціў апошнія дваццаць грошай, якія меў»[44].

Б. Каверда пайшоў насустрач П. Войкаву і пачаў страляць у яго. Дыплямат кінуўся ўцякаць, а замаховец пабег усьлед і выпусьціў у таго шэсьць куль. У ахвяру трапілі дзьве. П. Войкаў пачаў адстрэльвацца. Паліцыянты, якія дзяжурылі на пэроне, падбеглі да Б. Каверды і схапілі яго. П. Войкаў упаў на пэрон. Адзін з паліцэйскіх запытаўся ў Б. Каверды, у каго той страляў. Пачуўшы, што той страляў у савецкага пасла, адгукнуўся: «Шкада, што ня ў Троцкага»[45].

Сьмяротна параненага П. Войкава адвезьлі ў шпіталь, дзе той памёр. Замахоўцу накіравалі ў вязеньне Павяк.

Стрэлы на вакзале мелі вялікі розгалас. Прэм'ер-міністар Польшчы Ю. Пілсудзкі паклікаў да сябе віцэ-прэм'ера Бартэля[46]. На самым высокім узроўні было вырашана не абвастраць польска-савецкіх стасункаў, досыць напружаных і пасьля заключэньня Рыскай дамовы 1921 г. Таму ўзьнікла неабходнасьць судзіць Б. Каверду паскораным надзвычайным судом.

Ані польскі, ані савецкі ўрады не былі зацікаўленыя ў розгаласе забойства П. Войкава. Першаму не хацелася псаваць дачыненьняў з моцным усходнім суседам. У другога хапала дыпляматычных непрыемнасьцяў у Кітаі і ў Вялікабрытаніі.

(Менавіта з высланым зь Лёндану савецкім дыпляматам А. Разэнгольцам і піў апошні раз у сваім жыцьці кубак кавы П. Войкаў у вакзальным буфэце.)

Ва ўспамінах Б. Каверда ахарактарызаваў сваю судовую справу наступным чынам:

Паскарэньне ў разглядзе маёй справы адбылося ў выніку патаемнага пагадненьня польскага і савецкага ўрадаў. І Масква, і Варшава пашырэньне справы не лічылі карысным. Абодва ўрады жадалі найхутчэйшага вычарпаньня гэтага інцыдэнту. Таму працэс аказаўся пакамечаны… шматілкія пытаньні ўвогуле абмінулі. Гэта тычыцца і афіцыйнага пратаколу судовага паседжаньня. У газэтных справаздачах аб працэсе можна знайсьці значна больш за тое, што мелася ў запісе судовага сакратара[47].

На працэсе прысутнічала сто дваццаць журналістаў, расейскія эміграцкія газэты паведамлялі падрабязнасьці знаходжаньня абвінавачанага ў зьняволеньні, ён атрымліваў шмат віншавальных лістоў і тэлеграмаў ад расейскіх эмігрантаў з розных краінаў, у тым ліку з Кітаю.

[47] Коверда Б. Покушение на полпреда Войкова… С. 18.

Працэс над Б. Кавердам пачаўся 15 чэрвеня 1927 г. Польскі суд не пайшоў шляхам швайцарскага, які апраўдаў забойцаў іншага савецкага дыплямата Вацлава Вароўскага ў 1923 г. Канрадзі і Палуніна. Барыса Каверду прыгаварылі да пажыцьцёвай катаргі.

Тым ня менш, правая расейская эміграцыя была задаволеная ходам працэсу. Падсудны трымаўся акрэсьленай лініі, вінаватым сябе не прызнаў, рэальных натхняльнікаў замаху А. Паўлюкевіча і М. Якаўлева ня выдаў і ўзяў на сябе ўсю адказнасьць за замах.

Ці была справа Барыса Каверды карыснай для польскага ўраду? «Kurjer Warszawski» з задавальненьнем адзначаў: «Пра тое, што забойства пасла Войкава не было вынікам змовы, польская публічная думка даведалася з пачуцьцём значнай палёгкі. (…) Ва ўсялякім выпадку, было ясна, што польская дзяржава аніякіх

змоваў у сябе цярпець ня можа»[48]. (Насамрэч гэта не адпавядала рэчаіснасьці: змова існавала, але яе суд не раскрыў.)

Б. Каверда ўспамінаў, што ў вакзальным паліцэйскім пастарунку адзін з тых, хто вёў першасны допыт, «пачаў крычаць на мяне, пытаючыся, навошта я гэта зрабіў (пабіў П. Войкава. — **В. Г.**). Я адказаў, што дзейнічаў у інтарэсах дзяржавы. Той, хто пытаўся, заявіў, што гэта «мядзьведжая паслуга». Пазьней я даведаўся, што гэта быў Сухенэк-Сухецкі, начальнік аддзелу бясьпекі ў Міністэрстве ўнутраных справаў»[49].

Мабыць, гэты чыноўнік меў рацыю. Для супраціўнікаў савецкай дзяржавы стрэлы Барыса Каверды мелі нулявы палітычны вынік. Народнага ўздыму супраць бальшавікоў не адбылося. Стаўленьне Беларускага інтэлігенцыі да ідэі помсты за Войкава не палепшылася. Унутраная палітыка ягоных уладаў зрабілася яшчэ больш жорсткай — учынак Б. Каверды даў падставу для чарговага ўсплёску рэпрэсіяў супраць інтэлігенцыі і рэштак былых кіроўных клясаў (г. зв. «войкаўскі набор»).

30 кастрычніка 1927 г. Барыса Каверду накіравалі на пажыцьцёвую катаргу ў крэпасьць Грудзёндз (па-нямецку Граўдэнц) на ніжняй Вісьле (у Н. Стужынскай і І. Кашталян яна памылкова названая «Граўдэнш»). У вязьніцы, як мы ведаем, маладзён спрабаваў скончыць жыцьцё самагубствам. Але яго выратавалі.

Далейшы лёс Б. Каверды асьвятляецца ў нэкралёгах у сувязі зь ягонай сьмерцю (1987 г.), у артыкуле А. Багалюбава (1989 г.) і камэнтарах Д. Зубарава да публікацыі ліста Б. Каверды да В. Амфітэатрава з варшаўскай турмы (1997 г.).

Паводле амністыі прэзыдэнта Польшчы, Б. Каверду пасьля дзесяці гадоў вязьніцы выпусьцілі на волю. Як сьведчыў сябар Б. Каверды на эміграцыі Ўладзімер Самарын, той зьехаў з Польшчы ў Югаславію — моцны асяродак расейскай эміграцыі, здаў там экзамэн на атэстат сталасьці пры расейскім кадэцкім корпусе ў Белай Царкве (Вайводзіна, на мяжы з Румыніяй). У 1938 г. ён вярнуўся ў Варшаву, ажаніўся зь Нінай Аляксееўнай

[48] В. К. Ро[illegible]ku w [illegible]Kowerdyi/ Kurjer Czerwony. Wydanie wieczorne. 1927. №164. 17 czerwca. S. 2, 3.

[49] Кунцэвіч С. Пакушэнне на іншыя // Вайна. С. 17.

Пятрушынай, увосень яны абое пераехалі ў Бялград. Там Б. Каверда паступіў на тэхналягічны факультэт Бялградзкага ўнівэрсытэту.

Увосень 1939 г., калі пачалася Другая сусьветная вайна, сям'я Кавердаў была ў Варшаве. Капітуляцыя Нямеччыны засьпела Б. Каверду ў княстве Ліхтэнштайн[50], якое нібыта прытулілася да Альпаў між Швайцарыяй і Аўстрыяй. Улады княства не выдавалі нікога з былых грамадзянаў ані СССР, ані іншых краінаў Усходняй Эўропы савецкай уладзе, адрозна ад акупацыйных уладаў ЗША і Брытаніі ў суседніх Аўстрыі і Нямеччыне (мо таму, што княства межавала толькі з францускай зонай акупацыі Аўстрыі).

Жонка Б. Каверды з дачкою і бацькамі апынулася ў лягеры прымусовых перасяленцаў у Рэгенсбургу (амэрыканская зона акупацыі Нямеччыны). Неаднойчы супрацоўнікі служб СМЕРШ дапытвалі яе пра месцазнаходжаньне мужа, але пасьля не даведаліся.

У сваім электронным лісьце да аўтара артыкулу ад 29 ліпеня 2005 г. Натальля Барысаўна Мантавілава паведаміла, што ў Ліхтэнштайне сувязі зь сям'ёю яе бацька ня меў. Ён зьвязаўся са сваёй сястрою, якая жыла ў Парыжы, і прыехаў да яе. Толькі тады Б. Каверда адшукаў сваіх жонку і дачку. Яны з дапамогаю Талстоўскага фонду ў 1956 г. эмігравалі ў ЗША.

Б. Каверда меўся ехаць празь некалькі месяцаў туды ж, але ведамства іміграцыі і натуралізацыі ЗША адмовілася пускаць у краіну Б. Каверду, як асобу, асуджаную за забойства. Толькі праз хадайніцтва вядомай апякункі расейскіх эмігрантаў Аляксандры Лявоўны Талстой і князя С. Беласельскага-Белазёрскага кангрэсмэн Ўолтэр унёс у кангрэс ЗША праект пастановы пра дазвол прыехаць у ЗША для Б. Каверды. Пасьля падпісаньня прэзыдэнтам Д. Эйзэнхаўэрам дакумэнт займеў моц.

У ліпені 1956 г. Б. Каверда прыехаў у ЗША, і ягоная сям'я зноў аб'ядналася. Ён працаваў у рэдакцыі газэты «Россия», а праз два гады, пасьля яе закрыцьця, стаў перакладчыкам у рэдакцыі газэты «Новое русское слово» (Нью-Ёрк).

50. Пры Ліхтэнштайн як дзяржаву, што пасьля Другой сусьветнай вайны не выдавала ўладам СССР асобаў, якія прымалі ўдзел у вайне на баку нацыстаў, а таксама іншых грамадзянаў Савецкага Саюзу і дзяржаваў, вызваленых або акупаваных Чырвонай

У 1974 г. Б. Каверда сышоў на пэнсію, у 1976 г. ён з сям'ёю пераехаў у Адэлфі (штат Мэрылэнд, ЗША). Памёр ён у Нью-Йорку 18 лютага 1987 г., пахаваны на расейскіх могілках Мемарыял Нова-Дзівеева ў штаце Нью-Ёрк[51].

Колькі словаў пра сяброў Б. Каверды. Ён высьветліўшае М. Якаўлева і А. Паўлюкевіча (зьвесткі пра апошняга ў беларускім друку бязь сьведчаньняў Б. Каверды няпоўныя). М. Якаўлева ўлетку 1940 г. арыштавалі гітлераўцы, і ў красавіку 1941 г. ён загінуў у Асьвенціме. А. Паўлюкевіч удзельнічаў у руху супраціву нацыстам у Польшчы, яго арыштавалі і расстралялі гітлераўцы[52].

Варта адзначыць, што сьведка забойства П. Войкава, савецкі дзяржаўны дзеяч А. Разэнгольц, якога той сустракаў на вакзале ў Варшаве, таксама не ацалеў. Яго расстралялі як «ворага народу» паводле прысуду савецкага суду ў Маскве ў 1938 г.

У заключэньне варта адзначыць, што дасюль ня цалкам высьветленыя матывы і падрабязнасьці забойства Б. Кавердам П. Войкава цяпер больш зразумелыя. Згодна з прызнаньнем Б. Каверды, ён «забіў Войкава за ўсё тое, што бальшавікі зрабілі ў Расеі»[53].

Зразумела і іншае. Забойства згаданага савецкага дыпламата да беларускіх справаў дачыненьня ня мае. Залічаць Б. Каверду ў лік «беларускіх герояў», як уяўляецца мне на аснове аналізу крыніцаў, наўрад ці выпадае.

Гісторыя беларускага народу даўняя і невычэрпна багатая. Няма патрэбы штучна яе ўпрыгожваць за кошт мітаў пра этнічных беларусаў, якія адышлі ад беларушчыны.

На першы погляд, «кавердазнаўства» досыць далёкае ад тэматыкі маіх папярэдніх працаў у гісторыі культуры. Калі б узьнікла пытаньне, а чаму ж гэта мне давялося ім займацца, я б адказаў прыкладна так. Мне на вочы трапілі ўспаміны пра мастака Мартыроса Сар'яна. Адзін навуковец згадваў, як мастак, ужо стары чалавек, гуляў у парку санаторыя Акадэміі навук СССР «Вузкае» і ўласнаручна зьбіраў усялякія паперкі і

Армія, ч. 1. Нью-Йорк; Мюнхен: Мемуары солдаты. Москва: Яуза, Эксмо, 2004. С. 209.

[51] Katon, Pierre. Le Liechtenstein. Histoire et Institutions. — Genève: Librairie Droz, 1967. 2-nde edition — ёсьць цікавая нататка: «За пэрыяд з 25 красавіка па 2 траўня 1945 г. каля 7000 ўцекачоў схавалася ў Ліхтэнштайне праз пост Шатаньяльдэ: 1424 ваеннапалонныя, 3424 французы і 1254 савецкія грамадзяне» (с. 171). Факт пераб
ываньня Б. Каверды ў Ліхтэнштайне

сьмецьце, нібыта лічыў сваім абавязкам папраўляць чужую неахайнасць[54].

Мяркую, што старога мастака можна зразумець.

Што ж у выніку дала мне асабіста праца над тэмаю «Барыс Каверда»? Прыкладна тое, што для шахматыста рашэнне шахматнай задачы. Крокі на шляху да тлумачэння таямніцаў людской душы далі мне ў гэтым выпадку ня менш, чым чытаньне цікавай бэлетрыстыкі. Бо, як казаў П. Рыкёр, «разуменьне без тлумачэньня сьляпое, а тлумачэньне без разуменьня пустое».

Што дазваляе Н. Стужынскай і іншым аўтарам, якія у беларускім друку пісалі пра Б. Каверду, даказваць сувязь «ягонага адчайнага ўчынку» зь беларускім супрацівам?

1) Грэбаваньне традыцыйнай мэтодыкай пошуку і разгляду крыніцаў па тэме;

2) няўлік карысьці ад суцэльнага агляду крыніцаў і дасьледу як абавязковага для беларускай гістарыяграфіі. Падзеі беларускай гісторыі перакрыжоўваюцца з польскай, літоўскай, расейскай, калі этнічныя беларусы часта залічваюць сябе у дзеячы ці то аднаго, ці другога грамадзкага і культурнага працэсу — як раней, так і цяпер;

3) адвольнае тлумачэньне абмежаванай колькасьці крыніцаў па тэме і пасьпешлівая публікацыя вынікаў працы зь імі;

4) нежаданьне пры аргумэнтацыі ўлічваць контраргумэнты;

5) выкарыстаньне толькі тых фактаў з крыніцаў, што адпавядаюць пэўнай схеме[55];

6) паўтарэньне старых стэрэатыпаў, як і зьмяненьне ў іх знаку «плюс» на знак «мінус» і наадварот.

прыводзіць у сваёй вартаснай даведцы пра Б. Каверду Д. Зубараў. Ён дапускае памылку, калі сьцьвярджае, нібыта Б. Каверда «ў канцы 1940-х гг. жыў у лягеры для перамешчаных асобаў у Заходняй Нямеччыне (Зубарев Д. И. Амфитеатров и русские в Польше… С. 395). Але з Заходняй Нямеччыны асобаў, якіх патрабавалі выдаць савецкія ўлады, ахвотна выдавалі.

[51] Самарин В. Звёздный час… С. 175—177.

[52] Ліст Н. Б. Мантавілавай да аўтара артыкулу ад 22 ліпеня 2005 г.

[53] Убийство Войкова… С. 18.

Гэта толькі адсоўвае чаканую адмену старога падыходу да гісторыі як да паслугачкі палітыкі.

[54] Черёмушкин П. Пан профессор (Ленинского проспекта) // Новая Польша. 2004. № 11. С. 52.
[55] Ці не таму аўтарка «Беларусі мяцежнай» тлумачыць Слуцкі збройны чын 1920 г. супрацівам з боку сялянскіх масаў Беларусі палітыцы ваеннага камунізму, гэта значыць, як і раней было прынята сярод савецкіх гісторыкаў беларускага паходжаньня, клясавымі, матэрыяльнымі, а не нацыянальнымі, духоўнымі прычынамі?
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2007/01/28**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 11 (51) - 2006**

[image]

[image]

[image]

[image]

11 [image]-[image]2006

аналітыка • крытыка • эсэістыка • **гісторыя** • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

Віктар Жыбуль Арына Глінская і яе няспраўджаны талент

ВІКТАР ЖЫБУЛЬ

«самы скандальны сярод маладых паэтаў і адначасова найпапулярнейшы ў далёкай ад паэзіі публікі аўтар» (А. Хадановіч). Піша таксама літаратурную крытыку. Яго апошняя публікацыя ў «ARCHE» мела назву «Футурыст Пятрусь Броўка» (5/2005).

НА ВУЛІЦЫ

Бег трамвай. Бег, хапаўся.
Спазьніўся куды, мо проста так.
За газэтаю бег маленькі Паўлік —
Бацька паслаў і даў пятак.

Вуліцу перабягаў. Склізкія рэйкі.
Недзе блізка зазьвінеў трамвай…
Толькі пачуўся крык нейкі…
Кандуктар спалохаўся. Вагон стаў…

Скочылі людзі… «Божачка, задавілі!
Хуткую дапамогу! Пажарную часьць!
Як гэта? Божачка, як гэта зрабілі?
Як гэта яму давялося папасьці?»

Выцягнулі з-пад каткоў скромсанае цельца.
Засталася толькі лужынка крыві.
Вуліцаю сьнег беленькі сьцелецца,
Мабыць, да вечара яе прыкрые.

БДАМЛІМ. Ф. 225. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк. 81.

Доктар глянуў… Кінуў звычайнае:
«Памёр… яшчэ бы… пераехаць так!»
Толькі вецер плакаў глуха і адчаяна,
І блішчэў загублены ў крыві пятак.

Ленінград

Гэты верш належыць Арыне Глінскай — забытай беларускай паэтцы 1920-х гг. Надрукаваны 17 чэрвеня 1927 г. на літаратурнай старонцы бабруйскай газэты «Камуніст», ён яркай плямінай вылучаецца сярод іншых зьмешчаных тамсама паэтычных твораў —узораў пэйзажнай, інтымнай і «камсамольскай» лірыкі, часткова навеянай творчасьцю Ўладзімера Дубоўкі ды Паўлюка Труса. Верш не зусім характэрны для тагачаснай беларускай паэзіі зь яе схільнасьцю да абстрактнай сымболікі, і да таго ж часта заснаванай на прыродных вобразах. Тут жа — карціна, якая ўражвае сваёй канкрэтыкай, напружана-дынамічнае і дэталёвае апісаньне, здавалася б, звычайнага трагічнага здарэньня. Хуткая зьмена плянаў, абрыўкі фразаў, кінутых мінакамі — гэта больш уласьціва хутчэй кіно, чым паэзіі. Апісваючы выпадковую сьмерць маленькага хлопчыка, паэтка, тым ня менш, пазьбегла залішняй сьлязьлівасьці й сюсюканьня. Прыцягвае ўвагу і подпіс пад вершам: «Ленінград». Хто ж яна, загадкавая аўтарка Арына Глінская?

Высьветліць гэтае пытаньне ўдалося толькі часткова, бо ледзьве не адзінай біяграфічнай крыніцай зьвестак пра паэтку пакуль што зьяўляецца ейная аўтабіяграфія, напісаная 4 сакавіка 1925 г. на просьбу кіраўніцтва Магілёўскай філіі «Маладняку»[1].

Такім чынам, пачнём па парадку.

Калі меркаваць паводле подпісу *«І. Глінская»* , сапраўднае імя паэткі, хутчэй за ўсё, Ірына, а Арына — псэўданім. Нарадзілася яна ў Магілёве ў сьнежні 1907 г., а ўжо ў наступным годзе сям’я пераехала ў Амсьціслаў. І бацька, і маці паходзілі зь сялянаў, абое працавалі настаўнікамі. Акрамя Арыны ў іх былі яшчэ дзьве дачкі. Але атмасфэра ў сям’і складалася не

найлепшая: бацькі між сабою ня ладзілі, часта спрачаліся, сварыліся, зусім не даглядалі дзяцей, а пасьля рэвалюцыі 1917 г. і ўвогуле разьвяліся. Бацька захапіўся рэлігіяй, зрабіўся папом і кудысьці зьехаў, а маці зь дзецьмі засталася ў Амсьціславе. Жыцьцёвыя ўмовы яшчэ больш пагоршыліся, сям'я пакутавала ад голаду, холаду і хваробаў: гішпанкі, тыфусу, карбункулаў… Каб пражыць і пракарміць дачок, маці вымушана была працаваць падзёншчыцай, бо сваёй зямлі сям'я ня мела. Некаторы час (1919—1920 гг.) Глінскія жылі ў вёсцы Міхайлаўск, потым ізноў вярнуліся ў Амсьціслаў, дзе Арына паступіла ў пэдагагічны тэхнікум.

У 1924 г., уражаная сьмерцю Леніна, Арына ўступіла ў камсамол, атрымала працу. «Зьмянілася жыцьцё. Нейк сьвятлей стала. У камсамоле працавала», — прыгадала А. Глінская той час. Але гэтая кароткачасовая радасьць неўзабаве зьмянілася чарговым цяжкім пэрыядам, бо ўлетку 1924 г. маці будучай паэткі, страціўшы крыніцу заробку, зьехала ў Ветку да цёткі, а Арына зь сёстрамі засталася ў Амсьціславе. Дзяўчаты працавалі «на табаку» (верагодна, на тытунёвай фабрыцы) — гэтым і жылі. Неўзабаве лёс разлучыў іх. Увосень камсамол даў Арыне месца загадчыцы партбібліятэкі, але тэхнікум, дзе яна вучылася, перавёўся ў Магілёў, і Глінская паехала туды. Адначасова з навучаньнем у Магілёўскім пэдтэхнікуме Арына Глінская працавала важатай піянэрскага дому. Яе старэйшая сястра зьехала ў Ленінград, а малодшая засталася ў дзядзькі ў Амсьціславе.

Адчуўшы ў сабе літаратурныя здольнасьці, 17 лютага 1925 г. студэнтка Арына Глінская разам яшчэ з трыма маладымі паэткамі — Наляй (Настай) Маркавай, Ганнай Старавойтавай і Марысяй Рагоўскай — падала калектыўную заяву з просьбаю залічыць іх у толькі што створаную Магілёўскую філію «Маладняку»[2] і дадала некалькі сваіх твораў на разгляд. Гэтыя раньнія вершы не захаваліся, але пра асобныя зь іх можна меркаваць паводле пратаколаў сходаў Магілёўскай філіі «Маладняку». На здадзенай крыху пазьней аўтабіяграфіі А. Глінскай было напісана кароткае рэзюмэ: «Бацька з папоў», але, нягледзячы на «сумнеўнае паходжаньне», яе прынялі ў філію. Глінская адразу ўцягнулася ў жыцьцё філіі, актыўна

ўдзельнічала ў яе сходах і пасяджэньнях. Так, у пратаколе ад 22 сакавіка 1925 г. асобным пунктам стаіць «Разгляд вершу Глінскай «Піянэр»:

Па радкох. У першым куплету: Рытм новы й добры. У трэцім. Вытрымана нэпманаўская ідэолёгія. *У трэцім.* Арк. 47.

У трэцім. *У трэцім.* *У трэцім.* *

Потым так: тыпы нада заўсёды вытрымліваць, паставіў мету, абдумаў, а потым пішы. Вобраз трэба рабіць каб ён падыходзіў да народа, тады верш будзе красівы і мілагучны. Там, дзе вобразы пастаўлены ня так як сьлед — гора не паэзія, а проза бядненькая такая! Вобразы заўсёды захапляюць, чаго ня дзелае параўнаньне. Чытаць нада заўсёды паглыбляючы, і ўдумывацца. Ну можа есьць пытаньні?

4

Наколькі такая вось «адаптаваная тэорыя літаратуры» дапамагала маладым творцам разьвіваць паэтычныя здольнасьці — невядома. З тагачасных сяброў філіі некаторую вядомасьць у літаратуры набылі хіба што Сяргей Фамін і Наля Маркава — прынамсі, артыкулы пра іх ёсьць у шасьцітомным даведніку «Беларускія пісьменьнікі». Астатнім творчая вучоба пад кіраўніцтвам У. Паскрэбкі, відаць, на карысьць не пайшла.

4 Тамсама. Арк. 10.

У кастрычніку 1925 г. Арына Глінская пераехала на месца жыхарства ў мястэчка Гарадзец (цяпер вёска ў Рагачоўскім раёне) і, адпаведна, перайшла ў Бабруйскую філію «Маладняка», якой кіраваў больш дасьведчаны ў літаратурных пытаньнях Міхась Лынькоў. У справаздачы аб працы філіі ён назваў А. Глінскую ў ліку «8 чалавек, якія працуюць (пішуць) болей-меней рэгулярна»[5]. Менавіта ў той час маладая паэтка напісала паэму «Новая вёска», урывак зь якой (пад назвай «Новае») яна надрукавала 24 лютага 1926 г. у раённай газэце «Камуніст» пад рубрыкай «Песьняры Бабруйшчыны». Твор меў яшчэ яскрава вучнёўскі характар і слаба раскрываў індывідуальныя асаблівасьці паэтычнага стылю А. Глінскай. Як і іншым «агітацыйным» вершам 1920-х гг., паэме ўласьцівыя схематызм і апісальнасьць, афарбаваныя ўва ўзьнёсла-мажорны тон:

5 Тамсама. Адз. зах. 11. Арк. 4.

У нядзелю ня звоняць у звоны,
І ня йдзе ў царкву народ —
У чырвоныя клюбу загоны
Зьбіраецца моладзь на сход.
Ляцяць новыя словы і думкі,
Вось жанчыны прыйшлі на сход,
І Тарасова жонка Дунька

«Бунтуе» жаночы народ.
І ня толькі тут словы і думкі —
Вунь жнейку пусьцілі ў палёх,
І Мацееў сын Міколка
Ў сельсавет «Араты» прывёз…
І сялькор малады Ігнатка
У газэту напіша ліст,
Што ў вёсцы мядзьведжай нашай
Каапэратар на руку ня чыст…

Відаць, што ў паэме аўтарка пакуль яшчэ не пазбавілася ранейшых недахопаў: «рыхмы» ў яе па-ранейшаму слабыя (*палёх — прывёз, Ігнатка — нашай, старыкі — туды, Алёна — новая*). Затое ў пазьнейшых творах яна пачала сьвядома імкнуцца да недакладнасьці рымаў і «арытмічнасьці» радка, спрабуючы вынайсьці ўласны арыгінальны стыль. Арыну Глінскую вабіла танічнае вершаскладаньне, яна зьвярталася да дольніка, тактавіка, акцэнтнага вершу, карысталася новымі для беларускай паэзіі відамі рымаў: рознанаціскной (*крыві — прыкрые*), усечанай (*лапцюжная — дужа, дождж — можна, «Крэстынтэрн» — верная* і г. д.), няроўнаскладовай (*цельца — сьцелецца*). Што ў яе выходзіла найлепей — дык гэта стварaць асаблівую, даверлівую паэтычную інтанацыю, чымсьці падобную да гутарковай. Праўда, пры гэтым у творах Арыны Глінскай сустракаецца шмат русізмаў (*зажыгаючая, знойны, бальшы* і г. д.) і неўласьцівых беларускай мове словаформаў (кароткіх прыметнікаў кшталту *чыст, далёк, шырок, сьвецел*). Вядома ж, жыцьцё на ўсходзе Беларусі, а потым і ўвогуле ўдалечыні ад радзімы не спрыяла чысьціні мовы.

У Ленінград паэтка зьехала пасьля заканчэньня тэхнікуму, улетку 1926 г. — верагодна, да старэйшай сястры (а мо выйшла замуж?). Там, у расейскім горадзе на Няве, існавала згуртаваньне беларусаў, дзейнічала Ленінградзкая філія «Маладняку», якую ўзначальваў паэт Рыгор Папараць. Але Арына Глінская не далучылася да ленінградзкіх маладнякоўцаў, а засталася патрыёткай Бабруйскай філіі, працягваючы друкаваць вершы ў «Камунісьце» і альманаху «Ўздым». Дзялілася зь землякамі ўражаньнямі ад Ленінграду:

Ціха дрэмле і ў дроме казкамі марыць
Ля маста бальшы «Крэстынтэрн»,
А Нява яму пацалункі дарыць,
А Нява для яго жонка верная…
Сонца жоўтай дарожкай уніз пакаціцца
Пакупацца ў хвалях Нявы.
Пырснуць золатам хвалі. Нява багатая!
І схіляць галаву на беразе львы[6].

Ленінградзкія вершы Арыны Глінскай напоўнены смуткам і тугою па радзіме, і нават статуі сьфінксаў на беразе Нявы абуджалі настальгічныя пачуцьці:

Сьфінксы вочы сашчурылі, гледзячы ў неба,
Ўспамінаючы знойны і жоўты Эгіпет…
Там яны ніколі ня бачылі сьнега,
І ніколі памяць аб ім ня зьнікне[7].

[6] Уздым. Літ. зб. Бабруйскай філіі «Маладняка». Кн. 2. Бабруйск, 1928. С. 32.

[7] Тамсама.

[8] Пакінуўшы родны край, маладая паэтка напісала верш «Беларусі», у якім разьвіталася з радзімай: *«Я іду сваёю пуцявінай, / Адплываю к новым берагам, / Там убачу новыя краіны / І надоўга застануся там»*[8]. І сапраўды, у Ленінградзе яна засталася ня проста нядоўга, але, мяркуючы па ўсім, назаўсёды. Прынамсі, публікацыі А. Глінскай, і без таго рэдкія ў беларускай прэсе, больш у ёй не зьяўляліся. Ці друкавалася гэтая аўтарка ў ленінградзкіх выданьнях — невядома… І таму яе, Арыну Глінскую, можна паставіць у адзін шэраг зь іншымі паэткамі 1920-х гг. — Натальляй Вішнеўскай, Ганнай Брэскай, Наляй Маркавай, Ідай Чырвань, Зосяй Палын, Хмаркай (Натальляй Панамаровай), якія спачатку заявілі пра сябе як таленавітыя аўтаркі, але яшчэ ў маладыя гады з розных прычынаў спынілі творчую дзейнасьць.

[8] Уздым. Літ. зб. Бабруйскай філіі «Маладняка». Бабруйск, 1926. С. 87.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2007/01/28
[image]

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 11 (51) - 2006**
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
[image]
[image]-[image]2006
Пачатак • Архіў • Пошук • Кантакты
Пачатак • Архіў • Пошук • Кантакты
Пачатак • Архіў • Пошук • Кантакты

апынуліся ў Літве. Бацькава мама, якая нарадзілася ў ваколіцах Маладэчна недалёка ад мястэчка Краснае, якое ў міжваенны час было акупаваная палякамі, перад самай вайной зьехала ў Вільню (якая таксама была акупаваная палякамі), каб вывучаць мэдыцыну. Падчас вайны выйшла замуж за літоўскага чыгуначніка. Гэткім чынам і засталася ў Літве.

Матчыны бацькі паходзяць з Лагойшчыны, гэта дзесьці паўсотні кілямэтраў ад Менску. У 1929 годзе яны былі раскулачаныя савецкай уладай і сасланыя ў Архангельскую вобласьць. Пасьля вайны былі звольненыя паводле амністыі, але дамоў не вярнуліся, паехалі проста ў Вільню.

Беларускай мове мяне ніхто не вучыў, бо ў маіх ваколіцах ніхто яе і ня ведаў. Дый наагул цяжка было разабрацца, хто я такі і хто мае бацькі. Матчыны бацькі лічылі сябе палякамі, размаўлялі на пакалечанай польскай мове, хадзілі на польскія набажэнствы і вельмі злаваліся, калі мой літуанізаваны бацька падсьмейваўся зь іх: «Ды якія ж вы палякі, вы ж — беларусы». Для іх гэта была страшэнная абраза.

Яшчэ ў мяне быў адзін слаўны сваяк у Беларусі, які памёр у тым самым годзе, у якім я нарадзіўся. Юзаф Камінскі — гэта стрыечны брат майго дзеда. У Савецкім Саюзе, можа, і ня ўсе ведалі гэтае прозьвішча, хоць абсалютна ўсім было ясна, пра што ідзе гаворка, калі вымаўлялася слова «Хатынь» і згадвалася статуя старога, які трымае на руках сына, што памірае. Той стары і быў маім сваяком, які перажыў Другую сусьветную вайну, калі нацысты спалілі ягоную вёску разам з усёй сям'ёй. Пазьней гэтая вёска і статуя сталіся ў Савецкім Саюзе сымбалямі ўсіх цывільных ахвяраў Другой сусьветнай вайны.

Падчас вучобы аднакашнікі, ведаючы пра мае сваяцкія сувязі, часам жартам казалі пра мяне: «Ён — зь сямейства тых, што не гараць». А раз наважыліся ў інтэрнаце папырскаць мяне сьпіртам і праверыць… Балазе, што своечасова прачнуўся і не пасьпеў падгарэць.

У Беларусі бываў і раней. Яшчэ ў савецкі час, будучы падлеткам, закахаўся ў дзяўчыну зь Менску. Езьдзіў да яе.

Пазьней езьдзіў на сабачую выставу; у Менску і Горадні мой ньюфаўндлэнд стаў чэмпіёнам сярод прадстаўнікоў гэтай пароды. А потым толькі праяжджаў празь Беларусь, едучы ў Маскву ці ў Варшаву. Яшчэ аднойчы быў на канфэрэнцыі пад дзіўным назовам: «Маўчаньне інтэлектуалаў». Там інтэлектуалы замест таго, каб маўчаць, чыталі рэфэраты. А пры пляшцы гарэлкі мэтафарычна наракалі, што вось, маўляў, Беларусь нібы паранены партызан, якога таварышы-байцы (гэта значыць мы ўсе — усходнія эўрапейцы) пакінулі аднаго, а самі ў лес паўцякалі.

Я не гісторык, але мяркую, што вялікая праблема беларусаў — паходжаньне. Інакш кажучы, пытаньне «адкуль я ўзяўся?» пакінутае бязь яснага адказу. Беларускія інтэлектуалы, якія знаходзяцца ў апазыцыі да ўлады, носяцца з сымбалічнымі пашпартамі ВКЛ — Вялікага Княства Літоўскага. Гэта была цэнтралізаваная і добра арганізаваная літоўская дзяржава, якая заваявала разрозьненыя славянскія землі, аддзяліла іх ад Масквы на цэлыя стагодзьдзі і такім чынам дала пачатак беларускай і ўкраінскай нацыям. Але гэта толькі маё меркаваньне, меркаваньне літоўскага пісьменьніка зь беларускай крывёй. Сапраўдныя беларусы ня лічаць, што яны былі кім-кольвечы акупаваныя, і ўважаюць сябе наўпростымі спадкаемцамі ВКЛ. Таму і краіна, якая сёньня завецца Беларусьсю, магла б называцца Вялікай Літвой. Лідэры беларускага нацыянальнага руху канца дзевятнаццатага стагодзьдзя ўсур'ёз абмяркоўвалі такі варыянт назову будучай дзяржавы. Дык тады, можа, і рэпліка мойго бацькі, адрасаваная цясьцям, не гучала б так абразьліва: «Якія ж вы палякі, вы ж — вялікія літоўцы». А пра сябе я б сказаў: у мяне — чвэрць літоўскай і тры чвэрці вялікалітоўскай крыві. Але як жа тады мы жылі б у Літве, маючы пад бокам Вялікую Літву, якая й сапраўды памерамі большая, і ў якой на троне сядзіць Самы Вялікі Літовец?

Але гэтым разам я быў у Беларусі, каб паглядзець, якая яна цяпер і кім я мог бы стаць, калі б тыя мае тры чвэрці яе не пакінулі.

У ДАРОЗЕ

Дарогі добрыя. Чыста. На ўзьлесках кідаюцца ў вочы абчасаныя камяні з надпісамі: «Беражы лес», «Не падпальвай». Усё гэта нагадвае чорна-белы рысунак, дзе паасобныя дэталі размаляваныя неспрактыкаванай дзіцячай рукой. Так выглядаюць гэтыя ярка-сінія, зялёныя і чырвоныя камяні на фоне бясколернай прыроды.

Менск у параўнаньні зь Вільняй — ня проста прасторны горад. Аніякага затору машынаў, праспэкты шырокія. Ленін ды іншыя савецкія атрыбуты тут усьцяж модныя, хоць горад па-свойму спрабуе мадэрнізавацца і эўрапеізавацца. Менчукі маюць выдатнае пачуцьце гумару і здольныя да самаіроніі. Ледзь ня кожная менская вуліца або будынак маюць сваю анэкдатычную гісторыю, а найбольш папулярны пэрсанаж гэтых анэкдотаў — беларускі прэзыдэнт.

Па прыбыцьці ў горад усе гаворкі пра паноўны тут рэжым могуць падацца лухтой, паколькі ніякіх вонкавых азнакаў народнай трагедыі тут не відно. Людзі жывуць у добра ўпарадкаванай мэтраполіі, дзе вельмі інтэнсіўна вядзецца шырокамаштабнае будаўніцтва. Нават не баяцца сказаць тое, што думаюць пра ўладу. Слухаю іх і азіраюся, калі ж нарэшце падыдзе міліцыянэр ва ўніформе, скруціць рукі такому гаваруну і адзене наручнікі. Але ніхто не падыходзіць, хоць гэтых «уніфармалаў» тут як нідзе больш, навалам. Ва ўсім горадзе паразьвешваныя бігборды, на якіх паказаная шчасьлівая бабуля, а за ёй — міліцэйскі службовец з усьмешкай на твары і надпіс: «Ён заўжды блізка». Гэта і ёсьць адказам на пытаньне, чаму і навошта іх тут так шмат: каб запэўніць бясьпеку бабулькам.

Але ж мэта майго падарожжа ня ў тым, каб шукаць прыдзірак. Я прыехаў сюды, каб прымусіць кроў загаварыць.

ПЕРШАЯ СПРОБА[1] — ГАСЬЦІННАСЬЦЮ

У маёй адраснай кніжцы ёсьць шэраг славянскіх прозьвішчаў.

[1] Літ. bandymas мае некалькі значэньняў:

Касьпяровіч, Міклашэўская, Косава, Гаворава, Бутко… Усё гэта мае сваякі, якіх я ніколі ня бачыў. І тапонімы: Барысаў, Зембіна, Лагойск, Калюга, Сярэдняя. Адрасы старых кватэр, хтосьці ўжо, пэўна, будзе на тым сьвеце, хтосьці ў іншых кватэры, іншым доме альбо горадзе.

У Барысаў прыяжджаю цягніком. Горад вялікі, больш за сто тысячаў жыхароў. Багата прамысловых аб'ектаў. Вось толькі ў рэстаране, атрымаўшы рахунак, пачынаю адчуваць першыя прыкметы правінцыйнасьці. Танна. У шмат разоў танней, чым у Менску.

Чыгуначны вакзал і рэстаран знаходзяцца ў Новым Барысаве, а мне трэба ў Стары. Еду туды і спадзяюся пабачыць стары горад, а знаходжу нейкую вялікую драўляную вёску і незаасфальтаваныя вуліцы. Аднойчы, памятаю, адна беларуска пыталася ў мяне пра Вільню: «Вось усе нешта захапляюцца: Ах, віленская староўка, ах, віленская староўка… А што гэта значыць? Што там дамы старыя?»

У Старым Барысаве ўрэшце зразумеў яе пытаньне. Тут папросту абавязвае іншае разуменьне старога гораду. І даправуды — дамы старыя.

Нарэшце стаю перад домам Ніны, стрыечнай сястры маёй мамы. Ведаю толькі яе імя і прозьвішча і тое, што ейны бацька, Тадэвуш, брат маёй бабулі, быў невысокі і што быў вельмі ахвочы да кабет. Ніна зьявілася ад ягонага першага шлюбу. Другая ягоная жонка была карэйка, дык яна нават стала нашай сямейнай легендай. Ходзяць чуткі, што была чараўніца. Калі-часам загадвала, дык магла пазбавіць мужчыну палавой моцы. За гэта былі ёй асабліва ўдзячныя ейныя сяброўкі, чые мужы часта выяжджалі ў камандзіроўкі.

Стаю перад брамай зялёнага драўлянага дому. Брэша сабака. У дворыку зьяўляецца сівая старая. Няёмка мне, ня ведаю, што сказаць. Сказаць: я — далёкі сваяк і прыехаў сюды, каб прымусіць кроў загаварыць?

Пытаюся, ці жыве тут такая і такая Ніна. «Гэта я», — адказвае старая. «А я, — адрэкамэндоўваюся, — ваш сваяк зь Літвы.

«Урэшце», «сяброўка», «кватэра», «кватэры», «іншым доме», «іншых кватэры», «іншым доме», «іншым доме альбо горадзе», «іншым доме альбо горадзе», «іншым доме альбо горадзе

Унук Юзэфы». Маленькая паўза. «Зайдзіце», — запрашае. Нясьмела абдымае, цалуе. Вочы напаўняюцца вільгацьцю. «Даруйце», — кажа. А пазьней ужо ўвесь час паўтарае: «Даруйце». Садзіць мяне за стол і кажа: «Даруйце». Нясе на стол пачастунак і ўсьцяж паўтарае: «Даруйце». Падае альбом. Альбом пачынаецца са шлюбнага здымку майго бацькі. Пазьней зьяўляюцца здымкі зь дзяцінства маёй мамы, здымкі дзядулі, бабулі. Стала нават неяк няёмка, бо, стоячы перад брамай, разважаў жа, колькі часу мне спатрэбіцца, каб растлумачыць, хто я і адкуль. А гэтага зусім не спатрэбілася, дый увогуле, было такое ўражаньне, што гэтая сівенькая бабуля як быццам доўгі час чакала майго прыезду і ў найбольш пачэсным месцы трымала нашы здымкі, а цяпер толькі просіць ёй прабачыць, што яна, можа, крышачку застарая.

Ніна гартае альбом і расказвае. Думкі хаатычна скачуць у часе.

Яна была яшчэ маленькай дзяўчынкай, калі жаніліся мае дзядуля з бабуляй. Прыгадвае, што вясельле было вельмі вялікае. І што яна тады надта спрытна гойдалася на арэлях, прымацаваных да дзьвюх бярозаў. І што вясковы двор Міклашэўскіх (маіх прадзедаў) быў такі доўгі, што кожны іх сын, які жаніўся, мог да яго боку «прыклеіць» сваю хаціну. Таго доўгага двара не засталося, бо ўсіх дэпартавалі, а ўрэшце і дом пабурылі. Праўда, сяляне з ваколічных вёсак і дагэтуль называюць тыя месцы палямі Міклашэўскіх.

«Чараўніца…» — зь Нініных вуснаў вырываецца непрыязны эпітэт, калі трапляе на здымак карэйкі, сваёй мачахі.

Муж Ніны, вэтэран Другой сусьветнай вайны, які ваяваў на японскім фронце, сёньня ляжыць на божай пасьцелі. «Хто там?» — пытаецца са свайго пакою, пачуўшы, што ў хаце чужыя. «Сваяк зь Літвы прыехаў», — громка адказвае, нахіліўшыся над ім, Ніна. «Дык чаму ж ты не папярэдзіла?» — наракае на яе тонам гаспадара. «Скажы яму, што я зараз… Вось толькі тапкі абую і зараз жа прыйду». Але ён не прыходзіць, бо ўжо даўно ня можа хадзіць.

За некалькі вуліцаў знаходзіцца дом Галіны, стрыечнай сястры маёй мамы зь дзедавай лініі. І зноў на стале пачастунак, зноў

альбомы, у якіх тыя самыя вялікія шлюбныя здымкі маіх бацькоў. Тут таксама ня трэба тлумачыць, хто я і адкуль. Мы — сваякі, і гэтым усё сказана. Драўляны дом Галіны, у якім яна жыве разам з двума дарослымі дзецьмі, цеснаваты. У двары ўжо стаіць новы дом, пабудаваны зь белай цэглы, толькі яшчэ не абсталяваны ўнутры. Галіна горда водзіць мяне будоваю, паказвае, дзе будзе кухня, дзе ейная спальня, а дзе спальня яе дзяцей. А тут — камін. «Божачкі, — кажа, — я ж буду мець уласны камін. Прыедзьце праз год. Будзем адзначаць маё сямідзесяцігодзьдзе і ўваходзіны адначасова. Мы ж сваякі, і нас так няшмат засталося».

Калі, разьвітаўшыся, сядаю ў таксі, праз вузкую вулачку Старога Барысава пастух гоніць быдла. Адна з кароваў паварочвае ў Галінін двор — дамоў. Неверагодная цеплыня, зь якой мяне тут спаткалі, паволі разагравае тыя тры чвэрці крыві, але здаровы розум мне кажа ўвадначас, што жыцьцё тут было б сапраўдным выгнаньнем.

ДРУГАЯ СПРОБА — АГНЁМ

Наступны дзень — у Лагойску. У гэтым горадзе ў мяне няма сваякоў, ёсьць толькі магіла прадзеда. Ён пасьпеў памерці ўжо за савецкай уладай, але тады, калі яшчэ не была раскручаная рэпрэсіўная махіна.

Незнаёмую тэрыторыю заўжды спрабую адчуць, паеўшы. Паясі — і становіься бліжэйшым.

Абедаю ў лагойскай сталоўцы, якая на сто адсоткаў адпавядае ўсім патрабаваньням харчовых установаў майго дзяцінства. Магчымы дзьве стравы: сасіскі альбо катлеты. Гарніру няма, бо скончыўся. Цэны папросту сьмешныя. У Літве некаторыя спрабуюць прапанаваць турыстам сталоўкі ў савецкім стылі, але яны церазьліш штучныя ў параўнаньні з гэтай аўтэнтыкай. У музэі я назваўся літоўскім сваяком Юзафа Камінскага, героя спаленай Хатыні, і сказаў, што мае дзяды паходзяць з гэтых ваколіцаў. Ня ведаю, што спрацавала лепш: ці факт маіх сваяцкіх сувязяў, ці тое, што зьяўляюся замежнікам, але

работнікі музэю шчыра і ад душы стараліся мне дапамагчы. На стале насупраць мяне ляжаць тоўстыя кнігі з гісторыі Лагойску, старыя мапы, сьпісы дэпартаваных сем'яў. Сярод апошніх маіх блізкіх няма. Не ўдаецца знайсьці і былога двара маёй бабулі, ад якога ўзяўся назоў «палі Міклашэўскіх». Адна няўдача за адной; музэйныя працаўнікі відавочна хвалююцца, бо нічым ня могуць дапамагчы. А як толькі даведваюцца, што чарговая мэта майго падарожжа — Хатынь, тут жа стараюцца для мяне са службовым аўтамабілем. Сіні «жыгуль» з надпісам «культурно-просветительная» адвозіць мяне ў спаленую нацыстамі вёску. Але перад тым, як адчыніць чарговыя дзьверцы, мушу зрабіць уступ.

Колькі разоў сьніўся мне адзін і той жа сон. Вайна. Я — прыгожая маладая дзяўчына зь вісельнай пятлёю на шыі. Экзэкуцыя публічная. Грае нямецкі марш, нацысцкі салдат суне мне да вуснаў мікрафон і загадвае сьпяваць. Сьпяваю. Калі марш сканчаецца, разумею, што хутка мяне павесяць. У натоўпе заўважаю маленькую дзяўчынку. Пачынаю ёй крычаць, што мы павінны супраць іх змагацца, бо яны — зло. Яны — зло. У пэўны момант апынаюся ў паветры — і пятля зацягваецца. Нейкі час яшчэ назіраю сябе збоку. Потым прачынаюся і цешуся, што я — мужчына і што вайна скончылася шэсьцьдзесят гадоў таму.

Але гэта ўсяго толькі сон. Як літовец, я не адчуваю вялікага жалю з-за гэтай вайны. Ведаю, якімі вялізнымі былі людзкія страты, разумею ўсю жудасьць і маштабы забойстваў. Аднак усё гэта ня мае для мяне асабістага значэньня. Ніхто зь людзей, якія па-сапраўднаму мне блізкія, не пацярпеў падчас гэтай вайны. А самі літоўцы, напэўна, больш смуткавалі тады, калі нацысты пакідалі Літву ў 1944-м, чым тады, калі ў 1941-м яе акупавалі. І былі на гэта прычыны. Бо перад прыходам нацыстаў і пасьля іхнага сыходу былі саветы, якія згатавалі літоўцам нашмат больш жахлівыя рэпрэсіі.

У Беларусі было інакш. Паводле адных крыніцаў, цягам Другой сусьветнай вайны загінуў тут кожны чацьверты жыхар краіны, а паводле іншых — кожны трэці.

Вось які тэкст я знайшоў у Сеціве. Напісаны ён расейскім

жаўнерам, які разам з Чырвонай Арміяй абышоў у 1944-м абедзьве гэтыя краіны.

Ва ўрачыстым настроі, пераможна і горда, абсыпаныя безьліччу падарункаў, палкі 39-й арміі рухаліся праз тэрыторыю Беларусі, вызваленую палкамі першага эшалёну. Паўсюль прымалі з радасьцю і па-братэрску. Людзі сустракалі адзін аднаго з усьмешкамі, кветкамі і хатнім віном.

Гэтак трыюмфуючы, мы пад'ехалі да памежжа Літвы. Гэта было 10 ліпеня. Вось яно, ніколі ня бачанае замежжа. Насупраць нас — Швянчоніс, літоўскае памежнае мястэчка. Спыняемся на пляцы насупраць касьцёлу. Пасьля Беларусі — паўсюль настрой адваротны. Мясцовыя глядзяць на нас абыякава. Ніякіх авацыяў. Крыху супакоіўшыся, пачынаюць аглядаць машыны, гарматы, салдатаў. Ніхто ні аб чым не пытаецца. Недавер у вачах. Яскрава адчуваецца: мы — няпрошаныя госьці.

У Літве значная частка помнікаў ахвярам Другой сусьветнай вайны месьціцца ў парку Грутаса, інакш кажучы, у музэі савецкай эпохі. Тымчасам уся Беларусь — гэта вялікі музэй вайны пад адкрытым небам. Помнікі і мэмарыяльныя дошкі змагарам, загінулым, спаленым, пераможцам трапляюцца на кожным кроку. Знаходзячыся тут, нават моцна захацеўшы, не забудзесься на вайну. Найбольш жахліва тое, што ўсё гэта функцыянуе ня проста як напамін пра боль народу, але і як інструмэнт рэжымнай палітыкі. Краіна шэсьць дзясяткаў гадоў жыве ў пасьляваенным настроі, а найбольшай каштоўнасьцю тут лічыцца тое, што ты застаўся жывы і што твая сям'я не галадае. І якая там розьніца, хто пры ўладзе.

Цяпер ужо магу вылезьці зь сіняга «жыгуля» з надпісам «культурно-просветительная» і ісьці ў Хатынь. Мо тут адчую сапраўдны асабісты боль абмінулай мяне вайны?

Вось ён, славуты мой сваяк, выліты з бронзы. На руках — сьмяротна паранены сын. Мая мама зь дзядулем адведалі Юзафа Камінскага ў 1955 годзе. З таго гасьцяваньня застаўся здымак: Камінскі са сваёй другой жонкай, абодва ўсьміхаюцца.

На адвароце надпіс па-расейску: «На доўгую памяць дарагім братам. Калі паглядзіш, прыгадай дзяцінства. Камінскія. 14.02.55».

Юзаф Камінскі тады яшчэ ня быў знакамітасьцю, а Хатынь была адной з соцень вёсак, спаленых нацыстамі разам зь людзьмі.

Нашмат лепей Юзафа Камінскага памятае стрыечны брат маёй мамы, які празь сямнаццаць гадоў наведаўся ў той дом, у вёсцы Козыраў, дзе Камінскі жыў пасьля вайны. Тады ўжо пра Хатынь ведаў увесь Савецкі Саюз, а Камінскі быў зоркай.

«Стаміўся жыць, — гаварыў ён сваякам. — Мне нічога не бракуе, магу патэлефанаваць у Лагойскі выканаўчы камітэт, папрасіць нават вядро чорнай ікры, і яны зараз жа ўсё гэта прывязуць. Але іншым разам звоняць мне і кажуць: Камінскі, прыяжджае важная дэлегацыя, правядзі экскурсію. І я абавязаны паказваць ім Хатынь, соты раз расказваць, як усё было, і ўсё гэта яшчэ раз перажыць».

Праз паўгоду ён памёр.

А трагедыя Хатыні была такой.

У 1943 годзе савецкія партызаны ў ваколіцах Хатыні перарэзалі тэлефонныя драты. Нацысты прыехалі наладзіць сувязь, а партызаны іх чакалі ў засадзе. У часе перастрэлкі загінуў эсэсаўскі ваенны Ганс Вэльке, улюбёнец Гітлера. У 1936 годзе падчас Бэрлінскай алімпіяды ён стаў першым чэмпіёнам. Апрача таго, ён устанавіў новы рэкорд у кіданьні ядра і наагул зрабіўся першым грамадзянінам Нямеччыны на час усяе гісторыі алімпіяды, заваёўваючы алімпійскае золата ў лёгкай атлетыцы. Гэта, галоўным чынам, і паспрыяла зьяўленьню ў нямецкай прэсе заявы, што ў спорце пачынаецца панаваньне арыйскай расы. А празь сем гадоў гэтага арыйца ўкатрупілі на беларускім узьлеску. У Нямеччыне была абвешчаная жалоба, а батальён нацысцкай паліцыі празь сьляды на сьнезе шукаў партызанаў. Сьляды вялі ў Хатынь, дзе партызаны адпачывалі пасьля ўчыненага нападу. Пачалася бойка. Партызанам удалося ўцячы ў лес. Тады нацысты ўсіх жыхароў Хатыні загналі ў хлеў каваля Камінскага і падпалілі. Калі падпалены

натоўп сялянаў выламаў дзьверы хлява, па ім пачалі страляць з кулямёта. Сярод загінулых былі жонка Ю. Камінскага з чацьвёркай дзяцей. Пазьней нацысты яшчэ доўга шукалі жывых, білі ў твар рулямі аўтамата. Камінскі ляжаў без прытомнасьці, таму і ня чуў, як салдат выбівае яму ўсе верхнія зубы. Калі даходзіць да памяці, адзін зь ягоных сыноў яшчэ жыве. Яшчэ шмат жывых, людзі енчаць, абпаленыя і падстрэленыя. Усе яны памруць, за выняткам Камінскага і некалькіх вясковых дзетак, якіх нацысты не знайшлі альбо зь якіх, знайшоўшы, зьлітаваліся.

Чвэрць стагодзьдзя гэтая трагедыя была мала каму вядомая. Яна была папросту адной з многіх. Савецкая ўлада наагул не сьпяшалася гучна гаварыць пра ахвяры мірных жыхароў. Пазьней палітыка памянялася, і камуністычны лідэр Беларусі Пётар Машэраў вырашыў пабудаваць мэмарыял. Выбраў адну такую спаленую вёску на сваёй радзіме, недалёка ад Віцебску. Але падумаў, што Віцебск усё ж занадта далёка. Чаму выбраў Хатынь? Афіцыйна: дзеля турыстаў, каб было бліжэй да Менску. Але ёсьць і іншая, неафіцыйная прычына: дзеля назвы, каб назва Хатынь нэўтралізавала тую Катынь, дзе саветы ў 1940 годзе расстралялі больш за тысячу польскіх салдатаў. Дарэчы, перад вайной не было «Хатыні», а была «Хотынь», літара «а» зьявілася пазьней.

Але ўсё гэта не памяншае жаху таго, што тут адбылося. Выдатна тут папрацавалі і архітэктары, не дарма знаўцы называюць гэты мэмарыял шэдэўрам манумэнтальнага мастацтва. Паводле аповеду Юзафа Камінскага тут зробленыя рэпрадукцыі ўсіх дваццаці шасьці хатаў спаленай вёскі. На іх месцы стаяць стылізаваныя вароты, ёсьць падлогавы брук і слупы, якія нагадваюць коміны. Кожная хата мае невялікі звон. Званы звоняць, адзін у адным канцы вёскі, другі — у іншым. Сапраўды, узрушае.

Але ўзрушае ня так, як павінна б узрушаць, ня так, як было задумана аўтарамі і замоўцамі. Бо Хатынь створаная як памяць усім ахвярам вайны ў Беларусі, гэта значыць звыш двум мільёнам людзей. А я хаджу і расчульваюся толькі над ста васьмюдзесяцьцю спаленымі тут. Мне іх сапраўды робіцца да

болю шкада, тым больш калі звоняць званы і калі на ўскраіне мэмарыялу я дакранаюся да зьдзічэлай вішні з былога тутэйшага саду і нават адчуваю яе водар.

Напэўна, гэта ўжо мая няздольнасьць думаць і адчуваць глябальна альбо прыроджаны недахоп, уласьцівы ўсёй нашай сям'і, бо, паводле словаў аднаго з трох архітэктараў мэмарыялу, Юзаф Камінскі аж да самай сваёй сьмерці быў сьвята перакананы, што помнік у Хатыні быў пастаўлены яму. Звычайны селянін быў ня ў стане ўспрыняць сябе як сымбаль нечага большага і злаваўся на савецкую ўладу, што яна не прысвоіла яму званьня Героя Савецкага Саюзу.

Чатыры апошнія гады свайго жыцьця ён быў у цэнтры ўвагі грамадзкасьці. Ён быў найпажаданейшым экскурсаводам па Хатыні, чалавек, які са сьлязамі распавядаў, як на ягоных вачах згарэла жонка, чацьвёра дзяцей і ўся ягоная вёска. Гэтыя чатыры гады, ад моманту пабудовы мэмарыялу і да сьмерці Ю. Камінскага, вартыя цэлага раману. *Ён меў свой уласны помнік на тым месцы, дзе ўсё згубіў*.

Аднак існуе яшчэ адна, яшчэ больш жудасная вэрсія ўсіх гэтых падзеяў.

Батальён нацысцкай паліцыі, які спаліў вёску, складаўся ў асноўным з украінцаў, хоць мясцовыя жыхары чамусьці называлі іх «літоўцамі». У савецкі час гэты факт замінаў бы палітыцы братэрства народаў.

Вёска Хатынь была каталіцкаю, а каталіцтва ў гэтых краях атаясамлівалася з польскасьцю. Таму Юзаф Камінскі пазьней быў перайменаваны ў Ёсіфа, бо трэба было ўвасобіць у ім трагедыю сапраўдных, а не апалячаных беларусаў.

Усё гэта не памяншае трагедыі хатынцаў, таму нават прадстаўнікі найвышэйшых пластоў улады пагаджаліся: так, гэта праўда.

Аднак пра самую жудасную акалічнасьць новай вэрсіі хатынскіх падзеяў пакуль што гаворыцца толькі паўголасам. А яна вось якая: Юзафа Камінскага, стрыечнага брата майго

дзеда, не было ў Хатыні ў тым часе, калі нацысты спалілі яго вёску. Ён знаходзіўся ў Сярэдняй — роднай вёсцы майго дзеда, дзе сьвяткаваў хрэсьбіны.

Магчыма, беларуская савецкая ўлада ўдала выбрала вёску з увагі на ейную вядомасьць і геаграфічнае становішча, але пры гэтым зусім не пацікавілася ейнай перадгісторыяй. І майму сваяку прыходзілася сотні разоў расказваць створаную ім самім альбо накінутую легенду. Расказваць пра тое, як ён гарэў у сваім хляве, хоць яго там насамрэч і не было. Калі гэта праўда, дык фігура Юзафа Камінскага як сымбалю ахвярнасьці і гераізму рассыпаецца ў шчэпкі. Аднак яго чалавечая драма становіцца тады яшчэ больш вострая. Ён меў свой уласны помнік, пастаўлены на тым самым месцы, дзе калісьці ўсё згубіў. Хлусіў, што гарэў у хляве разам зь вёскай і з усёй сям'ёй. І хацеў званьне Героя за тое, што ў судны дзень яго папросту не было дома. Неяк не магу прымусіць самога сябе паверыць ува ўсё гэта. Але я — ягоны сваяк і наўрад ці мог бы быць аб'ектыўны.

Таму «культурно-просветительная» вывозіць мяне з Хатыні і вязе дзесьці ўглыб лесу. Недзе празь дзесяць кілямэтраў пад'яжджаем да Сярэдняй.

ТРЭЦЯЯ СПРОБА — КАРАНЯМІ

Калі вёска і бывае «глыбінкай», дык гэта якраз той выпадак. Людзі падазрона паглядаюць на надпіс на нашым службовым аўтамабілі. Пытаюся, дзе тут жывуць Казлоўскія. Паказваюць на другі канец вёскі. Насупраць дому Казлоўскіх — апошняя мэта майго падарожжа, месца, дзе стаяў дом дзядоў. У 1928-м, адтанчыўшы вясельле ў доўгім доме Міклашэўскіх, дзе ў двары на прымацаваных да двух бярозаў арэлях гойдалася Ніна, маладыя прыехалі сюды, на радзіму дзеда — у Сярэднюю. Нарадзіўся ў іх сын, мой дзядзька, які памёр дарогаю ў выгнаньне, не пражыўшы нават і паўгоду. А мая бабуля будзе пазьней да канца жыцьця ставіць сьвечачку невядомаму дзіцяці на могілках Роса ў Вільні з надзеяй, што гэткім чынам хтосьці і на Поўначы падбае і пра магілку яе першароднага.

Прыяжджаем да Казлоўскіх, Казлоўскія нічога ня ведаюць. Раяць ісьці да суседзяў.

«Касьпяровічаў дом? — перапытвае суседка, пажылая жанчынка. — А як жа, ведаю. Тут быў. Карову спрабавала навязваць, дык не было дзе калок увагнаць: паўсюль старыя фундамэнты».

У 1929 годзе ў Лагойску была выстава гаспадарчых дасягненьняў, і мой дзед вырашыў удзельнічаць, бо меў вельмі добрага каня. Выехаў у горад конна, а вярнуўся ў суправаджэньні прадстаўнікоў улады, якім гэты конь, відаць, надта запаў на вока. Гэтак мае дзяды былі раскулачаныя і дэпартаваныя на поўнач Расеі.

«Тут яшчэ доўгі час быў сад вашых дзядоў, — паказвае суседка, — вельмі харошыя яблыкі. Уся вёска аб'ядалася імі. Толькі вось дзесяць гадоў таму старшыня калгасу чамусьці загадаў яго высекчы. Уся вёска тады бедавала».

Зямля на месцы былога дому маіх дзядоў крыху прыпаднятая. У ёй — камяні былых падмуркаў. Калі чалавек можа мець карані, дык тут якраз тое месца, дзе мог бы іх адчуць. Залажу на гэтыя камяні і спаглядаю ваколіцы. Спрабую пачуць кроў, але кроў маўчыць. Здаецца, што ў 1929 годзе мяне вырвалі адсюль з усімі маімі каранямі і перасадзілі. Бо я нічога не адчуваю, хоць і раблю немалыя намаганьні. Калі б мой дзядуля вярнуўся з канём і надалей тут жыў і сёньня, я быў бы адным зь людзей гэтай вёскі…

Не, гэта не мая вёска і не мая краіна, як бы я таго ні хацеў. Мае тры чвэрці крыві нічога ня хочуць гаварыць. Я не зьяўляюся чальцом гэтага народу.

АПОШНЯЯ СПРОБА — БУНТАМ

Але, магчыма, існуе і яшчэ адна Беларусь, якой я ня ведаю. Спрабую апошні раз прымусіць кроў загаварыць — з групаю інтэлігентаў-апазыцыянэраў еду ў Віцебск падыскутаваць. Яшчэ

ў дарозе нас папярэдзілі, што арганізатары прасілі пазьбягаць палітыкі. Наагул, я не люблю палітыкі, але цяпер пастаўленая нам умова неяк мяне занепакоіла. Міжволі ўсе мае думкі запаланіла палітычная тэматыка.

Прыбываем на месца дыскусіі раней, чым наша аўдыторыя. Гледачы сабраліся дзесь у іншым месцы, каб без патрэбы не прыцягваць увагі службоўцаў ва ўніформе. Нарэшце сустрэча. Дыскусія — нейкая размытая і абсалютна нявінная. Толькі пазьней стала ясна, што большасьць слухачоў упершыню чуюць жывую беларускую мову і нічога не разумеюць. Але слухалі. Выходзіць, што гэта быў хутчэй канцэрт, чым дыскусія.

Пазьней нас вязуць у бярлог мясцовай апазыцыі. Менавіта так яны самі мянуюць: «бярлог». Мне называюць людзей. Вось гэта — камуніст, чалец апошняга дэмакратычнага парлямэнту Беларусі. Цяпер — валацуга і бясспрэчны чэмпіён краіны паводле колькасьці арыштаў. Жанчына — калісьці была абраная старшынёй аднаго камунальнага дому. Калі пачала змагацца за вырашэньне камунальных праблемаў, апынулася ў сьледчым ізалятары. Цяпер знаходзіцца пад хатнім арыштам і чакае суду.

У кватэры, што названая «апазыцыйным бярлогам», — рэвалюцыйны настрой. Шмат моладзі, у вачах усіх гараць агні, усе адданыя супольнай справе. Яны ведаюць, што зьяўляюцца бунтаўнікамі, і дзякуючы гэтай акалічнасьці ў іх ёсьць нешта прыцягальнае.

І вось тут мая кроў невыразна спрабуе нешта казаць. Але гэта хутчэй кроў творцы, чым кроў беларуса. Бо які ж творца ня марыў пра тое, каб быць бунтаўніком? А вось тут нават ня творчы, а самы сапраўдны бунт супраць таго самага зла, альбо, перыфразуючы «Гары Потэра», супраць Саміх Ведаеце Што.

І ўсё роўна гэта ня мой бунт. Мая рэвалюцыя адбылася пятнаццаць гадоў таму ў Літве. Я быў тады падлеткам і ня дужа змог да яе спрычыніцца. А каб далучыцца да гэтых людзей, трэба было б стаць бунтаўніком не зь неабходнасьці, а з пакліканьня. Але я ўжо маю прафэсію.

Еду дамоў і вязу з сабой выснову: кроў — гэта нямая матэрыя. Яна складаецца з плязмы, а таксама зь белых і чырвоных целаў. На пачуцьці і розум яна мае мізэрны ўплыў, а можа і ўвогуле ніякага ўплыву ня мае.

Наконт чалавечых каранёў мая выснова яшчэ больш суровая: няма чагосьці такога, як карані.

Толькі вось усё яшчэ ня хочацца жартаваць і пакепліваць зь Беларусі пад прэтэкстам бэлетрыстыкі. Бо мне падаецца, што беларускі народ цяпер балянсуе на дроце, падвешаным над прорвай. Калі пашанцуе, ён хутка выкараскаецца і яшчэ хутчэй нас усіх дагоніць. А калі трапіцца злая фартуна, яго можа і зусім ня стаць.

Аднак кроў мне кажа, што гэта ўжо не мая справа.

Пераклаў зь літоўскай Пётра Рудкоўскі
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/01/28
[image]

СЯРГЕЙ АБЛАМЕЙКА журналіст, працуе ў Празе. Скончыў гістарычны факультэт БДУ, дактарантуру Люблінскага ўнівэрсытэту (Польшча). Напісаў дысэртацыю па гісторыі Уніяцкай Царквы ў Беларусі. Апошняя кніга — «Егоізмы. Канстатацыі» (Бібліятэка «Вострая бровка», 2004).

Сяргей Абламейка Эгіпецкія фараоны — габрэі ці беларусы?

А гадзіне дня мы прыехалі ў гатэль і атрымалі пакой у дамку на беразе Чырвонага мора. Стаўшы пад вакном, я вырашыў зарыентавацца, куды падае цень. Ха-ха! Ценю няма. Сонца ў зэніце. Мы ў Афрыцы.

Трапны пачатак для эсэ, але з мастацкім перабольшаньнем. Насамрэч, прыгледзеўшыся, цень свой я знайшоў каля левай нагі — маленькі такі, сантымэтраў пятнаццаць-дваццаць.

* * *

Як толькі самалёт прызямліўся ў аэрапорце Каіру, праз ілюмінатар я ня ўбачыў ні караванаў зь вярблюдамі, ні пірамідаў, ні сьфінксаў і моцна зьдзівіўся. Пасьля падагналі трап, мы выйшлі з самалёта, і вецер чамусьці ня кінуў нам у вочы пясок з пустыні Сахары. А ў аэрапортаўскай прыбіральні я пералічыў усіх мух, і сярод іх не было ніводнай мухі цэ-цэ — усе звычайныя навозныя. Хіба гэта Афрыка, хіба гэта Эгіпет?! — абурыўся я.

Маё зьдзіўленьне тлумачыцца проста — я не люблю лётаць самалётам, а таму ў якасьці лекаў ад страху ўжываю гарэлку…

* * *

Каір — вялікі горад, ён цягнецца ва ўсе бакі на многія дзясяткі кілямэтраў. Сярод бясконцага мора агней, якія мы бачылі з самалёта, вельмі дзіўна вылучаліся шматлікія зялёныя агеньчыкі. Мне нават падумалася, ці ня мода гэта арабская — ставіць па ўсім горадзе разам са звычайнымі зялёныя ліхтары. Пасьля пасадкі мы ехалі начным Каірам, і зьдзіўленьню майму не было межаў, калі я зразумеў, колькі мячэтаў мы бачылі згары. Аказалася, тыя зялёныя агні ўпрыгожваюць… вежы мінарэтаў.

* * *

Паветра ў Эгіпце — малапразрыстае. Усё навокал як бы ахутвае гарачая смуга, краявід зацягнуты туманам. Недалёкія прыбярэжныя горы і горныя косы паабапал бухты ледзьве відаць у белаватым мроіве…

* * *

У эгіпецкай пустыні — ня толькі пясок, але і гліна. Можна сустрэць нават горы з засохлае і цьвёрдае як камень гліны. Вецер выдзімае зь іх цэлыя пласты, і ступеньчатыя, тэрасамі, схілы ўтвараюць фантастычныя незямныя пэйзажы. Можаш доўга рухацца пясковымі дзюнамі і раптам натрапіць на абрыў, пад нагамі далёка ўнізе адкрыецца велізарнае — на некалькі кілямэтраў — глінянае плято.

Пры заходзе сонца эгіпецкая пустыня набывае чырвона-карычневы колер…

* * *

Кожнае мора мае пах. Часам ледзь улоўны, а часам больш рэзкі. У ім адчуеш сьвежае паветра, салёную ваду, зацьвілыя водарасьці і вільготны пясок. Пах Чырвонага мора — ненавязьлівы, ледзьве ўлоўны і далікатны. Для гурманаў.

На Чырвоным моры ёсьць прыліў і адліў. Калі пасьля абеду мора пачынае адступаць, турысты бяруць пластыкавыя крэслы, заходзяць далёка ў мора на водмелі і сядаюць тварам да сонца загараць. Троху сюррэалістычны пэйзаж: далёка ў моры на вадзе стаяць крэслы, у іх дрэмлюць людзі…

Як прыемна сухапутнаму чалавеку глядзець на мора! Ці можа прыбярэжны жыхар з такой жа асалодай узірацца ў марскую далечыню?

* * *

Маё адкрыцьцё ў Эгіпце — фінікі. Ня сушаныя, а сьвежыя. Для арабаў яны тое самае, што яблыкі для беларусаў. Фінікі бываюць дзясяткаў гатункаў… Сьвежы фінік — гэта нешта сярэдняе паміж яблыкам, сьлівай і вінаградам. Іх ядуць і як першую страву, і як другую, і як дэсэрт. Іх можна есьці, заліўшы малаком, а можна зварыць, можна са скуркай, а можна і без — балазе, сыры фінік вылузваецца са скуркі так жа лёгка, як яго костка з пальцаў… Іх вараць, параць, тушаць, ядуць з соляй і цукрам… Карацей, цяпер я ведаю, чаму фінікі — асноўная ежа бэдуінаў.

* * *

Калі прыяжджаеш зь Беларусі ў Чэхію, адразу бачыш розьніцу ў прыродзе: навокал раз-пораз трапляюцца дрэвы і іншыя расьліны, якіх у нас няма. Але збольшага — тыя самыя хвоі, яліны і бярозкі. Калі ж прылятаеш у Эгіпет, адразу бачыш:

практычна ўсё, што расьце навокал, не сустракаецца ў Беларусі. Прыехаў, агледзеўся і адразу зразумеў: ты на іншым кантынэнце.

* * *

Мова эгіпецкіх курортаў на Чырвоным моры — ангельская. Але калі араб ідзе і бачыць эўрапейскую бляндынку, ён чамусьці кажа ёй усьмешліва:

— *Buongiorno*.

Няўжо гэта празь вялікую колькасьць фарбаваных італьянак на мясцовых пляжах? А можа, італьянская ўспрымаецца тут як мова каханьня?

Адказ зьявіўся празь некалькі дзён, калі я даведаўся, што наш гатэль — італьянскі, як і ягоны пераважны турыстычны кантынгент.

Наагул, «Бабілён» на беразе Чырвонага мора гаворыць на дзясятках моваў. У выніку — шмат дробных казусаў. Заходжу ў рэстарацыю і кажу:

— *Hello!*

Афіцыянт мне ў адказ:

— *Auf Wiedersehen*.

Славакаў паўсюль называюць чэхамі. Тыя не крыўдуюць і ў адказ памалу навучаюць арабаў «чэскай» мове. Арабы радуюцца і на разьвітаньне кажуць «па-чэску»:

— *Dovidénja*.

Чэскае *nashledanou*, відаць, моцна крыўдуе.

Мы таксама навучылі арабаў казаць «добры дзень» і «да пабачэньня». Даволі добра дзекаюць.

* * *

У рэстарацыі гатэлю і ў пары рэстарацыяў у Каіры нам ні разу ня трапілася перасоленая страва. Вельмі шмат — наагул не салёныя. Відаць, тубыльцы навучаныя векавым досьведам: наясіся салёнага — захочацца піць…

* * *

У рэклямных праспэктах пра комплекс паслуг «усё ўлучана» падкрэсьліваецца, што ў рэстарацыях гатэлю і барах на пляжы бясплатна падаецца алькаголь толькі мясцовае вытворчасьці. Калі я пакаштаваў эгіпецкае піва *Stella lager beer*, я падумаў, што добра знаёмая ўсім маім суродзічам расейская «Балтыка» побач не стаяла з гэтай эгіпецкай «Стэлай»…

Добрае ўражаньне пакінулі і мясцовыя віны. Я ўпадабаў чырвонае *Omar Chayam* зь вінаграду «кабэрнэ» і «савіньён» і ружовае *Rubis d'Egypte* з гатунку з гэткай жа назвай. Дый ці могуць быць кепскія віны пры такой колькасьці сонца і цяпла?..

* * *

Эгіпет — ваенная краіна. Усюды шмат вайскоўцаў і паліцыі. Нават у пунктах аплаты за дарогі — людзі ў форме і ў цывільным з «калашнікавымі» ў руках. Спыняемся на запраўцы — таксама пяць-сем людзей з аўтаматамі. На сьцяне за прылаўкам — партрэт нейкага генэрала. Пытаемся, хто такі. На ламанай ангельскай адказваюць, што генэрал — заснавальнік запраўкі!

У пунктах кантролю паліцыянты пералічваюць колькасьць турыстаў у аўтобусе і паведамляюць праз мабільную сувязь ў наступны пункт.

У нашым турыстычным аўтобусе — два мажныя афіцэры эгіпецкіх спэцслужбаў у гарнітурах, пры гальштуках і з аўтаматамі «Узі» пад пінжакамі — ахова. Мы з жонкай у геройства арабаў ня тое што ня верым, але так, трохі яму не давяраем, і вырашаем, што нашыя ахоўнікі пры тэрарыстычным замаху ўцякуць першыя. А нам трэба глядзець, куды пабягуць, і — за імі.

* * *

Эгіпет — другая паводле колькасьці насельніцтва краіна Афрыкі. Першая — Нігерыя. У Эгіпце жыве 70 мільёнаў чалавек, зь іх 90 працэнтаў — у гарадах даліны Нілу. 94 працэнты насельніцтва — мусульмане. Астатнія — хрысьціяне: грэкі, армяне і арабы. Сярод насельнікаў-мусульманаў — ня толькі арабы. Жывуць у Эгіпце і бэрбэры, і іншыя народнасьці. 51 працэнт — непісьменныя. Штогод краіну наведвае 3 мільёны турыстаў.

На 17 мільёнаў жыхароў у Каіры 10 мільёнаў аўтамабіляў. У найбольш экстрэмальную сытуацыю ў эгіпецкай сталіцы трапляе якраз аўтааматар. Правілаў дарожнага руху як такіх не існуе. Дарожных знакаў, кажуць, ёсьць 10. Сьвятлафораў, за выключэньнем некалькіх раёнаў Каіру, няма. У маёй памяці на ўсё жыцьцё засталіся малюнкі з каірскіх вуліцаў: чатыры-пяць палосаў у адзін бок, чатыры-пяць — у другі. Перакрыжаваньне. Сьвятлафора няма. На дарозе — страшэнны гармідар. Каля дзясятка паліцыянтаў, размахваючы рукамі, разганяюць затор, сварацца з кіроўцамі і паміж сабой, прапускаюць пешаходаў і нават дапамагаюць кіроўцам-небаракам буксаваць на ўзбочыну іх заглухлыя аўто.

Але самая галоўная неспадзеўка чакала нас напрыканцы. І гэта добра, бо інакш шматлікія нашы падарожжы былі б — як гэта сказаць? — ну… больш пікантныя. Толькі пад канец адпачынку мы даведаліся, як у Эгіпце здаюць на правы. Будучыя кіроўцы вучацца два тыдні дома прыватным парадкам і пасьля здаюць у паліцыі экзамэн. Той, хто атрымаў правы, можа ездзіць на ўсім, на чым захоча: на легкавіку, мапэдзе, матацыкле, на

самазвале, на аўтобусе і аўтафургоне з прычэпам. Правы выдаюцца адной універсальнай формы на ўсё жыццё. Ведай мы пра гэта загадзя, маглі б пару разоў і не згадзіцца падарожнічаць па краіне маленькімі прыватнымі аўтобусікамі…

У самалёце дарогай назад прачыталі нарэшце парады турагенцыі: што з сабой браць, як паводзіцца ў Эгіпце і чаго рабіць ня варта. Наконт правілаў дарожнага руху там было напісана з гранічнай ляканічнасьцю: «У Эгіпце на дарогах пануе адно правіла: «права мацнейшага зь цьвярдзейшымі нэрвамі»…

* * *

У цэнтры Каіру ёсьць велізарныя могілкі. Да іх прымыкаюць кварталы Старога Гораду, які цяпер знаходзіцца ў вельмі занядбаным стане. У першую каірскую ноч, калі мы ехалі праз стары цэнтар, нас уразілі яго сылюэты: купалы дзясяткаў мячэтаў, сотні мінарэтаў, абрысы характэрных стральчатых брамаў і ламаныя дахі арабскіх дамоў у сьвятле аграмаднага чырвонага месяца… Амаль фантастычная карціна, якая абудзіла ў душы дзіцячыя ўспаміны пра лямпу Аладзіна, «старыка Хатабыча», «багдадзкага злодзея» ды іншыя чытаныя і чутыя сюжэты.

Гэты сантымэнт, аднак, імгненна зьнік, калі мы прыехалі празь некалькі дзён у Каір пазнаёміцца з горадам. Аказваецца, тое, што так прывабна і рамантычна выглядала ў месяцовым сьвятле, пры сьвятле дзённым выклікае зусім іншыя пачуцьці, нават цэлую іх гаму: шчымлівую спагаду, шкадобу, абурэньне, боль і пратэст.

Штогод пяцьсот тысячаў перасяленцаў зь ліку зьбяднелых ушчэнт сялянаў атабарваюцца пераважна на тых агромністых, на многія квадратныя кілямэтры, могілках у цэнтры Каіру і прылеглых да іх пакінутых кварталах старога цэнтру. Усё разам гэта называецца Мёртвым Горадам — гэта яго абрысы мы бачылі ў месяцовым сьвятле. Мёртвы Горад даўно ўжо ня

мёртвы. Паміж магіламі новыя гарадчукі панаставілі буданоў і буданчыкаў, якія невядома як і невядома чаму ня падаюць ад парываў ветру. Паміж імі і магіламі ў брудзе і пыле поўзаюць у рызманах галодныя арабскія дзеці. Улады даўно зьмірыліся з засяленьнем могілак і нават пачалі праводзіць электрычнасьць і ваду да дамкоў на магілах. Ніхто ня ведае дакладнай колькасьці жыхароў Мёртвага Гораду, ніхто ня ведае, як ён можа прымаць новыя і новыя тысячы перасяленцаў з навакольных вёсак, і ніхто ня ведае, як і з чаго там жывуць і выжываюць.

Ня менш за Мёртвы Горад уражваюць бядняцкія кварталы на ўскраінах Каіру. Двух-, трох-, чатырохпавярховыя дамы, якія заканчваюцца абавязкова недаробленым паверхам, з кучамі будаўнічага друзу на ім. Недароблены паверхі шчэрацца ў неба бэтоннымі палямі і прутамі гнутае арматуры. Архітэктура найпростая: бэтонныя каркасы, сьцены і перагародкі, мураваныя ў адну цагліну ўпоперак, цэгла абпаленая, барвова-малінавая — з эгіпецкай гліны. Пыл, бруд, антысанітарыя. Вузкія вулачкі паміж гэтымі нетынкаванымі дамамі спрэс перагароджаныя кучамі сьмецьця. Яго ніхто не вывозіць — выкідаюць проста на вуліцах, або, у лепшым выпадку, выносяць і выкідаюць адразу за кварталам. Паміж дамамі можна бачыць цэлыя палі і пальмавыя гаі, заваленыя паўтарамэтровым слоем сьмецьця — суцэльны сьметнік. Стоячы проста на гэтых «брудных горах», падлеткі запускаюць паветраных зьмеяў. Зрэдчас сярод будаўнічага друзу на дахах — спадарожнікавыя антэны.

На першых паверхах — нейкія крамкі, майстэрні, «офісы», часта бяз вокнаў і дзьвераў. У арках і дзьвярных праёмах сядзяць захутаныя ў чорнае на саракаградуснай сьпякоце тоўстыя жанчыны, ля іх ног у пыле сярод пустых пластыкавых бутэлек, кавалкаў бруднае паперы і іншых адкідаў коўзаюцца прыгожыя, смуглявыя арабскія дзеткі. Побач сумуюць бяз працы работнікі-мужчыны…

Паветра насычанае невыноснай нудой, галечай і беспрасьветным адчаем.

Убачыўшы ўсё гэта, я зразумеў, адкуль вэрбуюцца дзеці на

ролю будучых тэрарыстаў-самазабойцаў. Калі ты ня ўмееш чытаць і пісаць, калі ты недаядаеш і ня маеш прыстойнай апраткі, калі ты пазбаўлены большасьці натуральных дзіцячых і юнацкіх радасьцяў, калі ў цябе няма шанцаў завесьці і ўтрымаць сям'ю і толькі зрэдчас праз тэлевізію ты бачыш карцінкі прыгожага заходняга жыцьця, табе вельмі проста паабяцаць Вырай зь яго 72 прыгажунямі адразу пасьля таго, як ты заб'еш сябе і некалькіх ненавісных габрэяў, эўрапейцаў ці амэрыканцаў, якія ў тваёй бядзе і вінаватыя…

Зрэшты, у 1980-я гады мне выпала з музэйнымі экспэдыцыямі аб'ехаць ці ня ўсю Беларусь. І нельга сказаць, каб убачанае моцна натхняла — і ў эўрапейскай нашай краіне сям-там яшчэ жывуць у хатах, якія топяцца па-чорнаму, у якіх няма электрычнасьці і земляная падлога, а з мэблі — толькі клясычны сялянскі набор XIX стагодзьдзя: стол, зэдлі і лавы пад покуцьцю, на якіх старэнькія беларускія кабеты і сьпяць, дажываючы свой век…

* * *

На эгіпецкія курорты едуць тысячы турыстаў зь дзясяткаў краінаў сьвету. Знаходзячыся ў такім «Бабілёне», цяжка ўстрымацца ад спакусы супаставіць народы і іхныя характары. У Эгіпце я абраў дзеля параўнаньня дзьве прыкметы: пыху і фізычны тып.

Калі казаць пра пыху, дык усе дзеляцца на дзьве вялікія групы: у адных — прэтэнзія, у другіх — упэўненасьць. Можна, зрэшты, сказаць і інакш: у адных — упэўненасьць, у другіх — самаўпэўненасьць.

Упэўненыя, найперш, — ангельцы. Яны проста сядзяць у барах на пляжы, п'юць піва або джын, кураць цыгары і гамоняць — і ў паставах іхных спакойная, непахісная рацыя і ніякага сумневу. Яны паводзяць сябе як гаспадары сьвету, не раздражняючы пры гэтым пыхай. Вялікія інтравэрты ў Брытаніі, ангельцы могуць не павітацца з суседам або, у лепшым выпадку, стрымана кіўнуць яму галавой. Але за мяжой яны ператвараюцца ў

экстравэртаў, аднак… толькі ў дачыненьні да іншых ангельцаў. Ангельцы заводзяць знаёмых і нават сяброў зь ліку сваіх суайчыньнікаў, выпадкова сустрэўшыся зь імі дзе-небудзь у Эгіпце ці на грэцкіх астравах. Так і сядзяць яны ў прыморскіх корчмах сваімі кампаніямі, нікому не замінаючы. На Маёрцы мне трапіўся нават спрэс ангельскі горад — усе навокал там гаварылі па-ангельску. І ў крамах, і ў рэстаранах, і ў гатэлях, і на пляжах.

Трошкі іншыя — ірляндцы. Гэтыя болей любяць піва і вялікія кампаніі сваіх суайчыньнікаў. Зьбіраюцца ў ірляндзкіх пабах, глядзяць футбол і гучна падтрымліваюць сваіх, могуць нават песьню на ўсё горла засьпяваць. Сярод ангельцаў і ірляндцаў вельмі шмат людзей, блізкіх вонкава да беларусаў.

Да ангельцаў збольшага падобныя паводзінамі немцы і галяндцы. Стрыманая ўпэўненасьць, самадастатковасьць, бяз пыхі. Хіба што немцы меней кантактуюць са сваімі суайчыньнікамі, а галяндцы — наадварот, такіх кантактаў шукаюць. Могуць таксама зьбірацца ў барах пры тэлевізійных трансьляцыях і выпіваць пры гэтым цыстэрны піва.

Італьянцы — бяз комлексаў, раскаваныя абсалютна. Гэтая іхная разьняволенасьць часам мяжуе з хамствам. Я б сказаў, што італьянцы — самаўпэўненыя, яны вакол сябе наагул нікога не заўважаюць. Італьянскія турысты ня могуць, як іншыя эўрапейцы, спакойна ляжаць на пляжы, глядзець на мора, думаць, чытаць. Яны бегаюць адзін да аднаго, перагукваюцца, жэстыкулююць і вельмі гучна размаўляюць. Абавязкова размаўляюць. Утвараюць кола з крэслаў і лежакоў і «сумоўнічаюць». Ім ня трэба купацца, нырцаваць і загараць — дастаткова сядзець у цянёчку, паліць і гутарыць. Калі італьянец заўважае такую кампанію і хоча да яе далучыцца, ён ня проста падыходзіць і загаворвае, ён пачынае крычаць, беручы ўдзел у размове за пятнаццаць-дваццаць мэтраў ад групы суайчыньнікаў. А падышоўшы, працягвае крычаць, як і астатнія. Часта такія групы даволі па-хамску выцясьняюць суседзяў з умоўна занятай тымі тэрыторыі пляжу, без дазволу «пазычаюць» плястыкавыя крэслы з-пад суседзкіх грыбкоў… Часам здавалася, што вакол — толькі італьянцы, якім на

радзіме не хапае кантактаў з суайчыньнікамі. Нібыта ня ўчора з Італіі прыехалі, але ўпершыню сустрэліся з дарагімі сваякамі і сябрамі пасьля шматгадовага выгнаньня.

Італьянцы, дарэчы, фізычна вельмі падобныя да беларусаў: такія ж невысокія, зь вялікімі галовамі, жанчыны — зь цяжкімі азадкамі… Але тэмпэрамэнт — адваротны нашаму.

Чэхі і палякі даволі блізкія паміж сабой — сваім вонкавым выглядам, манерамі і выразам твара яны як бы падкрэсьліваюць сваю незалежнасьць. Часта атрымваецца — пыха і прэтэнзія. У такі спосаб, відаць, у «новых эўрапейцаў» выяўляецца іх комплекс другаснасьці перад «старымі». Зрэшты, яны нярэдка спрабуюць адыграцца на яшчэ больш усходніх эўрапейцах — беларусах, расейцах, украінцах і нават прыбалтах. Дарэчы, адно дасьледаваньне грамадзкай думкі ў Польшчы паказала нядаўна, што сярод замежнікаў найлепей палякі ставяцца якраз да чэхаў.

Славакі — больш даступныя і адкрытыя, чым чэхі. І, як на мой густ, прыгажэйшыя.

«Нашы» людзі пераважна ціхія і спакойныя. Могуць, вядома, нападпітку і пашумець, папець расейскія песьні і гучна вылаяцца матам, што якраз і выдае прытоены копмлекс непаўнавартаснасьці. Расейцы на замежных курортах часта паводзяцца з выклікам, як бы адказваючы на «нелюбоў» замежжа. А ці ёсьць яна? Калі і ёсьць, дык толькі ва Ўсходняй Эўропе, дзе Расея спрабавала панаваць і навязваць свае парадкі. Расейцы, дарэчы, не разумеюць, што калі б яны конча адмовіліся ад спробаў «аб'яднацца», дык займелі б сярод некалі паняволеных імі народаў болей сымпатыкаў.

Арабы — захоўваюцца незалежна, але ўдзячныя за ўвагу да іх асабіста, а таксама да іх мовы і краіны, што выдае нацыянальны комплекс.

Ну а мы, беларусы, стрыманыя, спакойныя, самадастатковыя і ўсіх прапускаем наперад — нікому ня шкодзім. Пазнаць беларусаў даволі цяжка: спрэс размаўляюць па-расейску, фізычна таксама за апошнія семдзесят-восемдзесят гадоў

даволі моцна перамяшаліся з расейцамі і ўкраінцамі. Ну але пільнае вока і вуха сваіх пазнае. Наша з жонкай беларуская мова заўсёды прыцягвае ўвагу расейскамоўных турыстаў — відаць, некаторыя зь іх нас разумеюць, напружваюцца, але на кантакт звычайна не ідуць.

Фізычны тып арабаў у Эгіпце мяне ўразіў. Арабскія жанчыны ў Эгіпце больш высокія і танклявыя, у параўнаньні з кабетамі Блізкага Ўсходу. Ёсьць арабы — звычайныя эўрапэоіды, смуглявыя, чорнавалосыя і часта даволі прыгожыя. А ёсьць — нешта фантастычна старажытнае і незвычайнае, нібыта самі скульптуры фараонаў сышлі зь вітрынаў славутага Эгіпецкага музэю ў Каіры. У нашым гатэлі палова афіцыянтаў былі такія. Гэтыя заўсёды высокія вяскоўцы зь берагоў Нілу маюць вельмі масіўныя тулавы з шырачэзнымі плячыма, ненатуральна даўгія рукі, і трымаюць яны іх далонямі не назад (як мы), а да цела (як нэгры і жыхары Паўднёва-Ўсходняй Азіі). Ногі ў іх цяжкія, ступакі — аграмадныя. Твары таксама масіўныя, скуластыя, з прамымі насамі ды ілбамі — даволі эўрапейскія, але скура — амаль чорная. Глядзіш на такога — і ў памяці паўстаюць скульптурныя выявы эгіпецкіх фараонаў… Падабенства фантастычнае. Няма сумневу, што гэтак у арабскім моры «выстрэльваюць» гены аўтахтонных насельнікаў Эгіпту — старажытных эгіпцянаў.

* * *

Страх перад тэрактамі аказаўся меншы за цікаўнасьць і яшчэ дзіцячую мару паглядзець на адно зь сямі цудаў сьвету — эгіпецкія піраміды і славутага сьфінкса ў мястэчку Гіза пад Каірам.

І вось мы стаім перад самай вялікай пірамідай у сьвеце — пірамідай Хэопса. Побач яшчэ некалькі пірамідаў рознага памеру і сьфінкс. За гадзіну перад намі тут пабывала жонка прэзыдэнта ЗША Джорджа Буша-малодшага Лора, таму вакол яшчэ завіхаюцца сотні агентаў службы бясьпекі і паліцыянтаў. Зрэшты, і ў звычайныя дні іх тут процьма — улады як могуць стараюцца зьменшыць пагрозу тэрактаў.

Што адчувае чалавек у такія хвіліны? Захапленьне, зьдзіўленьне, цікаўнасьць? Усё так. Але ці не найболей — глыбока прыхаваны самасьцьвярджальны гонар, маўляў, і я таксама сюды дабраўся і гэта пабачыў. І фатаграфуюцца турысты масава на фоне пірамідаў і сьфінкса, каб захаваць свой уласны вобраз побач са славутымі помнікамі чалавечай цывілізацыі. Мы таксама зрабілі некалькі дзясяткаў здымкаў, у тым ліку і ў бэдуінскіх хустках з бэдуінамі ж у абдымку, на вярблюдах і побач з вярблюдамі, абышлі піраміды, памацалі рукамі камяні, падумалі трохі над тым, як тыя піраміды ўсё ж будавалі, узьняліся прыступкамі ўгару, паздымалі вершнікаў-паліцыянтаў на вярблюдах, пасьля на блізкім імправізаваным рынку купілі сувэнірных размаляваных кавалкаў папірусу (знаўцы сьцьвярджаюць, што насамрэч іх сёньня робяць ужо не з уласна папірусу, а з бананавага дрэва, таму яны недаўгавечныя). Але ўсё гэтае рабілі і іншыя ўдзельнікі нашай інтэрнацыянальнай турыстычнай групы. А мы з жонкай учынілі яшчэ нешта, да чаго не дадумаўся больш ніхто з нашага аўтобуса. Можа, таму, што мы паходзім з былога СССР?

Уваход у піраміду Хэопса для аднаго чалавека каштуе сто эгіпецкіх фунтаў (каля дваццаці амэрыканскіх даляраў), білет трэба купляць у недалёкай касе. Мы з жонкай нанесьлі шкоду эгіпецкаму бюджэту на суму 170 фунтаў: я даў бэдуіну-кантралёру на рукі дваццаць фунтаў за дваіх, і ён нас прапусьціў усярэдзіну. А калі мы дадалі яшчэ дзесяць фунтаў, бэдуін кінуў сваю кантралёрскую функцыю на паліцыянта, павёў нас углыб піраміды і ласкава згадзіўся сфатаграфаваць нас ля самага ўваходу ў разрабаваны склеп Хэопса. Каюся, вінаваты перад гасьціннай арабскай дзяржавай…

Але, зь іншага боку, і эгіпцяне вінаватыя перада мной. Калі я караскаўся аграмаднымі прыступкамі да ўваходу ў піраміду Хэопса, бэдуін зьверху пачаў у мяне пытацца, хто я такі:

— *Russo, russo?*

Я так абразіўся, што, узьлезшы на піраміду, ледзь не хапаў бэдуіна за грудкі:

— *Why? Why russo? I'm not Russian, I am Belarusian, I'm from Be-la-*

rus! Have you heard about my country?

Бедны бэдуін так напалохаўся, што, відаць, таму і згадзіўся прапусьціць нас усярэдзіну ўсяго за дваццаць фунтаў. Потым ужо, вяртаючыся ў Каір, мы задумаліся, чаму ж я падаўся бэдуіну расейцам. Вэрсіяў было дзьве. Па-першае, крыжык на шыі, бачны пад расшпіленай кашуляй. Па-другое, мой белы ільняны гарнітур. Пасьля ўжо нам сказалі, што акурат так апранаюцца на паўднёвых курортах «новыя расейцы». Сумняюся, што яшчэ калі-небудзь той гарнітурчык надзену, дарма што куплены ён са зьніжкай у Празе, вельмі зручны для трапічнае сьпякоты, і бачыў я такія ня раз на турыстах з самых розных краінаў сьвету…

* * *

У самім прадмесьці Гіза, дзе наша група абедала ў рэстарацыі, мы з жонкай згубіліся. Проста адсталі ад сваёй групы і заблукалі. Прызнаюся, было страшнавата, нават вусьцішна. Вакол адны арабы і вярблюды. Кожны імкнецца зацягнуць цябе ў сваю крамку ці чайхану. Раптам паўз нас прабег натоўп зь зялёнымі насілкамі — арабскія хаўтуры, не раўнуючы, як праз тэлевізар паказваюць палестынцаў, што хаваюць сваіх нябожчыкаў… Праз паўгадзіны марных пошукаў мы зьвярнуліся да паліцыянтаў — у Каіры яны вельмі прыязныя, заўсёды гатовыя дапамагчы. Адзін зь іх і давёў нас да рэстарацыі, дзе наша турыстычная група ўжо даядала абед са страваў арабскай кухні.

Мы таксама паабедалі, адзначыўшы якасьць эгіпецкай сачовіцы, дзіўна замарынаванай і падсмажанай кавалкамі на грылі курыцы з бакляжанамі і сьвежавыціснутага соку (а дакладней, кашы) з пладоў манга. Падчас абеду мне думалася пра недарэчнасьць тэрарызму. Нас так ім запалохалі, за нас так баяліся дзяўчаты з турыстычнай агенцыі, што было нават няёмка. А між тым адзін з супрацоўнікаў нашага гатэлю, сэрб Ігар, казаў, што летась, таксама ў траўні, турыстаў у гатэлі было пяцьсот чалавек, а сёлета разам з намі — пяцьдзясят. Людзі баяцца тэрактаў. Узімку на мяжы з Ізраілем выбухнуў

пяцізоркавы гатэль, некалькі гадоў таму тэрарысты расстралялі аўтобус зь нямецкімі турыстамі, у апошнія месяцы на рынках у Эгіпце адбылося некалькі драбнейшых тэрактаў. І вось ямо мы тыя эгіпецкія прысмакі і пытаемся самі ў сябе: ідэолягі тэрарызму, у тым ліку і родам з Эгіпту, наракаюць на Захад, які абкрадае мусульманскія краіны, але хто ж прайграў і страціў ад таго, што сёлета чатырыста пяцьдзясят чалавек абралі курорты іншых краінаў сьвету?

* * *

Арабы, як вядома, вельмі пільна ставяцца да асабістай гігіены. Яны, напрыклад, не карыстаюцца туалетнай паперай, а падмываюцца вадой. У багацейшых ёсьць бідэ, у астатніх — унітазы адмысловай канструкцыі з кранікамі ў задняй сьценцы. І вось у адной з рэстарацыяў Каіру я ўбачыў нешта неверагоднае. У задняй сьценцы ўнітаза не было маленькага краніка. Замест яго адтуль вытыркалася крукам угару 25-сантымэтровая мядзяная трубка. Гэта і быў кран для падмываньня. Прабачаюся за натуралізм, але для мяне вялікай загадкай засталося, як людзі спраўляюць вялікую патрэбу, цэлячы міма таго крана?

Дарэчы, калі мы ўжо чакалі свайго самалёта ў каірскім аэрапорце, каб ляцець у Прагу, я ўбачыў у тамтэйшай прыбіральні адмысловыя шлянгі з распыляльнікамі вады, як у душы. Меркавалася, што імі акуратна і ашчадна будуць карыстацца проста над унітазамі. Калі ж я ўбачыў велізарныя лужыны на падлозе і патокі вады з-пад дзьвераў занятае кабіны, дык адразу вырашыў, што лепш пачакаю пасадкі ў самалёт. Уцякаючы з прыбіральні, я яшчэ заўважыў, як некалькі чалавек чысьцілі зубы з пастай, але… пальцамі.

А наагул, каб адчуць каларыт Афрыкі, дастаткова правесьці пару гадзінаў у залі чаканьня каірскага аэрапорту. Якія там вакол пэрсанажы! Якая разнастайнасьць строяў, культураў, цывілізацыяў! Багатыя нэгры і арабы са сваімі гарэмамі. Дзясяткі адценьняў скуры і дзясяткі фізычных тыпаў. Важнасьць, прэтэнзія, пыха, цікаўнасьць, абыякавасьць,

дабрыня — усё гэта можна ўбачыць на тварах і ў позірках людзей, апранутых ва ўсё, што заўгодна, толькі ня ў звыклае нам эўрапейскае адзеньне. Тоўстыя аграмадныя нэгрыцянкі, без зубоў, увешаныя кіляграмамі золата. Іхныя сонныя, падобныя да бэгемотаў, мужы ў халатах-сукенках з голымі лыткамі. Маладзенькія жонкі багатага араба зыркаюць вачыма скрозь шчыліны павязаных на твары хіджабаў. Бель, чырвань, блакіт, чорнядзь і бронза, золата і срэбра — усе колеры зьмяшаліся ў фантасмагорыі пачакальні начнога каірскага аэрапорту. Я адчуў сябе героем галівудзкага баевіка, які ў касмапорце на Месяцы чакае на рэйс на іншую плянэту…

* * *

Паезьдзіўшы па Эгіпце, я зразумеў, што цяпер ведаю адну краіну, дзе на будоўлях не працуюць украінцы…

* * *

Седзячы на падушцы ў каірскай чайхане са складзенымі па-турэцку нагамі, папіваючы эгіпецкую гарбату «каркадэ» і пакурваючы кальян пад бясконцую рытмічную ўсходнюю музыку, нават патрыёт Эўропы можа падумаць, што і ў гэтай культуры ёсьць шмат чаго прывабнага…

* * *

У Каіры нашу турыстычную групу завезьлі да прыватнага парфумэра на «шоў». Гаспадар усяляк выхваляўся, рэклямаваў свае эсэнцыі, іхныя лекавыя ўласьцівасьці і чыста натуральны, без дамешку хімікаліяў, склад. Мэта адна — прадаць. І вось араб па-нямецку кажа:

— Цяпер мы адна сям’я, на гэты дзень, толькі на сёньня…

А славачка гадоў пяцідзесяці побач са мной:

— Дзякуй Богу…

* * *

Вонкава ў Эгіпце адчуваецца поўная рэлігійная талерантнасьць. На вуліцах Каіру можна ўбачыць легкавікі з пачэпленымі на люстэрка задняга агляду ружанцамі. Хрысьціяне носяць на шыях крыжыкі адкрыта і ня тоячыся. Ва ўсім Каіры раскіданыя ня толькі мячэты, але й вялікія дагледжаныя хрысьціянскія храмы з высачэзнымі званіцамі і крыжамі на іх. Залатыя купалы званіцаў далёка відаць.

Я стаяў на каірскім бруку паблізу копцкай царквы, і, убачыўшы, як з храму выйшла захутаная ў чорнае жанчына-мусульманка, падумаў, што новым пакаленьням беларусаў сёньня ўжо зусім не вядомая сама ступень рэлігійнай нецярпімасьці, якую давялося перажыць мінулым пакаленьнямі нашага народу ў Расейскай імпэрыі. Аднойчы ў 1884 годзе празь Беларусь ува Ўкраіну ехаў праваслаўны мітрапаліт Кіеўскі і Галіцкі Платон. Убачыўшы пры дарозе касьцёл, мітрапаліт спыніў карэту і зайшоў на пяць хвілінаў паглядзець на набажэнства. У выніку пра гэты выпадак год пісалі газэты імпэрыі, а беднаму ксяндзу Вінцэнту Маравічу, што пусьціў у касьцёл мітрапаліта, забаранілі служыць.

У Эгіпце кідаецца ў вочы цывілізацыйнае адрозьненьне паміж арабамі-мусульманамі і арабамі-хрысьціянамі. Першыя часта ходзяць у нацыянальным адзеньні — даўгіх балахонах да пятаў, на галовах — бэдуінскія хусткі-чалмы, жанчыны ў чорным, з закрытымі тварамі. Незамужнія дзяўчаты — ня ў чорным, але таксама максымальна захутаныя. Можна ўбачыць мусульманскіх дзяўчат і ў штанах — галоўнае, каб апрача твару, нічога не было відаць. Другія (арабы-хрысьціяне) — абсалютна эўрапейскага выгляду і ў эўрапейскіх строях. Я назіраў на пляжах і тых, і тых. Арабаў-хрысьціянаў можна зблытаць з італьянскімі ці гішпанскімі парамі. Ідуць такія сабе па пляжы немаладыя сужэнцы — мужчына ў сьветлых штанах і

кашулі з кароткімі рукавамі, жанчына — у джынсах і майцы з дэкальтэ, з крыжыкам на шыі і з цыгарэтай у руках. Хрысьціянская арабская моладзь на пляжы — у плаўках і купальніках. Мусульмане таксама бываюць па пляжы, толькі цалкам апранутыя, і жонак можа быць некалькі. Як жанчыны ня трацяць прытомнасьць на гэткай сьпёцы — загадка. Мусульмане, прынамсі на людзях, не купаюцца. У Эгіпце ўсе пляжы — прыватныя. Я неяк выпадкова зайшоў на пляж побач з прыватнай вілай, і пакуль ахоўнікі мне тлумачылі, што далей ісьці нельга, заўважыў, як гаспадары пляжу пад палатняным навесам адпачывалі ў крэслах ва ўсёй вопратцы…

Наагул, шмат цікавых карцінак з рэлігійнага жыцьця. На прыпынках уздоўж аўтабану — маленечкія мячэты для намазаў. Мы неяк ехалі праз пункт аплаты за дарогу і ня ўбачылі аховы. А пасьля згледзелі непадалёк паліцыянтаў, якія, прытуліўшы да кола джыпа аўтаматы Калашнікава, паслалі на зямлі кілімчыкі і пачалі біць паклоны Ўсёмагутнаму Алагу…

А раз у цэнтры Каіру я бачыў, як проста на ходніку сярод сотняў мінакоў немаладая кабета ў чорным села на кавалак анучы, склала ногі па-турэцку, выставіла рукі далонямі ўгару і пачала маліцца.

Ідучы каірскай вуліцай, вы можаце раптам побач з сабой пачуць прыгожую мусульманскую музыку і не зразумець, адкуль яна. І толькі пасьля сьцяміце, што гэта звоняць мабільнікі ў арабскіх маладзёнаў.

* * *

І вось мы нарэшце дабраліся да Каірскага музэю. Гэта адзін з самых вядомых музэяў сьвету і, калі верыць экскурсаводам, самы вялікі. У велізарнай будыніне з чырвонай цэглы ў цэнтры Каіру сабраныя сто дваццаць тысяч экспанатаў з старажытнага Эгіпту, і ўсе яны сапраўдныя — ніякіх муляжоў і падробак. Тысячы вялікіх і малых скульптураў, узрост якіх налічвае таксама тысячы гадоў. У скульптурах выяўлялі і фараонаў, і простых эгіпцянаў. Менавіта праз усю гэтую спадчыну

старажытнага Эгіпту ламаліся і ламаюцца дзіды ў міжнароднай палітыцы. Ангельцы і амэрыканцы вывозілі старажытныя скарбы, арабы патрабавалі і патрабуюць іх вярнуць. Ну, але «тое-сёе» ім засталося.

Фатаграфаваць у музэі катэгарычна забаронена. На ўваходзе я налічыў каля сарака паліцыянтаў і тры мэталашукальнікі.

Перад ганкам музэю, дзе ў адмысловым басэйне расьце папірус, нас сустрэў даволі гаваркі экскурсавод-араб, які прымальна размаўляў па-ангельску. Было відаць, як ганарыўся ён усім тым багацьцем, што выстаўлена ў музэі: скульптуры, зброя, рыштунак, начыньне, творы мастацтва, чоўны і муміі. А мне ў тыя хвіліны думалася пра цікавую ў маральным сэнсе зьяву — здольнасьць сучасных народаў ганарыцца спадчынай сваіх краінаў, але не сваіх этнасаў. Інакш кажучы, ганарыцца спадчынай, да якой яны, у лепшым выпадку, ня маюць дачыненьня, а ў горшым — яшчэ і прыклалі руку да ейнага заняпаду і зьнішчэньня. Пра гэта мне думалася ў Рыме каля Калізэю, калі маларослыя чарнявыя італьянцы, апранутыя ў форму старажытнарымскіх легіянэраў, прапаноўвалі турыстам сфатаграфавацца зь імі за памяркоўную плату. Пра гэта ж падумалася і цяпер, калі араб-экскурсавод відавочна і адкрыта хваліўся культурай, да заняпаду якой арабская заваёва Эгіпту і спрычынілася.

Мастацтва старажытнага Эгіпту — сымбалічнае і рэалістычнае адначасова. Пры сымбалічным значэньні вобразаў дэталі выяваў — цалкам натуральныя, нават натуралістычныя. Гледзячы на вялікія і малыя скульптуры і кампазыцыі, цяжка пазбавіцца думкі пра пачварнасьць чалавека і чалавечага жыцьця наагул. Вось сядзяць фараон Агнатон і ягоная жонка Нэфэрціці. Што побач з прыгажуняй Нэфэрціці менавіта яе муж, відаць толькі зь ягонага адзеньня — ва ўсім астатнім старажытны скульптар выявіў… дзьвюх жанчын. Фараон быў абсалютна жонападобны тып.

А вось выява жанчыны, якая, наадварот, мае ўсе прыкметы мужчыны… А вунь там скульптурная выява сям'і: муж, жонка і двое дзяцей. Муж — карлік зь ненатуральна вялікай галавой і караценькімі крывымі ножкамі, жонка — высокая прыгажуня,

якая замілавана абдымае звыродліўца рукамі і прыціскаецца да яго. Гэтак мастак выявіў суворую праўду жыцьця — карлік быў багатым злотнікам, а прыгажуня — бяднячкай, якая выйшла не за чалавека, а за ягонае багацьце, каб выгадаваць дзяцей у дабрабыце… Зусім актуальная сытуацыя, праўда? Калі чалавек меў фізычны недахоп, яго абавязкова адбівалі ў каменных выявах. Менавіта таму столькі ў Каірскім музэі фараонаў са ступакамі-ластамі, з жаночымі азадкамі ды іншымі калецтвамі і заганамі…

Золата Тутанхамона… Хто ня чуў пра яго? А вось пытаньне: чаму Тутанхамон такі вядомы, чым ён адзначыўся ў гісторыі? Абсалютна нічым. У дзевяць гадоў ён стаў фараонам, а ў сямнаццаць яго ўжо атруцілі і з помпай пахавалі. Увесь цымус у тым, што магіла Тутанхамона адзіная дайшла да нашых дзён неразрабаванай, яе знайшлі ў некранутым выглядзе ангельцы. Таму мы і ведаем, колькі было саркафагаў, як фараонаў хавалі, што клалі ў пахавальныя склепы пірамідаў. І вось нават такога скептыка, як я, ахоплівае хваляваньне, калі на другім паверсе Каірскага музэю нас запускаюць у асобную браняваную залю зь дзясяткамі сыстэмаў бясьпекі, з узброенымі паліцыянтамі і адмысловым падсьвечваньнем — там экспануецца золата Тутанхамона, у тым ліку велізарныя залатыя маскі-саркафагі ў поўны рост і розных памераў, якія накладалі на цела адну за адной, упрыгожаньні, латы, зброя… Тоны золата. Сотні захопленых людзкіх вачэй. І ціхі аповед экскурсавода, што гэта толькі частка знойдзеных у пахаваньні Тутанхамона залатых вырабаў — некаторыя ўсё ж вывезеныя з краіны…

Маю ўвагу прыцягнулі ложкі фараонаў зь сятчатымі матрацамі. Усе яны былі выгнутыя так, што чалавек, які лёг на сьпіну, мусіў бы знаходзіцца ў паўсагнутым стане.

На цокальным паверсе — самыя вялікія экспанаты. Велізарныя скульптуры і чоўны. Здалёк я ўбачыў васьмімэтровыя скульптуры фараона 18-й дынастыі Амэнофіса III і ягонай жонкі Туі. Я памкнуўся туды і ўжо на падыходзе стаў здагадвацца, што там убачу. Так яно і ёсьць, на каменным пастамэнце накрэмзана да болю знаёмае: *«Здесь были Кондаков и Волащев. Сургут…»*

У музэйных залях сям-там трапляюцца чалавечыя муміі. Але ёсьць і дзьве асобныя залі. Адна — з муміямі жывёлаў, туды можна заходзіць усім наведнікам. А іншая — з муміямі фараонаў, у яе ўваход за дадатковую плату. У будучай муміі абавязкова даставалі пячонку, лёгкія, страўнік і кішэчнік. Гэтыя органы хавалі ў асобных маленькіх саркафагах у выглядзе чатырох сыноў Ізыды-Сырыюса — чалавека, малпы, ваўка і птушкі. Дзіўна было глядзець на муміі сабакі, авечкі, пяцімэтровага кракадзіла і нават аграмаднай рыбы.

Мы доўга стаялі ля вялікай каменнай чорнай стэлі, на якой старажытнагабрэйскімі пісьмёнамі высечаная ўся гісторыя эгіпецкіх габрэяў. Стэляй моцна зацікавіўся адзін з удзельнікаў нашай групы, вучонага выгляду габрэй з Польшчы (пра сваё габрэйства ён казаў у аўтобусе). Але аповед экскурсавода аб тым, што праайцец Майсей быў эгіпецкім прынцам, нашага габрэя не зьдзівіў — відаць, ён абазнаны ў гісторыі свайго народу.

І вось да адной зь безыменных муміяў падышла мая Вольга, палашчыла шкло над засохлай галавой і спытала задуменна:

— Як жа цябе звалі, незнаёмец?

Славачка побач з намі пачула гэта і жартам адказала:

— Махмуд які-небудзь.

І тут, раптам, наш польскі габрэй злосна і зьедліва вымавіў:

— Ага, Махмуд… Фараоны ўсе былі жыдамі…

Мы з Вольгай пераглянуліся, усьміхнуліся, і я абсалютна сур'ёзна адказаў па-польску:

— Прошу пана, пан ня мае рацыі. Некаторыя фараоны былі беларусамі…

Паляк застаўся стаяць ля мумііі, зьдзіўлена ўсьміхаючыся, а мы пайшлі сабе далей.

Мы мелі ўжо іншы клопат. Празь дзень трэба было адлятаць у

Прагу. І мы думалі, што тыдзень на моры, бясспрэчна, мае сэнс, але два тыдні на моры маюць у два разы болей сэнсу.

Прага—Каір—Аль-Сохна—Прага
Травень-2005
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/01/28
[image]

[1] Гл.: Кісліцына, Ганна. Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы. Навуковае выданне. — Мінск: Логвінаў, 2006. — *Рэд.*

Клюдзіць, крывіць, выкручацца няпраўдай, мыляючы слухача фальшывымі або падтасаванымі данымі; гавораць аб заблутаным зайчым тропе: «наклюджана», «наклюджаны сьлед», зблутаны. Ужываецца также ў значэньні крывадушыць. Клюдзіць дзеўка, праўды ня кажа.

В. Ластоўскі
Раптам, адзін за адным, мне пачалі тэлефанаваць сябры і пытацца:

— А ці бачыў ты новую кнігу Кісьліцынай[1]?
— А ты ведаеш, што яна пра цябе напісала?
— Адразу відаць, што яна на цябе мае зуб…

Пасьля такіх паведамленьняў хаця-нехаця пачнеш цікавіцца…

Ну, пазычыў я тую кнігу. Пачытаў. Моцнай злосьці на сябе самога не заўважыў. Проста ў крытыкесы такі манерны дыскурс: усім заўдаць на арэхі. А што рабіць! Калі забараніць ёй звонкія поўхі, якія яна раздае літаратарам, дык ня будзе за што й зачапіцца: выйдзе звыклая вялая цягамоціна — ці то

позьні Кучар, ці то раньні Гніламёдаў. Прынамсі, кніга ня зьзяе ані сьвежым стылем, ані новай тэрміналёгіяй.

«Найсьвяжэйшыя» паняткі й катэгорыі, якія тарнуе сп-ня Кісьліцына, узятыя з арсэналу расейскае крытыкі канца, а то й пачатку 1980-х гг. Прынамсі, мне незразумела, навошта крытыкеса так старанна прыладжвае Эпштэйнаў панятак «мэтарэалізм» да беларускае літаратуры? Ведама, на тле сацрэалізму даны кірунак выглядаў як адкрыцьцё. Хоць ужо й тады было ясна: гэта чыста ўмоўны «аўтарскі» тэрмін «аднаразовага» выкарыстаньня.

І, калі ранейшая беларуская крытыка пераймала з расейскага арсэналу словы «шасьцідзясятнікі», «вясковая проза», дык гэта яшчэ можна было зразумець, бо пераймала й літаратура. Але навошта прыпісваць «мэтарэалізм» літаб'яднаньню «Тутэйшыя»? Калі б «Тутэйшыя» ўзялі на ўзбраеньне Эпштэйнаў панятак — гэта мела б апраўданьне ў старой савецкай звычцы. Але «Тутэйшыя» былі першыя, хто праігнараваў «расейскі час». Мала таго, яны гатовыя былі нават застацца «ззаду», абы не ісьці за «ўсесаюзным» стандартам. (Насамрэч, для літаратуры не існуе «ззаду» й «сьпераду».) Дык навошта прыніжаць «Тутэйшых» застарэлымі расейскімі парадыгмамі? Навошта «пераадкрываць» паўзабытыя тэорыі?

Здаецца, і гаварыць няма пра што? Пісаць рэцэнзію? Неяк некарэктна, раз ты сам аб'ект дасьледаваньня. Спрачацца? Але ж ня той жанр, зь якім варта спрачацца! Рэч яшчэ ў тым, што сп-ня Кісьліцына працуе ў манеры, якую называюць «меркавальная крытыка». Калі яна выносіць нейкія вэрдыкты, дык не падмацоўвае іх нічым, апрача ўласнае ўпэўненасьці. Хвосткія ацэны кампэнсуюць брак аргумэнтацыі.

Бяда ня ў тым, што сп-ня Кісьліцына піша ў кавалерысцкім стылі. Бяда ў тым, што яна чытае ў тым жа кавалерысцкім стылі. А вынік таго чытаньня ведама які…

Калі цябе ацэньваюць так ці сяк, я разумею — гэта справа густу крытыка. Калі цябе інтэрпрэтуюць так ці гэнак — гэта ўжо праблема інтэлекту й эрудыцыі таго ж крытыка. І тое й другое — воля аўтара. Але калі цябе пераказваюць з дакладнасьцю да

наадварот — гэта што? Праблема інтэлектуальнай сумленнасьці? Кампэтэнтнасьці? Проста чалавечае ахайнасьці? У кожным разе, аб гэтым нельга маўчаць.

90 % напісанага пра мяне сп-няй Кісьліцынай — вынік няўважлівага чытаньня, а то й зусім «нечытаньня». Дарэчы, усе гэтыя пасажы зьвязаныя з публікацыямі ў «ARCHE». Дык ці ня варта расставіць кропкі над і?

Сп-ня Кісьліцына скардзіцца: «Постмадэрнісцкае сьветаадчуваньне ў творах сучасных беларускіх пісьменьнікаў мала праяўленае». Вось жа я й праявіў… І адразу атрымаў поўху: маўляў, лезу ў Кісьліцынай дзялку. Цяпер во хаджу з «крытычным» ліхтаром пад вокам!

Маёй строгай судзьдзі не спадабаліся атрыбуты: *цытатнасьць, іронія, эклектыка* , якімі я надзяліў (не прэтэндуючы на жаднае адкрыцьцё) постмадэрнізм. Яна абазвала ўсё гэта «саматужным тэарэтызаваньнем», якое можна сустрэць у папулярных часопісах.

Толькі дзе тут лёгіка? Выйшаў нейкі аксюмаран. Або тое тэарэтызаваньне «саматужнае», г. зн. маё ўласнае, «хутаранскае», і ня мае нічога супольнага з «праўдзівым» постмадэрнізмам. Або ж яно стэрэатыпнае, г. зн. агульнапрынятае і, значыць, хоць банальнае, ды ўсё ж не саматужнае?

Дык калі вашэці не ўпанараў — хай зробіць унёсак у сусьветную культуру, прапануе сваё. Мяне ж якраз цікавіць не сама празь сябе альтэрнатыўная канцэпцыя, а тое, у якой меры яе канцэпцыя (яшчэ патэнцыйная) «упакоўваецца» ў катэгорыі? І ў якія канкрэтна катэгорыі? Можа, сп-ня Кісьліцына ня бачыць розьніцы паміж апісаньнем і катэгарыяльным абагульненьнем ці ня здольная ад аднаго перакінуць мост да другога? Мо яна зусім не разумее, пра што тут ідзецца? А калі разумее, дык няўжо ня бачыць, што яе вінавачаньні безьзьмястоўныя?

А наагул, дзіўная эўрыстычная ўстаноўка ў сп-ні Кісьліцынай: заміж таго, каб услухоўвацца ў цьверджаньні літаратараў, абагульняць іх, яна раздражняецца, саркастычна перасьміхае,

павучае. Цікава, як бы яно выглядала, калі б Умбэрта Эка раптам абвясьціў, дзей Марынэцьці «саматужна» разумеў футурызм? Або каб Віктар Шклоўскі ў свой час пачаў упікаць Маякоўскага за банальныя ўяўленьні аб футурызьме? Што? Я не Маякоўскі? Дык і сп-ня Кісьліцына ня Шклоўскі.

Я толькі пералічу некаторыя «няпраўды» сп. Кісьліцынай. Якой яны прыроды? Паводле В. Ластоўскага *ілжа* — гэта сьведамая няпраўда, *хлусьня* й *мана* — жартаўлівы падман. Думаю, ані тое, ані другое сюды не падыдзе. Сп-ня Кісьліцына ня *хлусіць* , ня *маніць* , ня *лжэ* (што), і нават ня *лжыць* (каго) — яна *клюдзіць*!

Няпраўда-I. Апублікаванае ў «ARCHE» (2004. № 3) мэмуарнае эсэ, «Постмадэрнізм, калыска мая…» (у рукапісе — «Постмадэрнізм, мая калыска…»), сп-ня Кісьліцына чамусьці паўсюль называе «артыкулам» ці «гістарычна-літаратуразнаўчым артыкулам». Хоць там навідавоку ўсе рысы мэмуарнага жанру. А таму, згодна з энцыкляпэдыяй, «паўсюль на пярэднім пляне ці сам мэмуарыст, ці ягонае бачаньне апісванага».

Думаю, што недагляд, які дапускае мая крытыкеса, невыпадковы. Практыкуючы такую недакладнасьць, яна адразу забівае некалькі зайцоў:

а) можа свабодна ігнараваць усе факты, бо мэмуары, якія б суб'ектыўныя яны ні былі, апэлююць да фактаў і толькі да фактаў;

б) заўжды можа недакладнасьць у жанравым азначэньні сьпісаць на недасканаласьць самога жанру (гэтаксама, калі б манаграфію сп-ні Кісьліцынай назваць раманам, дык перад намі быў бы вельмі кепскі раман).

Няпраўда-II. Чамусьці сп-ня Кісьліцына (і яшчэ той-сёй) згледзелі ў маім эсэ моцнае жаданьне называцца постмадэрністам. Аўтарка пераконвае:

Гэтае падкрэсьленае імкненьне Пацюпы быць ідэнтыфікаваным у

якасьці постмадэрніста яшчэ болей (А дзе было «меней»? — **Ю. П.**) *выяўляецца ў артыкуле «Постмадэрнізм, калыска мая»* .

Няма ў мяне жаданьня, ды яшчэ падкрэсьленага! Так, было некалі захапленьне постмадэрнізмам. Дык жа *было*… І чаму я павінен ад яго адмаўляцца?

Здаецца, чорным па белым я напісаў, што постмадэрнізм мне «спракудзеў» (г. зн. «моцна збрыд»), што расчараваньне прыйшло…

…яшчэ ў 1994—1995 гадох, калі Алесь Аркуш ладзіў літаратурныя канфэрэнцыі. Я браў у іх адумысна пасіўны ўдзел, ехаў, пачуваючыся вэтэранам постмадэрну, які сьведама адышоў ад «школы»: няхай моладзь бавіцца!

А няўжо няясна выказаўся я ў тым самым эсэ пра свае санэты?

Мушу разьвязаць пытаньне і наконт прыналежнасьці (ці непрыналежнасьці) мяне і маіх «Юрлівых санэтаў» да постмадэрнізму.

(…) Калі пачынаў санэты — думаў пра нэаклясыцызм, а выйшла, як заўсёды: што выйшла, тое выйшла!

Тут я каторы раз пераконваюся, што нашыя крытыкі фатальна ня здольныя чытаць тэкстаў, а падтэкстаў — і пагатоў. Дык разжую недагаворанае.

Я дбаў пра форму, пра зьмест санэтаў. І менш за ўсё думаў пра ўсякія «пост». Ня буду запярэчваць, калі якая крытыкеса знойдзе ў іх постмадэрнізм, і ня буду пярэчыць, калі іншая крытыкеса адмовіць ім у праве прыналежнасьці да памянёнага кірунку. Таксама ня бачу нічога дзіўнага, што гэты кірунак мог паўплываць на тэксты па-за воляю аўтара: мы ж ня ў вакуўме жывем!

Затое ў андэграўндзе (але ня ў вакуўме) бытавала школа гарадзенскага постмадэрнізму канца 1980-х — пачатку 1990-х гг. Балазе, ня ўсё зьнікла, многае захавалася ў рэдкіх выданьнях, у прыватных лістох. Некаторыя мае вершы праляжалі паўтара дзясятка гадоў.

Так, мне выпала нагода разам з успамінамі надрукаваць колькі тэкстаў, якія не адпавядаюць майму цяперашняму сьветагляду (але тыповых для таго часу), і зьмясьціць іх разам з тэкстамі больш новымі (такое суседзтва я лічу несумяшчальным, а таму й нізку назваў «Небясьпечная рэтраспэкцыя»). Дык зноў не супакойваецца сп-ня Кісьліцына! Зноў даводзіць тую самую, узятую зь ніадкуль, ідэю:

У канцы артыкулу прыведзены вершы, якія павінны сьведчыць на карысьць таго, што чытач мае справу з сапраўдным узорам «пост».

Можа, гэта прысьнілася сп-ні Кісьліцынай?! Там жа пад кожным вершам стаіць дата. А ў «мэмуарным» тэксьце крытыкеса магла б прачытаць, якія гады вершаваньня аўтар суадносіць з установаўкай на постмадэрнізм, а якія не. Ці задумвалася аўтарка над сваім аб'ектам? Ці ня ёсьць яе дыскурс вынікам безаб'ектнага самаўзбуджэньня? А мо яна ўсур'ёз верыць, быццам Пацюпа свае экспэрымэнты з рытмам, напісаныя ў форме пэйзажнае лірыкі, лічыць «узорам «пост…»?

Але найбольшую пікантнасьць тут мае эпітэт «сапраўдны» разам з прэдыкатам «сьведчыць» і мадальным апэратарам «павінны». Бяз гэтых элемэнтаў бязьвіннае жаданьне (або нежаданьне) называцца постмадэрністам ня мела б нічога крымінальнага. А тут, бач, я аж сумеўся: і праўда! як гэта мне стала адвагі без крытыкесы самазалічвацца ў постмадэрністы?

Вось разважаю над яе сьвятым раздражненьнем, і ў мяне такое ўражаньне, што я некаму перайшоў дарогу, напісаўшы ўспаміны пра пачатак постмадэрнізму ў Горадні. Нехта праспаў той пачатак, а потым схамянуўся: «Запішыце мяне ў постмадэрністы!» Нехта ў сярэдзіне 1990-х узяўся «закладваць

падваліны» гэтага кірунку, а тут усплыло, што падваліны ўжо ёсьць. А нехта паціраў рукі, прымяраючы ляўры тэарэтыка. І раптам усё ляснулася! Засталося адно: «апусьціць» таго, хто папсаваў людзям сьвята!

Дык жа, каб не было болей пытаньняў, урачыста й афіцыйна разжоўваю і заяўляю:

Сьведамая ўстаноўка на постмадэрнісцкую эстэтыку інсьпіравала многія тэксты, мае і маіх гарадзенскіх сяброў, канца 1980-х — пачатку 1990-х гг. Як іх будуць ідэнтыфікаваць крытыкі — мне ня надта рупіць. (Затое рупіць, каб не прыпісвалі мне тых ці іншых ідэнтыфікацыйных жарсьцяў і жаданьняў.)

Зь сярэдзіны 1990-х гг. я працую па-за ўстаноўкаю на постмадэрнізм. Але той застаецца для мяне дарагім як юнацкае захапленьне. Заразом я не зьбіраюся адмаўляцца ні ад свайго мінулага, ні ад тае школы, якую я прайшоў у гэтай мыслёвай парадыгме. Усякая цяперашняя ўстаноўка на постмадэрнізм мне ўяўляецца крыху наіўнай, крыху шкоднай, крыху застарэлай, але мілай і сымпатычнай, калі яна творчая, калі не разбурае нацыянальных каштоўнасьцяў.

А ўспаміны — гэта спроба сплаціць даўгі *часу, праўдзе* і сваім *сябром* . Хто ж за мяне напіша пра Горадню?

Няпраўда-III. Прыкладам, сп-ня Кісьліцына яшчэ раз «клюдзіць» (мяшае праўду з хлусьнёю), калі піша ў зьвязку з маім эсэ:

…спачатку аб'яўляе сябе тэарэтыкам («…давялося (…) паўтараць довады…»), а пасьля іміджмэйкерам («трэба ствараць міт Горадні як постмадэрновага гораду»)…

Гэта ж трэба ўмець так пісаць! Адзін сказ з двума аднароднымі дзельнікамі, а ў ім ёсьць і чыстая хлусьня і паўпраўда (і яшчэ цытата з абмылаю!).

1. Хлусьня ў тым, быццам я абвяшчаў сябе іміджмэйкерам:

а) фраза аб стварэньні «міту Горадні» ў маім тэксьце падаецца як прапанова І. Бабкова, і нідзе не сказана, што я пабёг яе спраўджваць, хутчэй наадварот — адышоў ад кірунку;

б) дзе й як у той прапанове сп-ня Кісьліцына знайшла сам факт «абвяшчэньня іміджмэйкерам», мо зноў прысьніла?

2. Паўпраўда датычыць «тэарэтыка»:

а) так, у адным месцы я пакарыстаўся гэтым азначэньнем, праўда, іранічна (а таму і ў дзьвюхкосьсі);

б) аднак у самым жаданьні займацца нейкай сфэрай літаратуры няма нічога благога, як няма благога ў тым, што мая крытыкеса ўзялася за гісторыю сучаснай літаратуры.

Усё пытаньне ў тым, *як* займацца сваёй справай.

А што да маёй ролі ў колішнім «Дыягене»… Дык існуе процьма апублікаваных і неапублікаваных фрагмэнтаў, якія датычаць усіх сяброў гурту. Вось і вывучайце іх, калі вашэць напраўду гісторык літаратуры.

Гартаў я, гартаў цытаваныя вышэй «інтэрпрэтацыі», і раптам мне дайшло: дык гэта ж, як той казаў, «Чапаеў і пустата»! У іх нічога няма апрача борздых шабельных наскокаў.

Няпраўда-IV. Сама прыкрае тое, што ў выніку свайго неахайнага чытаньня сп-ня Кісьліцына напрыпісвала мне якраз тых меркаваньняў, якія я адмаўляў. Нават *зьдзекліва* адмаўляў. Выйшла, як у показцы пра тое ўкрадзенае футра. Укралі! Ці то ў Пацюпы ўкралі, ці то Пацюпа ўкраў.

Вось што піша мая крытыкеса:

Калі ўлічваць прэтэнзію паэта на стварэньне гісторыка-літаратуразнаўчага артыкулу, даволі складана вытлумачыць яго тэзы пра тое, што постмадэрнізм можа быць «гарадзкім» і «вясковым».

Ведама, складана вытлумачыць тое, чаго не існуе! Дзе яна гэта вычытала?! Вось што пісаў я ў сваім эсэ:

Я з расчараваньнем даведаўся (…), што «Бум-Бам-Літ» хоча ствараць гарадзкую літаратуру. (…) З горадам, думаў, пасьля «Тутэйшых» ужо разабраліся. Ажно не. Добра, што хоць Купала не ствараў вясковае, а Багдановіч гарадзкой літаратуры.

Што тут няяснага? Я якраз *супраць* такога падзелу! Клясыкі не дзялілі літаратуры на вясковую й гарадзкую — і добра. «Тутэйшыя» пачалі дзяліць — блага. І ў гэтым — увесь патас. Думка сп-ні Кісьліцынай такая няўрымсьлівая, што прапускае цэлы шэраг лягічных агніваў. Першае: спрабаваў дзяліць ня я, а іншыя, задоўга да мяне. Другое: я іх практыку не ўхваляю, а ганю. Трэцяе: заганная не «гарадзкая» ці «вясковая» літаратура, а сама практыка разьмежаваньня і, адпаведна, нігілізму.

Устаноўка на адмежаваньне «гарадзкой» літаратуры ад «вясковай» вынікае з банальнае недасьведчанасьці й стэрэатыпаў. Выбірай якую хочаш тэматыку, але ведай: пасьля М. Багдановіча, Ф. Аляхновіча, А. Александровіча й А. Вярцінскага ўрбанізмам нікога ўжо ня зьдзівіш, пра пэйзанства нічога не кажу, бо пэйзанствам ніхто й не спрабуе зьдзіўляць. (Дарэчы, неяк нядаўна перачытаў А. Вярцінскага ды падумаў: якое арганічнае і нестандартнае ўспрыняцьце ўрбаністычных рэаліяў! Як далёка да Вярцінскага тым, хто аж са скуры вылузваецца, каб паказаць сябе гарадзкім.)

Дык жа намаўляў я да *яднаньня* літаратуры. І яшчэ заклікаў, каб нашыя ганарыстыя ўрбаністыя навучыліся паважаць традыцыю, бо нігілізм не збагачвае, а зьбядняе асобу, тэксты ж робіць павярхоўнымі, аднароўневымі. Пры нагодзе зацемлю: менавіта посмадэрнізм вучыў мяне пісаць так, каб у слове, як у дрэве, жылі напластаваньні ўсіх стагодзьдзяў.

Калі ў тым эсэ я пісаў пра «постмадэрнізмы» (у дзьвюхкосьсі), дык акцэнтаваў розную ступень насычэньня тэксту алюзійнымі сэнсамі. А ў падтэксьце даваў зразумець, што нігілізм

уласьцівы авангардызму, а не постмадэрнізму. Аднак пра якія падтэксты тут можна гаварыць?..

Няпраўда-V. Нават там, дзе сп-ня Кісьліцына спрабуе мяне вучыць, яна не прачытала ўважліва тэксту і адразу далася ў дыдактыку:

Сёньня выглядае актуальным не стварэньне арыгінальнай канцэпцыі «беларускага постмадэрнізму», а ўдумлівае прачытаньне і апісаньне твораў, якія характарызуюць літаратуру паваротнага пэрыяду.

Тут сп-ня Кісьліцына б'ецца ў адчыненыя дзьверы. Бо такая, як і ў яе, ідэя абгавораная ў маім эсэ. Аднак гэта якраз тая ідэя, ад якой я перасьцярагаў як ад бясплённай і тупіковай. Агадваючы ход думкі будучых гісторыкаў літаратуры, я закрануў мажлівыя дарогі дасьледаваньня і, наколькі дазваляў жанр, паказаў, чаму адна зь іх лепшая за другую:

Пры асягненьні ж кірунку (усё ж ня мэтаду) і апалягетам, і скептыкам трэба пільнавацца аднаго: не пайсьці дарогаю індукцыі стыляў, а строга сьледаваць шляхам дэдукцыі функцыянаваньня. Прасьцей кажучы, калі ад асобных прыймаў мы будзем ісьці да тэарэтычных абагульненьняў, дык у якой хочаш літаратуры знойдзем якія хочаш кірункі, ня толькі постмадэрнізм, але й авангард, і рамантызм, і рэалізм (што ўжо ня раз здаралася). Наадварот, мы мусім апрыёрна браць кірунак як часава-прасторавы інстытут і нудна апісваць яго прыймы. Іншага выйсьця няма. У часы мадэрнізму нават рэалісты — крыху мадэрністы, а ў часы постмадэрнізму, пэўна ж, усе мы крыху постмадэрністы…

Вось жа, абгледзеўшы ўсе цытаваныя недакладнасьці, пачынаю памалу разумець існасьць дыскурсу сп-ні Кісьліцынай. Там, дзе мае сябры бачылі нянавісьць да канкрэтнае асобы, мне бачыцца іншая жарсьць: *нянавісьць да фактаў*. Мая строгая крытыкеса проста пагарджае тымі фактамі, якія не адпавядаюць яе

ўяўленьням, і таму грэбліва іх прэпаруе, адпрэчвае, не заўважае. Катэгорыя дакладнасьці для яе проста не існуе. Такім спосабам, ня будучы лішне арыгінальнай, яна дасягае раскаванасьці, амаль фамільярнасьці, дыскурсу. Вазьму толькі адзін «прыкольны» прыклад: каб прынізіць «вульвацэнтрыста» С. Адамовіча, яна ставіць яго ў адзін шэраг з «вульваіндэфэрэнтыстам» Ю. Гуменюком і абодвух абзывае антыжаночымі пісьменьнікамі. А сама тым часам знаходзіць сабе «дах», апэлюючы да зручнае фэмініcтычнае парадыгмы. Але чаму вашэць не назваць мужаненавісьніцай? Дар за дар!

Не існуе для сп-ні Кісьліцынай і *катэгорыі часу*. Прыкладам, усе непаразуменьні наконт мае прыналежнасьці да постмадэрнізму вынікаюць з таго, што для аўтаркі манаграфіі няма розьніцы паміж Пацюпам цяперашнім і Пацюпам пятнаццацігадовай даўнасьці. (А чаго цырымоніцца?) Тое самае датычыць і іншых аўтараў. Скажам, там, дзе сп-ні крытыкесе бачыцца супярэчнасьць у думках і дзеяньнях А. Аркуша, там насамрэч зяўрае яе ўласная супярэчнасьць. Бо Аркуш-радыкал, які жыў на пачатку 1990-х, і цяперашні Аркуш, прыхільнік культурнага кансэрватызму, існуюць у розных кантэкстах, маюць розны досьвед. (Дарэчы, менавіта зь няўвагі да часу паходзяць і вышэй успамінаныя тэрміналягічныя анахранізмы сп-ні Кісьліцынай.)

Наастачу хачу яшчэ раз падкрэсьліць: тое, што я разгарнуў — не рэцэнзія. І пагатоў не дыскусія! Дыскутаваць можна пра факты, а не па-за фактамі. Гэта спроба паказаць частку таго, што панапісвана, як кажуць расейцы, «от балды».

Сп-ня Кісьліцына можа супакоіць чытача: «Такой бяды! Ці мала якія недакладнасьці здараюцца ў кнігах!»

І я б пагадзіўся з гэтым — дарма што ўся мая літаратурная дзейнасьць пераніцаваная на ліхі бок. Але аберненая ня толькі мая дзейнасьць! Фактаў перакручваньняў і недакладнасьцяў, якія ёсьць у кнізе, і ў дачыненьні да людзей, і ў дачыненьні да літаратурнага працэсу, набярэцца яшчэ на асобную кнігу. Калі ў сп-ні Кісьліцынай будзе цікавасьць, а ў рэдактараў цярплівасьць, я магу, як той казаў, «абвесьціць поўны сьпіс».

Нехта запярэчыць: навошта гэтулькі ўвагі адной, ня надта ўдалай кнізе? Дык жа пытаньне ня ў кнізе, а ў праўдзе! Калі няпраўду не аспрэчваць, тая ўжо назаўтра назаве сябе праўдаю. І тады пачне пісаць губэрня: той сказаў тое, а гэны рабіў гэна, а гэты ня гэтта, а вуньдзека. Таму я й спрачаўся не з ацэнамі, а зь перакручваньнямі ды фантазіямі. У выходных жа зьвестках манаграфіі сп-ні Кісьліцынай нідзе не сказана, дзей кніга мусіць значыцца па аддзеле «фэнтэзі», і ні ў якім разе — па аддзеле літаратуразнаўства.

***

Ад Рэдакцыі. Мы папрасілі Ганну Кісьліцыну пракамэнтаваць выказваньні Юр'я Пацюпы, але яна адмовілася, бо, на яе думку, у артыкуле гучыць толькі асабістая крыўда. Адмовіліся ад камэнтароў і многія іншыя літаратуразнаўцы і літаратары, да якіх мы зьвярнуліся. Але некаторыя ўсё ж пагадзіліся выказацца.

Севярын Квяткоўскі:

Што да тэксту сп. Пацюпы пра кніжку Ганны Кісьліцынай, мяркую, што танальнасьць сп. Пацюпы абсалютна неадэкватная — саркастычна-выкрывальніцкая (як у перадавіцы савецкай газэты). Кніжка мае шмат момантаў, якія вартыя крытыкі. (Напрыклад, абсалютна незакцэнтаваная ўвага на адноўленай «Нашай Ніве», якая, на мой погляд, адыграла значную ролю ў фармаваньні сучаснай беларускай літаратуры, «фэмінізацыя» некаторых літаратарак ды шмат чаго іншага.) Але абвінавачаньне Кісьліцынай у нейкіх наўмысных скажэньнях («Клюдзіць дзеўка, праўды ня кажа», «манаграфія-сымулякра», «Гэта спроба паказаць частку таго, што панапісвана, як кажуць расейцы, «от балды» і да т. п.) абсалютна надуманыя і выглядаюць хамавата. Аўтарка дае сваю карціну літаратурнага працэсу, і ня болей за тое.

Сяргей Балахонаў:

Прачытаўшы допіс Юр'я Пацюпы «Пра кавалерысцкі наезд на пісьменьніцкія хутары», я зразумеў толькі адну рэч: шаноўны аўтар вырашыў згуляць у традыцыйную беларускую забаўку пад назвай «крыўда». Вось і нарадзіліся больш за 20 тысяч знакаў (з прабеламі) у адказ літаральна на пару абзацаў кнігі, дзе спадарыня Ганна прыгадвае яго. Як на добры лад, дык дзеля «эфэкту рэха» можна было б рэагаваць на кнігу Ганны Кісьліцынай і не знайшоўшы ў ёй ніводнай прыгадкі пра сябе. Таму сам факт рэакцыі сп. Пацюпы выглядае сымпатычным. Але абранае дыскурсіўнае поле не дае аўтару мажлівасьці для манэўру, акром бясконцага паўтору шаманскага заклёну «Ой, гора ж маё! Ай, крыўда на плячах!». Куды там *крытыкесе* зь ейным *манерным дыскурсам*! Але ж крыўда, хоць і бывае іншым разам добрым генэратарам ідэяў, часьцей выконвае ролю правадніка да аблуды. Мне шкада, што сп. Пацюпа як *вэтэран беларускага постмадэрнізму* так неадэкватна рэагуе на *a priori* правакацыйную іронію Ганны Кісьліцынай.

Сяргей Шыдлоўскі:

Абазначаная спрэчка выдатна ілюструе сюжэт з разваг П. Бурд'ё пра сымбалічнае змаганьне інтэлектуалаў у полі літаратуры *за ўладу называць*. Два бакі дамагаюцца, па сутнасьці, аднаго: манапольнага права выступаць з пазыцыі трымальнікаў дыскурсу сучаснай беларускай літаратуры, іншымі словамі, магчымасьці адзінаасобнага канструяваньня нашага з вамі (вядома, прафаннага) уяўленьня пра беларускую літаратуру. Прынамсі, той яе вобласьці, якая называе сябе постмадэрновай.

Менавіта «постмадэрнізм» бачыцца найбольш вялікай стаўкай у вышэйзгаданым змаганьні. Гэтае слова цьвеліць многіх. Якія бонусы дае валоданьне гэтым тэрмінам? Аграмадныя. Зь яго магічнымі магчымасьцямі можа паспрачацца хіба трафэйная астралябія ў руцэ правадыра племені гурурумба.

Адчуваючы ўсёдзёрзкасьць зробленай спробы ўзурпацыі, бакі робяць захады, каб залучыць у свой актыў рэсурс незадаволенасьці, які верагодна існуе ў грамадзтве. У выпадку Г. Кісьліцынай — гэта разьлік на гендэрную карту, у Ю.

Пацюпы — на супрацьстаяньне здамінаванай ускраіны і даміноўнага цэнтру (сталіцы, Акадэміі навук і г. д.).

Адно да аднога бакі ўжываюць аднолькавую зброю: дыскрэдытацыю прафэсійных здольнасьцяў, ставячы пад сумнеў адно аднога як спэцыялістаў. Калі ў Г. Кісьліцынай гэта мяккі варыянт — выказваньне подзіву да амбіцыяў Паэты канцэптуальна мысьліць, то ў Ю. Пацюпы — радыкальнае адмаўленьне апанэнту ў здольнасьці валоданьня беларускім словам наагул.

На пытаньне «Навошта гэта ім патрэбна?» маем пэўны адказ, які цалкам усё тлумачыць: гэта ім патрэбна.

Пятро Васючэнка:

У апалёгіі Юрася Пацюпы намаляваны партрэт ваяўнічай «крытыкесы», гэткай гусар-дзявіцы, якая, гарцуючы па літаратурных палетках, «ставіць фінгалы» безабаронным аўтарам. І гэта, між іншым, не асабліва псуе імідж адвечна юнай, бы Дыяна, Ганны Кісьліцынай.

Зь іншага боку, Юрась Пацюпа ня надта высока ацэньвае прафэсійныя якасьці і мэтады Г. Кісьліцынай. Яна, маўляў, апроч Эпштэйна, нікога не чытала.

Дзеля чаго, у такім разе, гэтая даволі кволая самаабарона? Ці ж думка непрафэсіянала падставаю для праўдашукальніцтва?

Юрась Пацюпа як паэт самадастатковы і сталы, але яму па-ранейшаму баліць, што кажа пра яго Ганна Кісьліцына. У чым рэч?

На золку «Бумбамліту» я выказваўся пра іхні тазік як пра рэшата зь яйкамі, зь якіх невядома хто яшчэ вылупіцца. Г. Кісьліцына апекавалася імі, бы гаспадыня, баронячы ад каршакоў. Тады ўсе яе хвалілі: «Віват, Ганна Кісьліцына!»

Мінуў час. Бумбамлітаўцы падгадаваліся. Мэтады Г. Кісьліцынай, пра якія ня вельмі тактоўна кажа Ю. Пацюпа, засталіся тыя ж, але канатацыя яе выказваньняў памянялася.

Сяго-таго з аўтараў пачала «гладзіць, меджду протчым, проці шэрсьці». Той стрываў, а той ня змог і пачаў крычаць: «Далоў, Ганна Кісьліцына!»

Нехта на некага пакрыўдзіўся, і аб тым. Нічога, памірацца.

Такі вось інцыдэнт адбыўся на старонках паважанага часопісу. Месца яму, на маю думку, — у тусоўцы або на форуме ў сетцы. Праўда, варта прыгадаць выказваньне філёзафа Валянціна Акудовіча: «Галоўнае ня творы, а літаратурны працэс». Працэс ідзе.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2007/01/28**
[image]

[illegible]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 11 (51) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image] [image] [image] 2006

да Зміцера

літаратура

[image] [image] [image]

Яраслаў Гаўлічак Пагібель мястэчка Альшыны

ЯРАСЛАЎ ГАЎЛІЧАК (Jaroslav Havliček) нарадзіўся ў 1896 г. у Ілемніцы (Jilemnice), мястэчку ў паўночна-ўсходняй Чэхіі, у падножжа Карканошаў. Пасьля заканчэньня сярэдняй школы ў Ічыне, у 1915-м Гаўлічак стаў вывучаць гандаль у вышэйшай школе ў Празе. Вайна перапыніла гэтае

Дзень першы

НАЧНЫ ЗВОН

Аж да зьмярканьня пэнсіянэр Голец завіхаўся ў садку. Ён падцінаў ружы і прыкрываў іх хваёвымі лапкамі, рыхлу загоны і ўгнойваў зямлю пад яблынямі. Вецер вырываў яму з рук матузы і прылады, разьдзімаў нагавіцы, тармасіў шалік, сыпаў у вочы вапнавым пылам. Ён вярнуўся дахаты наскрозь правеяны, з наможаным хрыбетнікам, хукаючы ў скарчанелыя пальцы. Павячэраўшы, ён адразу пайшоў спаць.

Ён доўга круціўся ў ложку, ніяк ня могучы заснуць. Яму балела ўсё цела, пякло ўваччу, а ў дадатак у коміне безупынна і сэрцашчымліва скавытаў страхотлівы вецер. Калі ён прымружваў вочы, перад ім пачынаў цягнуцца бясконцы табун сівых аблокаў. Калі іх расплюшчваў, яго непакоіла хваляваньне фіранак, якімі варушыў скразьняк, і вычварнае адлюстраваньне сутоньня ў вокнах. Яму здавалася, што ўсе шыбіны, нібыта нэкралёгі, былі абрамленыя чорнымі палоскамі. Мабыць, яшчэ ніколі ён не адчуваў такой тугі ад самоты.

— Што са мною? — мучыла яго пытаньне. — Я ўжо застары,

каб баяцца цемры.

Але ўрэшце трывожнае сэрца сунялося, і стома ахінула ягоны мозг сном, блізкім да страты прытомнасьці.

Каля поўначы ён раптоўна прачнуўся. Яму здалося, што ён чуе прыглушанае галашэньне. Яго ахапіў невытлумачальны страх. Ён склаў рукі да малітвы, але ягоная разгубленасьць была такая вялікая, што яму блыталіся словы. Бедаваньне не супынялася. Голец прыгадаў час, калі ягоная жонка, цяпер ужо нябожчыца, паплаквала побач зь ім у ложку, заглушаючы ўсхліпы цяжкай паласатай пярынай. Гэта гучала так сумна і знаёма, што ягоны страх абярнуўся ў спагаду. Ён сеў у ложку і ўважліва разгледзеўся па пакоі.

Каля дзьвярэй, на старым куфры, куды ён складаў брудную бялізну, сядзела босая прыява ў адным споднім, хустка ёй зьехала з рэдкіх сівых валасоў, тонкая каса вілася на згорбленай сьпіне. Прыява хавала твар у даланях і трэслася ад усхліпаў.

Спачатку Гольцу падумалася, што ён стаўся ахвярай падману пачуцьцяў. Перш чым легчы, ён упэўніўся, як кожнага дня, ці засунуў засаўку пры дзьвярах у хату, а потым яшчэ замкнуўся ў сваёй спальні. Як сюды магла трапіць чужая асоба? Ён працёр вочы, каб пераканацца, што гэта не вар’яцкі сон, і глянуў зноў. Постаць сядзела на тым самым месцы, выразна бачная ў месячным сьвятле. Рукі, якія выглядалі з рубчастых рукавоў кашулі, былі тонкія, як палкі.
— Прабачце, хто вы і чаму плачаце? — запытаўся пэнсіянэр расхваляваным голасам.

Мокрыя ад сьлёз далоні троху расхінуліся, і нараканьне пачулася гучней. Каса на згорбленай сьпіне зноўку несуцешна страсянулася.
— Ведаеце, — паважна сказаў Голец, — гэта для мяне крыху дзіўна. Колькі жыву, я вас ніколі ня бачыў і зусім не разумею, як вы сюды трапілі. Ня вельмі каб прыемна прачнуцца сярод ночы і ўбачыць, што ў пакоі сядзіць і плача незнаёмая жанчына.

Прывід выцягнуў з за пазухі каляровую насоўку, тужліва

навучаньне, і Гаўлічак пабываў як на расейскім, так і італьянскім франтох. Пасьля вайны Гаўлічак давучыўся ў гандлёвай школе, ажаніўся з паннай зь Ілемніцы, дастаў урадніцкую пасаду ў Празе і пачынаючы з паловы 1920-х гг. пачаў публікавацца ў літаратурных выданьнях. Памёр даволі молада, але натуральнай сьмерцю, у 1943-м. Крытыкі прысвоілі Гаўлічку тытул стваральніка

высмаркаўся, ягоныя рукі апалі на прыпол. На пэнсне з
паглядзела жаласьлівае, маршчыністае аблічча старо
— Чаму ж мне ня плакаць? Плача ўсё неба, плача ўсё
Сталася найстрашнейшае, што ўвогуле магло стацца
наш мілы Госпад Бог.

Нічога не сказаўшы, Голец адхінуў пярыну і спусьціў
жылістыя ногі на падлогу. Зь несхаваным страхам паглядзеў
дзівотнага госьця.

Як і ўсім сяльчанам, Гаўрыіл Гаўрыінскі ня ведаў,
што ён — Vyrnahl (у перакладзе з чэскай — «Выгнаны»).
Ён ня ведаў, што ў 1944 годзе ў Польшчы (дзе ён
ня ведаў, што ён — Petrolej (у перакладзе з чэскай — «Гас»).
Ён ня ведаў, што ён — Ніхто.

Ён ня ведаў, што ён — Ніхто.

Ён ня ведаў, што ён — Ніхто.

таксама, як і на зямлі: калі няма тастамэнту, паміж астатнімі ўзьнікае вэрхал. Найгорш, аднак, што нам трэба лічыцца і з нападам злых сілаў на пусты пасад. Ты мяне разумееш? Нешта падобнае, як было перад стварэньнем сьвету. Тыя, што калісьці былі разьбітыя і зрынутыя, зноў падымаюць галовы. Зноў падымаецца пыха, самалюбства і прага ўлады. А нашыя? Ах, плянаў абароны знайшлося б дастаткова, але няма нікога, хто б узяўся кіраваць. Усе страцілі галовы. Разумныя баяцца стаць самазванцамі, а нясьціплым, якія самі сябе прапануюць, ніхто не давярае. Ведаем, што адзіны шлях — веча і выбары, але да гэтага мы прыйдзем ня надта хутка. Хоць у сьвятых найсьвятлейшы розум, яны сварацца між сабою. Арханёлы нецярпліва брынкаюць мячамі. Славалюбства, як чарвяк, разьядае адзінства, якое вельмі патрэбнае дзеля захаваньня вялікае спадчыны. Хлісьнем бяды, калі пекла пакарыстаецца сытуацыяй і пачне дзейнічаць!
— Тады настане разлад, анархія, — прашаптаў пэнсіянэр.— А што будзе з намі на зямлі?
— Пра гэта тут не ідзецца, — пасьпешна сказаў анёл. — Ваш лёс будзе вырашацца разам з нашым. Бясспрэчна тое, што як было на пачатку, так і цяпер усё зноў будзе залежаць ад баяздольнасьці нябеснага войска.
— А мы што — павінны маліцца? — запытаўся Голец, перамагаючы ком страху ў горле.
— Каму? — горка ўсьміхнуўся анёл.

Тут навонкі азваўся манатонны і ўрачыста-паважны гук, падобны на змрочнае выцьцё пажарнай сырэны. Шыбіны пачалі пабразгваць, усё роўна што вуліцай ехалі цяжка гружаныя калёсы. Анёл саскочыў з куфра і накіраваўся да дзьвярэй.
— Куды ідзеш? — зноўку спалохаўся стары. — Ты ж мяне цяпер не пакінеш?
— Я мушу. Там, угары, спатрэбяцца ўсе сілы. Ці ты ня чуў голасу Габрыелевай трубы? Абвясьцілі мабілізацыю. Пакуль не разьвіднела, усе верныя мусяць згуртавацца вакол апусьцелага пасаду.
— Не, не, пачакай! — роспачна выкрыкнуў Голец і выбег за анёлам у сені. — Скажы, а сонца будзе сьвяціць, як і раней? Ці мы будзем, як і дагэтуль, жыць і паміраць? А дзеля каго? Зь якой мэтай?

Запытаны ўжо не адказаў. Ягоная стракатая кашуля затрапятала на ветры, босыя пяты адарваліся ад зямлі, камічная касічка падскочыла, і анёл узьляцеў кудысьці ўгору, у навальнічны прастор над мястэчкам.
— Бяда, — застагнаў пэнсіянэр і хісткім крокам вярнуўся ў пакой. Але раптам нешта пастанавіўшы, ён нацягнуў на сябе самае неабходнае і выбег празь дзьверы, якія засталіся адчыненыя пасьля нябеснага госьця.

На вуліцы было поўна народу. Людзі гаманілі ў групах, якія ўсё пабольшваліся. Не было нікога, каму б гэтай страхотнай зьвесткі не перадалі прарочы сон, прывід або прадчуваньне. Усе аслупянела глядзелі ў неба, адкуль усё яшчэ даносіліся бадзёрыя гукі сыгнальнай трубы ў суправаджэньні рэзкіх маланак. Тых, хто да гэтай пары заставаўся недастаткова паінфармаваны, затрымлівалі прыявы, што ўзьнікалі на рагах пляцу. Незнаёмы бледны маладзён з расхрыстаным плашчом, пад якім не было відаць ніякага цела, прамаўляў да людзей пад згаслым ад ветру ліхтаром. Ён зьнік, калі людзі абступілі яго шчыльнейшым колам. Пляц відавочна хваляваўся. Бабулькі голасна ўсхліпвалі. У вачах моладзі гарэла непрыхаваная радасьць ад гэтай сэнсацыі. Вецер, які буяніў без упыну, выдатна пасаваў да настрою; бразгалі дзьверы ў дамах, сыпалася шкло, лёталі капелюшы, выдзімаліся спадніцы. Напружаньне дасягнула вяршыні, калі да гоману далучыўся гулкі ўдар звону, а зараз за ім другі.
— У касьцёл! У касьцёл!

Ніхто ня ведаў, хто так загадаў. Мужчыны і жанчыны, старыя і маладыя, памчаліся вузкай вулачкай да малога барочнага храму. Людзей там было як мух, усе маўкліва стаялі і аслупянела глядзелі на вежу, вакол якой кружылі спалоханыя галкі. «Бім-бом, бім-бом», — адмерана нёсься пахавальны тон, а сам раскалыханы звон відаць было праз павырываныя ветрам жалюзі.
— Хто гэта звоніць? — здушаным голасам запытаўся Голец у свайго суседа, спадара ў глыбока насаджаным капелюшы, калі яму ўдалося праціснуцца да першага шэрагу.
— Ніхто, — разьюшана адсек запытаны. Гэта быў аптэкар, спадар Баер. — Звоніць само сабою. Гэта на пахаваньне,

разумееце? — І дадаў скрозь зубы, быццам бы саромеючыся паўтараць перад астатнімі, якія ўжо што-нешта ведалі: — А вы што, ня ведаеце, што наш стары Госпад Бог памёр?

Пэнсіянэр глядзеў угору на пасівелы крыж на сьпічаку вежы, вільготнымі вачыма назіраў за звонам, і яму пачало здавацца — калі ён так стаяў з напружанай шыяй, а чорныя хмары хутка плылі на небе, — што гэта ня хмары там уверсе, але ён, вежа, людзі ды цэлая зямля імчаць кудысьці ў шалёных уцёках.

Дзьве гадзіны звон гудзеў злавесна, няўмольна, безупынна. Перад касьцёлам ужо нікога не засталося, а ён усё званіў. Найперш паасобку, а потым купкамі людзі пачалі разыходзіцца. Іхны страх мацнеў. Сход расставаў. Першыя адыходзілі ціха і крадком, апошнія ўцякалі ў нейкай дзікай сумятні, баючыся свае адзіноты.

Пад раніцу вецер аслабеў да лёгкага павеву. Калі людзі ўставалі з ложкаў, перапалоханыя, нявыспаныя, ня верачы ў драматычныя сцэны мінулай ночы, было зусім бязьветрана. Звон маўчаў. Над ваколіцай вісела непраглядная, як сьцяна, густая імгла.

[image]

[image]

Дзень другі

БАРТАНЕВА ЯЗДА

На падворку карчмы «Пад збаном» вытыркалі з імглы дышлі драбінаў і брычак, усё роўна што дулы гарматаў, падрыхтаваных да стрэлу. Іхныя вільготныя акоўкі цьмяна блішчэлі. Страху над буданчыкам з гміннай вагою пакрывала шэрань, а за вастрыі жалезнага плота чаплялася ашмоцьце туману. Карчма бруіла гарэлачным духам. На вуліцы, перад поштай, аднавокі Пэхачак замятаў конскія пончыкі. Азваўся стукат капытоў, найперш прыглушаны на подсьціле, пазьней востры на брукаваным падворку — гэта вазак Бартань выводзіў

са стайні паўсьляпога, лядашчага белага каняку. У гэты самы момант над падворкам праляцеў першы крумкач з прарэзьлівым карканьнем.

Бартань паволі запрог каня, закурыў люльку і цырымонна залез на козлы паштовага воза. Перш чым узяць лейцы ў рукі, ён на імгненьне зірнуў угору, у бяздонную, сіва-брудную плахту неба, адкуль даносілася злоснае карканьне. Сама менш дваццаць крумкачоў ніцавалі гарызонт уздоўж і ўпоперак. Яны кружлялі, апускаліся і зноўку ўзьнімаліся.
— Но! — сказаў Бартань і гучна прыцмокнуў.

Конік не зварухнуўся. Зь дзьвярэй гасподы выйшаў п'яніца Білэк са сьвежанапоўненай бутэлькай ядлаўцоўкі, нюхнуў бурачковым, прышчаватым носам і затрымаўся пасярод двара. Яго зацікавіў упарты конік.
— Но! — мацней паўтарыў Бартань, але бялун толькі баязьліва зьвесіў галаву. Вазак ня памятаў, каб нешта такое калі-небудзь здарылася. Ён сунуў люльку ў кішэню і хапіўся за пугу.
— Кар! Кар! — крычалі ў мэлянхалічнай смузе крумкачы. Іх магло быць пад сотню. Яны нязграбна махалі крыламі, садзіліся на дахі дамоў, на жалезныя вастрыі плота, на поручні вагі. Цокалі на брукаванцы, дзяўблі абручы і абады колаў.

Бартань ашпарыў белуна пугаю па худых баках. Конік напяўся, але не ступіў ні кроку. Ён зьвесіў галаву яшчэ ніжэй.
— Кіньце, гэты вам не пацягне, — азваўся якісьці вясёлы голас з вуліцы. Там ужо стаяла ладная грамадка разявакаў, яны глядзелі адзін на аднаго, але нельга было вызначыць, каторы зь іх гэта сказаў. Крумкачы каркалі яшчэ злавесьней. Іх былі ўжо ня сотні, а тысячы. Немагчыма было іх зьлічыць.
— Дык што, пачварына, паедзеш ці не? — разьюшыўся вазак і пачаў біць каня пугаўём.

На парозе пошты зьявілася жаночая постаць, захутаная ў ваўняную хусту.
— Вой-вой, Бартань, ня беце майго косю!

Пугаўё разанула, паштмайстрыха заламіла рукі, абхапіла конскую шыю з гістэрычным галашэньнем:
— Чаго вы яго б'яце, бедачыну, ён жа не вінаваты, ён толькі

баіцца!
— Баіцца? А чаго ж ён баіцца? — разявакі прыступілі бліжей. Цяпер ім стала цікава.
— Чарцей баіцца. О Госпадзе, ці ж вы ня ведаеце, што гэта не зусім звычайныя крумкачы лётаюць навокал? Ці хто-небудзь бачыў калісьці такую грамаду крумкачоў?

Ніхто не адказаў, усе разгублена паглядзелі адзін на аднаго.
— Ну дык бачыце! Чэрці выройваюцца, пачынаюць вайну за неба. Бартань, выпражце каня і адвядзеце яго ў стайню. Людзі, людзі, ці ж вы забылі пра тое, што сталася сёньня ўначы?
— Ну, так, — незадаволена мармытнуў вазак, — а хто паедзе ў Яварак па пошту? Хто прывязе газэты зь цягніка?

Чыгунка мінала мястэчка шырокай дугой. Бартнеў каўчэг езьдзіў два разы ў дзень на станцыю, што была за гадзіну язды з гакам. Хто прывязе газэты? Гэтае пытаньне зачапіла за жывое. Ніколі раней альшынцы так не сумавалі па газэтах. Як жа інакш яны даведаюцца, што робіцца з астатнім сьветам?
— Так нельга, — разважліва сказаў Білэк. — Хтосьці мусіць ехаць.

Грамадка вакол яго згодна падтакнула.
— Я ўсё ж паеду, — вырашыў вазак. — Ці я калі баяўся чаго-небудзь? Не. Ня буду баяцца і крумкачоў. Спадарыня, будзе лепш, калі вы пойдзеце дахаты, а наконт язды мы з канём дамовімся.

Некалькі суседзяў ахвотна ўзяліся падтрымліваць паненку.
— Абавязак ёсьць абавязкам, — растлумачыў мужчына на козлах і надзяліў каняку парай грунтоўных сьцёбаў. Бялун жвава рушыў дапераду і ўжо не спыняўся. Бартань горда разглядаўся, падскокваючы на няроўнай брукаванцы пад гару, у бок Расахацкага лесу.
— Слава табе! — памахаў яму Білэк бутэлькай ядлаўцоўкі. Ён бегма правёў паштовы воз ажно да каменнага мосту цераз млынавы струмень, дзе стаялі дзьве перакрыўленыя фігуры сьвятых.

На вуліцы ўсё яшчэ мазгавалі. Птушкі ці д’яблы? А чаму так раптоўна зьніклі? Ці Бартню пагражае нейкая небясьпека?

Дзьверы згорбленай хаціны каля пошты адчыніліся наросьцеж, і старая багамолка Гэбэртка вылезла на парог. Яна стала і паглядзела ў бок лесу, прыкрываючы вочы. Але воза ўжо ня згледзела. Хэкаючы і кашляючы, яна вярнулася ў сваё лагво.
— Хай Госпад Бог будзе з намі, — мармытала сабе пад нос, — хай Госпад Бог будзе з намі, а нячыстае ідзе прэч! Цяперака яго разьдзяруць.

Бартань выехаў перад дзявятай, а да адзінаццатай павінен быў ужо даўно вярнуцца. Набліжаўся поўдзень, а яго не было. Некалькі гультаёў стаялі перад вітрынай гадзіншчыка Кмоха і сузіралі, як мінае час. Яны паціскалі плячыма і круцілі галовамі. У Гэбэртчыным ваконцы мільгатала сьвечка, яе жоўты розбліск журботна расплываўся ў імгле. Было відаць старую, якая раздражнёна хадзіла ў кухні, сьціскаючы ружанец у кашчавых пальцах. Раззлаваны цырульнік Квіда загрукаў кулаком у ваканіцу:
— Чаго вы запалілі гэтую сьвечку?
— За мёртвага, — адсекла багамолка.

Людзей ля пошты ўвесь час прыбывала. Бартань не вяртаўся. Было ўжо ясна, што яму нешта прыдарылася. Госпадзе Божа, няўжо Гэбэртка мае рацыю? Папоўдні людзей яшчэ пабольшала. А палове першай ад пясковай дарогі данеслася бразгатаньне воза, які ляцеў з шалёнай хуткасьцю.
— Гэта ён! — усьцешыліся Бартневы сябры.

Аднак аказалася, што іхная радасьць была заўчасная. Праз момант бразгат колаў пачаў аддаляцца. Гарбун Квіда ў белай цырульніцкай накідцы на калматым швэдры, які выглядваў з рукавоў і вакол шыі, падскокваў, як гумовы паяц. Шкада, не было каго галіць.
— О так, о так, яму ня трэба было ехаць, — сьмяяўся ён да сьлёзаў, а неверагодна вялізнага памеру галава ківалася над кароткім тулавам. — Дзе ён меў розум?
— Заткніся! — закрычаў на яго Білэк.

Не пасьпеўшы яшчэ зьмірыцца зь першым расчараваньнем, яны пачулі каляску з другога боку мястэчка. Гэта ніяк ня мог быць Бартань — куды ж бы ён ехаў? Тым ня менш усе сабраныя перад поштай затаілі дыханьне. Прыслухоўваліся, пакуль

стукат капытоў не заціх у далечы.

Праз гадзіну экіпаж прагрукатаў там, дзе ніхто ніколі ня езьдзіў, на дарозе ў лагчыне пад Галчынай гарой. Каго ж тудою чэрці носяць? Было чуваць нейкі страхотлівы голас, падобны на выцьцё, рыпелі восі, колы падскоквалі на камлыгах, ляскала пуга.
— Калі б не было гэтай імглы, мы бачылі б гару зусім добра, — заклапочана ўздыхнуў Білэк.

Потым таямнічы вазак павярнуў кудысьці на Кухэльскую грэблю, і надзея зноўку пагасла. Але калі грукат воза даляцеў ад вёскі Стржэць, а потым зноў ад жвіроўні, разьвіднела ў галаве разумнаму гадзіншчыку Кмоху.
— Ну як жа! — крыкнуў ён, уважліва прыслухаўшыся да шораз слабейшага грукату. — Хай я буду біты дурань, калі гэта ня сам Бартань так упарта аб'яжджае мястэчка. Чэрці яго ганяюць палямі зь ягонай поштай!

Вакол яго адразу паднялася магутная гамана. Некаторыя цяпер ужо былі ўпэўненыя, што таямнічы вазак ня можа быць нікім іншым, як толькі Бартнем. Насамрэч, усе гэта ўжо даўно прадчувалі. Аднавокі сьцьвярджаў, што пазнаў яго празь лясканьне пугі ўжо пад Галчынай гарой. Білэк спасылаўся на знаёмае іржаньне каня, Квіда мог бы прысягнуць, што гэта ён хвіліну назад так роспачна клікаў на дапамогу. Але што гэта ўсё значыць? Ці ён, можа, згубіў дарогу ў гэтай імгле? Заблудзіў? Як бы там ні было, трэба выбегчы яму насустрач, затрымаць яго. Знайшлося некалькі сьмелых, якімі ўзяўся кіраваць гадзіншчык. Апошнім разам воз матаўся дзесьці за жвіроўняй, паводле ўсіх азнакаў цяпер ён перасячэ стары гасьцінец каля могілак. Значыць, мігам туды — на могілкі!

Каля траціны людзей кінуліся бегчы. Астатнія зьбянтэжана прыціхлі і вычэквалі, настаўляючы вушы на ўсе чатыры бакі.

Каля чацьвертай імгла пачала радзець. Ад гор павеяў вецер, паразьдзіраў туман на камякі, што нагадвалі здані, і пагнаў іх вулачкамі, а потым далей цераз палі і лугі. Не пасьпелі людзі агледзецца, як стала зусім ясна, на захадзе паказалася сонца, гузакаватае і агромністае, як бурак. Пэхачак пачухаў кудлы і

зарагатаў:
— Гергот, цяпер, магчыма, нам удасца яго ўбачыць!

На другім паверсе пошты адчынілася вакно, і зь яго выглянула ўтрапёная галава ў ваўнянай хустцы, з вачыма, падпухлымі ад плачу. Цырульнік Квіда вырашыў, што ён таксама разглянецца па ваколіцы, а менавіта — з даху свайго дому. Ён пабег з разьвеяным крысьсём, але перш чым пасьпеў адчыніць дзьверы ў цырульню, зноў пачуўся грукат колаў.

Гэтым разам воз не аддаляўся, а пад'яжджаў бліжэй, шораз бліжэй, з зусім іншага боку, чым яго чакалі, ад млынавага мосту — ляцеў проста на перапалоханую грамаду перад поштай.
— Ён тут! Ён нарэшце тут! — яны пераможна крычалі яму на прывітаньне. Бартань аднак нічога ня бачыў і ня чуў. Ён сьцябаў свайго беднага ўпацелага коніка, вырачваў вочы, быў бяз шапкі. Яны дарэмна стараліся пераступіць яму дарогу, ён гнаў як апараны, мінуў скрыжаваньне ля пошты і паімчаў далей, да жвіроўні.
— Лавеце яго! — завішчала Гэбэртка ў вакне за дагарэлай сьвечкай. — Ня бачыце, што ён звар'яцеў?

Найбольш прытомныя пабеглі за возам. Ім пашанцавала дагнаць яго, калі ён паварочваў каля Марцінавай клуні, яны павісьлі пры конскіх цуглях, як рой мух. Бялун захістаўся, ногі пад ім падкасіліся, з налітых крывёю вачэй пырснулі амаль людзкія сьлёзы. Бартань, як дасьпелая грушка, зьляцеў з козлаў у рукі сваіх сяброў — Білэка, Пэхачка і Квіда.

Уваскрашалі яго добрую гадзіну ў карчме «Пад збаном». Білэк ахвярна ліў у яго ядлаўцоўку. Толькі па пятай чарцы яму вярнулася мова, але зашмат ад яго не даведаліся. Ён толькі помніў, што згубіў дарогу. Ён, які езьдзіў на станцыю ўжо дваццаць пяць гадоў! Напэўна, збочыў з гасьцінца зараз за сьвятым Флярыянам, бо не даехаў нават да Расахацкага лесу. Дзе езьдзіў? А чорт яго знае. Вытрасаў душу па лагчынах і па вораным полі, адчувае сябе, як здохлы сабака. Што гэта было — чары, вядзьмарства? Ён паціснуў плячыма. А што ён бачыў дарогаю? Нічога. Імглу. Імглу і чорнае поле. Чорнае? Ну так, зусім чорнае, поўнае крумкачоў. Крумкачы і крумкачы: іх там

каля мільёна. Д’ябал каля д’ябла. Не, ён ужо ніколі нікуды не паедзе. Нечувана, бо мястэчка застанецца без газэтаў і бяз пошты. А хай бы гром пабіў усіх цікаўных! Яму перасохла ў роце. Ён працягнуў дрыготкую, зьледзянелую руку па новы кілішак ядлаўцоўкі.

У карчме затупацелі неспакойныя крокі. Што дзеецца? Ах, гэта толькі Кмох са сваёй кампаніяй. Вярнуліся. Але чаму жанчыны пад вокнамі пачалі так бедаваць, чаму так загаласілі? І ані кроплі ўвагі да героя Бартня! Першы праціснуўся ў сені цырульнік. Скурчыўшыся і паклаўшы галаву на калені, на найбольшай бочцы сядзеў гадзіншчык і распавядаў. Ягоныя таварышы, агаломшаныя і зьбялелыя, сядзелі вакол яго на бочках зь півам і перапынялі яго. Адзін перад адным хваліліся сваімі прыгодамі. Калі яны з пустымі рукамі вярталіся каля могілак — там была ого якая імгла! — заўважылі страшную рэч: мёртвыя ажылі! На могілках было, як на кірмашы. Там прагульваюцца алейкамі, гнезьдзяцца на дрэвах, сядзяць на прыступках пад заржавелым Хрыстом, качаюцца на разьбітых надмагільных плітах. Адны нябожчыкі! І нядаўна пахаваныя, і шкілеты ў гнілых лахманах. Вядома, яны далей не чакалі, пабеглі, нібыта апараныя, у мястэчка.
— Яшчэ й гэта! Яшчэ й гэта! — енкнуў Квіда і схапіўся за галаву. — Мёртвыя ажылі! Чэрці, а цяпер яшчэ нябожчыкі! Нічога сабе госьці!

Дзьверы адчыніліся, і Білэк акінуў цырульніка дакорлівым позіркам. Бартню зноў заняло мову.

Навіна неслася з вуснаў да вуснаў, шырылася як чума і сеяла жах. На ўсіх вуліцах ішлі ліхаманкавыя дэбаты. А на пляцы — адкуль Галчыну гару відаць было як на далоні, дый ня толькі яе, але і Кухэльскую грэблю ды нівы пад Расахацкім лесам — стаялі тыя, хто ўжо насыціўся сэнсацыйнымі размовамі. Цяпер яны толькі глядзелі. Шарэла, але ад імглы не засталося ні сьледу. Як скінуць вокам, усюды былі крумкачы. Час ад часу некаторы падымаўся, махаў цяжкімі крыламі і зноў сядаў. Яны ня каркалі, былі маўклівыя, злавесна маўклівыя. Бярозы на Галчынай гары былі ўвешаныя імі, як экзатычнымі пладамі.
— Іх тут хоць гаць гаці, — сказаў пэнсіянэр Голец. Ён стаяў на

абмуроўцы фантана, усьпіраючыся на плячо свайго сябра, купца Шчовічка.
— Калі на іх гляджу, мурашкі бегаюць па сьпіне, — пагадзіўся купец. — Гэта сапраўдная аблога!

[image]

[image]

Дзень трэці

ШТУКАРЫ

Пляц быў пусты, толькі пад аркадай карчмы штурхалі адзін аднаго абібокі. Апошняя спозьненая гаспадыня з напханай закупамі торбай стаяла перад латком крамніцы Файтоўкі. Ратушавымі сходамі паважна спусьціўся паліцыянт Мушэк, хвіліну памарудзіў перад дошкай з публічнымі аб'явамі, а потым, хістаючыся з боку ў бок, пайшоў да вузкай вулачкі за вежай. Не пасьпеў ён павярнуць на яе, як з за рогу на другім канцы вулачкі паказалася падазроная пара.

Два мужчыны клыпалі безь відавочнай мэты. Абодва былі адзетыя ў старыя вайсковыя нагавіцы, на нагах мелі боты з халяўкамі, а на галовах зухаватыя, паношаныя зялёныя капелюшы. Яны былі смуглявыя, як катляры, на плюшавых камізэльках з мэталёвымі гузікамі калыхаліся тоўстыя срэбныя ланцужкі. Яны жвава прайшлі міма каменных фігураў сьвятых і папраставалі на сярэдзіну пляцу. Старэйшы, даўгяла з чорнымі натапыранымі вусамі, ляніва апусьціўся на прыступкі фантана; маладзейшы, блазьнюк зь нізкім лобам і шырока расстаўленымі вачыма, стаяў над ім з рукамі ў кішэнях і фальшыва пасьвістваў. Паліцыянт, які тымчасам вярнуўся з вулачкі на пляц, сачыў за незнаёмымі неспакойным позіркам. Ён ужо двойчы быў намерыўся пакінуць сваё месца ля сьцяны ратушы і двойчы перадумаў. У гэты момант гадзіньнік пачаў паволі, велічна біць адзінаццатую.

Маладзейшы цыган паглядзеў на старэйшага. Здалося, што

старэйшы незаўважна кіўнуў. Бязвусы выцягнуў рукі з кішэняў і зь няўлоўнай воку хуткасьцю пачаў трапаць пальцамі правай рукі аб далонь левай. Пачуўся стукат бубна, спачатку ціха, як шум спорнага дожджыку аб шыбу, але чым далей, тым разборлівей і выразьней, ажно ўрэшце цэлы пляц дрыжаў ад грукату нябачнага штукарскага бубна. Зьдзіўленая Файтоўка адагнулася ад сваіх пляцёнак. Некалькі вокнаў зь ляскам адчыніліся. Што робіцца? Дзівотны бубнач няўтомна бубніў далей, шораз больш гвалтоўна, шораз больш апантана, гул нёсься да самых далёкіх вуліцаў. Пачалі зьбягацца людзі.

Разьлютаваны паліцыянт накінуўся на бубнача. За ім шчыльным паўколам стаяў натоўп.
— Дуй адсюль! — крыкнуў яму ахоўнік парадку.

Даўгяла паволі ўзьняўся, паглядзеў на яго зьдзекліва, потым нечакана выкінуў абедзьве рукі ўгору і апусьціў іх уніз. Потым адскочыў — і ля, якое дзіва! Перад ім вырасла палатка, больш-менш на дзьве асобы. Паліцыянт змоўк, з разяўленым ротам узіраючыся на дзіва.
— Увага! — мужчына магутным голасам перакрычаў гул бубна. — Толькі для мужчынаў!

Толькі ён гэта прамовіў, як дакладна гэткі надпіс засьвяціўся чырвонымі літарамі над уваходам у палатку. Жанчыны ў грамадзе незадаволена замармыталі. Бубнач выцер рукі аб калашыны і схаваў іх у кішэні. Настала такая цішыня, што было чуваць парыпваньне пеўніка на ратушнай вежы.
— Толькі для мужчынаў, — паўтарыў штукар, выкрыўляючы твар у саладжавай, лісьлівай усьмешцы. — Гэтым я ніяк не хачу сказаць, што наш паноптыкум скрывае нейкую гідкую брыдоту. Мы ня маем на складзе ні скаромных фатаграфіяў, ні глыбока дэкальтаваных васковых фігураў. Кожны мужчына, які сюды зазірне, убачыць на ўласныя вочы сваё першае каханьне. Вы мяне добра зразумелі? Сваё першае каханьне! Баіцеся падману? Нічога прасьцейшага, як самому пераканацца. Ніхто ня будзе ашуканы, плата за ўступ пасьля відовішча, хто нічога ня ўбачыць, той нічога ня мусіць плаціць. — Ён пахіліўся і энэргічна расхінуў палатку. Пасярэдзіне задняй сьцяны таямніча бліскала прагляднае вочка.

— Шаноўныя месьцічы, — працягваў мужчына з вусамі, — вам прапануецца незвычайная рэч, дзіва над дзівамі. А можа, вы нам не давяраеце, бо перад сабой бачыце толькі двух беднякоў з пустымі кішэнямі? Вы памыляецеся, мы багацейшыя, чым вы думаеце, бо мы прапануем на продаж сны, — ён абярнуўся на пяце і працягнуў руку з указальным пальцам, закрыўленым, як кіпцюр. — Гляньце вунь на таго млынара, на таго таўстуна з галавой, як кавун! Я ўбачыў яго ўчора — а можа, гэта й не было якраз учора? — як ён міла прагульваецца ўздоўж струменьчыка і лічыць зоркі, утопленыя на дне. А ты, кравец, худы і жоўты, як кавалак воску, не запярэчыш, што на днях доўга ўзіраўся ў іголачнае вушка, быццам бы табе там мільгаў стары, забыты ўспамін? Я стаяў пад вакном гасподы і сачыў за карцёжнікамі. Адзін зь іх, забыўшы пабіць карту, напружана ўглядаўся ў малюнак чырвовага туза. Што ён там бачыў? П'яніцы стараліся як найхутчэй напіцца, але ў іхных песьнях была нейкая ласка, а ў каламутных позірках нейкая туга. Вы ўсе марна тужыце аб вашай чароўнай мінуласьці. Вы можаце яе займець! Прычына вашай маркоты — тут, праўдзівая аж да болю, незафальшаваная і салодкая. Першае каханьне! Колькі ж вы па ім сумавалі, колькі ж тужылі! Заходзьце! Заходзьце! Толькі дурань мог бы яшчэ вагацца!

Прадавец сьвечак прытэпаў ад сваёй крамы, скрушліва высмаркаўся ў хустачку і, ссунуўшы шапку, зьбянтэжана выцер сваю лысіну.
— Нічога, — ліхаманкава зашаптаў яму праз плячо аптэкар Баер з настабуранымі вусамі і вырачанымі вачыма, — ці гэта будуць чары, ці толькі пякельны падман, мы й так пойдзем, каб гэта паглядзець.
— Так, так, — падтакнуў прадавец і крадком разгледзеўся, ці ня чуе ягоная жонка.

Паліцыянт Мушэк прыглушаным голасам размаўляў зь лістаношам Гайкам. Калі б ён ня быў на службе, першы пайшоў бы на гэта паглядзець. А так — не выпадае. Абавязак ёсьць абавязкам. На ходніку перад аптэкай размахваў рукамі млынар Тайхман, які нагадваў кісельную гару сала. Яго падмаўлялі, а ён мужна бараніўся.
— Што, ніхто ня мае ні трохі сьмеласьці? Што, ніхто нам ня

верыць? — злаваўся цыган і люта біў сябе ў грудзі, ажно дзылінкалі мэталёвыя гузікі на ягонай камізэльцы. — Дарэмна я вас запрашаў, дарэмна намаўляў!
— Аднак гэта цікава, — гаварыў дараднік Дэнк касіру ашчаднай касы Пасэку, задумліва сьціскаючы яго за плячо. — Гэты мужчына, так сказаць, сапраўдны красамоўца, гэта яму трэба прызнаць.

Яны абодва стаялі з голымі галовамі — так, як выбеглі з канцылярыі.

Натоўп урэшце заварушыўся, даючы дарогу стэльмаху Фальгу, зачырванеламу ажно да самой макаўкі.

Стэльмах пачціва нахіліўся да вочка. Усе затаілі дыханьне. Глядзеў ён доўга, нічога ня кажучы, потым раптоўна выпрастаўся і схапіўся адной рукой за лоб, як быццам яму закружылася ў галаве. Другой рукой пачаў шнарыць у задняй кішэні нагавіцаў.
— Наступны, запрашаем наступнага, — прыпрошваў маладзён зь нізкім лобам, прымаючы заплату.

Тры мужчыны адначасова кінуліся да палаткі, між імі млынар. Першы, касір Пасэк, спачатку манерна хіхікаў, але хутка перастаў, а ад вочка ўжо адыходзіў пакорліва, як ягнятка. Другі, шавец Гоўска, толькі агаломшана круціў сваёй ускудлачанай рыжай мазгаўнёй. Калі палатку пакідаў млынар Тайхман, па яго мясістых шчоках каціліся буйныя, як гарох, сьлёзы. Млынар плача! Цяпер раптам усе захацелі паглядзець тое, што і ён. Людзі кучай кінуліся ўсярэдзіну. Аптэкара і прадаўца сьвечак амаль данесьлі да ўваходу ў паноптыкум.

Перад латком Файтоўкі шапталіся кабеты, якія пакінулі свае кухні, ня дбаючы пра тое, прыгарыць ім абед ці не. Чаго тыя мужчыны там талопяцца? Яны браліся пад бокі, падскоквалі, сачылі за мужчынскай сьціжмай варожымі позіркамі. Фокусьнік усё ж хлусіў, напэўна там нейкія непрыстойнасьці. Чаму таго не забароняць?
— А хай сабе мужчыны пазабаўляюцца, а хай сабе пазабаўляюцца, — каркала Файтоўка, трасучыся ад сьмеху.

Дараднік Дэнк дзякаваў той акалічнасьці, што ня мае капелюша, той прынамсі не перашкаджаў яму, калі ён прыціснуўся да вочка. Першы бегкі пагляд падзейнічаў на яго, як удар, — у адно імгненьне ён перанёсься на добрых трыццаць гадоў назад у мінулае. Не магло быць нават найменшага сумневу, што ён бачыць старую клуню сьвятара, якая згарэла пазалетась, а перад ёй — так, так, гэта ж стаіць і чакае Блажэнка Крэйсава з тымі сваімі дзіцячымі ямачкамі ў локцях і яшчэ раскашнейшымі ямачкамі ў пульхненькіх шчочках!
— Ужо іду, ужо іду, — прабалбатаў памаладзелы Дэнк, але ў гэтую самую хвіліну яго ўдарылі пад бок, — кравец Вітвар дамагаўся сваёй чаргі.

Спадара дарадніка ахапіў гнеў. Цяпер, калі ён нарэшце знайшоў яе, калі можа сказаць ёй усё тое, аб чым забыўся нашаптаць на вушка пры апошнім спатканьні, ён зноў павінен яе вырачыся ці нават пакінуць яе тут на папас пажадлівых вачэй гэтага гулкага тлуму? Нізашто на сьвеце! Блажэнка была ягоным першым каханьнем, нічыім больш! Ён не аддасьць яе нікому! Яго ахапіла рэўнасьць. Ён хапатліва разгледзеўся і з крыкам скочыў дапераду. Нешта падобнае на мыльную бурбалку лопнула перад ягонымі вачыма, пырснула ў лоб халодным душам. Палатка была ўсё тая, а Блажэнка стаяла перад імі на лузе, поўным кветак. Яна завагалася, а потым пайшла яму насустрач. Ён раскінуў рукі і пабег да яе, выкрыкваючы ейнае імя.

Калі людзі ўбачылі, што дараднік развaліў будан і гоніцца за сваім прывідам, на пляцы падняўся крык незадаволенасьці, які неўзабаве зьмяніўся жудлівай цішынёй. Цяпер усе пабачылі тое перад сабою — кожны сваё першае каханьне. Беднае, яно ўпарта баранілася ад пацалункаў спадара Дэнка!

Першы ачомаўся млынар. Ён разгроб людзей сваімі мядзьведжымі рукамі і схапіў дарадніка за каўнер. Аптэкар усё ж быў спрытнейшы і падставіў абодвум ногі. Нейкую хвілю яны дужаліся толькі ўтрох, усё роўна што біліся за жыцьцё, а потым узьняўся агульны гармідар. Хто мог, кінуўся ў бойку. Мужчыны счапіліся ў адзін клубок і пачалі абкладваць адзін аднаго кулакамі.

Бойка трывала, нягледзячы на роспачныя крыкі жанчын і недарэчныя прымірэнчыя прапановы баязьліўцаў. З адчыненых вакон надарэмна вабіў пах згатаваных абедаў. Толькі калі на ратушнай вежы прабіла дванаццатая, задзіракі пачалі прыходзіць да памяці. Задыханыя, скрываўленыя, з разьбітымі локцямі і запэцканымі тварамі, яны падымаліся зь зямлі і зьбянтэжана глядзелі адзін на аднаго. Ужо забыўшыся, за што біліся. Адзін за адным пакідалі бойку і незаўважна зьнікалі.

Апошні падняўся з бруку дараднік Дэнк. На лобе ў яго выскачыў вялізарны гузак, з надарванага вуха крапала кроў, ён увесь быў выкачаны ў гразі, але пераможна ўсьміхаўся. Да грудзей ён прыціскаў патаптаную, зьмяжджэраную галоўку чырвонай капусты. Некалькі лісткоў капусты няўпэўнена мяў сваімі тлустымі пальцамі млынар.
— Першае каханьне, — шаптаў сам сабе дараднік і, нібы ў экстазе, глядзеў кудысьці ў пустку.

Стэльмах Фальг сумна ўсьміхаўся, падкідваючы выбіты зуб на далоні. Паліцыянт Мушэк прысаромлена хаваў за службовай шапкай свой падрапаны твар. Вітвар аглядаў разьбітае калена, а Пасэк правяраў, ці не зламаў ключыцу.
— А дзе гэтыя два нягоднікі? — жаласьлівым голасам перапытваў немаведама каторы раз прадавец сьвечак Лінкэ. Як быццам у адказ, з другога канца пляцу данёсься дуэт такога пустога сьмеху, што людзям на ходніку кроў у жылах застыла ад жаху.
— Вой, мне ажно сэрца спынілася, — застагнала Файтоўка і, зьбялелая як радно, бясьсільна апусьцілася на ўслон.
— Дзе гэтыя праклятыя чэрці? — паўтараў сваё пытаньне Лінкэ, трасучыся ад узрушанасьці і страху. — Гэта былі яны, пякельныя выпадні, ворагі ўсіх людзей!

Яны разглядаліся дарэмна. А на тым месцы, дзе яшчэ перад хвілінай стаяла палатка і лютавала бойка, тлела сінім полымем некалькі сьцяблінак травы.

[image]

[image]

АТАКА МЁРТВЫХ

Тры дні мёртвыя абмяркоўвалі, як гамузам наведаюць мястэчка, ужо нават зьбіраліся ў дарогу, але кожны раз перамагала лянота, і яны разыходзіліся да сваіх магілаў, млява пазіраючы ў неба. Гэтае ваганьне яны перанесьлі ў сваё новае быцьцё зь цішыні папярэдняга сну. Здавалася, што паход так і не адбудзецца, але справу ўзяў у свае рукі нядаўна памерлы цукернік Паржызк. Гэты жартаўнік, былы актор аматарскага тэатру, задумаў сабе, што ўваход у мястэчка адбудзецца з адпаведнай помпай. Ён пранюхаў, дзе тыдзень таму гіцаль закапаў здохлую кабылу рамізьніка Бэма, і адразу меў гатовы ўвесь плян. Насупраць могілак разьлягаўся прасьцяг быдлячага рынку, дзе сяляне з ваколіцы ставілі свае калёсы. Мёртвыя мусілі задаволіцца адным возам, таму што мелі толькі аднаго каня. У ясную, месячную ноч Паржызк запрог здыхляціну ў воз з драбінамі. Садзіліся доўга, бо зь мёртвымі клопат гэткі самы, што і з малымі дзецьмі. Ледзь толькі некаторыя зь іх пасьпелі сесьці ў воз, як адразу пачыналі драмаць і забываць, чаго яны туды залезьлі. Калі вярнуўся цукернік, які вэрбаваў далейшых, воз зноў быў пусты. Ненадзейныя нябожчыкі страцілі ахвоту да забавы, за якой тужылі яшчэ хвіліну таму, і паразлазіліся. Выйшла так, што страхотлівая выправа вырушыла ў дарогу ўжо за белага дня.

Маляўнічы і нечаканы ўезд выклікаў паніку на вуліцы ад могілак. Да галашэньня і праклёнаў дарослых далучылася надрыўнае выцьцё дзяцей. Хто мог, хаваўся па дамах. Бразгалі дзьверы перад носам спозьненых. Тыя, што засталіся навонкі, шукалі паратунку ўцёкамі. Тупатаньне ўцекачоў ускалыхнула рэшту мястэчка. Мёртвыя едуць! Мёртвыя едуць! Няшчасьнікі з вырачанымі вачыма і натапыранымі валасамі забягалі ў чужыя сені, расьцярушваліся па найбольш аддаленых вулках. За імі гнаўся скрып панурага воза. Пляц імгненна апусьцеў. Крамы былі пазачыньваныя, шторы вітрынаў паапусканыя. Файтоўка схавалася ў Баеравай аптэцы. Паліцыянт Мушэк, які быў тут дзеля таго, каб утрымоўваць парадак сярод жывых, а не каб

супрацьстаяць мёртвым, схаваўся ў ратушным праезьдзе, зачыніўшы за сабою браму і змацаваўшы яе жалезнымі крукамі. Жаласна і працягла выліся сабакі.

Паржызк сядзеў на козлах велічна, быццам дворскі вазьніца на каралеўскім вясельлі. Нягледзячы на зелянковае адценьне скуры і на азызласьць, выкліканую прасунутым трупным распадам, ён мог падацца жывым. Драбіны грукаталі па брукаванцы, і хоць цукернік стараўся ўціхамірыць буянасьць свайго чарнявага коніка і ехаць як мага павальней, з воза ўсё роўна чуваць было праклёны і прытлумленыя нараканьні. Некалькі найстарэйшых нябожчыкаў, якія дагэтуль сяк-так трымаліся, не перанесьлі безупыннай трасяніны і пачалі памалу пераўтварацца проста ў кучкі касьцей. Мацнейшыя і маладзейшыя спадарожнікі зусім не дурылі сабе галавы стогнамі сваіх таварышаў. Мястэчка прабудзіла ў іх даўнія ўспаміны, і іхнае зацікаўленьне расло з кожнай хвілінай. Яны разглядаліся, ківалі знаёмым стрэхам, галёкалі, патрасалі сваімі злахманенымі саванамі і не зьвярталі ўвагі, як побач крышацца хрыбты і сыплецца парахня.

Воз затрымаўся на пляцы сярод цішыні больш замагільнай, чымсьці тая, што была на могілках. Дамы заглохлі. Не зварухнулася ніводная фіранка. Такога прывітаньня, зразумела, не чакалі перш за ўсё тыя, хто выбраўся ў дарогу зь вялікім энтузіязмам. Пачаліся дакоры, а некаторыя накінуліся на Паржызка, які быў паабяцаў ім амаль сямейнае прывітаньне са сьлязамі і пацалункамі. Актор, з жалем успамінаючы свае колішнія заслугі, моцна перажываў горыч цяперашняй няўдзячнасьці і сам ня быў супраць таго, каб адпомсьціць суродзічам гучным скандалам. Але спачатку ён хацеў яшчэ паспрабаваць па-добраму. У белых шкарпэтках і чорным пінжаку, распоратым на сьпіне, ён ускараскаўся на абмуроўку фантана і, як сапраўдны правадыр, узьнятай рукою папрасіў увагі.
— Гэй вы там, за вокнамі, — пачаў ён прамову, водзячы каламутным позіркам па фасадах маўклівых дамоў, — колькі часу мінула з тае пары, як вы нас ушаноўвалі вянкамі і папяровымі кветкамі і палілі за нас сьвечкі? Крывадушнікі, гэта ганьба, што вы цяпер ня хочаце да нас падысьці! Мы прыехалі з

уласнай волі, мы толькі хочам, каб вы адчынілі перад намі свае дамы, у якіх мы нарадзіліся і якія калісьці былі таксама нашыя. Вы ж хіба не настолькі бязмозгія, каб нас баяцца? Цяпер паміж намі няма істотнае розьніцы, — філязафічна дадаў ён, — няма ніякіх мёртвых, усё жыве, або, калі хочаце, усё памерла. Я вітаю гэтыя цікавыя абставіны і даю вам пяць хвілінаў на роздумы!

Пяць хвілінаў мёртвыя перачакалі даволі цярпліва, але калі гэты тэрмін мінуў і нічога не зьмянілася, яны пачалі шукаць камянёў. На пляцы іх, на жаль, не было, але затое перад аркадай гатэлю «Пад Божым вокам» стаяў апусьцелы латок Файтоўкі. Яны мігам апаражнілі пляцёнкі, паразьбівалі бутэлькі, павыварочвалі мяхі, і на ўпарта зачыненыя вокны пасыпаліся бульбіны, морква, рэпа, памідоры, арэхі і квашаныя гуркі. Бразгацела разьбітае шкло, на элегантнай тынкоўцы зьяўлялася штораз больш плямаў. Цукернік спрабаваў кіраваць атакай са сваёй трыбуны, але ягоныя каманды патаналі ў агульным вэрхале. Запасаў у латку не хапіла на ўсіх раззлаваных, на шчасьце, пад рукой была яшчэ іншая амуніцыя — косьці рассыпаных нябожчыкаў. Замест гародніны, бульбы і арэхаў паляцелі пажоўклыя косьці, чарапы, пальцы, пазванкі і паламаныя рэбры. Але і гэтыя запасы хутка скончыліся. Сквапныя рукі бязьлітасных таварышаў пачалі разьбіраць шкілеты, якім удалося перанесьці язду. Да д'ябальскага скавытаньня разьлютаваных нападнікаў дамяшаліся баязьлівае ляскатаньне бязьмясых сківіцаў і млявыя пратэсты разьбіраных ахвяраў.

Генэрал Паржызк са змрочным жахам глядзеў на пагібель сваёй арміі. Жаласны канец атакі здаваўся няўхільным, але акторскі мозг пасьпеў выціснуць зь сябе выратавальную ідэю:
— У школу! — загрымеў ён магутным голасам. — У школу, на дапамогу зьняволенаму брату!

Калі вытрашчаныя бельмы і глыбокія пустыя вачніцы павярнуліся да яго зь няўцямам, ён растлумачыў, адмерана махаючы рукамі, што ў школьным кабінэце ўвязьнены такі самы бедачына, як і яны, таксама мёртвы, як і яны, якога ад усяго астатняга сьвету аддзяляе квадратная шкляная сьцяна.

Ідэя аказалася вельмі добрай. Нябожчыкі рушылі за сваім начальнікам, а на пляцы засталася асірацелая конская падла, якая зьвесіла галаву перад пустымі драбінамі.

Аддзел з цукернікам наперадзе працягнуўся вузкай вуліцай пад гару і вышыхтаваўся перад школай. Тым часам як пераможны паток мёртвых цёк калідорам да сходаў, у дрывотніку сутыкнуліся адзін з адным дырэктар Крус і вучань Шкопэк. Яны прыселі за кучай дроваў і, з вырачанымі ад жаху вачыма, амаль ня дыхалі. Паржызк і ягоная хеўра затрымаліся ў прыродазнаўчым кабінэце перад узорным касьцяком, які ваяўніча глядзеў з нутра шафы.
— Браце, — узьнёсла прамовіў цукернік, — паглядзі, вось уваскрашэньне, пра якое ты й ня сьніў! Хадзі, настаў канец тваёй няволі, кліча цябе свабода!

Яны раструшчылі ахоўнае шкло. Але тут іх напаткала расчараваньне! Шкілет быў натыркнуты на жалезны шворан, як матылёк у калекцыі, галава не пасавала да грудзей, грудзі да рук і ног. Самотны худзеча, палатаны як мутрахлястая кашуля, чый ганарысты выгляд зусім не пасаваў да ягонай поўнай бездапаможнасьці, замест спачуваньня выклікаў весялосьць. Мёртвыя ўжо даўгавата сумавалі па нейкім малым жарце, былі сытыя па горла гэтай панурай павагай, а таму цяпер яны пачалі вышчарацца, штурхацца і качацца на падлозе, як вар'яты.

Гэтая незацугляная пацеха сталася бар'ерам, аб які спатыкнуўся зьменлівы настрой мёртвых. Калі яны насьмяяліся ўдосталь, раптам усё ім абрыдла. Дарэмна актор клаў ім у вушы палымяныя словы. Яны заціхлі, страцілі цікаўнасьць да помсты і самога мястэчка ды пачалі адзін за адным разыходзіцца. Нейкі час яны яшчэ бязмэтна туляліся вулачкамі, аднак урэшце знайшлі дарогу на могілкі, ведзеныя вецярком, які дзьмуў адтуль і нёс з сабою ўлюбёны пах раскапаных магілаў.

Паржызк ахвярна бегаў па Альшыне, стараючыся нанова сабраць сваё расьцярушанае войска, але безвынікова. Таму яму не засталося нічога іншага, як толькі паддацца гэтай бязглуздай цязе і падацца ў той самы бок, куды пашкандыбалі ягоныя сябры. Падла Бэмавай кабылы засталася самотна стаяць

пасярод пляцу. Знуджаным позіркам здыхляціна азіралася вакол сябе, ляніва паскубвала траву паміж камянёў, але і яе таксама перастала забаўляць гэтая бязмэтная бязьдзейнасьць. Яна скранулася зь месца, аб'ехала фантан, павярнула на Панскую вуліцу, мінула вуліцу з поштай, прашкандыбала мостам цераз млынавы струмень і пацягнулася з сваім пустым возам гасьцінцам у бок Расахацкага лесу.

Крус і Шкопэк выграбліся з дрывотніка толькі тады, калі вакол іх запанавала цішыня — знак таго, што мёртвыя сышлі са школы. Яны асабліва ня думалі аб прычыне гэтых адведзінаў, нашмат больш іх цікавіла пытаньне, ці на дварэ ўжо зусім бясьпечна. Дырэктар спрабаваў паслаць вучня ў разьведку, але той асьмеліўся запрапанаваць, каб было наадварот. Разглядаючыся на ўсе бакі, яны ўрэшце высунуліся за выламаную браму. На пустэльнай вуліцы іхная адвага пабольшала. Згараючы ад цікаўнасьці, яны вырашылі паглядзець мястэчка пасьля атакі.

На пляцы яны ўбачылі забаўную карціну. Усе вокны былі разьбітыя, сьцены перапэцканыя квашанымі гуркамі і памідорамі, на бруку і ходніках валяліся чарапы і косьці, як быццам сюдою прайшоў нейкі сьмерч і вымеў трупярню. Адчуваючы сябе крыху ніякавата, яны глядзелі больш угору, чымсьці долу, і дырэктар з поўнага маху наступіў сваім лякаваным пантофлем на спарахнелы чэрап. Раздаўся гучны трэск. Дырэктар падскочыў, як пырнуты шылам, і інстынктыўна паглядзеў на зямлю. Ён здолеў яшчэ заўважыць кончык вострага язычка, які пажадліва аблізаў ніжнюю сківіцу — пасьля гэтага ён зваліўся, як калода, у абдымкі свайго вучня.

Абамлець пасьля ўсяго гэтага геройства было зусім недарэчы, таму што ўяўны язык мёртвага ня быў нічым іншым, як толькі хвосьцікам чорнай салямандры, якая хавалася ад падэшвы дырэктара ў натуральнае сховішча.

[image]

Дзень пяты

У КАСЬЦЁЛЕ

Дэкан Вэліх абвясьціў на нядзелю вялікую казань, зьвязаную з урачыстай імшой і прычашчэньнем вучняў. Мястэчка выявіла зразумелую зацікаўленасьць — натоўпы людзей валілі ў касьцёл яшчэ за паўгадзіны да пачатку службы, каб заняць месца. Нельга апісаць зьдзіўленьне першых вернікаў, калі яны пачулі ў касьцёле пахі пудры і парфумы ды ўбачылі аздоблены букетам экзатычных кветак амбон і хоры, запоўненыя незнаёмымі панамі.

Прыгожыя паненкі з глыбокімі дэкальтэ сядзелі ў вольных позах на лаўках, усё роўна што на тэатральным бальконе, шамацелі шаўковымі сукнямі і бліскалі аздобамі. Вакол аргана і пры балюстрадзе стаялі бледныя элеганты ў фраках, зашораныя накрухмаленымі нагруднікамі, са сьляпуча белымі зубамі і палымянымі паглядамі. Людзі, якія зьбіраліся ў касьцёле, шэптам распытвалі адзін аднаго, што за шляхетныя госьці сядзяць на хорах, але нават касьцельны ня змог задаволіць іхнай цікаўнасьці.

Усхваляванасьць, выкліканая прысутнасьцю такіх знакамітых гасьцей, спрычынілася да таго, што агідны, характэрны пах, які пачаў даносіцца зь сеняў храму, вернікі пачулі толькі тады, калі касьцёл быў бітком набіты народам. Галовы неспакойна аглядаліся. Хваля шэпту з вуснаў у вусны данесла ззаду страшэнную вестку. Яшчэ да таго як стары дэкан увайшоў вітымі ўсходамі на казальніцу, якая формай нагадвала разяўленую пашчу кіта, усе ўжо ведалі, што ў сені праніклі нябожчыкі. А тыя на хорах? Здагадка багамольнай Гэбэрткі дапоўніла жахлівасьць варункаў: гэта госьці зь пекла. Ззаду мёртвыя, а ўверсе д'яблы! Напалоханы натоўп ускладаў усю надзею на звышнатуральную моц сівога мужчыны ў адпрасаванай рызе, які акурат распачаў казань ад Божага імя.

Гоман на хорах багабойна заціх, прыгожыя паненкі прыставілі тэатральныя бінокліе да падмаляваных вачэй, а паны нахіліліся над балюстрадай, аказваючы маўклівую зацікаўленасьць. Паставе нанізе палегчала, бо вернікі спадзяваліся ад тых наверсе адно грубых насьмешак або прарэзьлівага кашэчага

мяўканьня. Аптэкар Баер нават усьміхнуўся з удзячнасьцю да пякельнікаў са сваёй лаўкі перад галоўным аўтаром.
— Бог вечны, — запэўніваў дэкан вернікаў, неспакойна паглядаючы на хоры, — ён ня мог памерці, ён жыве! — Некалькі галоваў паглядзела на яго зь недаверам. — Падзеі, што вас засмучаюць, гэта толькі пакараньне за вашыя грахі. Даверцеся без ваганьняў нязьменным артыкулам катэхізму! Аднавеце ў сабе веру, падарваную рэлігійнай абыякавасьцю, а ўсё міне. Ці ёсьць такія сярод вас, што сумняваюцца? Вам патрэбныя доказы? Не, Бог не памёр. У зьяўленьні фальшывых анёлаў, у д'ябальскіх нападах, ва ўваскрасаньні мёртвых вы можаце распазнаць ягоныя непранікнёныя задумы. Усё гэта — справа ягоных сьвятых рук. Адбываюцца цуды. Хто іншы іх творыць, калі ня Бог?
— Гэта памылка, — загучаў у цішыні паважны, крыху сумнаваты голас з хораў. — Вы перакручваеце факты, ці то ад няведаньня, ці то знарок. Цуды не пачаліся, яны скончыліся. Іх ужо няма. Цуд сьмерці, цуд жыцьця, цуд росту — усе яны ў мінулым. — Прамоўца, які стаяў наперадзе, амаль пасярэдзіне, худой рукою працягнуў па гладка зачасаных чорных валасах і выкрывіў вусны ў горкай усьмешцы.

Натоўп захваляваў ад страху, як жытнёвая ніва ад ветру. Дэкан перапалохана паглядзеў у твар таму, хто з такой дзёрзкай самаўпэўненасьцю пярэчыў яму. Шыя дэкана пачырванела ад бязмоцнай злосьці. Ён схапіў крыж са сьцяны і дзіка ім замахаў:
— Apage, satanas!
— Ня будзьце ідыётам, — знуджаным тонам працягваў франт — гэтым вы мяне ня выпудзіце. Я звольнены ад абавязкаў, якія на мяне паклаў памерлы пераможца. Сам факт, што я тут, даказвае праўду маіх словаў.

У вачах дэкана, які глядзеў на яго з прыхаваным жахам, заблішчала новая надзея.
— Я ўжо бачу, — крыкнуў ён, — што і я быў вялікім грэшнікам, і таму сёньня Госпад так мяне прынізіў. Ды паслухай жа, ты, воўк у авечай скуры! Калі ўсё так, як ты сьцьвярджаеш, дык чаму ты не скарыстаеш супраць мяне ўсю сваю цёмную моц, а імкнесься толькі зьбіць мяне з панталыку бясплённай палемікай? Вы сабраліся там наверсе толькі за Божым

дазволам. Калі ён захоча, зьмяце вас адным узмахам сваёй сьвятой рукі, дакладна так, як ужо аднойчы ён зьмёў вас у прорву пякельную. Усе вашы бессаромныя словы — толькі пыл, узьняты ягоным пакаральным подыхам.

Потым ён зьвярнуўся да вернікаў:
— Ад нас залежыць, ці мы скорымся перад Богам і горача папросім яго адпусьціць нам нашыя грахі. Калі пакаемся, ён з нас зьлітуецца.
— Ня зьлітуецца, ён ня можа, ён мёртвы, — упарта паўтарыў д'ябал. — Ягоная спадчына дастанецца мне, таму што я пасьля яго наймацнейшы. Чаму я ня зьнішчу вас сваёй моцай? Вы мне не замінаеце. Я памяркоўны. І разумны. Я не такі помсьлівы, як быў ён!

Дэкан ізноў успыхнуў злосьцю. Ён некалькі разоў махнуў рукамі, але не знайшоў трапнага адказу. У прыступе роспачы ён схапіў вазу зь нязвыклымі кветкамі (галянтны падарунак зь пекла), каб запусьціць ёй у прамоўцу. Ваза ў ягоных руках перамянілася ў аблочак дыямэнтавага пуху, які ціха паплыў над галовамі зьдзіўленага натоўпу. Дэкан стаў на калені, чалом упёрся ў абрамоўку казальніцы ды пачаў маліцца і галасіць у прыступе нейкай дзікай гістэрыкі.
— Супакойцеся, спадар, — дастойна сказаў д'ябал, — я і ня думаў вас зьневажаць. Толькі я не магу цярпець, калі вы гаворыце нешта, нязгоднае з праўдай.

Вернікі адказалі на гэтыя словы ўхвальным мармытаньнем. Здалося, што дэкан недачуў гэтай бясспрэчнай праявы сымпатыі да непрыяцеля. Ён грузна ўстаў і бясшумна сышоў уніз, каб працягваць імшу. Відавочна, ён усё яшчэ цешыў сябе думкай, што чэрці скорацца перад містычнай моцай абраду.

Але дзівам сёньня не было канца. Пасьля нясьмелага дзылінканьня званочка загучала музыка, чысьцейшая і саладзейшая за ўсё, што калі-колечы выйшла са старога аргана. Усе твары мімаволі павярнуліся да хораў. Той, хто гаварыў, цяпер граў. Ён сядзеў над рэгістрам, ківаючыся з боку ў бок, ахоплены чарамі ўласнага ўмельства. Напудраныя паненкі глядзелі на яго з замглёнай кунегай. Франты маркотна зьвесілі галовы.

Дэкан, мабыць, таксама ведаў, хто грае, але ён ні на што не зьвяртаў увагі, заняты багаслужбай, у якую ўклаў усю душу. Калі ўступная мэлёдыя была незвычайна прыгожая, дык з чым можна было параўнаць тое, што наступіла цяпер? Арганныя трубы загучалі такім урачыстым сумам, што ніводнае вока не засталося сухім. Тоны хапалі за самое сэрца, вярэдзілі яго безнадзеяй і кідалі ў бездань балеснай асалоды. Многія ўсталі і павярнуліся да хораў усім целам, зусім забываючыся на імшу. Азмрочаны, упарты дэкан хадзіў, як накручаны, з аднога канца аўтара ў другі, рыхтаваў аплатку, наліваў віно, богведама як баронячыся ад чароўнай музыкі. Эвангельле чытаў ён страшэнным голасам; багаслаўляючы, махаў рукамі як шаленец, а калі касьцельны загледзеўся на хоры і забыўся пазваніць, дэкан вырваў яму званок і адзваніў сабе сам. Яму давялося ажно тройчы заклікаць дзяцей да прычасьця, пакуль ягоны памочнік ачомаўся і падрыхтаваў малых вернікаў.

Калі надышла гэтая частка абраду, сярод чарцей заўважыўся нейкі рух. Арганіст прыцішыў музыку настолькі, што было выразна чуваць усхваляваны стукат сэрцаў. Дэкан, сыходзячы з аўтарных прыступак з залатым келіхам у руках, пераможна паглядзеў на хоры. Як толькі першае дзіця прыняло прычасьце, яно закрычала і пачало плакаць. Другое разьвяло ручкамі і пачало ванітаваць. З хораў данёсься голас арганіста, ціхі, але цьвёрды:
— Што гэта за недарэчнасьць — даваць дзецям цела пяць дзён як мёртвага Бога?

Узьнялася хваля абурэньня. Маці павыбягалі з лавак і пахапалі сваіх дзяцей. Не, не, нельга такога дапусьціць! Насамрэч, трэба з усім гэтым скончыць. Падняўся гармідар. Бацькі выносілі сваіх нашчадкаў на руках. Хутчэй зь імі навонкі, на сьвежае паветра! Пачуліся праклёны і стогны пратэстаў, калі першыя шэрагі людзей пачалі націскаць на тых, хто быў ззаду. Урэшце ім не засталося нічога іншага, як толькі прабівацца праз страхотную блякаду мёртвых.

І ў гэты момант усе адчулі нечаканую палёгку, убачыўшы, што ў сенях увогуле не было ніякіх нябожчыкаў. Тое, што так гідка сьмярдзела цягам цэлай імшы, аказалася толькі крапільніцай,

крапільніцай са сьвятой вадой!

Перад касьцёлам людзі зьбіліся ў кучкі і раіліся. З нутра касьцёлу ўсё яшчэ грымеў арган. Але як! Найбольш захопленыя скупіліся пры ўваходзе, намерыўшыся прывітаць майстра-музыку авацыямі. Людзі абмяркоўвалі шляхетныя рысы характару будучага валадара сусьвету. Жанчыны, безумоўна, хацелі яшчэ раз зірнуць на знакамітыя туалеты пякельных паненак.

Апошні выбег з касьцёлу дэкан. Ня бочнымі дзьверцамі, а галоўным уваходам. Ён забыўся пераадзецца і ў абрадным строі засьпяшаўся да плябані. Ні на кога не глядзеў, не адказваў на зьбянтэжаныя прывітаньні, выглядаў панура, як сам Люцыпар. Яго перамаглі ў ягоным уласным храме!

Ягоныя пяткі чапляліся за рызу і пэцкалі яе гразьзю, прыліплай да чаравікаў. Ягонае адзеньне было такое ўрачыстае! Ягоныя паводзіны такія недарэчныя! Вочы зяхалі маланкамі. Сам ён сьвяціўся золатам.

[image]

[image]

Дзень шосты

ВЫКРАДАНЬНЕ

Паветра было нерухомае, зьлеглай травы не варушыў ні найменшы ветрык. Пад пахіленымі алешынамі ціха бруіў млынавы струмень. Марынка Кадава адклала кніжку, абаперлася на сьценку альтанкі, аброслай дзікім вінаграднікам, і заплюшчыла вочы. Наступіў момант млявага забыцьця, моташнага падзеньня ў цемру — аднак неўзабаве ўсё зьлілося ў звычайную чарнату, якая пачала быць нуднай. Лепш зноў расплюшчыць вочы. Але — што гэта? Яна спалохалася, дзіва што яшчэ ня крыкнула. Усё выглядала так сама, як раней: заходзіць цьмянае сонца, чырванее лісьце дзікага вінаградніку, жаўцее радок парэчкавых кустоў — толькі гэтага чалавека тут

не было. Адкуль ён узяўся? Як ён сюды трапіў? На калодах ля плота сядзеў босы бадзяга з кайстрай за плячыма і, хітравата ўсьміхаючыся, трымаў пры вуснах дудачку з васьмю дзіркамі.

Чорныя валасы над ягоным лобам закручваліся ў віхрыкі, што нагадвалі рожкі, іскрыстыя вочы не адрываліся ад дзяўчыны. Марынку ўзрушала прысутнасьць гэтага абадранца, адначасова, аднак, яна адчувала сябе млява. Яна хацела ўстаць і ўцячы, але не магла паварушыцца.

«Усё роўна», — падумала яна і толькі адвярнула галаву ўбок, каб пазьбегчы дапытлівага позірку незнаёмца.

Вандроўнік асьцярожна і разважліва піскнуў сваім простым інструмантам. Тон, потым яшчэ адзін, неахвотна, з адмеранай паўзай, але безь ніякай мэлёдыі. Ажно ў вушах закалола.

«Дарма я баялася, — падумала Марынка, — гэты чалавек, пэўна, хворы на галаву».

Гукі з двух канцоў сьвету няўпэўнена набліжаліся адзін да аднаго, адзін — худы і жвавы, другі — тоўсты і лянівы. Яны сышліся хістка, няўпэўнена — але як жа гэта было балюча! Як стрэмка, увагнаная ў самае сэрца. Пучок свавольна-назойлівых нотаў рассыпаўся крывавым градабоем.
— Ах! — Яна ніяк не магла стрымаць уздыху і дакорліва паглядзела на музыку.

Ён засяродзіўся, паўтарыў свой тон, дадаў два новыя, нізкі і высокі, дудачка заплакала несуладнай трэльлю. Ён сьвістаў і сьвістаў без упыну, са злоснай зацятасьцю. Марынка абмахнула рукой свой лоб. Хоцькі-няхоцькі ўстала, ногі пад ёю падкошваліся. Вандроўнік вышчарыўся, вытрас з дудачкі сьліну і зноў прыклаў яе да рота.
— Што вы робіце? — выціснула зь сябе зусім разгубленае дзяўчо і зрабіла два хісткія крокі да валацугі.

Ён спахмурнеў, нічога не адказаў і пачаў дзьмухаць у свой інструмант як апантаны, ягоныя вочы палыхалі злым агнём. Урэшце, пасьля цяжкай намогі, ён зьмяніў форму завабліваньня. Марынка крыкнула, схапілася за грудзі і ўпала

на траву. Калі зноў апрытомнела, убачыла, што незнаёмец усьміхаецца амаль ветлівай усьмешкай. Ён далей сядзеў на калодах, але ўжо ня граў. Стукаў дудачкай аб калена ў палатанай калашыне.
— Цяпер я вас уведаў, — сказаў ён вясёла.
— Што?
— Цяпер я вас уведаў. Я вас ужо знайшоў.
— Я вас не разумею, — сказала яна стомленым голасам, далей прыціскаючы далонь да месца, дзе паволі супакойвалася напалоханае сэрца. Яна не адважылася даць рэзкі адказ.
— Я вас маю, ведаеце? — ахвотна тлумачыў ён. — Я знайшоў ваш тон. Цяпер пойдзеце за мною, куды захачу. Вы — мая.

Яна зьбялела.
— Уласна кажучы, хто вы? — спыталася яна зь пералякам у голасе.
— Я — шукальнік тонаў.
— Шукальнік тонаў?
— Вы не разумееце? Гэта ж зусім проста! Ці вы слухалі калісьці водгук свайго голасу ў пустым пакоі? Пры пэўнай ноце сьцены пачынаюць дрыжаць ад вашага крыку. Калі граеце на піяніна — у нейкі момант вам недарэчна адказвае шклянка з паліцы або забытая талерка на стале. Вы, людзі, зусім як тыя сьцены і шклянкі: настроеныя на адзін тон. Дастаць вас ня так цяжка, як можа здавацца. Хопіць толькі знайсьці гэты правільны тон, тады вы ўжо не бароніцеся, гэта ваш лёс.
— А як вы, прабачце, сюды прыйшлі? — запыталася яна сумным голасам.
— Струменем, як жа інакш! Я доўга і ўважліва назіраў за вамі, таму было так ціха. Вы заплюшчылі вочы. У вас шаўкавістыя вейкі і прыгожыя сьветлыя валасы. Вы тонкая і адначасова поўная. Я меў шчасьце, што так хутка вас знайшоў.

Яна недаверліва ўсьміхнулася.
— Ну, цяпер ужо ня будзе так дрэнна, ведаеце? — падбадзёрваў ён яе. — І ўжо ня будзе балець. Гэтак бывае толькі спачатку, пасьля ўсё падобнае на цудоўны сон. Пабачыце, як вам будзе добра! — І ён прыклаў дудачку да вуснаў.

Яна міжвольна заткнула вушы, але і так пачула, як быццам зь

вялікай далечы, гукі — знаёмыя і мэлянхалічныя, як прамінулае дзяцінства, гарачыя, як голас каханьня. Яны азваліся зноў, няўмольна, усё роўна што паляўнічы клікаў вярнуцца пужлівага белага хорта. Супрацівіцца гэтаму клічу было б неразумна, калі гаспадароў голас гучыць так прыветліва! Яшчэ момант, і Марынка кінулася да ног вандроўніка, усхвалявана дыхаючы.

Яна глядзела на яго зьнізу, бачыла ягоныя сьпічастыя і парослыя поўсьцю вушы, адкрыты рот, вузкія і доўгія зрэнкі. Ягоная барада была рэдкая, шаўкавіста-залацістая.
— Ці я вас ужо недзе бачыла? — захоплена запыталася яна. — Дзе гэта магло быць?

Ён усьміхнуўся. Вусны адсланілі прыгожыя малочна-белыя зубы. Ён быў малады і пахучы — толькі чым ён пахнуў? Летняй мяжой, веснавым гаёчкам, вечаровай смугой, восеньскім дажджом. Адкуль ён прыйшоў? Хто ведае? Ці ёй конча гэта ведаць? Не, гэта яе зусім не цікавіла. Яна сядзела ў траве, і ёй сапраўды было добра. Каля плота расла дуброўка і позьнія кветкі, забытыя кветкі.
— Што робіць ваша маці? — пацікавіўся вандроўнік. Ягоныя шэрыя вочы ўпіваліся ў яе зь пяшчотай, але яна ведала, што яны падманлівыя.
— Я ўжо даўно ня маю мамы. Яна памерла, калі я была яшчэ зусім малая.
— А хто ваш бацька?
— Ён доктар. — Яна віла вянок з дуброўкі, успамінаючы мінулае: гульні зь лялькамі, купальскія вогнішчы, таемныя ночы дзевяці кветак.
— А хто такі доктар?
— Ну, доктар. Лекуе людзей.

Ён жорстка засьмяяўся.
— Лекаваць зусім дарэмна, ад сьмерці яшчэ ніхто ня вылекаваў. А вы яго любіце?

Яна зьдзівілася. Як яна магла б не любіць свайго добрага татку?
— А яшчэ каго-небудзь любіце?

Яна хутка пакруціла галавой.
— А сябе — сябе ня любіце?

Гэта было дзіўнае пытаньне. Праўду кажучы — любіць. Яна сябе моцна любіць. Ад самага маленства ўсе яе гушкалі, служанкі, Марта, а найбольш — бацька. Пацыенты, якія прыходзяць да іх, таксама яе любяць. А яна ставіцца ветліва да ўсіх людзей. Але нельга сказаць, што яна іх любіць. Затое любіць зьвяроў, птушак, дрэвы. І яшчэ прадметы: сваю канапу, свой зэдлік, свой ложак…
— Ах, ложак! — вандроўнік загарэўся. — Я таксама маю ложак. З палявых кветак! Духмяны ложак для бадзягі. Неба яго прыкрывае, дрэвы яго ахінаюць, птушкі над ім сьпяваюць. Спаў я на ім сам, цяпер будзем спаць абое.
— Абое?
— Так, абое. Вы і я. Як вас завуць?
— Марынка.
— Дык пойдзем, Марынка, — ён схаваў дудачку ў кайстру.
— Куды?

Ён паціснуў плячыма і махнуў рукой, паказваючы кудысьці ў далеч. Яна паслухмяна ўстала, насунула жоўты вянок з дуброўкі на свае кудзеркі. Ён абняў яе за стан. Яна прыхінулася да яго бліжэй і пайшла зь ім. Ёй хацелася з чагосьці сьмяяцца. З дому? Сапраўды, калісьці ён быў важны, але цяпер ужо перастаў. Яны прайшлі садком і ўвайшлі ў халодныя скляпеністыя сені.
— Пачакай! — выкрыкнула яна. Яна скінула чаравікі, зьняла панчохі і таксама пайшла басанож.

У той вечар жыхары Альшыны ўбачылі асаблівае відовішча. Доктарава дачка выбегла з бацькоўскага дому ў абдымках маладога хлопца з вандроўным клункам і, не зважаючы на пярэпалах суседзяў, пайшла зь ім проста на пляц. Яны яе клікалі, але яна ня чула. Яны ўпрошвалі яе, каб вярнулася, але яна не дала сябе спыніць. За імі бегла і галёкала чарада дзяцей. І да таго яна была басанож! Блюзка ў яе была расшпіленая, абадранец сунуў сваю калматую лапу ў разрэз. Бялела аголенае плячо і кавалак узьнятай грудзі. Арыштаваць галоту! Дзе падзеўся наш стары Мушэк? Пакуль знайшлі ахоўніка парадку,

пара зьнікла ў вузкай вулачцы за ратушай. Бабка Фоўсткава згледзела іх, як яны ўцякалі пожняй да тржэбашынскай жвіроўні.

Паўгадзіны пазьней пляцам праімчаў доктар Кадавы з расхінутым крысьсём і акулярамі ў руках. Ён праседзеў цэлы адвячорак пры ложку сьмяротна хворага, які нібыта ніяк ня мог памерці.
— Марынка! — клікаў ён, паварочваючы ў вулачку за ратушай, а на пяты яму наступалі ягоныя сябры: дырэктар Крус, дараднік Дэнк, аптэкар Баер.

Ужо бралася на сутоньне. Ён мінуў апошні ліхтар і затрымаўся на самай ускраіне поля, запоўненага крумкачамі, амаль каля тржэбашынскай жвіроўні.
— Марынка! — трывожліва крычаў ён, зьвінуўшы далоні ў трубку.

Ніхто яму не адказваў, толькі пасьля кожнага выкрыку ў паветры віравала чарада чорных птушак, быццам нехта дзьмухаў у сажу. Доктар хацеў бегчы далей, але яго схапілі за крысьсё. Ён упаў. Акуляры разьбіліся. Яны завалаклі яго назад на пляц, хоць ён і супраціўляўся, зь ляскам зачынілі за ім дзьверы ягонага ўласнага дому і паставілі варту.

Доктар цяжка сеў на сходы побач з Мартай, сваёй гаспадыняй, якая там галасіла ўжо ад самага вечару, і сьлёзы ліліся зь яе, як зь перапоўненага гаршка.

[image]

[image]

Дзень сёмы

ЗАБОЙСТВА І САМАГУБСТВА

Дворнік Пэхачак піў у карчме «Пад збаном» увесь вечар і ўсю ноч, сьвяткуючы новы сусьветны парадак. Раніцай павалокся дахаты. Далёка не зайшоў, перад поштай сустрэў жонку.

Жончына хустка была пагрозьліва завязаная пад барадой, а вочы злосна блішчэлі.
— Здароў, вось нечаканая сустрэча, — аднавокі дворнік паспрабаваў жартаваць, але адразу атрымаў проста ў сківіцу. Ад нечаканасьці ён паляцеў на плот Гэбэртчынага гародчыка. Паволі падымаючыся, ён тугадумна мазгаваў, ці павінен уступіць у спрэчку з жонкай. Жанчына мела відавочную перавагу — яна была цьвярозая. Ён адчуваў сябе дурнавата, бо перад цырульняй стаялі Білэк і Квіда і рагаталі на ўсё горла. Ён агледзеўся, але ня ўбачыў нічога, за што можна было б ухапіцца. Яму не заставалася нічога іншага, як толькі біцца голымі рукамі. Ён зарычаў, кінуўся з пахіленай, як тур, галавою і бадануў у нешта мяккае, сам ня ведаў у што. Найважнейшае, што гэта ўжо не выглядала так ганебна, як першая сутычка. Але ўдарыць другі раз яму ўжо не давялося. Спадцішка, але спрытна, яму падставілі нагу, і на ягоны азызлы ад гарэлкі твар пасыпаліся аплявухі.

Уставаў ён цяжка, як бездапаможнае дзіця. Аднак ягоная галава не была такая нявінная, у ёй кіпела шалёная лютасьць. Як жа так, дастаць у морду пры сябрах? І да таго яшчэ ад дурной бабы? Ён схапіўся за плот, прыкідваючыся, што ледзь стаіць на нагах, але гэта была толькі гульня, бо крадком за плячыма, дрыжучы ад прагі помсты, ён адкрываў нож. Наагул Пэхачак жыў са сваёй жонкай даволі згодна — зразумела, па-свойму, — цяпер, аднак, ён павінен быў змыць ганьбу любой цаною. Ён даскочыў, замахнуўся і, перш чым хтосьці з гледачоў здолеў яго спыніць, убіў нож у жончыну сьпіну. Нож увайшоў ажно па тронак і завяз у целе. Аднавокі імгненна працьверазеў. Яго замарозіла адчуваньне, што ён учыніў нешта незваротнае.

Аднак, на вялікі зьдзіў, не наступіла нічога такога, чаго ўсе спадзяваліся. Жанчына, што праўда, перапалохана крыкнула, нават жахліва выкрывілася, працягнула руку за плечы і намацала ўбіты нож, але ня ўпала ад гэтага сьмяротнага ўдару, толькі адразу пачала страшэнна лаяцца на мужа. Білэк з Квідам ды яшчэ якія тры выпадковыя сьведкі гэтае сцэны цяпер перапалохаліся значна больш, чымсьці пры першай атацы разьюшанага мужчыны. Раптам справа ўзяла іншы паварот. Пэхачку адлягло, калі ён убачыў, што жонка перанесла ўдар

нажом лягчэй за блышыны ўкус. Разьятраны абразамі, якімі яна яго частавала, і падмацаваны баявым посьпехам свайго сьцізорыка, ён пырнуў яшчэ раз — у грудзі суперніцы. Жанчына заенчыла яшчэ пранізьлівей і схапіла яго за кудлы. Пэхачак пыраў і пыраў, як шалёны. Нож пачырванеў ад крыві, але ня больш за тое. Пэхачыха ня слабла, ня траціла прытомнасьці, не паміралa — яна была непераможная! Білэк і астатнія абступілі цікаўным колам загадкавае відовішча. Паволі да іх пачало даходзіць.

Адзіным, які дагэтуль нічога ня цяміў, быў аднавокі. Ён кідаўся на жонку, убіваў ёй нож у грудзі, у шыю і ў жывот, пакуль не стаміўся. Тады ён бездапаможна апусьціў рукі і зьдзіўлена паглядзеў на публіку.
— Нічога не атрымліваецца, — прамармытаў ён, — вы самі бачылі, што так нічога не атрымліваецца!

Ён кінуў біцца, а і Пэхачыха праявіла ня меншае міралюбства. Яна нечакана абціхла, упусьціла выдзерты жмут п'яніцавых кудлаў, хвілю якую бязмэтна пакруцілася на месцы, а потым пайшла і села на каменны слупок перад карчмой «Пад збаном». Там яна неяк абсунулася сама ў сябе, абаперла локці аб калені, схавала твар у даланях. Яна выглядала зусім жаласьліва, як выкінутая лялька.
— Людзі, людзі, што вы на гэта? — аднавокі шукаў хоць якога слухача. — Ну й паказаў я вам відовішча!

Бурачковы нос Білэка палаў.
— Гэта ён, — Білэк цыбуком люлькі паказваў на дворніка новым гледачам. — Гэта ён, Пэхачак! Паночкі, як ён яе лупцаваў! А бачыце, ня ўходаў яе, яна ўсё жывая! Вось што тварыцца, такога мы ніяк не чакалі!

Такім чынам людзі ў мястэчку Альшыне пераканаліся, што ўжо сапраўды нельга памерці. Навіна неслася з вуснаў у вусны, прыцягала ўсё новых зацікаўленых на месца бойкі. Нельга памерці! Анёлы гэта прадказалі, мёртвыя пацьвердзілі, д'ябал у касьцёле растлумачыў. Што цяпер будзе? Як жыць далей? Ніхто ня будзе ні старэць, ні расьці! Агромністы і змрочны цяжар — вечнае жыцьцё — лёг на чалавечыя плечы. Забруіла радасьць, але яна была пазначаная такім жахам, што нават ні разу ня

піскнула.

Тымчасам аднавокі выхваляўся перад слухачамі каля Гэбэртчынага дамка:
— Дайце на гарэлку, і я пакажу вам гэта яшчэ раз. Пырну аж пасюль, — ён паказваў на нож, — толькі так, для жарту. Хто скінецца на гэтае відовішча?

Яшчэ дзіўнейшы плян высьпяваў у вялізазнай, шышкаватай галаве цырульніка Квіда. Іншым разам такі балбатлівы, ён ня ўдзельнічаў у абмеркаваньнях, пераступаў з нагі на нагу, а ягоны твар быў скрыўлены грымасай, якая сьведчыла аб глыбокім роздуме. Ён адбегся, а праз хвіліну вярнуўся зь вяроўкай і высокім дзіцячым услончыкам. Ступіў на яго і доўга валтузіўся зь нечым над дзьвярыма цырульні, дзе на іржавым круку вісела бліскучая цырульніцкая місачка. Калі быў гатовы, урачыста махнуў рукамі і вышчарыўся ўсьмешкай да людзей на вуліцы:
— А цяпер мая чарга, глядзеце, такога вы яшчэ таксама ніколі ня бачылі. Гэта будзе нешта іншае!

Ён сунуў галаву ў падрыхтаваную пятлю (ніхто не зварухнуўся, каб яго паўстрымаць), таўхануў нагамі ўслончык — і павіс, як сапраўдны вісельнік.
— Гарбун павесіўся! Адрэжце яго!
— Навошта? Ці ж ён мог павесіцца? Яму ж нічога ня можа стацца!
— Але ж і пацеха! — Білэк, каб пацьвердзіць, што гэта сапраўдная пацеха, ухапіўся за ногі вісельніка і пачаў разам зь ім гайдацца, пераможна пакрыкваючы. Усьмешка паволі спаўзла з цырульнікавых рысаў, ягоны твар напух, пасінеў, рот адкрыўся ў страхотлівым пазяханьні, паказаўся нерухомы язык.
— О-о! — найбліжэйшыя адступіліся з агідай. — Пусьці яго! Пусьці яго! — закрычалі яны на Білэка.

Наймацней гарлапаніў гадзіншчык Кмох, расстаўляючы рукі і махаючы шапкай. Білэк, вядома, ня бачыў твару свайго жывога ківача. Ён пусьціўся толькі тады, калі ягоную забаву абарвалі моцныя ўдары кулакоў пад рэбры.

У гэты самы момант у шчыльнае кола цікаўных увайшоў

бледны спадар у чорным пінжаку, спыніўся з рукамі ў кішэнях перад вісельнікам, пасьміхнуўся, агледзеўся вакол сябе іранічна прыплюшчанымі вачыма і зьнік у натоўпе.
— Хто гэта быў? — разгублена запытаўся нехта.

Ніхто яму не адказаў.

Цяпер усе хацелі толькі аднаго — як найхутчэй адрэзаць цырульніка. Аказалася, аднак, што ўся гэтая трывога была зусім не патрэбная. Квіда паволі ачомаўся ад свайго здранцьвеньня, на твар вярнулася нешта накшталт румянцу, язык зноў заварушыўся і зьнік у роце. Ягоныя ногі шукалі ўслончыка. Яны ахвотна яго падставілі, і ён сам вызваліўся зь пятлі.
— Ну, як яно было? — хацеў даведацца аднавокі.
— Як яно было? — далучыўся Білэк.

Цырульнік маўчаў. Ён быў дзіўна зьбянтэжаны, змарнелы на твары, безупынна круціў сваёй вялізазнай, шышкаватай галавою. Прысутным ён падаўся настолькі забаўным, што яны пачалі душыцца ад сьмеху. Нейкая бабуля нясьмела папрасіла ў яго кавалак вяроўкі, але ён прыкінуўся, як быццам яе не заўважыў. Дзеці скакалі вакол яго:
— Вісельнік! Вісельнік!

Раптам заварушылася Пэхачыха. Як так сталася, што пра яе зусім забыліся ў гэтай сумятні? Яна паднялася са свайго слупка і, узяўшыся рукою пад бок, зрабіла некалькі хісткіх крокаў.
— Куды ідзеш? — крыкнуў ёй усьлед аднавокі.

Яна прамаўчала, толькі мацней завязала хустку пад барадою. Потым пайшла больш рашуча.
— Куды яна ідзе? — запытаўся Пэхачак у таварышаў, крыху занепакоены.

Яны ня здолелі адказаць. Зрэшты, увагу ўсіх прыцягнулі дзівотныя паводзіны цырульніка Квіда. Ён хадзіў па ходніку, быццам нечага шукаючы, час ад часу няўцямна паглядаў на вяроўку, якую трымаў у руцэ. Раптам затрымаўся, вытрашчанымі вачыма паглядзеў на Пэхачыху. У гэтых вачах было столькі смутку! Ён бяз слова пабег за ёю.

— Што гэта? — зьдзівіўся Білэк.

Жанчына спынілася на рагу Панскай вуліцы і там пачакала гарбуна.

Гэтага было аж надта:
— Ну й парачка! Яны падыходзяць адно да аднаго, чорт іх бяры! Куды яе гэты курдупель вядзе? Пэхачак, пільнуй сваёй жонкі! — Людзі пачалі спаборнічаць у грубаватых жартах. Сьмяяліся, штурхалі адзін аднаго, потым чарадою пусьціліся за імі, згараючы ад цікаўнасьці.

Пара хутка перайшла цераз пляц, павярнула за ратушу, рушыла вуліцай да могілак. Да могілак! Няўжо яны ідуць на могілкі? Яшчэ некалькі крокаў, і хеўра спынілася: так яно і ёсьць! Не, туды за імі ніхто не наважыцца пайсьці.
— Дык там жа адны мёртвыя, — халодна прамовіў Білэк. Люлька яму згасла.

Мёртвыя? Натоўп скалануўся ад жаху. Некаторыя разьбегліся. Астатнія яшчэ мацней скупіліся, як быццам адчувалі сябе бесьпячнейшымі, саграваючыся ўзаемна цяплом свайго дыханьня і жывых целаў. Суседзі з Млынавай вуліцы маўкліва вярталіся дамоў.
— Як я раней не дадумаўся, — гаварыў гадзіншчык Кмох, стоячы зноў перад сваёй крамай, — што яно так скончыцца? Ці раней здаралася такое, каб за зло не было пакараньня? Сяк ці так, пакараньне прыйдзе заўсёды. І калі няма сьмерці, дык ёсьць нешта іншае. Магчыма, што яно яшчэ горшае. А ўвогуле, гэта цікава — выглядае, што на сьвеце ўсё ж ёсьць нейкая справядлівасьць. Бог у нас памёр, але справядлівасьць засталася. Гэтага я не магу зразумець.
— Вы лепш не блюзьнерце, — гыркнула на яго Гэбэртка.

Пэхачак стаяў наводдаль. Ён сьціскаў у жмені скрываўлены сьцізорык і боязна пазіраў на могілкі сваім адзіным вокам. Нават ягоны сябра Білэк не падышоў да яго.

[image]

Дзень восьмы

ЧОРТ

На мосьце над млынавым струменем пасярод чарады вісусаў стаяў тоўсты, рыжы, гадкі, калматы чорт і вычварна вышчараўся. Зьляжалая і шурпатая поўсьць была зьлепленая гразьзю і гноем са скулаў, вылінялыя прагалы агалялі чорную, паморшчаную і прышчаватую скуру. Дзеці спачатку думалі, што гэта толькі чучала, але каровіны рогі салідна вырасталі з лоба, а капыты і хвост з рэдкай вяхоткай на кончыку былі сапраўдныя. На кароткай нягнуткай шыі сядзела кантовая галава з налітымі крывёю вачыма і пляскатым носам, падобным да зьвярынай пысы.
— Д'ябал! Д'ябал! — цешыліся дзеці.
— Я ня д'ябал, а чорт, — прыдуркавата бараніўся ён. — Паміж чортам і д'яблам вялікая розьніца, вы гэтага ня ведаеце? Д'ябал — гэта пан, ён гладкі і самавіты, носіць манокль і голіцца. У яго сьвецкія манеры, і ён падабаецца паненкам. Я не падабаюся нікому. Я ня пан, а галяк. Чаго вы сьмеяцеся? — ён ашчэрыў трухлявыя зубы ў раскрываўленых дзяснах.
— Які ён брудны! Як ён сьмярдзіць!

Ён зарагатаў, ажно нешта зарыпела, і каб забавіць іх яшчэ больш, гучна пукнуў.
— Ты чорце хвастаты! Ну й сьвіньня!

Дараднік Дэнк быў першы, хто заўважыў чорта сярод дзяцей. Ён выйшаў з канцылярыі зь лістом на пошту, хоць ведаў, што паштовую скрынку ўжо тыдзень не апаражняюць. Ён не паверыў сваім вачам. Ці гэта нейкі заблукалы мядзьведзь, ці, можа, сапраўдны чорт? Зрэшты, сёньня ўсё магчыма. Нельга ўжо нічому зьдзіўляцца. Ці не пайсьці мне туды? Ён вагаўся. Яму не хацелася ісьці да свавольнікаў, але цікавасьць перамагла. Ён перасунуў капялюш узад галавы, заклаў рукі за сьпіну і паважна прыблізіўся да вісклівай чародкі.
— А што вы тут, дзеці, маеце?
— Гэта чорт! Сапраўдны! — вясёла выкрыкнулі хлопцы. Яны скакалі і куляліся вакол чорта. Адзін свавольнік ухапіў чортаў хвост, задзёр яго і зь дзікім рыкам паказаў на ягоны голы чырвоны азадак.

Чорт па-сяброўску ўсьміхаўся.
— Такіх як я, старых, там шмат — растлумачыў ён, — але нам вельмі цяжка. — Ён спахмурнеў і патрос кулаком у бок цёмнага далягляду: — Гэта паны! Самі ходзяць у белых пальчатках, ядуць толькі адны прысмакі, п'юць адборнае віно, а нас маюць за парабкаў. Мой хрыбет усё яшчэ смыліць ад іхных бізуноў!
— Вас б'юць? — спачувальна запытаўся дараднік.
— Яшчэ як!
— Не паддавайцеся. Зрэшты, цяпер, калі законы Творцы зрынуліся, мабыць, і вашы службовыя дачыненьні скасаваныя. Вы таксама вызваленыя ад сваіх абавязкаў. Вы, пэўна, таму й прыйшлі да нас?
— Ды не! Я ўцёк, вось што.

Яны пацягнуліся на пляц — Дэнк, дзеці і страшыдла. Людзі зьдзіўлена азіраліся за імі, далучаліся да іх. Сьціжма расла. Выпівохі са «Збана» ўзялі чорта разам з сабою. Білэк частаваў яго ядлаўцоўкай, Бартань, як знаўца, разглядаў ягоную зьвярыную морду. Аднавокі ўступіў зь ім у вельмі глыбокі дыспут на тэму пякельных катаваньняў. Як там маюцца забойцы, ці звычайныя забойствы разглядаюцца асобна і ці ап'яненьне залічваюць да зьмякчальных варункаў?

Касір Пасэк прыбег з фотаапаратам.
— Калі ласка, — засопшыся, крычаў ён здалёк, — зрабеце мне крыху месца, толькі крышачку! Гэта будзе раз-два. Усьміхнецеся на хвілінку, калі ласка!

Як толькі да чорта дайшло, што з агульнай зацікаўленасьці можна займець нейкую карысьць, ён пачаў жабраваць. Ён кланяўся, бессаромна працягваў лапы з высунутымі кіпцюрамі, круціў тлустымі клубамі, як старая распусьніца. Толькі калі аптэкар паабяцаў яму суп і нешта з абеду, ён перастаў мітусіцца і дазволіў Пасэку зьняцца.

Адразу пасьля гэтай нуднай працэдуры чорт пачаў дамагацца абяцанага абеду. Ім давялося доўга тлумачыць яму, што цяпер толькі адзінаццатая і што абед яшчэ не гатовы. Ён саступіў зь незадаволеным мармытаньнем. Але потым доўга ня меў ахвоты да ніякай забавы.

Кравец Вітвар запрапанаваў, каб чорт тымчасам паказаў нейкія чары. Такія пякельнікі сёе-тое ўмеюць, прыгадайма хоць бы тых двух катляроў, якія адным махам рукі паставілі на пляцы палатку з чарадзейным вочкам. (Дэнку гэтая размова ня надта каб падабалася, яму яшчэ не загаіліся драпіны на руках і абліччы, што засталіся пасьля бойкі з млынаром.) Але чорта давялося доўга падмаўляць. Ён тлумачыўся, што ад голаду яму вуркоча ў жываце, што дзеля гэтага ён ня мае сілы і што, карацей, яму папросту ня хочацца. Але калі яны ўбачылі, што ён мякне, пачалі яму пляскаць, падхвальваць яго, гладзіць яго па рагатай галаве. Аказалася, аднак, што мілы чорт увогуле не прызвычаены да такіх выступаў і ня ведае, з чаго пачаць.

Аптэкар падказаў яму:
— А што, калі б ажывіць вунь тыя каменныя фігуры сьвятых?

Але некалькі прысутных спадарынь найахвотней пабачылі б нейкую фаўстаўскую зьяву, Гэлену, Ахіла, Адысэя або Парысаў суд. На Парысаў суд умомант натхнілася і большасьць мужчынаў. Прадавец сьвечак Лінкэ запатрабаваў тлумачэньняў, а калі яму растлумачылі, што да чаго, ён сказаў, што такія непрыстойныя сцэны непатрэбна выклікалі б маральнае абурэньне.
— Калі вы такі сарамлівы, дык ня мусіце на гэта глядзець, — пальнуў яму дараднік.

Узьнікла спрэчка, і ўжо здавалася, што згоды ня будзе. Калі ўрэшце яны прыйшлі да розуму, усё выйшла бледна. Чорт умеў ня больш за нейкага вандроўнага штукара. З капелюша дарадніка ён выцягнуў некалькі маладых галак; пасьліній сабе палец, дзьмухнуў, і быў з таго начны матылёк; з кончыка свайго хваста выпусьціў некалькі вёдраў бруднай вады. Нікому гэта не спадабалася, і яго абсьвісталі. Ён пераступаў з нагі на нагу, чухаў сваю поўсьць, зьбянтэжана ўсьміхаўся.

Бліжэй да поўдня ў грамадзе вакол пякельніка пачалі зьяўляцца гаспадыні, якія дагэтуль завіхаліся ля кухоннай пліты. Чорт вычуў у паветры пах абеду і зноўку ажывіўся. Ён рабіў рэвэрансы, усьміхаўся на ўсе бакі, аблізваўся, падмігваў. Неўзабаве жанчыны засталіся на пляцы ў большасьці, мужчыны, відаць, ужо наглядзеліся на відовішча, якое не

абяцала нічога новага.

Чорт валэндаўся ад дому да дому, там, дзе спыняўся, спыняліся і ягоныя гледачы. Калі паказваў нейкі дурнаваты фокус, раздаваўся гучны рогат. У Файтоўкі ён украў жменю сушаных сьліў з кашолкі, але яго заўважылі, і ён кінуўся наўцёкі, ажно іскры сыпаліся з пад ягоных капытоў. Крамарыха гналася за ім зь мятлой ажно да ратушы і яшчэ доўга пасьля лаяла яго і пагражала яму. Стэльмах Фальг падсунуў яму табакерку, але чорт выбіў яе зь ягонай рукі, табака завірыла ў паветры, і ўсе сталі чыхаць. Жонка лістаноша Гайка ўзяла яго пад руку і, сярод агульнай весялосьці, пачала шпацыраваць зь ім пад аркадамі. Чорт муляўся, адмахваўся хвастом, адпіхваў назолістую панюсю сваімі каровінымі рагамі.

Прыклад Гайкавай распаліў маладых дзяўчат. Яны пасьмялелі і таксама пачалі какетнічаць з чортам. Вадзілі за ім вачыма, хіхікалі, скубалі яго за бараду. Чорту гэта надзвычайна падабалася. Ён сеў на край ходніка перад гасподай — яго абступілі дзяўчаты. Дзёрзкая ветрагонка Індра Гоўскава верхаводзіла і падшпігоўвала тых, якія яшчэ крыху бянтэжыліся.
— Чорце, ці хацеў бы ты мяне за жонку?

Сьмех.
— Ну дык скажы, прынамсі, ці я табе падабаюся!? Ах, ты, ёлупень, няма ў табе ні на грош галянтнасьці. Адразу відаць, што ты стары кавалер!

Яны ціснуліся да яго ўсё бліжэй і бліжэй. Штурхаючы адна адну, шэптам абменьваліся назіраньнямі, якіх нельга было выказаць уголас. Чорт сядзеў, як на голках. Турзаўся, бліскаў вачыма, сьлініўся. Найбольш спакушала яго глыбокае дэкальтэ Індры. Раптам ён кінуўся на яе, але яна спрытна вывінулася, і чорт злавіў іншую, маленькую Ганну Гільмараву, зацісnуў яе ў сваіх гідкіх абдымках і пачаў цалаваць яе твар і шыю.

Яна крычала, лямантавала. Сяброўкі вырвалі яе, але дачку аптэкара хапіў прыступ гістэрыкі, а Тынка з млына нават абамлела. Потым не было ўжо чаго чакаць. Яны разьляцеліся, як вераб'іная чародка, у якую нехта стрэліў. Тынку зацягнулі ў

аптэку Баера.

Па другі бок пляцу, каля ратушы, пачалі зьбірацца хлопцы і змаўляцца дзеля крывавае помсты. Апошняе здарэньне абудзіла ў іх рыцарскія пачуцьці, больш-менш усе адчувалі сябе зьняважанымі гэтым бессаромным выпадкам. Найбольш гарлапаніў малады Гоўска, які ў нядзелі прагульваўся з Ганкай галоўнай вуліцай.
— Гэтага яму нельга дараваць, за гэтае нахабства ён мусіць быць як сьлед пакараны. Кажаце, што ў яго ня ўсе дома? Што ён ня можа адказваць за свае ўчынкі? Ясна, вы лічыце, што найперш трэба было б уваліць нашай Індры. Аб гэтым пастараюся я, вы не тлумеце сабе галавы. Нельга дапусьціць, каб такія прастакі цалавалі нашых дзяўчат, якім мы сама больш нясьмела паціскаем рукі пад сталом або складаем нявінныя вершыкі, абліваючыся сёмым потам.

Занадта яны да гэтага ня рваліся, чорт ёсьць чортам, чалавек ніколі ня можа ведаць, што ён вычварыць, але яны ўсё ж узброіліся дубінкамі. Чакалі толькі, пакуль іх будзе больш, пакуль прыйдуць падмацаваньні з Млынавай вуліцы і з хацінаў за струменем, дзе жылі юнакі асабліва сьмелыя і прызвычаеныя да боек.

Яны не пайшлі на чорта ў лабавую атаку, але абкружылі яго. Разьдзяліліся на малыя групкі ў прылеглых вулачках і выскачылі адначасна на сьвіст Гоўскі. Пякельны выпадзень задаволена, у шчасным самазабыцьці, ляжаў там, дзе яго пакінулі дзяўчаты, чухаў сабе сьпіну і цешыў сябе мроямі аб ласунках. Ён зусім не прадчуваў блізкай катастрофы. Тым горшае было яго прабуджэньне, калі ён адчуў, што па ягоным хрыбце загулялі дубінкі.
— Аў! Аў! — жаласьліва зароў ён. — Гэта ж баліць! Аў! Аў!

Ён скуголіў ад болю і падскокваў, але яны не перасталі, пакуль ён ня кінуўся наўцёкі.

Ён прыкурчыўся пад фігурай сьвятога Язэпа зь дзіцяткам непадалёк ад касьцёлу, каб адпачыць і спакойна выплакацца. Яго зноў білі, немаведама чаму малаціў яго кожны. Яму паабяцалі абед, а не далі нічога. Ён жаліўся самому сабе і ліў

сьлёзы. Аднак доўга там не насядзеўся. Ворагі знайшлі яго і зноў абкружылі. З усіх бакоў на яго пасыпаліся камяні.

Ён выскачыў, як апараны, з натапыранай поўсьцю і схаванай у руках галавой, і са скавытаньнем і парохкваньнем зьнік у полі, учарнелым ад крумкачоў, у таемнай і злавеснай пустэчы, дзе разьлеглася армія неўтаймоўных і невядомых сілаў.

[image]

Дзень дзявяты

ПЛЯТКАРКІ

Каля пляцу, на рагу Млынавай вуліцы, перад домам пекара Гільмара сустрэліся бабка Фаўстлева з бабкай Дрылькай, маці рымара Дрыля. Фаўстлева несла кашолку з закупамі да дому сваёй замужняй дачкі, Панушакавай, а Дрылька валакла поўны кош. Чаго яна там не напакавала, мой Божа! Калі дзьве старыя пачынаюць гамонку, заўсёды добра зробяць, калі найперш адставяць свае ношы, таму што такая размова толькі зрэдку бывае кароткая. Дык во, Фаўстлева паставіла сваю кашолку побач з Дрыльчыным кашом. Трэба тут згадаць, што Дрылька была глухаватая; на шчасьце, моўны орган бабкі Фаўстлевай быў больш чым выдатны.

У іншых абставінах абедзьве спадарыні, якія ня бачыліся цэлы тыдзень, пачалі б размову ад сем'яў сваіх дзяцей. Але час быў гэтак багаты на падзеі, што яны парушылі стары, заведзены парадак.
— Якая злыбедзь!
— Ага.
— Госпад Бог з намі!
— Зноў нешта?
— Не, нічога, чаго б вы ня ведалі.
— Вы думаеце пра Горалка?
— Каторага Горалка, старога ці маладога?
— Ды маладога, да якога, кажуць, вярнулася нябожчыца жонка, і ўжо будзе другі дзень, як яны жывуць пад адным дахам.
— Во, што робіцца! А пра доктараву дачку вы чулі — тую, што

прапала?
— Што прапала?
— Не, што ўчора паказалася.
— А-я-яй — а дзе?
— На Кухэльскай грэблі, ля самых хатаў. Каменячос Мацейка яе бачыў.
— Яна прыйшла з тым сваім?
— Каб жа! Адна. Была зусім голая.
— Не кажэце, у такую халадэчу!
— Якую халадэчу? Такім, што сьпяць з чортам, ніколі не халодна.
— Яна, можа, плакала? Хацела вярнуцца дадому?
— А дзе там, не. Насьміхалася і глумілася. Ківала каменячосу. Але ён яе баяўся. Пайшоў і сказаў пра гэта доктару. А сёньня з самай раніцы ў яго сядзяць мужчыны.
— Лавіць яе?
— Ды што вы?! Доктар ужо і бачыць яе ня хоча. Гэта маладыя. Чакаюць, што яна зноў пакажацца. Яны заплацілі каменячосу.
— Цьфу! Во моладзь!
— Ну. Як той Чэрмак.
— Каторы Чэрмак? Карчмар са «Збану»?
— Не. Шчовічкаў зяць. Пачаў піць. Кажа, што будзе канец сьвету і што ўжо няварта ашчаджаць. Лепш добра пажыць. Кінуў жонку адну і падлабуніўся да той тоўстай дзеўкі ад мясьніка Копала.
— А што на гэта мясьнік?
— Нічога. Яму ўсё роўна. А пра маладую жонку бляхара Шміда, пра тую, што з крывым ротам, вы чулі? Яна мелася гэтымі днямі нарадзіць, павітуха сядзіць там ужо ад пятніцы, але дагэтуль нічога. Мусіць, яно таксама спынілася.
— Ды ўжо ж, ніхто не нараджаецца, ніхто не памірае.
— А вы ня ведаеце, што зь пекаравай Ганкай? Кажуць, што ад таго чорта ў яе на твары застаўся паскудны лішай.
— Казалі, што яна нават зьлегла. Шаўцова дачка таксама зьлегла, бацька яе адлупцаваў дзягаю.
— А што дэкан, далей дурэе?
— Касьцельны казаў, што ён ужо паразумнеў. Цяпер толькі піша і піша. Ад раніцы да вечара, а часам і цэлую ноч. Пэўна, мазоліцца зь нейкімі новымі доказамі Божай існасьці.
— Стараецца, бедачына. А зноў жа Білэкава…

— Што зь ёю?
— Напякла пірагоў, наварыла бак кавы і зачынілася наглуха ў хаце. Не выходзіць і ня хоча ні з кім гаварыць, пакуль усё гэтае насланьнё ня скончыцца. Ну, ці не здурнелі некаторыя людзі?
— Але ж, але ж. А вы ня чулі, зь неба не прыйшлі новыя зьвесткі? Час ужо, каб людзі даведаліся, што будзе далей. Так гэта ня можа трываць.
— Вядома, што ня можа. Ага, во што я яшчэ хацела сказаць, толькі што я гаварыла са старым Гольцам. У ягонай студні няма ўжо ні кроплі вады.
— Божа! А што, калі ўсе студні перасохнуць?!
— Жах! Адзін жах! Што нас яшчэ чакае?
— Мне неяк здубянелі ногі, — раптам паскардзілася бабка Фаўстлева. — Ці гэта ня знак, што ўжо час дахаты?
— Дзіўна — мне таксама здубянелі, — сказала Дрылька. Яна крыху агледзелася вакол сябе і заўважыла чорнага ката, які сядзеў на пекаравай лаўцы ля хаты. Была гэта жывёліна як мае быць з жоўтымі вачыма, вялізнымі, як дзьве галушкі сыру. — Вы толькі гляньце на гэтую пачварыну, — разгневалася бабка, — як яна напорыста на нас глядзіць. Чый гэты кот?
— Я ня ведаю, — задумліва адказала Фаўстлева, — я ніколі яго ня бачыла. Найхутчэй, валачашчы. Але цяпер я ўжо сапраўды пайду. — Яна хацела падысьці, каб разьвітацца зь сяброўкай, аднак сталася бяда — не дала рады! — Што гэта такое? — прамармытала яна. — Гэткай нематы ў нагах, колькі жыву, ня мела. Ды я ўвогуле не магу паварушыцца! Дрылька, — пакорліва папрасіла яна пасьля кароткага маўчаньня, — ці вы маглі б падвесьці мяне да вунь той лавачкі, мне трэба адпачыць, я слаба сябе адчуваю.
— Ах, божачкі, Фаўстлева, — перапалохана залямантавала Дрылька, — я вас ахвотна туды падвяла б, але ў мяне самой ногі як гіры. Гэта зрабіў той кот! — выкрыкнула яна ў прыступе раптоўнай азоранасьці. — Я ад самюсенькага пачатку думала, што гэта не такі сабе звычайны кот!

Фаўстлева ахвотна і выдатна дапамагла б сваёй сяброўцы ў бедаваньні, калі б начыста не здурнела ад страху. Ёй на доўгую хвіліну заняло мову. Дрылька зрабілася трохі меншай, чымся была раней! Так, так яно фактычна было, Дрылька зьнікала, яе было штораз менш, яна зьмяншалася! Што гэта магло значыць?

«Зрэшты, — шапнула ёй ейная зламыснасьць, — якая табе справа, што гэтая глухая калода крыху паменшае?» Мова ёй вярнулася, але яна нічога не сказала. Праз хвіліну будзе, мабыць, яшчэ цікавей. Найахвотней яна падышла б да таго шэльмы ката і пагладзіла яго.

На жаль, Дрылька маўчала дакладна з такіх самых прычынаў. Тым часам як Фаўстлева сачыла за зьмяншэньнем свае сяброўкі, Дрылька глядзела з насалодай, як зьнікае Фаўстлева.

«На Хрыстовы пакуты, — падумала Дрылька, і на душы ў яе пацяплела, — праз хвіліну зь яе, бедачынкі, застанецца толькі дробка!»

Назіраючы за сваёй сяброўкай, яна на момант кінула позірк на свой кош. О, людкове на сьвеце! Што гэта? Кош стаяў на сваім месцы, але які ён быў агромністы! Быццам вежа! А што казаць пра пекараў дом! Зрок не сягаў нават да даху! А кот! І толькі тут яна зразумела: ня толькі Фаўстлева, але і яна расьце ў зямлю!
— Фаўстлева, Фаўстлева, — запіскала непрыкметная асобінка, ростам усяго некалькі сантымэтраў, ледзь чутным галаском, — з намі нешта робіцца!

Бедная Фаўстлева ўжо не змагла ёй адказаць, яна не была ўжо Фаўстлевай, але чымсьці непараўнальна горшым і брыдотным. І Дрылька не была ўжо Дрылькай. На ходніку перад Гільмаравым домам сядзелі адна насупраць адной і перапалохана варушылі вусікамі дзьве шэрыя мышкі з голымі хвосьцікамі, у бляску гіпнатычнага позірку ўкормленага чорнага ката.

Паволі, самавіта, нашмат больш самавіта, чымсьці славуты кот у ботах, чорны чараўнік зьлез з лаўкі, шырока разявіў сваю пашчу з вострымі зубамі і адным хапам каўтнуў абодва няшчасныя стварэньні.

І быў бы гэта канец абедзьвюх старых гаварух, калі б ня тая суцяшальная акалічнасьць, што ў нашым мястэчку Альшыне, прыгнечаным незразумелым праклёнам, ніхто ня мог памерці. Значыць, сталася так, што абедзьве бабкі яшчэ таго самага

вечару зноў нарадзіліся зь дзьвюх аднолькавых купак, якімі кот-забойца справядліва надзяліў пякарню і склеп, перш чым бязь сьледу зьнікнуць са старонак гэтай гісторыі.

Фаўстлева няўцямна праціра́ла вочы, з крахтаньнем падымаючыся з падлогі каля самай печы, пад позіркам зьдзіўленага пекара.

Дрылька доўга не магла даўмецца, дзень гэта ці ноч, заціснутая двума мяхамі бульбы, якія перакрывалі ёй дарогу на волю.

Няма, відаць, патрэбы падкрэсьліваць, што абедзьве спадарыні згодна вырашылі назаўсёды змаўчаць гэты самы незвычайны лухтаплёт з усіх, у якіх ім калі-колечы давялося ўдзельнічаць. Дзіва, якое завяршылася такімі нізкімі пераўвасабленьнямі, не падалося ім вартым публічнага пашырэньня. Але канец прыгоды яны сьмела маглі лічыць шчасьлівым для сябе: знайшлі кашолку і кош дакладна там, дзе іх паставілі. За гэта яны маглі быць удзячныя толькі дзікаватаму часу, у якім усё гэта здарылася. Альшынскія злодзеі былі настолькі выбітыя са свае каляіны апошнімі падзеямі, што і красьці ім зусім не хацелася.

[image]

Дзень дзясяты

МУДРАСЬЦЬ ПРАФЭСАРА МАДЛА

Дзевяць дзён славуты навуковец прафэсар Мадл сядзеў, зачынены ў сваім працоўным кабінэце. Ранютка дзясятага дня ён выйшаў і роўным крокам пайшоў на пляц, падобны са сваімі сьсівелымі валасамі і велічнай барадою на нябожчыка Бога. Ён павярнуў у Касьцельную вуліцу і зьнік у друкарні братоў Фрундаў. А ўжо перад адзінаццатай Фрычаў хлапец ляпіў на ўсіх рагах аб’явы з тоўстымі чырвонымі літарамі:

Ужо сёньня а другой гадзіне
па поўдні

ў залі Гарадзкой ратушы
лекцыя праф. доктара
Робэрта Артура Мадла.
Уваход задарма! Толькі добраахвотныя
ахвяраваньні на аплату пастаноўкі!
Тэма: Сучасная сытуацыя

Выступу вучонага земляка ў мястэчку нецярпліва чакалі. Было ясна, што гэты геній можа шмат што сказаць наконт апошніх незвычайных падзеяў. Ніхто не сумняваўся, што ён абавязкова нешта адкрые і прыдумае зусім новую маральнасьць для гэтага новага часу. Нарэшце. Альшынцы цяпер маглі ўжо дыхаць свабодна — справа была ў добрых руках. Пасьля абеду ратушная заля была набітая бітком.

Славуты выкладчык заняў сваё месца яшчэ да вызначанай гадзіны. Ён сядзеў на адкрытай сцэне за засланым абрусам столікам, на якім стаялі шклянка і слоік з вадой. Ён выглядаў дзіўнавата. На галаве ў яго быў начны каптур з кутасом, на нагах — пантофлі, у ягоных кашчавых пальцах мігцелі пруткі для вязаньня, зь якіх зьвісала велізарная, тоўстая панчоха. Ён увогуле ні на кога не зьвяртаў увагі. Акуляры аб'ехалі яму на самы кончык носа, а ён, гледзячы праз шкельцы, уважліва лічыў вочкі. Гоман у залі ўзрастаў па меры таго, як прыбывалі людзі. Панчоха выклікала сэнсацыю. Божанькі, што ён робіць? Ці не павінен чытаць лекцыю? Усё гэта выклікала ледзь толькі заўважную нахмаранасьць густых сівых броваў навукоўца.

Чвэрць гадзіны спазьненьня. Калі ён урэшце пачне? Раптам ён голасна закашляў і разгледзеўся па слухачах сваімі прымружанымі шэрымі вачыма.
— Цыц! Цыц! — напамінальна зацыкалі з усіх бакоў.

Шум аціхаў, зьнік зусім. Было ціха, як у касьцёле, толькі пруткі пастуквалі.
— Значыць — памёр! — прахрыпеў шурпаты бас навукоўца. Ён гаварыў хутчэй сам сабе, чымся публіцы: — Зразумела, усё памянялася. Усюды адны чэрці, зрэдку анёлы. Усялякія мыльныя бурбалкі, загадкі, чары, ашуканствы і гэтак далей. Хваляваньне неразумных людзей. Га! — ён павысіў голас. — Цяпер вы хацелі б пачуць, што з гэтым рабіць. Новая эпоха,

што? Бог прапаў, назаўсёды прапаў. Ну што — вам не палягчэла?

Ён пранізаў палымяным позіркам найбліжэйшых слухачоў, але адказу не чакаў.
— Зразумела, што з даўняга досьведу і даўніх ісьцінаў нічога не засталося. Але прынамсі з адным мы маемся добра! Жыцьцё не ўцякае, як уцякала раней, нікому нічога не пагражае. Было досыць часу на роздумы. Няўжо вы таксама нешта выдумалі? Ня выдумалі, ага! Але я выдумаў! Я ўжо ведаю.

Ён замоўк на хвіліну і толькі шаптаў сабе нешта пад нос. Было відаць, што ён зьбіўся зь ліку і стараецца пералічыць вочкі.
— Новае жыцьцё, ці ж ня так? Кожны ёлупень да гэтага дапяў. Але як? — ён панура хіхікнуў. — Колькі клопату мы мелі зь верай, якую ніхто не разумеў. Дурні! Гэта было заўсёды зразумела! Напрыклад, я. У што, вы думаеце, я верыў? Напрыклад, у тое, што калі мне нехта прысьніцца ўначы, днём я магу яго сустрэць. Ці яшчэ: калі нейкі дзень пачаўся няўдачай, дык няўдачы цягнуліся за мною аж да вечару. Ну так, сны, шчасьлівы або нешчасьлівы дзень, вось у што я верыў. Ці мне што-небудзь замінае верыць у гэта надалей?

У залі праляцеў ухвальны гоман — гэта было ўсім зразумела. Прафэсар зазьзяў, на хвіліну ён нават перастаў вязаць.
— Ці ж ня так? Ня нейкае бессэнсоўнае спадзяваньне на найвышэйшую дабрыню, на нябачную ўсюдыіснасьць, на няісную дасканаласьць, але тое сапраўднае, унутранае, перад чым чалавек ня можа абараніцца, нават калі б і хацеў — вось вера. Зь яе нам трэба пачаць. Калі мы маем веру, можам шукаць жыцьцёвую мэту. Чаму мы мелі б ад гэтага адмаўляцца? Правілы нам крыху паблыталіся і зьмяшаліся. Цяпер, аднак, калі мы сваю веру так спросьцілі, мэты таксама зразумелыя. Ці нехта калі-небудзь сумняваўся ў сваіх сапраўдных мэтах? Калі не, ён толькі прыкідваўся. Мы павінны вярнуцца да натуральных мэтаў, як ежа, піцьцё, сон. Я за вялікім баляваньнем не сумую, але затое спаць люблю надзвычайна. Кажу вам, — выкрыкнуў ён з запалам, — мая сёньняшняя мэта — пайсьці рана спаць. А калі буду засынаць, — дадаў ён зь лёгкай усьмешкай, — буду марыць аб наступнай

мэце — сьнеданьні. Вы ўсе зразумелі? Як жа вы маглі б не зразумець. Значыць, пяройдзем да другога пункту. Узвышаная вера. Узвышаныя мэты. А цяпер трэба было б неяк разумна арганізаваць людзкую грамаду. Калісьці гэта было важна, цяпер нікому да гэтага няма справы. Калісьці чалавек паміраў, калі ня еў. І, збольшага, ня еў, калі не працаваў. Сёньня ўжо не памрэ, сёньня ня мусіць працаваць, сёньня ўжо ня мусіць есьці, калі ня хоча. Было б неразумна рабіць нешта зь нічога. Мы можам цалкам добра перанесьці гультаёў і злачынцаў ды ўсялякіх непрыемных тыпаў сярод нас, не пакрыўдзяць нас неўраджай, паводкі, пажары. Нам нічога ня можа пашкодзіць. Арганізаваць людзкую грамаду? Стаўленьне асобы да асобы? Няхай кожны робіць, што хоча. Гэты пункт адпадае. Ідзем далей. Каханьне. Сужонства. Першае — небясьпечнае, другое — непатрэбнае. Дзеці ня лічацца. Хопіць таго, што ёсьць. Няхай людзі кахаюцца, калі ім гэта даспадобы, мяне гэта не абурае. Бацькі, якія гадуюць дачок, хай кінуць іх пільнаваць і пазбудуцца бязмэтнай строгасьці, няма ніякага сэнсу старацца дзеля чыстае фікцыі! Тое самае з мужам і жонкай. Іхная манаполія скончылася, прадукцыя спынілася. Застаюцца маралісты. Маралісты! — Ён хітаў галавой і хітра ўсьміхаўся. — Я шчыра вам раю — адкіньце маральнасьць! Кожны можа быць сапраўды задаволены. Застаецца нам яшчэ мастацтва. Колькі жыву, я ня мог у ім як сьлед разабрацца. Пра яго пісалі ў газэтах, абмяркоўвалі яго ў салёнах, людзі ставіліся да яго з павагай. Худыя, кудлатыя і не заўсёды дамытыя маладзёны чынілі зь ім усялякія чары. Яны могуць рабіць гэта і далей, калі хочуць. Толькі што ім ужо ня будзе хацецца. У мастацтва пранікла шмат элемэнтаў — як жа пра гэта кажуць? — элемэнтаў загніваньня. Я сумняюся, ці яно яшчэ каго-небудзь зацікавіць. Ствараць скульптуры, увекавечваць, калі ўсё і так вечнае? Маляваць? Час нерухомы, як застоеная вада, усё застыла. Людзі кінуць і маляваць. Кніжак таксама ўжо ніхто пісаць ня будзе. Калі чэрці перастануць пужаць, а мёртвыя зноў спакойна лягуць у магілы, ня будзе больш ніякіх падзеяў. Музыка? Ведаеце, я думаю, што мы палянуемся слухаць і музыку.

Ён змоўк і доўга сядзеў ціха, ажно людзі пачалі баяцца, што ён ужо ня вернецца да сваіх разважаньняў, што лекцыя

скончылася. Мудрыя словы вучонага былі зразумелыя ўсім, аднак нешта яшчэ заставалася недасказанае. На шчасьце, упаў адзін зь ягоных пруткоў. Дараднік Дэнк саскочыў з лаўкі і падаў яго.
— Бачыце, — з запалам працягваў прафэсар, беручы пруток у паслужлівага чалавека, — такая панчоха, — вось гэта нешта! Мы падышлі цяпер да сутнасьці ўсяго. Мы нешта мусім — ну — хто скажа, што? Ніхто ня ведае? Мы мусім нешта *ра-біць*! Так, рабіць. А я заўсёды гэта любіў. Калі я быў яшчэ малы, мама часам давала мне маток прадзіва, каб я нешта зьвязаў, ведаеце? Цяпер я гэта зноў успомніў. Дарэчы — а хто з вас гэта ўмее?

Паднялі рукі ўсе жанчыны, але не азваўся ніводны мужчына. Навуковец пахмурна глядзеў на лес узьнятых рук.
— Як вам ня сорамна, мужчыны! Як вам ня сорамна! Такога ня ўмець! Паслухайце, — мякка працягваў ён, — я быў прафэсарам, вучыў моладзь, ставіў адзнакі, вывучаў сёе-тое, цягаўся па бібліятэках, кіраваў канфэрэнцыямі — але гэта мяне ня цешыла. А вось гэта мяне цешыць. А як я пакутаваў! Ад думаньня мяне кідала ў пот. А пры гэтым я не пацею. Гэта робіцца само. Чалавек варушыцца толькі трошку. Чуеце? Дзынь-дзынь-дзынь — як зьвініць! Ці ж не прыгожа? Буда глядзеў у свой пуп. Што ён там бачыў? Яму лепш было б вязаць панчоху. Ці вы яшчэ не зразумелі, што найлепшыя думкі прыходзяць якраз тады, калі вы ні пра што ня думаеце? Седзіцё, непрысутныя духам, а ў галаве вам нешта ўзыходзіць. Пра нешта падобнае гаворыцца ў Эвангельлях. Толькі я тое крыху зьмяніў бы: «Вяжэце панчохі, а ўсё астатняе будзе вам дадзенае». Я вас не прымушаю, але гэта страшна проста. Глядзеце! — Ён памахаў панчохай, як крапідлам. — Гэта сапраўдная мудрасьць. А цяпер я выкажу вам тое, што павінна быць высновай з майго вучэньня. Увага! Як вы думаеце? Ці знойдзецца недзе нейкая нага да такой агромністай панчохі? — І ён сам сабе адказаў: — Ня знойдзецца. Мая праца ня мае ніякай мэты. Такім чынам, мы апынуліся ля самай сутнасьці чалавечай узвышанасьці.

Ён стаў гаварыць похапкам, зь відавочнай раздражнёнасьцю:
— Цяпер падвядзем вынікі: няма Бога, няма часу, няма мэты,

няма грамадзкага парадку, няма мастацтва, што тады застаецца? Застаюся я. Што я буду рабіць? Што мне падабаецца. А што мне падабаецца? Вязаць панчоху. Чаму якраз панчоху? Таму што яна зусім не патрэбная. Гэта ўсё, што я вам хацеў сказаць. Бывайце!

Ён паволі ўстаў, няўклюдна апрануў шэры плашч (усе стаілі дыханьне), абматаўся панчохай пад пахамі, узяў парасон, насадзіў карычневы капялюш на спальны каптур, асьцярожна спусьціўся са сцэны прыступкамі, накіраваўся да дзьвярэй. Пруткі і клубок ён трымаў у левай руцэ, а правай пракладваў сабе дарогу.

Каля самых дзьвярэй ён спыніўся. Ён увесь дрыжаў ад прыхаванага хваляваньня.
— Каб не забыцца — вы толькі ня думайце, што я вар'ят. Я зусім ня цьверджу, што панчоха — адзінае, што можна рабіць. Можна, напрыклад, гуляць у ножык або кідаць боб — зразумела, кожны толькі сам з сабою, каб выйгрыш перастаў быць мэтай. Можна таксама рабіць папяровыя караблікі і пускаць іх у ваду, біць лынды, ганяць сабак. Але я не хачу абмяжоўваць вашу фантазію. Хто нічога ня ўмее, хай, прынамсі, ловіць блохі!

І ён, разьятраны, выйшаў.

Усе сядзелі, ніхто не зварухнуўся. Людзі разгублена глядзелі адзін на аднаго, баяліся загаварыць, баяліся засьмяяцца. Прайшло некалькі хвілінаў, пакуль яны сталі разыходзіцца. Галовы ва ўсіх былі апушчаныя, абліччы азмрочаныя. Было відаць, што ўсе да аднаго глубока задумаліся.

[image]

Дзень адзінаццаты

АНЁЛЬСКАЕ ЗЬВЕСТАВАНЬНЕ

Ужо наступнага дня выявіліся дзівосныя наступствы прафэсаравай лекцыі: усё мястэчка пачала спаборнічаць у

гонках за бязмэтным. Некаторыя ўзялі прыклад зь вялікага прарока. Аптэкар зьняў з гарышча стары калаўротак і пачаў прасьці на ходніку перад аптэкай, хоць ня меў кудзелі. Дараднік Дэнк з вудзільнам прысеў на ўскрай фантана і лавіў у ім уяўныя стронгі. Пэнсіянэр Голец выкапаў у садку яму, агромністую непатрэбную яму, а ягоны сябра Шчовічак насіў у яе ваду са струменя, вядро за вядром, безь ніякай надзеі, што калі-небудзь яе напоўніць. Кравец Вітвар шыў адзеньне голкай бязь ніткі, а пекар Гільмар пёк у сваёй печцы булачкі з гразі. Прафэсар Мадл моўчкі шпацыраваў між сваімі вучнямі, з панчохай у руках, задаволена ўсьміхаючыся ў вусы і не перастаючы вязаць.

Пад вечар, калі агульнае вар'яцтва дасягнула вяршыні, над мястэчкам нечакана закружыў голуб. Як толькі людзі яго заўважылі, адразу ўсё кінулі і сталі ўважліва да яго прыглядацца, бо адразу было відаць, што гэта не такая сабе звычайная птушка. Голуб прызямліўся дакладна пасярэдзіне пляцу, зрабіў некалькі хісткіх крокаў на няроўным бруку, падняўся на тры прыступкі да каменных фігураў сьвятых, пралез праз шчыліну паміж імі на другі бок, а калі паказаўся зноўку, гэта быў ужо ня голуб, а гуска. Яна загагатала, замахала крыламі, паднялася на абмуроўку фантана і там прысела. Але калі яна там села, гэта была ўжо ня гуска, а анёл у панцыры. Гэта была анёл-жанчына зь мігатлівымі нагруднікамі на выпучаных грудзях, з павязкай, аздобленай каштоўнымі камянямі, на русых валасах. Ейныя беласьнежныя крылы трымцелі ад хваляваньня.
— Жыхары зямлі, — прамовіла анёл безь ніякага ўступу сваім крышталёвым голасам і какетліва падняла голае плячо, аздобленае залатой зьмейкай над локцем, — мінула адзінаццаць дзён ад Божай сьмерці. Сьвятыя астанкі былі спаленыя ў найбольшым зь ягоных сонцаў, а попел рассыпаны, каб даць плён палям у сусьвеце. Роспач, якая нас ахапіла ў тую сумную ноч, зьмянілася ў развагу. Я ня буду вам тлумачыць, як мы там уверсе вырашылі свае праблемы, вы самі можаце назіраць за вынікамі: сонца сьвеціць, як і сьвяціла, дзень наступае пасьля ночы, як і мае быць. Мы ня толькі што не рассварыліся, але яшчэ ўзброілі войска, якое нецярпліва чакае на змаганьне. Цяпер, калі мы моцныя, мы павінны ўзяцца за

нашае найцяжэйшае заданьне — вызваліць зямлю ад нячыстай сілы. Паўторыцца вялікі бой, падобны да таго, які быў на пачатку. Мы ўдарым на д'ябла і загонім яго назад туды, дзе ягонае месца, у пякельную цемру. Вынік змаганьня не падлягае нават найменшаму сумневу. Пасьля мы прыступім да аднаўленьня адвечнага парадку ў гэтым сьвеце.

Адказам ёй быў ухвальны гоман. Анёл замоўкла на хвіліну, каб перавесьці дых. Разглядала слухачоў і лавіла іхныя зацікаўленыя позіркі. Анёл спадабалася асабліва мужчынам. Яны як знаўцы пазіралі на ейныя прыгожыя плечы, пад лёгкай тунікай бачылі павабныя лыткі. Анёла гэта ўвогуле не бянтэжыла, наадварот, калі яна зразумела прычыну захапленьня сваёй асобай, ветліва ўсьміхнулася касіру Панку, які пранізваў яе позіркам, поўным рэлігійнага жару, і апусьціла сваю гожа-кшталтную нагу яшчэ ніжэй, так што з пад тунікі паказалася круглае калена. Яна глыбока ўцягнула паветра, ажно натапырыліся ейныя залатыя нагруднікі.
— Сябры, — працягвала яна, — маё небясьпечнае падарожжа да вас не было толькі рамантычнай прыгодай, толькі неўтаймоўнай прагай сустрэчы зь людзьмі. Было б наіўна ляцець на зямлю толькі дзеля таго, каб паінфармаваць людзей. Пасланьне, якое я вам прыношу, мае яшчэ і іншы сэнс. Паслухайце мяне! Мы ў небе цьвёрда разьлічваем таксама на вашую дапамогу!

Згода на гэты раз не была ўжо такая спантанная. Некаторыя нават спалохаліся гэтай нечаканай зьвесткі і памкнуліся незаўважна зьнікнуць. Так, напрыклад, адышоўся прадавец сьвечак Лінкэ, а сьледам за ім кравец Вітвар і дырэктар школы Крус. Анёл прыкінулася, быццам не заўважыла ўцёкаў гэтых баязьліўцаў, ды сваімі позіркамі і ўсьмешкамі ўсё больш старалася прыдабрыцца Панку, млынару і аптэкару, у якіх вычула адданасьць і ахвоту да ахвяраваньня.
— Я не дамагаюся ад вас, каб вы разам з намі ваявалі, — тлумачыла яна, забаўляючыся ланцужком з рубінавай сьлязой, якая запала ў лагчынку паміж грудзьмі. — Вы занадта безабаронныя ў змаганьні супраць звышнатуральных сілаў. Мы толькі хочам, каб вы выпудзілі д'яблаў з палёў. Бітва на зямлі для нас была б невыгодная, мы амаль усе летуны, а не

пешаходы, а да таго мы вельмі неахвотна аддаляемся ад нябёсаў. Мы ня хочам трапіць у нейкую засаду або страціць сувязь са сваёй рэзэрвай. Вашае заданьне простае. Вазьмеце дубінкі, стрэльбы, бубны, ляскоткі, усё, што гукае і грукае, і выйдзіце за мястэчка. Вам ня трэба будзе бегаць па ўзараным полі і разганяць усю тую процьму. Як толькі ўзьляціць першая большая чарада, астатнія падумаюць, што так трэба, і таксама ўзьляцяць, і ўсё тое чорнае чартоўства пакіне зямлю. Далейшы клопат застанецца ўжо нам. Вы мяне зразумелі?
— Зразумелі, — адказаў за ўсіх млынар Тайхман. — А калі мы павінны пачаць?
— Заўтра раніцай, як толькі разьвіднее. Мы можам на вас разьлічваць?

Тыя, хто стаяў найбліжэй, пачалі навыперадкі клясьціся і прысягацца.
— Добра, — сказала анёл са спакусьлівай усьмешкай, — само сабой зразумела, што наймужнейшыя і найбольш ахвярныя будуць узнагароджаныя. А гэтай узнагароды чалавечаму розуму не ахапіць, бо вока яе ніколі ня бачыла, вуха пра яе ніколі ня чула.

Анёл абаперлася аб Панкава плячо (маладзён ад радасьці ўвесь пачырванеў, як звараны рак) і саскочыла з фантана. Некалькі вісусаў дурнавата захіхікалі. На анёльскай туніцы ззаду застаўся здрадлівы сьлед каменнага пылу ў форме двух роўных эліпсаў. Анёл іх не заўважыла. Яна ўзяла меч і шчыт у правую руку і ўзмахнула крыламі, зьбіраючыся да адлёту.
— Я хацела яшчэ дадаць, — сказала яна, адначасова папраўляючы свабоднай рукой сваю анёльскую прычоску, — што вы можаце быць зусім спакойныя, вы ня будзеце атакаваць чарцей самі, з вамі пойдуць мёртвыя. Я хвіліну таму зь імі гаварыла. Цяжка было іх намовіць, але ўрэшце яны паабяцалі, што зранку таксама пойдуць выпуджваць чарцей дзеля нашай сьвятой справы.

Сказаўшы гэта, яна ветліва пакланілася, паслала некалькі паветраных пацалункаў, зашчаміла туніку каленямі (каб захаваць дэкорум перад моладзьдзю) і ўзьляцела. Яшчэ раз памахала ім на разьвітаньне з вышыні, потым зьмянілася ў

залатую мушку і зьнікла ў прамянях вячэрняга сонца.

Зараз пасьля адлёту анёла на пляцы пачалася сварка паміж міралюбамі і прыхільнікамі вайны, паміж рупліўцамі, якія ўзялі бок нябеснага пасла, і памяркоўнымі, якія хацелі, каб усё засталося так, як было дагэтуль. Да гэтых апошніх далучыліся амаль усе жанчыны, раздражнёныя нясьціплымі анёльскімі паводзінамі. Баявітыя папракалі міралюбаў за нястачу ідэалізму, памяркоўныя бараніліся, кажучы, што падчас аблогі ў мястэчку было нашмат лепш, чымсьці калі-небудзь раней. Тут прыйшлася б вельмі дарэчы мудрасьць прафэсара Мадла, але навукоўца даўно ўжо не было. Ён, абураны, пайшоў прэч, як толькі анёл пачала прамову.
— З тымі на полі, — сьцьвердзіў Білэк, які далучыўся да памяркоўных, — мы прынамсі былі ўпэўненыя ў жыцьці. Анёлы нам толькі вернуць сьмерць і будуць яшчэ талкаваць, што яна для нас — багаславенства.
— Вы ўжо забылі, як цудоўна гралі чэрці ў касьцёле? — падтрымаў яго дворнік. Не таму, каб быў вельмі музыкальны, але таму, што ён крыху баяўся новага сусьветнага парадку паводле старых рэцэптаў.

Барацьбіты прыгадалі страшэнную атаку мёртвых, уцёкі доктаравай дачкі, агідныя паводзіны разбэшчанага чорта. Нічога ня зробіш, яны былі больш красамоўныя, умелі лепш пераконваць; калі памяркоўныя хацелі настаяць на сваім, ім трэба было прывесьці падмогу. Дзеля гэтага яны павывалаклі з дамоў усіх баязьліўцаў, якія паўцякалі першыя.

Прадавец сьвечак доўга муляўся. Ён ня біў сваіх дзяцей, ніколі не пакрыўдзіў нават куранятка, яму будзе цяжка лупцаваць бясшкодных чорных птахаў.
— Чорт — таксама жывое стварэньне, — гаварыў ён дакорлівым голасам, — і яно бязмоўнае, нельга яго крыўдзіць. А гэты анёл быў нейкай прайдзісьветкай.
— Бязмоўныя, паслухайце толькі, — разьятрылася Гэбэртка. — Бачыце, спадар Лінкэ ўжо ахвотны паставіць сьвечку чарцям.

Дырэктар Крус прытрымліваўся думкі, што ўсё гэта лухта. Мільён чарцей не спалохаюцца адной стрэльбы і некалькіх велікодных ляскотак. Калі б ён, пэдагог, мог нешта параіць,

дык варта было б прыгадаць адну старую і разумную прыказку: калі не сьвярбіць, ня чухайся.

Справа ішла да неблагой заварухі, баявітыя і памяркоўныя былі ўжо гатовыя кінуцца адны на адных, але тут на сцэне зьявіўся дэкан Вэліх, якога вэрхалам вырвалі з набожных роздумаў. Найперш ён папрасіў растлумачыць, аб чым ідзецца. Калі яму расказалі, ён упаў на калені і закрычаў магутным голасам:
— Асанна! Асанна! Асанна! — гэта загучала вельмі патасна і незвычайна.

Потым ён жвава падхапіўся і пачаў заклікаць усіх да згоды. Ня можа быць ніякіх сумневаў у праўдзівасьці анёльскага пасланьня. Само сабой зразумела, заўтра нам трэба ісьці на чарцей. Хто павядзе паход? Ну, хто ж іншы як ня ён сам, дэкан Вэліх? Дык вось, ужо заўтра! Ён увесь памаладзеў, ягоныя вочы заблішчалі. Урэшце прыйшлі капцы гэтаму чартоўскаму спадарству на зямлі. Ці Лінкэ ня сорамна выстаўляць напаказ сваю баязьлівасьць? Ці яму прынамсі вядома, што ўсё ягонае рамяство залежыць ад хрысьціянскага памінаньня памерлых і ад вернікаў? Тым часам як прадавец сьвечак стаяў, сумна зьвесіўшы галаву, дэкан настойліва ўгаворваў памяркоўных і вярэдзіў іхнае сумленьне пералікам нябесных раскошаў. Гарачых сунімаў падхвальваньнем і хіліў да згоды. Калі можна так выказацца, гэта была вельмі прыгожая казань.

Тонкі, як валасок, месяц, які выплыў над гарбатымі дахамі, убачыў мястэчка Альшыну сяк-так сабраным у лягер аднадумцаў. Куды б ні заглянула ягонае насьмешлівае сьвятло, людзі ўсяляк набіраліся сьмеласьці і рыхтаваліся да вялікіх падзеяў. У касьцёле да позьняй ночы грымеў арган пад умелай рукою дырэктара Круса, які такім чынам каяўся за сваю папярэднюю ненадзейнасьць, а вернікі сьлёзна маліліся разам з дэканам Вэліхам, які зь неверагодным спрытам перарабіў некалькі малітваў дзеля гэтай незвычайнай акалічнасьці. На пляцы і на вуліцах усё яшчэ гаманілі. Найбольш гаварылі аптэкар, дараднік і гадзіншчык. У карчме «Пад збаном» Білэк старшыняваў у гуртку выпівохаў, у якім аднавокі дзіка бліскаў сваім адзіным вокам, а паштовы вазьніца сьпяваў сэнтымэнтальныя песьні.

[image]

Дзень дванаццаты

БІТВА

Пры сьвятле слабенькага ранішняга сонца, якое павісла на даляглядзе над Галчынай гарою, на пляцы каля фантана сабраліся ўзброеныя да зубоў альшынскія добраахвотнікі. Шмат каго не хапала, нават з тых, якія яшчэ ўчора дадавалі сьмеласьці іншым, але наагул гэта было войска шматлюднае і знакамітае. Былі тут кампаньнікі са «Збана», суседзі з Млынавай вуліцы і спадары з пляцу. Некаторыя трымалі ў руках матыкі, іншыя толькі дубінкі, хто меў, той абуў боты з халяўкамі ці хоць нацягнуў гамашы. Безумоўна, найлепш за ўсіх выглядаў іхны важак, дэкан Вэліх, які быў у сваёй сьвяточнай, вышыванай золатам рызе. Ён адзін быў без аніякай зброі, затое ў правай руцэ трымаў крапідла і махаў ім, як булавешкай. Хлопец Фрычавых, у апратцы прыслужніка, плёўся за ім са збанам сьвятой вады.

Пасьля кароткай нарады яны вырашылі, што пойдуць каля могілак. Такім чынам яны створаць нагоду далучыцца мёртвым. Пэрспэктыва хаўрусу зь нябожчыкамі не была занадта прывабная, але альшынцы выбралі меншае зло. Больш за агіду да мёртвых душыў іх страх перад д'яблам, а да таго ж — лепш і невялікая дапамога, чым увогуле ніякая. Глянуўшы на гэта зь іншага боку, паколькі зь нябожчыкамі нічога ня можа стацца, іх можна будзе выкарыстаць у самым небясьпечным месцы, напрыклад, на перадавой.

Але каля самых могілак змагароў чакала вялікае расчараваньне. Брама была завязаная ланцугом і дадаткова заблякаваная ломам. Мёртвыя — прынамсі тыя, якіх было відаць — млява ляжалі на магілах або злосна вышчараліся з разгалістых дрэваў і з могілкавага муру. Дэкан тройчы загрукаў крапідлам у клямку і заклікаў нябожчыкаў, каб неадкладна зьнялі ланцуг і лом. Адзіным адказам быў пусты сьмех. Пэнсіянэр Голец нясьмела запрапанаваў, каб паклікаць цукерніка Паржызка, які раней вёў мёртвых на мястэчка.

— Спадар Паржызк! Гэй! Нябожчык цукернік Паржызк, калі ласка да брамы! — п'янюга Білэк, нарэзаўшыся ядлаўцоўкі, гуляў у перамоўніка.

Цукернік сапраўды зьявіўся зараз пасьля першага закліку. Ён, пэўна, толькі й чакаў, каб выступіць перад былой публікай у гэтай малой ролі Карыяляна. Ён па-акторску кашлянуў і абцягнуў крысьсё свайго элегантнага імпэратарскага плашча. Маўляў, што за гонар для мёртвых, калі да іх прыходзіць амаль цэлае мястэчка з правялебным на чале! Няўжо дарагія сябры і землякі маюць нейкае пажаданьне або іншую асаблівую мэту, напрыклад, прыйшлі запрасіць нябожчыкаў наведаць гуртам астатніх жалобнікаў?
— Няма часу на дурнаватыя жарты, — строга адказаў яму дэкан. — Згодна з мабілізацыйным загадам ваеннага анёла, вы павінны былі падрыхтавацца да паходу супраць д'ябла, а замест таго могілкі зачыненыя наглуха, быццам крэпасьць. Мёртвыя паводзяць сябе так, нібыта гэта іх увогуле не датычыць. Ці вы маглі б мне гэта растлумачыць?
— Ага, растлумачыць, паход супраць д'ябла, ага, — насьмешліва кланяўся цукернік, — адчыніць браму, сабрацца і ісьці. Але ж, так яно й мела быць. Толькі ці нехта яшчэ памятае, — выкрыкнуў ён з патасам, — як яно было, калі мы да вас прыехалі зь як найлепшымі намерамі? Што зрабілі спадары мяшчане ад старасты да самага апошняга парабка? Зачыніліся ў сваіх дамах, запаўзьлі ў свае норы. Ну, але цяпер надышла гадзіна адплаты. Мы робім толькі тое, што вы зрабілі нам. Дзеля выпуджваньня чарцей мы вам прыдаліся б, ясная справа, але мы й ня думаем гэтага рабіць. Не адчынім. Ня пойдзем. Самі выганяйце чарцей.

Дэкан пачырванеў, быццам індык.
— Дык добра. А што анёл? Ягоныя загады? Вы іх ня слухаеце?
— Анёл — а што нам анёл? — тут цукернік вельмі груба выказаўся аб прыгожым русым анёлу, выклікаючы сярод нябожчыкаў выбух весялосьці.

Млынар Тайхман пачціва тузануў дэкана за рукаў рызы. Навошта непатрэбна хвалявацца? Мабыць, найразумней было пайсьці далей. Мёртвыя і так не адчыняць.

Ах, гэтыя мёртвыя! Ужо час, каб яны зноў сталі сапраўды мёртвымі. Іхная здрада была сама менш абуральная. Далей альшынцы пайшлі ўжо не з такім энтузіязмам. Іхны настрой адчувальна пагоршыўся. Гэта вельмі прыкра, калі чаканая дапамога не надыдзе. Каб толькі яны далі рады адужаць чарцей! Баязьлівейшыя спалохана азіраліся назад. Чаго зьдзіўляцца? Нічога прыемнага мець за плячыма варожую крэпасьць, а ў ёй гэтую агідную здрадлівую чэлядзь, якая, чаго добрага, можа далучыцца да пякельнікаў.

Поле пачыналася зараз за могілкамі. Цяпер яны маглі ўбачыць на ўласныя вочы, што Бартань гаварыў чыстую праўду. Поле было сапраўды такое, якім яны яго ўяўлялі ў зацішшы сваіх дамоў і вуліцаў — пакрытае чорнымі панурымі птушкамі.
— Госпад Бог з намі, а ўсё злое прэч! — сказала Гэбэртка і перахрысьцілася.

Млынар і дараднік выстралілі са стрэльбаў, хлопцы заляскаталі ляскоткамі, жанчыны паднялі пякельны лямант, а найадважнейшыя кінуліся дапераду з дубінкамі і матыкамі. Паліцыянт Мушэк мужна бубніў.

Ніхто не разьлічваў, што перамога будзе такая лёгкая! Споўнілася ўсё тое, што прадказвала анёл, хоць яны такога ніяк не чакалі. Агромністая чарада захвалявала, затрапятала крыламі, узьнялася ў паветра. З усіх бакоў раздалося карканьне. З аглушальным лопатам крылаў паднялося ўсё чорнае покрыва зямлі, куды ні кінуць вокам. Выгляд гэтай процьмы, якая віравала ў паветры, выклікаў вельмі гнятлівы настрой.
— Ура! Ура! — роў Білэк, быццам яму выцягвалі зуб, і пырскаў навокал самагонкай так шчодра, як дэкан сьвятой вадой.

Толькі што ўжо не было з кім змагацца. Шавец Гоўска, які быў начальнікам пажарнікаў, на знак дэкана затрубіў адбой. Альшынцы вярталіся моўчкі, самкнутым шыхтом, ніхто не жартаваў. Грамады крумкачоў кружлялі ўсё вышэй і вышей, ажно зьліліся ў адну агромністую чорную хмару, якая закрыла сонца. Ваколіцу зацягнула густая шэрань.

Калі яны праходзілі паўз могілкі, мёртвыя панура глядзелі на

іх праз краты брамы. Яны не надалі нябожчыкам ніякай увагі.

Пераможцы затрымаліся толькі на пляцы. Некаторыя селі на прыступках помніка, іншыя абаперліся на абмуроўку фантана, нікому не хацелася ісьці дадому. Яны ведалі, што найважнейшае яшчэ наперадзе.

Яны доўга-доўга ўзіраліся ў неба, але нічога там ня ўбачылі. З хмары далятаў грукат, падобны на градабой. Нераўнамерныя пошугі ветру выдзімалі жаночыя спадніцы, якія й без таго лапаталі ад узмахаў тысячаў крылаў! Адтуль, зьверху, цягнула холадам — але чаму менавіта холадам? Відаць, гэта быў пякельны холад. Урэшце на чорным тле далягляду, высока, неверагодна высока, паявілася белае воблачка, яно расплывалася, разрасталася, калыхалася на ветры, быццам яхта без стырна. Гэта былі яны — анёлы! Натоўп прывітаў іх трапяткой узрушанасьцю. Потым белае воблака пашырылася на ўвесь далягляд, а што было раней чорным, цяпер пашарэла.

Людзі стаілі дыханьне. Які спэктакль адыграецца ў фантастычных глыбінях нябёсаў? Ліне крывавы дождж? Прастора напоўніцца лямантам параненых і паміраючых? Усе перажывалі аднолькава, аптэкар і дырэктар, дэкан і млынар, багамолка, паліцыянт і дворнік. Сярод іх не было толькі прафэсара. Ён быў вышэй за гэтыя падзеі, чэрпаючы насалоду з дзылінканьня сваіх пруткоў для вязаньня.

Раптам пачуўся шэпт, які праляцеў праз натоўп, як восеньскі вецер празь бярэзьнік. У вышыні зьявілася дробная кропка, якая пачала паволі апускацца на зямлю. Калыхалася, кружляла, пагойдвалася, потым, як быццам надумаўшыся, пачала ціха падаць, проста на галовы сабраных. Яны трохі расступіліся і дазволілі ёй упасьці на зямлю.
— Што гэта?

Найбліжэйшыя нахіліліся. Што гэта — далікатнае прывітаньне з вышыні, дзе лютуе незразумелая бітва?
— Прывеяны пух?
— Сьняжынка?
— Не, гэта пёрка з анёльскага крыла! — пранеслася з вуснаў да вуснаў. Пакуль зьвестка абляцела натоўп, падала ўжо другое,

трэцяе, дзясятае пёрка. У гэты момант нехта загаласіў, усё роўна што завыў.
— Што дзеецца?
— Гэбэртка плача.
— Чаго яна плача? — перапалоханыя твары глядзелі адно на аднаго.
— Як жа ня плакаць, калі анёлы прайграюць?

Натоўп захваляваў.
— Чаму прайграюць?
— А таму. Ці вы бачылі, каб дзе ўпаў таксама чорны пух? Не, ня бачылі. Значыць, белых шкуматаюць, чорныя перамагаюць. Бяда!

Узнялася навальніца ляманту. Дэкан магутным голасам заклікаў народ да агульнай малітвы. Галовы пахіліліся. Анёльскае пер'е падала шторaз гусьцей, чапляючыся за сукні і капелюшы, слалася на зямлю.

Спачатку выглядала так, быццам вецер разносіць дзьмухаўцы.

Потым стала падаць большымі камякамі, як тады, калі гаспадыня вытрасае пярыну.

Не, гэта было невыносна! Вернікі пераставалі гаварыць марныя малітвы. Першым пакінуў натоўп прадавец сьвечак Лінкэ. Ён бяз слова абтрапаў адзеньне ад пер'я, абабіў боты на парозе сваёй крамы і ўвайшоў усярэдзіну. Двойчы павярнуў за сабой ключ.

Зноў баязьлівасьць? Ды не, гэта было найразумнейшае, што можна было зрабіць. Калі адбываецца нешта так страшнае, найлепш пра гэта ня ведаць. Ляскалі дзьверы, людзі хаваліся, пляц пусьцеў.

Да адзінаццатай гадзіны на сваім месцы стрывалі толькі дэкан, Гэбэртка, купец Шчовічак, аптэкар, млынар і Голец.

Апоўдні на пляцы не было ўжо нікога.

Белы пласт пакрываў зямлю і рос са страхотнай хуткасьцю.

Ніводзін сьлед не крануў пуховай роўнядзі. Ніводнай чорнай пылінкі на ўсёй белай раўніне! Насуперак усяму здароваму сэнсу, насуперак усёй веры і надзеі, бітва нябёсаў зь пеклам была прайграная. Аптэкар у зацішшы сваей прасьмярдзелай лябараторыі мроіў аб няшчасным анёльскім пасланцы, і ягонае сэрца білася ад шалёнага хваляваньня.

А чацьвертай гадзіне белыя сумёты сягалі ўжо вокнаў. Потым дзіўная замець яшчэ пагусьцела. Апошняя пасмачка шэрані зацягнулася цемрай. Застаўся толькі ўсеагульны, павольны апад зь небасхілу. Ва ўсіх дамах сьвяцілася.

А пятай гадзіне адно за адным пачалі гаснуць вокны на Млынавай вуліцы і за струменем, дзе дамкі наагул былі нізкія. Першае пагасла сьвятло ў краме Шчовічка, апошняе — у пэнсіянэра Гольца.

Беласьнежныя навеіны расьлі, у іх зьнікалі сьцены, усё роўна што раставалі. Двухпавярховыя дамы выглядалі цяпер як аднапавярховыя. На месцы аднапавярховых дамкоў парабіліся ледзь заўважныя ўзгорачкі, падобныя да магілаў.

А сёмай можна яшчэ было распазнаць абрысы дахаў там, дзе раней быў местачковы пляц. Быццам каплічка між магілаў, тырчаў сярод белага пуху сьпічак ратушавай вежы, дзе ўсё яшчэ мігцела апошняе сьвятло, якое пільнаваў паліцыянт Мушэк. Каля дзясятай ад дахаў не засталося і ўспаміну, а паліцыянт, адзіная жывая істота ў мястэчку, апошнімі прыступкамі падняўся ажно да самага мэханізму ратушавага гадзіньніка, які ішоў нягледзячы ні на што.

А палове адзінаццатай гадзіньнік спыніўся, таму што вялізная стрэлка ўжо ня здолела прабіцца празь белую навеіну, хоць яшчэ гарэла сьвятло паміж малаточкамі, пад самім дахам, завершаным іржавым пеўнікам. З гэтага моманту час ужо перастаў адмервацца.

Магло быць каля поўначы, калі і гэтае апошняе сьвятло пагасла.

Раніцай трынаццатага дня не было ўжо мястэчка Альшыны.

Небасхіл быў чысты, бясколерны, сьнег зь яго ўжо ня падаў, але й не было ў ім ніводнай шчыліны, празь якую прасьвечваў бы блакіт. Куды ні глянуць, цягнулася мёртвая раўніна зь невялічкімі горбікамі, быццам караванамі, засыпанымі пяском у пустыні.

І на гэтай роўнядзі, белай як папера, прагнай як незапісаная старонка, я, як утомлены вершнік, стаўлю апошнімі ўзмахамі свае пікі, апошнімі росчыркамі свайго заплямленага атрамантам пяра —

канец гэтай вар'яцкай гісторыі.
1930

З чэскай мовы пераклала Галіна Максімюк
Фатаздымкі Яраслава Фэйфара

Яраслаў Фэйфар (Jaroslav Feyfar, 1871—1935) нарадзіўся ў Празе, дзе закончыў мэдыцыну і пачаў сваю лекарскую практыку. У 1903 г. ён прыняў пасаду павятовага лекара ў Ілемніцы і застаўся ў гэтай «глухой правінцыі» на ўсё жыцьцё, нягледзячы на пазьнейшыя спакусьлівыя прапановы вярнуцца ў сталіцу і паправіць сваё становішча ня толькі ў сьвецкім ці прафэсійным вымярэньнях, але і фінансавым. У 1904-м Фэйфар ажаніўся зь ілемніцкай паннай і стаў весьці жыцьцё саліднага і ўсімі шанаванага ў мястэчку (3000 жыхароў) і ўсім павеце (30 000 народу) чалавека. Акрамя лекарскай практыкі, у Фэйфара, надзеленага шматлікімі талентамі, было шмат пабочных зацікаўленьняў, улучна з шаўцоўствам і матацыклетамі. Але тым дадатковым заняткам, які запэўніў яму месца ў гісторыі, стала фатаграфаваньне. Фэйфар актыўна займаўся фатаграфіяй у 1904—1914 гг., значыць, на схіле тае непаўторнае belle epoque у гісторыі аўстра-вугорскай манархіі ў прыватнасьці і Эўропы ўвогуле, калі ўсё ішло сваім адладжаным парадкам, а людзі цешыліся мірным і спакойным жыцьцём. Здымкі Фэйфара засталіся наступным пакаленьням дзякуючы ягонаму сыну, які беражліва перахаваў бацькавы нэгатывы і спрычыніўся да іх публікацыі. Цікава, што два

найбольш славутыя ілемніцкія землякі, Яраслаў Гаўлічак і Яраслаў Фэйфар, ніколі ў жыцьці не сустрэліся. Але, кожны па-свойму, яны зрабілі прыблізна адну справу — здолелі выхапіць з жорнаў гісторыі і захаваць для наступных пакаленьняў некалькі запамінальных абразкоў са свае фантастычнае Правінцыі.

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2007/01/29

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 11 (51) - 2006**

[image]

[image]

[image]

[image]

11 [image] [image] 2006

аналітыка • крытыка • эсэістыка • гісторыя • палеміка • **літаратура**

[image] [image] [image]

Карлас Шэрман Лірыка

КАРЛАС ШЭРМАН (25 кастрычніка 1934 г. — 4 сакавіка 2005 г.) — беларуска-гішпанскі лацінаамэрыканскі перакладчык, літаратар і праваабаронца, ганаровы віцэ-прэзыдэнт Беларускага ПЭН-Цэнтру. Нарадзіўся ва Ўругваі. Перакладаў і пісаў на гішпанскай (роднай), беларускай і расейскай мовах. Быў сябрам навукова-экспэртнай

ШМАТКРОП'Е

Напярэдадні Калядаў
Быў доўгі нябесны шлях,
А потым я крочыў
Апоўначы
Па нарвэскай зямлі
У першую ноч
Бяз вышукаў, арыштаў,
Выгрыньня ворагаў «айчыны»,
Лухты і ананімнага зьбіцьця
Сяброў, зь якімі, вядома, і я,
Ды бачыў з таксоўкі
Абрысы, прывіды
Прыбеленых сьнегам вяршыняў
Ды ціхія марскія затокі.

Са мною былі Тамара і сябры.

Крочыў я насамрэч
У няведамы прытулак,
Каб крыху сьцішыць
Незагойныя шнары,
Што ныюць адчайна,

Аддыхацца, штосьці дадумаць
У вольным градзе Крыстыянсандзе,
Але з кожным крокам —
Напярэдадні далёкіх ад дому
Калядаў маіх —
Сьцяміў я, што да сьлёзаў
Баліць і баліць Уругвай,
Баліць і баліць Беларусь.

АГМЕНЬ

У самотным прытулку
Агмень
Шыпіць, вохкае, крэкча
Па-старэчы,
Помніць з табою
Маленства
Пад Паўднёвым Крыжам,
Студэнцкія страйкі
Ды жандараў чорныя краты,
Змаганьне з дыктатам
У Беларусі ў змроку,
Выгнаньне зрэшты —
Бясьсільле
У самотным прытулку,
Дзе братні агмень
Дзеліцца цеплынёю
Нават з чаіцамі,
Што прыселі на комін
Ды пазіраюць на мора,
Скуль вятрыска,
Таксама на самоце.
Далёка ад мяне —
Дзеці, сябры і ворагі,
Штосьці скамянела ў душы
Ад ледніковае сьцюжы гора,
І толькі агмень

Рады Беларускага Калегіюму. У яго перакладзе на гішпанскую мову выйшлі выбраныя творы Я.Купалы і Я.Коласа «Папараць-кветка» (1982), кнігі А.Куляшова «Мая Бесядзь» (1976), Р.Барадуліна «Чорны вол маёй трывогі» (1985), раман І.Чыгрынава «Плач перапёлкі» (1988), аповесьці В.Быкава «Дажыць да світаньня» (1980), «Абеліск» (1984), «У тумане» (1989) і інш.

Дыхае жыццём,
Спадзяванкай
Няспраўднай.

КОЛІСЬ

Колісь
Суворыя нарвэскія горы
Ад шчырага зьдзіўленьня
Пакланіліся перад морам,
Зьмякчэлыя схілы
Зазелянелі соснамі,
Запаялі птушанятамі
Ажно да самага
Пясчанага берагу.

Так узьнікла Божая гармонія,
Ды завяршальным акордам
Ягамосьць Крыстыян IV
Сфундаваў град у даліне,
На ціхіх узгорках,
Каб люд паўднёва-нарвэскі
Жыў спрадвечна
З запаленай Богам сьвечкай
У душы.

ВЫГНАНЬНЕ

Жыццё ў выгнаньні як стрэмка,
Што пульсуе млосна ў сэрцы,

Іншы век ды слоў бярэмка,
Іншы люд у паняверцы,
Што пазірае з усьмешкай,
Хоць ты ўсё ж зь іншай плянэты,
На дошцы жыцьця ды пешкай
Стаўся бяз мовы паэта.

Ад сяброў надта далёка,
Што часам звоняць нанова,
Ад мовы, што ні галёкай,
Ад зямлі яшчэ ў аковах.

Ты пажывеш у выгнаньні,
Штосьці напішаш, вядома,
У стылі рэтра-вяртаньня
Да танга, што лучыць з домам.

Жыцьцё ў выгнаньні як стрэмка,
Што пульсуе млосна ў сэрцы,
Іншы век ды слоў бярэмка,
Іншы сьвет у паняверцы.

МЫ СУСТРЭНЕМСЯ…

Заўсёдныя разьвітальныя словы незабыўнага Васіля Быкава па тэлефоне

Мы сустрэнемся нанова
Празь зіму і праз завею,
Калі сьціхне ветру злога
Сьцюжа, ад якой хварэем,

І вясноваю абдымкай
Распачнецца шлях да плёсаў,
Да зямлі з блакітнай дымкай,
Што ўскалыхвала лёсы,

А рана ў душы адсочыць
За выгнаньнем, нібы раем,
І ные ды крываточыць,
Уначы нас расьпінае.

Мы сустрэнемся нанова
Празь зіму і праз завею,
Калі сьціхне ветру злога
Сьцюжа, ад якой шалеем.

ГІТАРА

ГТ —
Гэйру Тар'е Юглянду

Гітара ўжо пачынае
Сьпеў чаканы, быццам стогне,
Трымціць у руках, палае,
Пакалыхвае і сьцёгны,

А рытмы дыхтуе неба,
Яна ўздыхае патроху
Ад каханьня і сугрэву,
Што разьліваюцца ў змроку.

Ужо вогнішча затлела,
Па небе ўсплывае зорка,
Хай ня зьнікне, не самлее
Пачуцьцё, што нас агорае.

Гітара ўжо пачынае
Сьпеў чаканы, быццам стогне,
Трымціць у рукох, палае,
Скураю голасу вохкае!

ВЕРШНІК БЕЗ ГАЛАВЫ

Безгаловы, змрочны вершнік
На самоце служыць панам,
Сам з басоты, але вершыць
Лёс абсурдна за туманам.

Вершнік скача ў ноч прадвесьця
Постацьцю цёмнай, грувасткай.
Нібы прывід, ён абвесьціць
Прысуд, што сэнсам як пастка.

Імчыцца дарогай даўняй
Між муроў сярэднявечных,
І зачыняюцца стаўні,
Дрыжыць пад коўдрай паплечнік.

Безгаловы, змрочны вершнік
На самоце служыць панам,
Сам з басоты, але вершыць
Лёс абсурдны за туманам.

УВЕЧАРЫ

Увечары
Счырванелі нябёсы
Ад сораму
Ці не за мінулы день.

СЬВЯТЫ ДУХ

Птушка
На крыжы храму
Ў Грыме
Усьміхаецца мне
Сумна.

СЬВЕТ

Сьвет Божы
Празь лёгкае жалюзі
Разьвітваецца
Назаўсёды.

ВЕЦЕР СКАГАЛАКА

Брунатна-зялёныя горы
Трываюць вяршынямі восень,
Ды вецер ад мора агорае
Самоты бяз Быкава восы.

НАЦЫЯНАЛЬНАЕ СЬВЯТА

Дзесьці ў сьвеце
Ідуць вайсковыя паказы,
Брацаньне ядравай зброяй,
Зямля трымціць ад скрыгату
Атамных пачвараў,
Нябёсы здрыгануцца
Ад бамбавікоў і гелікоптэраў,
А тутака,
Каля лютэранскае катэдры
Крыстыянсанду
Ды па ўсёй краіне
Паўночнага Шляху
Ідуць дзеці
У старажытных строях,
Гучаць песьні, сьмех
Дзіцячы,
Каляровыя шарыкі
Ўздымаюцца да нябёсаў,
Марскі брыз лашчыць
Безьліч сьцягаў увесну,
Безьліч сэрцаў,
Каб адчуць
Сапраўдны пульс краіны,
Пульс
Нарвэскае будучыны.

ЗЬ ЗЯЛЁНАЕ ДАЛІНЫ

Зь зялёнае даліны
Гляджу я штодня
На бунтоўнае мора,
За якім мой боль,
Надзея і ганьба.

СЬВЕДКА

Назапасіў я ўспамінаў,
Ды каб толькі перагартаць
Добрыя згадкі ў памяці,
Трэба ці не яшчэ адно жыцьцё,

І гэтак шмат прыкрых цемраў,
Што мяне ажно не прапускаюць
На спрадвечны транзыт,
Мабыць, з-за лішкаў багажнае вагі.

Вось я нанава запаўняю фармуляры,
Тлумачу, чаму ў графе пэўнай
Накрэмзаў «блуканец з Уругваю»,
А бюракраты з апошняе канцылярыі
Ніяк ня здольныя ўцяміць,
Зноўку вяртаюць паперчыны
Ды мармычуць, што ўсё адно
На кожнага з вас свая апраметная,

А я ўжо думаю, —
Мо кінуцьме гэную мітусню
Зь бяздушнымі клеркамі
Ды застацца
На мяжы жыцьця і сьмерці
Хоць бы на тое, каб паглядзець,
Што будзе з ашалелым сьветам
Заўтра,
Калі ня нафта ці атам, а паэзія
Станецца жывой крыніцай
Энэргіі чалавецтва?
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум

№ 11 (51) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2007/01/29**
[image]

рэцэнзіі

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ

Павал Абрамовіч
Ад дзёньніка да літаратуры

літаратурны крытык. Рэгулярна друкуецца ў «ARCHE».

---

[1] Гл., прыкладам, артыкул «Фэміністычны дыскурс у сучаснай беларускай літаратуры» ў ейнай кнізе «Новая літаратурная сытуацыя: зьмена культурнай парадыгмы».

Тэда Лі. *Каляндарык сярэдзіны кастрычніка* // Дзеяслоў. № 8. 2004.

Тэда Лі. *Інфэкцыйны клюб* // ARCHE. № 3. 2005.

Тэда Лі. *Ліпавы шлюб* // Дзеяслоў. № 22. 2006.

Пра беларускую жаночую прозу ня пішуць артыкулаў і навуковых працаў. Наша літаратуразнаўства не сьпяшаецца разгледзець гэты важкі сэгмэнт сучаснай літаратуры і такім чынам легітымізаваць яго. Не ў апошнюю чаргу праз маўчаньне навукоўцаў склалася ненармальная сытуацыя, калі беларускую літаратуру ў вачах замежнага чытача рэпрэзэнтуюць пераважна пісьменьнікі-мужчыны. Да прыкладу, зь дзевяці твораў, зьмешчаных у анталёгіі «Białoruś. Kraina otoczona wysokimi górami» (Wybór i przekład Katarzyna Kotyńska, Małgorzata Buchalik. — Olsztyn: Borussia, 2004), толькі адзін належыць пяру жанчыны (апавяданьне Евы Вежнавец «Візыт архіварыюса»).

Прабіць сьцяну спрабуе крытык Ганна Кісьліцына[1]. Ніжэй я разгледжу тры апавяданьні пісьменьніцы Тэды Лі (часопіс «Дзеяслоў» раскрыў таямніцу псэўданіму, паведаміўшы, што за ім «схавалася» 21-гадовая студэнтка і журналістка зь Менску

Адэля Дубавец) — і такім чынам далучуся да Ганьнінага высілку.

ХІБЫ ЖАНОЧАЙ ПРОЗЫ

У 1931 г. расейскі паэт і літаратурны крытык Уладзіслаў Хадасевіч напісаў рэцэнзію «Жаночыя» вершы» для газэты «Адраджэньне» (Парыж), у якой, на мой погляд, сказана галоўнае пра слабыя бакі жаночага слоўнага мастацтва. На думку У. Хадасевіча, трэба разьмяжоўваць спачуваньне чалавечае і спачуваньне мастацкае. **Наяўнасьць першага** яшчэ **не ўтварае другога**. «Паэзія патрабуе ўсталяваньня асаблівай, чыста літаратурнай сувязі, якая ствараецца пры дапамозе гэткіх жа спэцыяльных, літаратурных спосабаў узьдзеяньня, — пісаў У. Хадасевіч. — Паэт павінен умець і жадаць імі карыстацца». Дакумэнтальная моц перажываньня ілжывая і небясьпечная для літаратара, бо той, хто спадзяецца толькі на яе — без усталяваньня літаратурнай сувязі з чытачом — пакідае без увагі эстэтыку і паэтыку. У. Хадасевіч перакананы, што жанчыны больш давяраюць асабістаму досьведу, сваім перажываньням, чым «доказам, створаным тэорыяй». Таму жаночая літаратура за рэдкім выняткам нагадвае хутчэй прыватныя дзёньнікі, чым мастацкія творы — зашмат у ёй асабістага, інтымнага, выпадковага, другаснага, зашмат «капрызаў» і «недаразьвітага». Таму яна больш цікавая менавіта як «чалавечы дакумэнт», сьцьвярджаў крытык.

Нехта скажа, што У. Хадасевіч быў небесстаронным крытыкам і жанчынаненавісьнікам. Гэта няпраўда. Ён быў удумлівым чалавекам, здольным спасьцігаць сутнасьць рэчаў (нездарма ён першы зразумеў дар Уладзімера Набокава). І да таго ж ён — таленавіты літаратар, які ведаў усё пра ўзьвядзеньне крыштальных літаратурных мастоў і дбаў найперш пра чысьціню, гарманічнае разьвіцьцё слоўнага мастацтва. Ягоныя развагі пра неабходнасьць «мастацкага спачуваньня» і небясьпеку для літаратуры «чалавечых дакумэнтаў» застаюцца актуальныя.

Ці нараджаецца «мастацкае спачуваньне» ад апавяданьняў Тэды

Лі? Адказ на гэтае пытаньне мы і паспрабуем знайсьці.

ДЗЁНЬНІК «ПЕРАВАЖЫЎ»

Сюжэт першага, дэбютнага, апавяданьня Тэды Лі «Каляндарык сярэдзіны кастрычніка» вельмі просты. Дзяўчына кахае хлопца, але той здраджвае ёй, і таму яна яго кідае. Ёй кепска, яна робіць усё, каб забыць нягодніка. Нарэшце праз тры дні дзяўчына ўсьведамляе, што ўсё скончылася — яна вызвалілася з палону каханьня і можа жыць па-новаму, паводле іншага каляндарыка.

Гераіня апавяданьня мусіць выклікаць спачуваньне. Сапраўды, яе *па-чалавечы* шкада: «Усё скончылася. Ён сыходзіць, ты — заміраеш з распухлым ад сьлёз і ветру тварам. Сёньня будзеш сама гатаваць на сьцюдзёнай камфарцы свой гарачы мармэляд. Сама — есьці лыжачкай, запіваючы моцнай бэргамотавай гарбатай: вы ніколі не пілі такой разам».

Аўтарка ведае, што чытачоў будзе найперш цікавіць тое, як ейная гераіня пераадолее варункі, якое выйсьце яна знойдзе. Балазе варыянтаў нямнога, і гераіня спрабуе іх усе па чарзе. Спачатку, *як і ў жыцьці*, адзінота і сьлёзы, успаміны, якія вярэдзяць душу, спробы зразумець, чаму так выйшла. Потым — алькаголь і дапамога сяброўак. Затым думкі пра самагубства, злосьць, жаданьне адпомсьціць — дзеля гэтага гераіня ненадоўга аднаўляе сустрэчы з былым каханым. Потым у душы наступае цішыня; надыходзіць усьведамленьне таго, што жыць безь ЯГО можна і трэба: «…ты больш ня ЁН, ты цяпер проста «ён», яшчэ адзін з тых, каму я пасіўна не жадаю нічога і адпускаю назаўсёды». Вось і ўсё. Наўрад ці гэта было каханьне, хутчэй закаханасьць.

Мяне больш цікавіць іншае: ці ўзьдзейнічае Тэда Лі на сьвядомасьць чытачоў пры дапамозе сродкаў мастацтва, ці ўсталёўвае яна, карыстаючыся словамі У. Хадасевіча, «літаратурную сувязь»?

Усе даты ў «Каляндарыку…» рэальныя. Перад намі — сапраўдны «чалавечы дакумэнт». Мы прагарталі прыватны

дзёньнік, пражылі чатыры дні з гераіняй А. Дубавец. З пункту гледжаньня псыхалёгіі тут усё дакладна, усё, як у рэчаіснасьці. З усяго відаць, што аўтарка сама перажыла падобнае, праўдзіва занатавала свае перажываньні, «падзялілася» імі з пэрсанажам. Але што Тэда Лі прапануе нам, апроч фактаграфічнасьці, дакумэнтальнасьці? Амаль нічога. Дзеля справядлівасьці зазначу, што аўтарка іншым разам прыбягае да мастацкіх прыёмаў, спрабуе стварыць вобраз: «У ценях кастрычніцкіх сквэраў і алеяў я заўважаю, што я ўжо не адна, нас як мінімум *двое*: я і мой горад, які абдымае мяне, запальвае гронкі ілюмінацыяў для мяне і для мяне залоціць лістоту дрэваў… Адзінота адхлынае, дзень сканчаецца».

Аднак гэта ня робіцца мэтаю, і дакумэнтальнасьць перамагае, забіваючы кволыя мастацкія парасткі. Тэда Лі палічыла, што істотней, вышэй за праўду жыцьця ня можа быць нічога, але памылілася: мастацкага спачуваньня ў чытача не нарадзілася, апавяданьня не атрымалася.

БЫЦЦАМ СЁСТРЫ

Праблемы зь перапрацоўкай асабістага, прыватнага ў *літаратурнае* ўласьцівыя і іншым беларускім аўтаркам-дэбютанткам. Вось і 25-гадовая гамяльчанка Югася Каляда (псэўданім Яўгеніі Парашчанкі) у трылёгіі «Лета» нярэдка зьбіваецца і, захапіўшыся дзёньнікамі, сырым матэрыялам, пакідае тэрыторыю мастацтва. Пры гэтым пісьменьніца з уласьцівым ёй гумарам пераконвае даверлівых чытачоў у адваротным: «Ну ў чым быў вінаваты перада мною хоць бы той самы Сева? Якое злачынства ён зрабіў, каб я, узмахнуўшы чароўным алоўкам, ператварыла яго ў літаратурнага героя?» («Экіпаж разьвітваецца з вамі»).

Адрозна ад Тэды Лі, Ю. Каляда, відаць, усьведамляе свае хібы, і таму ідзе на хітрыкі. Так, дзеля таго, каб выразна пазначыць свой статус як пісьменьніцы і пераканаць чытачоў у тым, што перад імі — 100-адсоткавы мастацкі твор, яна нярэдка распачынае гульню са сваімі пэрсанажамі: «Яны [героі] проста моўчкі адвярнуліся ды пайшлі прэч па белай дарозе і хутка-

хутка зьніклі, пакінуўшы мяне сам-насам з гэтай белай дарогай — чыстай паперай. Я са сьлязамі на вачах і болем у сэрцы праводзіла іх сваім мэнтальным позіркам» («Замалёўкі зь вясковага жыцьця»).

Некаторыя беларускія літаратурныя крытыкі, як, прыкладам, Ігар Бабкоў, адразу «павяліся» (гэта зразумела, бо падобныя мадэрновыя прыёмы ў нашым слоўным мастацтве вельмі рэдкія), прычым заявілі, што гэта і іншае ім вельмі, вельмі падабаецца, ня здолеўшы, аднак, патлумачыць нам, *чаму* і *за што* яны ўпадабалі творчасьць Ю. Каляды. Але няма нічога дзіўнага, што аўтар «Адама Клакоцкага і ягоных ценяў» прызнаўся ў сымпатыях да аўтаркі «Галоўнай памылкі Афанасія» — у «эстэтычным вымярэньні» Бабкова вельмі адзінока, а тут, нарэшце, зьявілася родная душа (хутчэй, яе ўдалая імітацыя).

Ю. Каляда шмат чытае і спрабуе тое-сёе скарыстаць з багатага арсэналу клясычнай і найноўшай сусьветнай літаратуры. Гэта — пэрыяд вучнёўства ў жыцьці маладой, дзёрзкай і пэрспэктыўнай пісьменьніцы. Магчыма, ён ужо сканчаецца[2], а магчыма, што Ю. Каляда зробіць высьвятленьне стасункаў з пэрсанажамі сваім «фірмовым знакам» у спадзеве на ўвагу тых чытачоў, якія ніколі ня бралі ў рукі «Пніна» ці «Празрыстыя рэчы» У. Набокава.

Тэда Лі і Ю. Каляда злоўжываюць «чалавечымі дакумэнтамі» (дакладней, сваімі біяграфіямі), аднолькава разьлічваючы на дакумэнтальную моц перажываньня (чытай, уласных пачуцьцяў). Таму іхныя першыя творы (апавяданьне «Каляндарык сярэдзіны кастрычніка» Тэды Лі і апавяданьні «Зялёны акіян, залатыя бурбалкі» і трылёгія «Лета» Ю. Каляды) блізкія і праблематыкаю. Супольныя для аўтараў і ўпершыню ўзяліся «памахаць чароўнымі алоўкамі», збаяўшыся наступстваў, тэмы пошуку каханьня і шчасьця, выбаўленьня ад самоты, а таксама… матыў дзіцячага гвалту. Акрамя таго, іх яднае прага самаўдасканаленьня. У дэбютных творах маладыя пісьменьніцы занятыя пераважна сабой, яны высьвятляюць, чаму зь іхнага жыцьця «зьніклі мужчыны» (Югася Каляда), і адчуваюць «амаль навобмацак сваю адзіноту»

[2] Тэда Лі «Галоўная памылкі Афанасія» (2000) і «Пакінутыя» (2001).

[3] Ю. Каляда «Пяцёрымка для дарослых» (2001).

(Тэда Лі). Яны разгубленыя, знэрваваныя, але аднак
пераконваюць сябе ў тым, што моцныя і ўсё здолеюць
падобна гераіням «Дзёньнікаў Брыджыт Джонз» альбо
на месяцовае сьвятло».

Гераіня Тэды Лі глыбока занураная ў свой унутраны сьвет, і
таму рэчаіснасьць для яе размытая, пазбаўленая выразнага
абліччя. Ю. Калядзіна лічыць, што жанчыны «бяруць
пачатак у Міфе, дзе ўсё ўзаемазвязана, і таму
ім чужая Адзіная Карціна Сьвету, якая ўсё тлумачыць,
ім чужы Бінарны Код, які ўсё дакладна ўпарадкоўвае,
ім чужы Аб'ектыўны Погляд, які ўсё ставіць на свае
месцы». Такім чынам, Ю. Калядзіна ўводзіць
дыхатамію «мужчынскі — жаночы», якая, на
Харыленскі, бярэ сваю пачатак у старажытнасьці і
фіксуе (як лічыць Ю. Крысьцева) розныя
прадпрыхтаваліся да выбараў…») і зноў вяртаецца да сваіх
дзявочых праблемаў.

(ARCHE. 2006. № 1—2), «Тарыфу напісаныя ў новай манеры.

ЛОКЦІ НАРКАМАНКІ ЯК ЛІТАРАТУРНЫ ВОБРАЗ

Давайце разьвітаемся зь Ю. Калядой — яна сыходзіць з маёй рэцэнзіі, бліснуўшы акулярамі. А мы разгледзім другое апавяданьне Тэды Лі — «Інфэкцыйны клюб» — і паспрабуем адказаць на тое ж пытаньне: ці мастацкі гэта твор?

Апавяданьне напісанае ад імя першай асобы. Як і ў выпадку з «Каляндарыкам…», гэты ход патрэбны, каб пераканаць чытачоў, што аўтарка — сьведка апісаных падзеяў і ўсё тут праўда. Існуе «чалавечы дакумэнт»? Зусім не. А. Дубавец гэтым разам ня робіць выпісак са свайго прыватнага дзёньніка: у апавяданьні «Інфэкцыйны клюб» яна гаворыць ад імя мужчыны, сталага наведніка месца, якое ў міліцэйскіх зводках называюць «наркапрытонам». Калі я чытаў тэкст, дык баяўся, што зараз існуе атрымаю іньекцыю мэлядраматызму, але не, абышлося. Тэда Лі ўтрымалася ад гэтага. Больш за тое, пісьменьніца здолела намаляваць шэраг адметных запамінальных вобразаў:

Лоры не было ў той вечар. Яе не было яшчэ вельмі доўга. Урэшце аднойчы яна прыйшла. Яе калаціла, яна была жудасна гарачай, з бліскучымі вачыма і пачырванелай скурай пад носам. Яна зайшла

ў той самай ружовай маечцы, у яе па-ранейшаму не было грудзей. Была толькі тоненькая маечка, жахлівая прастуда і суворая зіма на вуліцы. Яна стаяла пасярод пакою, выставіўшы локці, пакуль мы ўсе глядзелі на яе ў чаканьні чагосьці асаблівага.

Літаратура пачынаецца з назіраньня, потым надыходзіць чарга цішыні, роздуму, затым — перастварэньня. Тэда Лі ўсьвядоміла гэта, пра што, у прыватнасьці, сьведчыць яе ўвага да дэталі («ружовая маечка», «стаяла пасярод пакою, выставіўшы локці»). У «Інфэкцыйным клюбе» яна вырашае цалкам мастацкія задачы: аўтарка імкнецца паказаць людзей, чые жаданьні, мэты і мары адрозьніваюцца ад нашых (але адначасова, як і мы, яны хочуць быць шчасьлівыя), людзей, якія прагнуць вырвацца з задушлівых абдымкаў рэчаіснасьці. Дзеля таго, каб перадаць «інакшасьць», адметнасьць сваіх герояў, Тэда Лі выкарыстоўвае выключна мастацкія сродкі. Сцэна, калі кампанія наркаманаў глядзіць фільм у кінатэатры і літаральна патанае ў кінавобразах, выглядае пераканаўчай, па-мастацку сьпелай. Сэксуальныя трызьненьні закаханага наркамана яркія, індывідуальныя («Лорыны локці былі насамрэч вельмі прыгожыя, вытанчаныя і ружовыя. Бывае, я пачынаю трызьніць яе локцямі. Ня вуснамі, не вачамі, не нагамі. Локці ў яе гэткія ж вострыя, пругкія і значныя, якімі бываюць грудзі».) У Тэды Лі атрымліваецца прыкмячаць дэталі, ствараць эпізоды, казаць пра пачуцьці. Аднак калі аўтарцы спатрэбілася сфармуляваць у апавяданьні жыцьцёвае крэда аматараў галюцынагенаў, зрабіць панарамны здымак, надаць твору філязофскую глыбіню, то ў яе, на жаль, нічога не атрымліваецца — адно літаратурныя штампы:

Мы робім з сабой усё, каб забыцца, усё, каб сьвет страціў сваё рэальнае аблічча, усё, каб яго карцінка ня рэзала вочы, не мусоліла пагляд. Мы тут лішнія, і мы анічога ня цэнім. Нам наплявaць на заўтра. Мы накачваемся рознай дрэньню, каб паверыць у тое, што мы — не слабакі, і што сьвет, які мы так і не адолелі, — усяго толькі бутафорыя, падман. Мы — трагедыя.

На мой погляд, пісаць гэткія банальнасьці пасьля таго, як выйшлі друкам жорсткія, гранічна шчырыя кнігі Ўільяма Бэраўза і Пітэра Ўэлша, нельга. Але ня будзем забывацца, што Тэда Лі зусім нядаўна дэбютавала ў літаратуры. Яна яшчэ шукае свой шлях, уласную тэму. І робіць гэта, трэба прызнаць, энэргічна. Пазаўчора яна пісала пра тыповыя перажываньні тыповай дзяўчыны, спадзеючыся, што атрымаецца мастацкі *тып*, а ўчора, забыўшыся на «чалавечыя дакумэнты», не збаялася выказаць сваё «літаратурнае» меркаваньне датычна складанай і актуальнай для беларускага слоўнага мастацтва тэмы — стасункаў меншасьці і большасьці. Гэта — вялікі крок наперад, чарговае пацьвярджэньне мудрых словаў Максіма Багдановіча, што ў нашай літаратуры ўсё робіцца шпарка.

Аб чым піша Тэда Лі сёньня?

«НЯЛІПАВАЕ» АПАВЯДАНЬНЕ

У трэцім апавяданьні — «Ліпавы шлюб» — пэрсанажы атрымаліся яшчэ больш складаныя, чым у «Інфэкцыйным клюбе», — яны маюць уласныя душы, жывуць у паралельным сьвеце, створаным для іх воляй аўтаркі, але надзеленым прыкметамі нашай убогай сучаснасьці: бурачковая салата, бюлетэнь Сьведкаў Еговы і часопіс «Маладосць» у паштовай скрынцы, заначка гаспадарчага мыла, «вялікія елкі ў цесных хатах» пад Новы год, пэнсійнага ўзросту кабета, якая ў радыёперадачы «скуголіць у ролі надзвычай уразьлівага дашкольніка». Учынкі герояў псыхалягічна дакладныя, маюць унутраную матывацыю (вельмі добра атрымаўся камічны вобраз матулі галоўнай гераіні). Мова добрая, пругкая.

Што таксама важна, гісторыя каханьня ў «Ліпавым шлюбе» ня мае нічога агульнага з комам злобна-нэрвовых павярхоўных перажываньняў і капрызаў з псэўдалітаратурнага «Каляндарыка…». Тут — сапраўднае глыбокае пачуцьцё, ад якога ў сэрцах чытачоў нараджаецца (нарэшце!) мастацкае спачуваньне: «Ты не пацан. Ты проста сапраўдная. Сапраўдная. І яшчэ ў цябе скура пахне пяском, і ты для мяне».

Таму няма нічога дзіўнага, што, публікуючы гэтае апавяданьне,

часопіс «Дзеяслоў» назваў сапраўднае прозьвішча аўтаркі: прыйшоў час Адэлі Дубавец выйсьці на літаратурную авансцэну і зірнуць у вочы сваім чытачам, якія чакаюць ад яе новага перастварэньня рэчаіснасьці.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2007/01/29**
[image]